# ARCHE Зьмест № 2’1999 ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА


1. Зьмест / Уводзіны
2. ARCHE 2(3)-99. Ад рэдакцыі: "...У гэтым нумары “ARCHE” мы ўбачым знакі вайны. Перш за ўсё — адлеглай ад нас на 55 гадоў апошняй вайны на нашай зямлі. Навала зла, прынесенага ёю Беларусі, не дапускае розных ацэнак. Кожны тут ведае, дзе там было чорнае, а дзе — белае. Ня кожны, аднак, думае пра тое, як гэная вайна дзяліла беларусаў..."
3. ARCHE 2(3)-99. Трывога. С.Юстапчык (Антон Адамовіч). "…Гэта быў маленькі гарадок, якіх даволі расьсеяна па Расеі–“матушцы”, дый па найвярнейшай дачушцы ейнай, сіберна–сівернай, ссыльна–катаржнай Сібіры…"
4. ARCHE 2(3)-99. Зь дзёньніка Ів.Ів.Чужанінава. Л.Крывічанін (Лявон Савёнак). "...21 сьнежня. Купляў цацкі на ёлку. Дзіўная рэч: вайна, скрозь галеча, а людзі ёлку ладзяць. Разам са мной купляў цацкі нейкі тып. „Дайце мне, — кажа, — якіх–небудзь вясёленькіх цацак“. „Вясёленькіх? — кажа крамніца, — калі ласка“. І — шась на прылавак гармату, гранату, самалёт, ды йшчэ якіхсь пушак..."
5. ARCHE 2(3)-99. Страшны год. Юр. Монвід (Францішак Аляхновіч). "…Едзем. Ня маем яшчэ ніякага пляну датычна пераходу граніцы. На мейсцы пабачым, разьмяркуем, вырашым... За Коўняй на кажным масточку — савецкая варта…"
6. ARCHE 2(3)-99. Miensk siannia. Francisak Alachnovic. "...Paslali pa palicyju. Zjavilisia maladyja chlopcy. Adzin z ich smiela vyciahnuu sufladu i zaprapanavau..."
7. ARCHE 2(3)-99. Леанарда. Вячаслаў Адамчык. "… Думалася пра ўсё благое — пажар, сьмерць, — толькі не пра тое, што ў яго за сьпінаю будуць стаяць яшчэ пяцёра, а ў пройму прыадчыненых дзьвярэй уткнецца руля вінтоўкі, каб ужо іх зачыніць яна не магла…"

8. ARCHE 2(3)-99. Абвесткі. 1941-1944. "...У новых прадуктовых картках катэгорыі “Б” (для работнікаў цяжкое працы), выдадзеных на пэрыяд ад 22/II па 21/III — 43 г., зь віны друкарні ёсьць наступныя памылкі:.."
9. ARCHE 2(3)-99. Вацлаў Іваноўскі і беларускае адраджэньне. Юры Туронак. "...Адразу пасьля забойства Кубэ, раніцай 22 верасьня чальцы Камітэту даверу Вацлаў Іваноўскі, Юры Сабалеўскі, Аўген Калубовіч і Міхал Ганько накіраваліся да начальніка палітычнага аддзелу генэральнага камісарыяту, д–ра Маркуса з просьбай не пачынаць рэпрэсій супраць жыхароў Менску…"
10. ARCHE 2(3)-99. Правільны выбар. Валерка Булгакаў. "… Маршал Блюхер спяшыў прыехаць у вёску N завідна. Вёска трывожна не спала. Дзед Кузьма паставіў самавар. Дзед Рыгор пачасаў бараду і закурыў цыгарку. „Не к дабру гэта ўсё, не к дабру“, — падумаў дзед Мікіта і загасіў у хаце газніцу…"
11. ARCHE 2(3)-99. Великая отечественная: миф плюс история. Андрей Екадумов. "...Ради будущего освобождения человека следовало приносить жертвы настоящим, ради должного жертвовать сущим. Надо было закабалить миллионы и миллионы, подчинив волю каждого индивида выполнению цели, торжество которой сам он уже не застанет. Несколько поколений уже рожденных людей должны были совершить подвиг отречения во имя будущих, еще не родившихся поколений..."
12. ARCHE 2(3)-99. Добраахвотныя памочнікі Гітлера. Звычайныя немцы й Галакост. Дэніэл Голдгаген. "…Удзел паліцыйных батальёнаў у маштабных карных апэрацыях у рамках генацыду пачаўся зь нямецкага ўварваньня ў Савецкі Саюз 22 чэрвеня 1941 году…"
13. ARCHE 2(3)-99. Белорусский народ не простит буржуазным националистам их кровавых дел. Лаврентий Цанава. "...И в каждом сожженном доме, разрушенном предприятии, в разграбленном колхозе, в каждой капле крови невинных жертв содержалась большая доля вины преступных белорусских националистов, по праву теперь именуемых национал–фашистами. Это они, белорусские нацфашисты, присутствовали при казнях белорусских

советских патриотов в качестве гитлеровских прокуроров, в качестве палачей гитлеровского “нового порядка”..."

14. ARCHE 2(3)-99. Жыцьцё з галавою ў пятлі. Уладзімер Ісаенка. "...Разбомблены цэнтар гораду згарэў, але менчукоў гэта ня вельмі патрывожыла, бо ад Карла Маркса да плошчы Свабоды — гэта быў раён энкавэдыстаў, дык хоць 4 кв. км. у цэнтры згарэла, а ўсё навакольле, дзе жылі мясцовыя, засталося цэлым…"
15. ARCHE 2(3)-99. Мастацтва пра вайну. Сяргей Харэўскі. "… Сапраўдным шэдэўрам у той яшчэ не астылы ад агню час стала палатно Волкава „Менск, 3 ліпеня 1944 году“, якое адным крокам увайшло ў савецкую клясыку й засталося непераўзыйдзеным у сваім жанры ў мастацтве беларускім... Цяжка сказаць дакладна, калі Волкаў пачаў пісаць сваё эпічнае палатно пра ўваход танкаў у Менск, адно пэўна — да 1944 году…"
16. ARCHE 2(3)-99. Песня белорусских партизан. Андрэй Хадановіч. "...Ой, Тарзаны, лесные Тарзаны! Хай жыве обезьяна Кинг–Конг! Уходили в поход партизаны, уходили в далекий Гонконг! Далеко им идти до Гонконга... В тех краях, где растет баобаб, по весне разливается Конго, затопляет беременных баб. В дельте Нила советские танки — тель–авивский агрессор не рад: там смуглянки, сиречь молдаванки, собирают в садах виноград!..."
17. ARCHE 2(3)-99. Беларуская Опэра ў 1941–1944 гадах. Віктар Мухін. "…Наступ гітлераўскага войска быў нагэтулькі імклівы, што першымі здолелі ўцячы толькі савецкія кіраўнікі Рэспублікі, а гэтаксама іхныя сем’і. Для дзеячоў культуры й мастацтва, ужо ня кажучы пра шараговае жыхарства, акупацыя сталася гэткаю ж раптоўнаю, як і ўдар маланкі…"
18. ARCHE 2(3)-99. Аповед пра Іона Аксэльрода. Зьміцер Саўка. "...Іон Аксэльрод стараўся бяз шуму / Пракрасьцісь паўз жоўты плот. / Але ён меў рудую бэрэтку — / Яго заўважыў / кот..."
19. ARCHE 2(3)-99. Іншага канца сьвету ня будзе. Чэслаў Мілаш. "...У дзень канца сьвету / Над кветкай настурцыі лётаюць пчолы, / Рыбак ладзіць свой нераток, / У моры вясёлыя скачуць дэльфіны, / А скура вужа зьзяе золатам,

як і павінна..."

20. ARCHE 2(3)-99. Ці гэта чалавек? Жыцьцё ў Асьвенцыме. Прыма Леві. "…У шахтах распаўсюдзіліся зьвесткі пра дэсант хаўрусьнікаў у Нармандыі, пра наступ рускіх і пра няўдалы замах на Гітлера. Яны ўзьнялі хвалі бурных, але эфэмэрных спадзеваў. Кожны адчуваў, як дзень за днём згасаюць ягоныя сілы, губляецца воля да жыцьця, точыцца розум; і Нармандыя, і Расея былі так далёка, а зіма так блізка…"
21. ARCHE 2(3)-99. Дзесяць гадоў бяз Прыма Леві. Цьветан Тодараў. "…я адзначыў бы дзьве, магчыма, банальныя, але моцныя тэзы, моц якіх і бярэцца з самой гэтай супрысутнасьці. Першая заключаецца ў прызнаньні таго, якія жахі здольны чыніць чалавек. Гуманізм тут зусім ня зводзіцца да культу чалавека, чалавека ўвогуле і ў прыватнасьці, або веры ў высакароднасьць ягонай натуры; не, адпраўны пункт тут — гэта Асьвенцым…"
22. ARCHE 2(3)-99. Расейскія прэтэнзіі на рускую спадчыну. Эдвард Кінан. "...я маю намер абмеркаваць шэраг распаўсюджаных поглядаў на гісторыю расейскай афіцыйнай ідэалёгіі (падаўшы іхны пералік трохі ніжэй), каб вызначыць, у якой ступені яны адлюстроўваюць гістарычную рэальнасьць, а пасьля (паколькі яны яе не адлюстроўваюць) прапанаваць пару думак наконт таго, як яны ўзьніклі і падтрымліваліся..."
23. ARCHE 2(3)-99. Сьледчыя хацелі зрабіць мяне Міронам. Уладзімер Плешчанка. "…Раніцаю я быў на мейсцы здарэньня. Вакол пастамэнту сабралася шмат прадстаўнікоў гарадзкога кіраўніцтва ды іншых асобаў у цывільным, нібы ў Віцебску адбылося штось надзвычайнае. На мяне ніхто не зьвярнуў увагі…"
24. ARCHE 2(3)-99. У Німе. Міхась Шупенька. "...Прымаюць яны нас добра. І кушакі даюць, і вінка белага й чырвонага выставілі колькі захочаш. Дзядэк — музыкаж, і Дарэк, і Чарэк, і Джоні–Гітара, які зьбег яшчэ падчас ваеннага стану ў Польшчы ды так і застаўся, апошнія гадоў з восем усё ніяк ня могучы выбрацца “на Корсыку” да сваёй кабеты..."
25. ARCHE 2(3)-99. Пра вайну. Вінцэсь Ліпскі. "...Цяпер пайшла мода разважаць, што вось партызаны правакавалі

немцаў на знішчэнне мірных вёсак. У 1942 г. два чэхі, закінутыя з Англіі на парашутах, забілі імперскага пратэктара Багеміі і Маравіі Гайдрыха. У адказ немцы расстралялі заложнікаў і знішчылі два бліжэйшыя населеныя пункты — Лідзіцэ і Лежакаў..."

26. ARCHE 2(3)-99. Плач па Косаве. Ісмаіл Кадарэ.
"...Песьняры заўсёды гінуць у бітве апошнімі, сказаў надоечы князь Лазар, начальнік над усім хрысьціянскім войскам, загадаўшы, каб усе сэрбскія гусьляры, валаскія і басьняцкія дудары і альбанскія барды, што прынесьлі з ілірыйскіх Альпаў свае аднаструнныя лагуты, сабраліся разам на ўзгорку побач зь ягоным намётам, каб зь бясьпечнага месца сачыць за бітвай..."

[image]
[image]

З ь м е с т 2 (3) - 1999

.

[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

---

[image] 1999
[image]
Вялікая айчынная вайна
[image]
[image]

# ЗЬМЕСТ

*Ад рэдакцыі*

**кніга**

*С.Юстапчык (Антон Адамовіч).* Трывога
( [image] **ZIP:** 123 K )

**полымя**

*Л.Крывічанін (Лявон Савёнак).* Зь дзёньніка Ів.Ів.Чужанінава
*Юр.Монвід (Францішак Аляхновіч).* Страшны год
( [image] **ZIP:** 27 K )
Miensk siannia

**слоўнік паняцьцяў**

*Вячаслаў Адамчык.* Леанарда
*Абвесткі.* 1941–1944
*Юры Туронак.* Вацлаў Іваноўскі і беларускае адраджэньне
( [image] **ZIP:** 43 K )
*Валерка Булгакаў.* Правільны выбар
( [image] **ZIP:** 27 K )
*Андрей Екадумов.* Великая отечественная: миф плюс история
*Дэніэл Голдгаген.* Добраахвотныя памочнікі Гітлера. Звычайныя немцы й Галакост
( [image] **ZIP:** 24 K )
*Лаврентий Цанава.* Белорусский народ не простит буржуазным националистам их кровавых дел

**успаміны**

*Уладзімер Ісаенка.* Жыцьцё з галавою ў пятлі
( [image] **ZIP:** 25 K )

**мастацтва**

*Сяргей Харэўскі.* Мастацтва пра вайну

**вожык**

*Андрэй Хадановіч.* Песня белорусских партизан

**прабел**
*Віктар Мухін.* Беларуская Опэра ў 1941–1944 гадах
**лірыка**
*Зьміцер Саўка.* Аповед пра Іона Аксельрода
*Чэслаў Мілаш.* Іншага канца сьвету ня будзе
**сьветліня**
*Прыма Леві.* Ці гэта чалавек?
*Цьветан Тодараў.* Дзесяць гадоў бяз Прыма Леві
**гуманістыка**
*Эдвард Кінан.* Расейскія прэтэнзіі на рускую спадчыну
( [image] **ZIP:** 22 K )
**хроніка**
*Уладзімер Плешчанка.* Сьледчыя хацелі зрабіць мяне Міронам
**гісторыі**
*Міхась Шупенька.* У Німе
**запісы**
*Вінцэсь Ліпскі.* Пра вайну
**прыпавесьць**
*Ісмаіл Кадарэ.* Плач па Косаве ( [image] **ZIP:** 44 K )

---



---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 14-07-1999**

[image]
[image] *Вайна ў 2(3)-1999* .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

да Зьместу 2-1999

# Ад рэдакцыі

**М**інуўшчына жыве ў вэрсіях. Дыстанцыя ёй надае нарасьцяў — узьвелічае або мізэрніць. Вэрсіі, угрунтаваныя на фактах, вылушчаных з забыцьця, дужаюцца міжсобку, прыціраюць, змагаюцца, урэшце, трыюмфуюць адна над аднэй...
У гэтым нумары “ARCHE” мы ўбачым знакі вайны. Перш за ўсё — адлеглай ад нас на 55 гадоў апошняй вайны на нашай зямлі. Навала зла, прынесенага ёю Беларусі, не дапускае розных ацэнак. Кожны тут ведае, дзе там было чорнае, а дзе — белае. Ня кожны, аднак, думае пра тое, як гэная вайна дзяліла беларусаў. На тых, што самі робяць выбар, і тых, чый выбар залежыць ад іншых, на тых, што ведаюць цану дыктату, і тых, што ад дыктату неаддзельныя, на тых, якія баяцца, і тых, якія б’юцца, на тых, якія ведаюць Бацькаўшчыну, і тых, якім за бацькаўшчыну цэлы сьвет.
Сапраўдныя весткі з вайны разьвейваюць чорна–белую яснасьць. Мы ў гэтым нумары хацелі найперш рэканструяваць “настрой часу”. Настрой крывавага часу. Не замоўчваючы ідэалягічных забабонаў. Мы адшуквалі творы, якіх ня ведаем, пра вайну, якую ўрэшце мы ня ведаем. Пра вайну, якую нам засланіў міт пра яе. Ёсьць там месца й нацыянальным ілюзіям людзей, якім выпала паспытаць чарговага чужынскага парадку. Былі ў іх тады рознабаковыя хаўрусы, зрываліся яны на імпэтныя прысяганьні, перапаўняліся ад авантурных ідэяў... Наўкола тым часам лілася кроў і варагоў, і сваіх — на вайне заўжды як на вайне. Цывілізацыйны камуфляж фашызму стракацеў мільёнамі загубленых жыцьцяў. Заходнія альянты заставаліся на Захадзе. Загасалі апошнія ілюзіі для Беларусі. Беларусь пасьля вайны канчаткова засталася на Ўсходзе... Чужым сэрцам санкцыянавалася, перасьцярожліва адмервалася нам прастора мысьліць і снаваць вэрсіі — абдумваць сябе.

Зьбіваючы заржавелыя замкі накінутых абмежаваньняў, мы ўзнаўляем факты і дапаўняем палітру. Мы шукаем спод тэмы, блізкай кожнаму з маленства — *вялікая айчынная вайна*.
***Юрась Бушлякоў***

---

[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima
[image]

*Вайна ў ARCHE 2(3)-1999* . [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **14-07-1999**

[image]
[image] Вайна ў 2(3)-1999 .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

да Зьместу 2(3)-1999

*кніга*

# С.Юстапчык (Антон Адамовіч) Трывога*

# * Апавяданьне з жыцьця сучаснага савецкага глыбокага тылу, адкуль ня так даўно выбраўся аўтар. (*Зацем Антона Адамовіча 1943 году*.)

**Антон Адамовіч (псэўданімы Г.Альгердзіч, В.Бірыч, Д.Забранскі, Н.Недасек, Р.Склют, С.Юстапчык; 1909 г., Менск — 1998 г., Нью–Ёрк) — маштабная фігура беларускай інтэлектуальнае прасторы XX ст., выдатны практык непадсавецкага нацыянальнага мысьленьня, таленавіты літаратуразнаўца, празаік і гісторык. Быў адным із стваральнікаў Інстытуту вывучэньня СССР (Мюнхэн). Як празаік выступаў з 1940–х гг. Найбольшы розгалас атрымалі ягоныя творы ваеннага часу — аповесьць (“завязка**

**раману”) “Каханы горад” (яго перадрукавала “Наша Ніва”, 1993) і апавяданьне “Афрадыта–Ост”.**

**Прадстаўленае ў гэтым нумары “ARCHE” “апавяданьне” “Трывога” папярэднічала памянёным творам: стваралася ў 1942 — пачатку 1943 году ў Менску. Паводле пасьляваеннага прызнаньня Адамовіча, і ёй, і ў крыху пазьнейшым “Каханым горадзе” ён карыстаўся “адным з найулюбёнейшых мэтадаў нябожчыка З.Бядулі, якім напісаныя… “Салавей” і “Язэп Крушынскі” і які ўзвышэнскі крытык Адам Бабарэка сваім часам трапна назваў быў “мэтадам натураграфічнага зашыфроўваньня”. Як сьведчыў Адамовіч, “мэтад гэты, вынайдзены ў абставінах савецкага гвалту над свабодаю друку, быў вельмі зручны й пад зусім такім самым у прынцыпе таталітарным ціскам нямецка–гітлераўскім. Лёгка было зашыфроўваць сьпісваных проста з натуры герояў “гэрэнфольку” пад зусім ідэнтычных ім псыхалягічна камуністаў, “актывістаў”, камісараў”.**

**“Трывога” падаецца тут правапісам арыгіналу. Трэба адзначыць, што аповесць не свабодная ад ідэалягічных знакаў свайго часу.**

**I**

**Г**эта быў маленькі гарадок, якіх даволі расьсеяна па Расеі–“матушцы”, дый па найвярнейшай дачушцы ейнай, сіберна–сівернай, ссыльна–катаржнай Сібіры (суворай мачыхай ці аднаму была…)

Як усе такія — ні табе горад, ні табе сяло. Пасярэдзіне — плошча зь вялізарнай лужынай — запраўдным морам, што й найбольшымі сьпёкамі не перасыхала. У ейных водах, забруджаных і запаскуджаных двуногімі й чатырохногімі

жывымі істотамі, строга люструецца “собор” — вялізная мураваная царква — адзіны ў горадзе помнік недраўлянай архітэктуры. Калісьці вымуравалі былі багамольныя адно ці багабойныя купцы, выгналі ўшыркі і ўвышкі кшталтам найшаноўнейшага свайго куміра — тульскага самавара, вялікае гордасьці вынаходу нацыянальнага генія. Цяпер, пэўна–ж, — клюб, а да абяскрыжанае званіцы прымайстравалі парашутнае ўладжаньне, брудную палатніну якога тузае няўпынёны ўгары вецер. Часам гупаюць адтуль, падвязаўшыся на шлейках, ледзь ні ў лужыну проста, маладыя энтузіястыя авіяцыі, часьцей дзяўчаты і, пэўна–ж із заўсёдным сваім піскатам і віскатам — найбольш ад таго, што із спадніцы другі парашут робіцца. Што праўда, цяпер усё гэта бывае куды радзей: “если завтра война” перабраўшыся аж у заўчора й так зажыўшыся ў сяньняшнім, ня вельмі каб і тут вабіла...
Насупраць царквы, праз плошчу наўскасяк, ходаючыся з мураванінаю аб высі, тырчыць пажарная вартавая вежа, ганарова — “каланча”. Толькі куды да царквы — дарма, што вышэйшая, а драўляная, старая, ад ветру рыпіць — аж доле чуваць. Гэта–ж і гарадзкі гадзіньнік, адно што без цыфэрбляту. Цыфэрблят, праўда, ёсьць, але ўнізе, у старожцы, на бойкіх ходзіках. Як стрэлка падыйдзе, ну, бывае, што крыху й пярэйдзе, а мо й не дацягнецца — выходзіць хто з вартаўнікоў із старожкі і, каб лішне ня турбаваць свае косьці ўшэсьцем па хісткіх і круткіх сходах — проста галёкае, задзёршы голаў угару й прыставіўшы трубою далоні:
— Бі–і!
І чакае з часінку так, бо часам адтуль, з гары, далятае пытаньне:
— Коль... бі–іць?
А пасьля таго, як выгукнуты лік дойдзе і да вышэйшага гадзіншчыка, і да жыхароў бліжэйшае ваколіцы — зь вежы памалу падаюць зыкі, як–бы ад пабітага сагана, у патрэбнай колькасьці. На дванаццацёх бывае, што й зь невялікім “перавыкананьнем”: чорт яго там лічыў, або й змыліцца чалавек — усё’ дна–ж людзі ведаюць, што больш за дванаццаць гадзінаў ня б’ецца.
Шырэйшага за плошчу, вышэйшага за “сабор” і “каланчу” ў горадзе нічога ня знойдзеш. Дык тут — самы пуп ягоны, сюды зьбягаюцца і ўсе вулічкі, як дарогі ў свой Рым. Другія канцы

трацяць яны на балацяным узрэччы. Па той бок рэчкі — толькі мясцовая індустрыя: тартачок калісьці, гадамі індустрыялізацыі, машынізацыі, калектывізацыі і іншых варыяцыяў узьведзены на гордае ўзвышша “дрэваапрацоўнага камбінату”. Цяпер–жа — бяры йшчэ вышэй: зьліквідаваўшы “камбінат”, перанесьлі сюды нейкае вельмі–ж важнае ваеннае прадпрыёмства. Якое — ня ведае ніхто дый не даведаешся: перад плотам вырасла йшчэ густая сьцяна з калючага дроту, дзень і ноч ходзіць НКВД, работнікі ўсе жывуць за дротам, у горадзе ніхто ніводнага й ня бачыў, якія хоць. Давоз і адвоз увесь — не праз горад, а з таго боку рэчкі — вузкакаляінка й да бліжэйшае, хоць ня дужа блізкое, станцыі.
Гэта — найбольшы знак для гарадка, што вайна. Бо так — чым яго возьмеш? Пра такія–ж Гогаль калі йшчэ казаў: хоць тры гады скачы — ні да якое дзяржавы не даскачаш. Зацямненьне? А калі тут на вуліцах сьветла было? У крамах пуста — а гэта дзіва ці навіна? Яшчэ ніякае вайны й заваду ня было, а ўжо людзі жартавалі: “і чаго — чаго толькі там няма: і хлеба няма, і табакі няма, і нічога няма...”
Праўда, мужчынаў, хлопцаў павыцягвалі–ткі з гарадка. Засталіся хіба што старыя і калекія. Як гэтыя во, пры каланчы: стары дзед Ахрэм і маладзейшы, кульгавы непатутэйшаму — як–бы Кузьма, ці што завецца (ня мудруючы, гэтак, ато й проста Кузькам, і завуць). Зусім здаровы, у соку самым мужчына, адзін бадай толькі й ацалеў у цэлым горадзе, дый то–ж — найбольшае партыйнае начальства: сакратар гаркому, сам наш Цімафеіч. Іншае начальства, праўда, ня ўсё зьвялося ці на бабы сыйшло. Толькі новыя, зусім новыя людзі панакручваліся — і гэта, можа, ня меншы знак, чым ваеннае прадпрыёмства за рэчкай, адно што да яго як сьлед прыгледзецца трэба, проста ня відаць, дый падумаць ня шкодзіць.
Вось забралі адразу неяк старшыню горсавету, “вылучэнца” з работнікаў камбінату, маладога, здаровага хлапца, Фаміных на прозьвішча быў. А назаўтрае ўжо бадай, ці праз дні два, сядзеў на ягоным месцы новы бацька гораду, таварыш Іонаў. Выглядаў ён, праўда, зусім не патутэйшаму, а на тутэйшы розум, дык неяк і ня зусім пачалавечаму — хутчэй нешта, да казла падабнейшае. А як гаварыў, дык штосьці як–бы ў горле хрыпела й між зубоў пасыквала. І хоць ня ведаў ніхто, што йшчэ пару год таму таварыш Іонаў зваўся й пісаўся проста Іонэсам, але

нехта з бывалейшых ужо паставіў дыягназ: пэўны жыд, ці бок — габрэй. Народу гэтага абарыгены зусім дасюль не зналі — хіба крыху чулі ад тых, што па сьвеце папацягаліся. А тут па Іонаву, неўзабаве зьявіўся на пажарнага начальніка таварыш Гарлапанін — то крыклівы й рухлівы, варушкі, то паважны, самавіты, проста сьвяты — артысты, чысты артысты, нездарма адразу і ўсё клюбную работу, у парадку грамадзкае нагрузкі, ажывіў. Гэты вылупіўся з Гэрлаханчыка, але тут яшчэ цяжэй было дабрацца: у горле ўжо нічога ня хрыпела — горла было закатнае, нездарма і ў прозьвішчы ўвайшло, а гаворка зусім чыста–маскоўская, як гарохам на патэльню (бо ўжо толькі напалавіну — матка судамойкаю з Масквы была). І ўсё–ж — і тут людзі ня хібілі: і гэты — з тых самых “даўганосікаў”, усерасейская слава якіх сплеценая ў анэкдоце зь імём самога ўсерасейскага старасты, дакацілася й да гарадка.
Ну, а ўжо пра таварыша Геаргадзе — разам і НКВД, і начміл, і ваенком (усё–ткі, мужчынак малавата...) — ведалі адразу: гэта зь іншае пароды, гэта — з сакалінае сям’і самога сябра, правадыра й настаўніка народаў, самога вялікага Іосіфа Вісарыёнавіча СТАЛІНА (сумленныя машыністкі іначай ніколі й не друкавалі).
Так, даплывам сьвежае крыві, не сьсякала мужчынская слава гораду, слава ягоных патрыцыяў.
І было тут усім ім цёпла, выгодна, зацішна ад фронту, ад вайны, ад бомбаў, ад мала йшчэ якіх неспадзевак.

***далей***

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]
Вайна ў ARCHE 2(3)-1999 · [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 10-05-2000**

[image]
[image] .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima



да Зьместу 2(3)-1999

***полымя***

# Л.Крывічанін (Лявон Савёнак)
# Зь дзёньніка Ів.Ів.Чужанінава

**Л.Крывічанін — псэўданім Лявона Савёнка (1897, в. Вялец ля Глыбокага — 1974), празаік і журналіст. Выпускнік Маладэчанскае настаўніцкае сэмінарыі (1914). З 1926 — рэпартэр газэты „Савецкая Беларусь“. У 1929 выдаў зборнік фэльетонаў „Чароўная іголка“. У 1930 зьвінавачаны ў належнасьці да т.зв. Белнаццэнтру й звольнены з працы. У 1933 без суду высланы (сьпярша ў Сібір, пасьля ў край Комі). У 1939 вярнуўся на Бацькаўшчыну — настаўнічаў ля Крычаву. У часе вайны супрацоўнік „Беларускае газэты“. З 1944 у Нямеччыне, з 1950 — у ЗША. Быў адным зь лідэраў заснаванае па вайне ў Заходняй Нямеччыне партыі — Аб’яднаньня беларускіх нацыянал–дэмакратаў. Браў актыўны ўдзел у працы Рады БНР, амэрыканскага Камітэту незалежнае Беларусі (1955—60–ыя), нястомна рупіўся на карысьць Беларускай Аўтакефальнае Праваслаўнае царквы.**

**„Дзёньнік Ів.Ів.Чужанінава“ — трохгадовы цыкль фэльетонаў, у якіх аўтар, тонкі псыхоляг і трапны назіральнік, захоўваючы**

**мастацкую дыстанцыю, падаў панараму беларускага жыцьця ў варунках ваеннага неспакою. Гэты па тых часах неакрэсьленага жанру тэкст цяпер чытаецца як клясычны і адзін з найдасканалых як па стылі, так і па кампазыцыі твораў беларускай літаратуры XX ст. Прапанаваныя фрагмэнты „Дзёньніка“ друкаваліся на бачынах „Беларускае газэты“ ў 1943 г. БІНіМ (Нью–Ёрк) выдаў „Дзёньнік Ів.Ів.Чужанінава“ асобнай кнігай (1999).**

**14 лістапада.** Ад сацыялізму да сьпірытызму — адзін корх. Учора я ў гэтым сам пераканаўся. Наязноў прычапіўся, каб пайсьці зь ім да нейкай Ніны Васілеўны, што сьпірытычныя сэансы выдае.

— Хоць ты, — кажа, — ні ў якое таямніцтва ня верыш, але ў Ніны Васілеўны твой нігілізм разьляціцца ў друзачкі.

Пайшлі. Дарогаю Наязноў апавядаў, хто такая Ніна Васілеўна. За бальшавікамі яна лічылася недзе „па асьветніцкай лініі“, выступала на ўсіх сходах і ўсё крычэла: „Камунізм! Сацыялізм! Мы — бальшавікі!“ А была яна беспартыйнай бальшавічкай, мужык жа ейны быў парцейны камуніст. Цяпер ён у ролі бравага камісара недзе люта змагаецца на ўсіх франтох, ну, а бабе, натуральна, карціць даведацца, ці хутка ён вернецца дзеля пакаёвага змаганьня. Вось яна й рынулася ў сьпірытызму, каб хоць дух які дарадзіў ёй у гэтай самотнай справе...

Мы прыйшлі якраз у пару. Выклікалі духа Аляксея. Але дух нешта зацяло — ён чамусь не адгукаўся на выклік: ці то ён дзе па малой справе адхінуўся, ці можа яму кумпанія не спадабалася. Бо кумпанія, трэба сказаць, была несамавітая. Сама Ніна Васілеўна, асоба ўжо ладна пацёртая, ейная прыяцелька, нейкая абскубаная істота, адзін былы камуніст, з абвіслым чэравам, і яшчэ нейкі стары хрэн. Калі не лічыць мяне й Наязнова, дык зусім зразумела, што ад такой кумпаніі які хочаш дух нос адверне... З гэтае, мабыць, прычыны і другі, і трэйці дух не адгукаліся. Нарэшце выклікалі нейкага духа Макса. Той, праўда, адразу пачаў круціць сподачкам. Напачатку ён настукаў, што мужык Ніны Паўлаўны вернецца праз два тыдні, сам, бязь ейных клопатаў, пасьля адказаў, што вайна скончыцца праз тры тыдні... „А якая ж улада будзе? — запыталіся ў яго ўсе, — наша ці не? Ты, дух, скажы толькі адно

слова — так ці не“. І дух адказаў так. Тут жанкі запляскалі ў далоні, а былы камуністы пагладзіў сваё чэрава.
Я, ведама, гэтаму ня даў веры, але на кажны выпадак занатаваў у дзёньніку: вайна скончыцца 3–га сьнежня.
Калі варочаліся з Наязновым дахаты, то я спытаўся, ці можна гэта з навуковага гледзішча пагадзіць такія дзьве рэчы, як марксызму й сьпірытызму. Ён адказаў, што калі ўжыць дыялектычны мэтад, дык, безумоўна, можна пагадзіць якія хочаш рэчы. Хоць ён і прафэсар, але тут, як мне здаецца, збрахаў.
**19 лістапада.** А ў беларусаў няма адзінага фронту. Сяньня чытаў у газэце пра заходнікаў і ўсходнікаў. Вынікае, што яны паміжсобку не зусім у згодзе. У чым разыходжаньні, я з артыкулу так нічога не зразумеў, але разыходжаньні ёсьць. Трэ будзе даведацца пра гэта ў Арыентацкага.

**25 лістапада.** Меў сустрэчу з прадстаўніком аграрыяў. Да Рыгора прышкандыбала аж з–пад Чэрвеня ягоная цётка. Ну, ведама, мы ўсе сабраліся да Рыгора, бо кажнаму цікава даведацца, што на сьвеце дзеецца. Седзімо й слухаем, як цётка лепартуе:
— А дзетачкі мае, — сказала яна, — ня бачыла я гораду два гады, каб яго і век ня бачыць. Ледзь не адурэла. Прывезьлі гэта мяне тыя хлопцы, што на тракце падсадзілі ў машыну, і ссунулі проста ў руіны.
— Ну, кажуць, цётка, табе направа, а нам — налева. Дыбай да свайго Рыгора.
Сказалі гэтак і паехалі. А я стаю й гляджу, як дурная. Зірнула направа, — пустка, зірнула налева — пустка, зірнула сьпераду — дзірка. А гораду няма. Села гэта я на каменьне ды й плачу. Ажна тут нейкі добры чалавек трапіўся:
— Чаго, кажа, цётка, вільгаць пушчаеш? Паводля якога здарэньня?
Ну, я яму й выклала ўсё, як сьлед: ехала, маўляў, у Менск да Рыгора, а трапіла сама ня ведаю кудою.
— Дык гэта ж, кажа, і ёсьць Менск, а сядзіш ты, цётка, на самай Ляхаўцы, — і скіраваў мяне, дзякаваць, куды трэба.
Мы ўсе надта сьмяяліся, як гэта цётка гораду не пазнала? Але Сымон давёў, што такія здарэньні могуць быць.
— Гэта, — казаў, — ня дзіва, што цётка гораду не пазнала. Мой

прыяцель, Юрэц Бладук, дык той аднойчы хаты роднае не пазнаў, а й выпіўшы быў ня надта. Прыйшоў гэта ён аднойчы да хаты й пытае: „А венікі сьвежыя ё?“ І пачаў распранацца. Скінуў гэта ён, выбачайце, усё і палез на сьцяну з гальнём, які яму добры сынок падсунуў. „Ну, кажа, і напаруся сяньня“. Ускочыла жонка ў хату, а ён, выбачайце, зусім голы лезе на сьцяну. І гальнём сябе па бакох хвошча. „Паддай, крычыць, пары!“ Дзецям, ведама, пацеха, а жонка абурылася: „Ты гэта што! — крычыць — звар’яцеў?! Сорам згубіў?!“ А ён сваё: „Дырэктар, — крычыць, — давай сюды дырэктара! Гэта што за непарадкі! Чаму, — крычыць, — бабы ў мужчынскай лазьні?“ Ледзь яго ўгаманілі, што гэта ня лазьня, а свая хата. Дык вось якія здарэньні ў жыцьці бываюць... А гораду не пазнаць... Пакуль мы слухалі апавяданьне Сымона, Загржэмбіцкі меў інтэрвію з чэрвенскай цёткай у пытаньні тамтэйшых коштаў. Выявілася, што яйкі — 30, сала — 200. А попыт ёсьць на дрожджы й соль.

**29 лістапада.** Нешта недзе дзеецца. А што — невядома. І чуткі пайшлі нейкія, надта сакрэтныя. Рыгорава жонка прысягалася, што сама на рынку чула, як казалі пра тры самалёты й адну бомбу. Дзюркаў знаёмы пад сакрэтам паведаміў, што на фроньце зламаліся, але хто — ён яшчэ не даведаўся. Але казаў, трэба чакаць вялікіх падзеяў.

Наязноў таксама ходзіць вельмі таямніча і нічога не гаворыць. Відаць, нешта й ён чуў. Каб мяне гэта надта турбавала, дык не, але ўсё ж цікава, зь якога боку вецер дзьме...

**2 сьнежня.** Апанас Дзюрка набыў капялюш.

— Годзі, казаў, у носе калупаць, — пара із новай Эўропай прывітацца.

Праўда, капялюш не самавіты, нібы стары грыб сядзіць на ім. Але Дзюрка надта ганарыцца.

— Цяпер я, — кажа, — сьмела магу да Эўропы далучыцца, і ніхто мяне не затрымае. А ізноў жа, — кажа, — годзе нам памыі на галаву лілі, пара й рот разявіць.

А Сымону не падабаецца такое пераабсталяваньне Дзюркі.

— Ат, — кажа, — дармо, хоць ты й пад капелюшом ходзіш, а ўсё роўна дурань. Хіба твая галава пад капялюх выструганая? Ёй палі забіваць, і то вялікі гонар.

Сымон, ведама, як кансэрватар, уважае, што на кожную галаву павінна быць свая покрыўка.

**5 сьнежня.** Ёсьць подлыя людзі на сьвеце. Сяньня зьявіўся Хамовіч (той, што цэлую капэлю захапіў) і прынёс рапараваць нейкую басэтлю.
— Вы ж, — кажа, — шаноўны, музычны майстра, патэнту выбралі, дык будзьце ласкавы, адрамантуйце гэты музычны струмант. Прашу.
І нагою шмаргануў. Зараза! Хіба ён ня ведае, што зь мяне такі ж музычны майстра, як ізь цеста куля. Я яго, ведама, пагнаў зь ягонай басэтляй, а ён пагражаў данесьці, што я не музычны майстра, а сымулянты. І данясе! Такая паскуда гэта зробіць... А данясе — могуць быць непрыемнасьці. Трэба, няйначай, ліквідаваць прадпрыёмства і мяняць кірунак.
**7 сьнежня.** Загржэмбіцкі ў выніку нядаўняе размовы з чэрвенскай цёткай набыў каня і тэрмінова скіраваўся ў Чэрвеншчыну.
**10 сьнежня.** Хадзіў ва Ўправу. Там сустрэў былых актывістых. Разам за бальшавікамі працавалі. Нічога, і цяпер ня крэкчуць: адзін у Ўправе на аржаным месцы, другі недзе на базе, а трэйці — так, каля базы. Дармо! Не прападуць!
— Як жывяцё? — пытаюся.
— Ды так, — кажуць, — нічагуткі — прыкідаемся патрохі. А вы?
А што я! Ім прыкідвацца добра, калі яны на службе, а як мне, саматужніку з патэнтам? Тут як ні прыкідвайся, а Хамовіч цябе ўраз расшыфруе. Не! Трэба нешта рабіць!
**14 сьнежня.** Фэцкі кінуў голую тэорыю і перакінуўся на практычную матэматыку. Цяпер лічыць, што гэта, скажам, было б, каб у Менску наладаваў машыну дрожджаў і шугануў іх у Западнюю, там бы абмяняў дрожджы на сала, яго ў Менск, а тут бы рэалізаваў гэтае сала на вольным рынку на грашовыя знакі. Як бы гэта ўсё выглядала? Папярэдняе інтэграваньне дае нешта такое жудаснае, што нават на звыклай да лікаў лысіне Фэцкага валасы дуба сталі. Фэцкі лічыць на два варыянты апэрацыяў: адзін — калі дрожджы на рынку й машына чужая, другі — машына службовая й дрожджы службовыя.
У апошнім выпадку выходзяць такія астранамічныя лікі, што калі аб іх прачуў Загржэмбіцкі, дык у бедака ад перапуду раптам аслабеў жывот.
**18 сьнежня.** Вайна скрышыла ўсе спэцыяльнасьці. Круглоў і

той занядбаў сваю мышыную спэцыяльнасьць і скіраваўся на купца. Праўда, ён больш прадае, чымсь купляе, але гэта ня шкодзіць яму мець пэўную, як ён кажа, дывідэнту. Учора меў ад нейкай апэрацыі такі гешэфт, што ад лікаў млосна робіцца.
— Каб гэта, — казаў ён, — на мірную пару такая дывідэнта, дык жонку сваю ўшыў бы ў каракулі ды ў сабалі, а сам бы малясоўку смактаў із залатое конаўкі...
Вось тут і кажы пра адукацыю. Недавука, мышыны спэцыялісты, а галава міністэрская...

**20 сьнежня.** А ўсё ж у паветры нечым пахне. Бо Мар'я Іванаўна — і тая зьмяніла тон. Сяньня ў яе засьпеў нейкага невядомага, з падазроным абліччам. Казала, што гэта ейны знаёмы шофэр, нават далёка родзіч. Прывіталася са мною надта скупа, як із чужым. І трымаецца неяк больш бадзёра й незалежна.
— Сядайце, — кажа, — тав. Чужанінаў.
Цікава: учора быў Ванечка, а сяньня — тав. Чужанінаў...
Не! Тут штосьці ня так. Ці тут гэты „шофэр" прычынаю, ці то іншыя справы, больш сакрэтныя... У кажным разе трэба даведацца, які тут вецер пад бабін хвост дзьме...
**21 сьнежня.** Купляў цацкі на ёлку. Дзіўная рэч: вайна, скрозь галеча, а людзі ёлку ладзяць. Разам са мной купляў цацкі нейкі тып. „Дайце мне, — кажа, — якіх–небудзь вясёленькіх цацак". „Вясёленькіх? — кажа крамніца, — калі ласка". І — шась на прылавак гармату, гранату, самалёт, ды йшчэ якіхсь пушак.
— Не, — кажа тып, — дзякуй за такую вясёласьць. Я ўжо гэтага наглытаўся досыць.
— Дык якога ж, — пытае, — хрэна вам трэба?
— Дайце мне якую–небудзь цацачку, якая б клікала да жыцьця, а не да сьмерці.
— Тады бярэце барабан або трубу.
— Не, ня тое. Мне вось бы такую мірную цацачку, каб скажам, пявунка, або птушачку, якая б зерняткі дзяўбла... Пашукайце там із старога арсэналу, а не з бальшавіцкага, бо ў мяне гэтая чырвань вочы выела.
— Ну, дык наце вам коніка.
І паднесла да ягонага носу валявянага коніка.
Той аж спалохаўся.
— Вы, — кажа, — даражэнькая, што гэта мне сунеце?
— А што? — пытае.

— У гэтага каня хвост уніз вісіць, а мне трэба, каб угару стаяў.
Тут ужо й крамніца раззлавалася:
— Вы, кажа, грамадзянін, ня выдумляйце тут! Што вы хочаце, каб я за вашыя за тры маркі ды хвост угару падымала? Сорам вам!
Публіка, што ў краме была, падтрымала крамніцу:
— Запраўды кажуць, грамадзянін, не выдумляйце. Якое вам яшчэ трасцы не стае? Бярэце, што даюць, ды й годзе. І не зазірайцеся пад хвасты.
Так і пайшоў гэты грамадзянін, нічога не купіўшы.
А й сапраўды дзівак. Хіба яму ня ўсё роўна, куды хвост вісьне — уніз ці ўгару? Я купіў барабан, дырыжабль СССР, дзьве гарматы, пяць бліскучак, дзесяток пшыкавак... Жонка была задаволеная...
**24 сьнежня.** Калі ўжо не пашанцуе, дык і дзеўцы ветрам надзьмуе. Гэта праўда. Небараку Загржэмбіцкага, якога колькі ўжо гадоў калечылі, зноў паклалі на лапаткі. Вярнуўся з падарожжа голы, як бізун. Сустрэла яго ў лесе пад Чэрвенем нейкая вясёлая кумпанія і кажуць: „Усё ваша — будзе наша, а вы, пане, — вэк“. Яшчэ і ўсыпалі трохі на дарогу, каб не замёрз часам. Ні каня, ні саней, ні солі. Кідаецца цяпер ува ўсе бакі, як вар'ят. А што з гэтага кіданьня будзе — няведама.

**28 сьнежня.** Куцьцю спраўляў дома, але дзе гэтыя тры дні калядаваў — нічога ня ведаю. Адно толькі памятаю, што пілі, але дзе й колькі — хоць зарэж, ня ўспомню...
Нядрэнная рэч гэтыя старамодныя сьвяты.
**29 сьнежня.** Чуў колісь аднаго разумнага чалавека, які казаў: „Трымай чалавека голадам, дык ён будзе мець толькі адно жаданьне, а накармі яго, дык жаданьняў у яго зьявіцца безьліч“. Гэта, мабыць, праўда. Сяньня спаткаў свайго даваеннага, яшчэ з–за царскіх часоў, прыяцеля. Быў ён трохі ахвіцэрам, да Ўрангеля падаўся, там нешта рабіў, а цяпер нейкім парадкам ізноў тут апынуўся.
— Якім, — пытаюся, — ветрам сюды зноў закінула?
— Ня ветрам, — кажа, — а самаходам. Радзіма пацягнула...
— Ого, — кажу. — Дык васпан ізноў угару пайшоў. На самаходзе.
— Эт, якая тут гара, — кажа, — мышыная. Хіба ты ня ведаеш, кім я раней быў? Дзеншчыка меў! А цяпер сам за халуя ў гэтага

дзеншчыка. Дык па–твойму, гэта парадак?
— Ну, ведама, — кажу, — у вашым стане, дык парадак незайздросны. Але ж выгляд у вас, потым, гладкі...
— Што выгляд? Гэта глупства... Бо не аб адзіным хлебе жывы чалавек бывае...
— Праўда, — кажу, — да хлеба патрэбна й скварка...
— Ды я не аб скварцы, пакуль даволі й гэтага, надоечы вось 20 кілё масла загарнуў. Пакуль што йшчэ сяк–так самадапамагаемся.
— Ну і памагай Бог, — кажу, — абы ціха.
— Дзякаваць. З гэтага боку ўсё ў парадку, ніхто не падкалупне. Але не аб гэта ходзіць. Дзе духовая страва, я пытаюся? Улада дзе? Дзе пашана, гонар? Вось аб што ходзіць! Вось чаго не стае!
— Але ж, — кажу, — вайна! Цяпер абы жывот...
— Ну ты, даражэнькі, дробна плаваеш. Адным жыватом доўга ёрзаць ня будзеш. Захочацца й на ногі стаць... Вось гэтага я й хачу.
Разьвіталіся мы, і ён бадзёра закрочыў з узнятай галавой, быццам трымаючы на версе брыля тую славу, да якой чалавек імкнецца.
Вось тут і зразумей чалавечую натуру. Пакуль із чужых талерак кавалкі зьбіраў, усё было добра, а як ужо нажэрся чужога хлеба, на вышыню славы палез. Улады захацеў!
Праўда, што чалавеку ніколі не стае й жаданьням ягоным няма канца...
**30 сьнежня.** На нашай вуліцы сэнсацыя: дачка Апанаса Дзюркі, якую мы ў ліпені хрысьцілі, сяньня нечакана радзіла дзіцю. Нічога дзіўнага тут, ведама, няма. Паводле законаў прыроды, усё адбылося зусім натуральна, бо дзеўка ўжо досыць сьпелая. Але новыя этычныя пачуцьці Апанаса атрымалі моцны выцін. Бо ўсе цяпер напярэймы віншуюць Апанаса:
— З прыбыткам, пане Апанасе! Віншуем! Дай Бог штогод.
Асабліва назаляе Сымон:
— Апанас, — крычыць, — скідай капялюш! Бо ўсё роўна ім цяпер не прыкрыеш гэтае прыроднае зьявы... Ня хопіць...
Апанас бароніцца, як можа.
— Я, — кажа, — тут не вінават. Гэта спадчына ганебнага мінулага.
— Але як ты з гэтай спадчынай ды ў новую Эўропу будзеш цыркуляваць? Вось ты што скажы?

Апанас на гэта нічога не адказвае й хутчэй бяжыць у хату. Прыкра чалавеку, але як ён мог прадбачыць, што так хутка сьвет пераменіцца...

**2 студзеня.** Новы год сустракалі ў Рыгора. Банкет наладзілі ў складку, натурай — каму што Бог паслаў. Больш налягалі ў кірунку пітва, бо гэты прадукт у нашай парафіі шануюць перадусім.
Гасьцей было шмат: і сваіх, і чужых. Банкет пачаў Рыгор. У сваёй уступной прамове ён адзначыў, што гэты новы год — першы такі ўдалы год і хаця ня з нашае віны — але ён вольны...
— Я, — кажа, — у вайну пагарэў ушчэнт. А што вы бачыце ў мяне сяньня? Дзе вынікі агню? Няма іх! Вось жа я й кажу: дай Божа кажнаму так пагарэць. — Дык пажадаю ўсім вам такога шчасьця, якое мне паслаў Малох вайны, — так скончыў Рыгор сваю прамову і перакуліў чарку.
Мы зрабілі тое самае, а пасьля пачалі падвойваць і патройваць. Рыгоравы госьці, ягонае начальства з Управы, больш налягалі на закусь. Відаць, ня надта сытыя.
— Яно й зразумела, — казаў Апанас, — бо яны ж на працы, а мы не працуем. А хто не працуе, той і ня есьць. Вось чаму нашыя менш ядуць, а больш налягаюць на пітво.
Як ужо трохі замарылі чарвяка, зноў паліліся прамовы. Але цікавага было мала. Усе гаварылі пра шчасьце, пра лепшую будучыню, пра йшчэ лепшае жыцьцё на новы год. Езуіты! Шмат каму зь іх і ня сьнілася такое жыцьцё, як цяпер жывуць, а гавораць аб лепшым.
Калі ўжо добра падсілкаваліся, паэта Цымбальскі задэклямаваў свой навагодні верш. Я ня памятаю, што ён там напачатку крычэў, але пасьля як грымнуў кулаком па стале і залямантаваў:

Сваю душу пераніцую!
Душу варожую скрышу!
Відэльцам сэрца пракалю я!
Усіх ушчэнт перадушу!!!
І як падхопіць крэсла, як бразьнець аб падлогу — ажно ёлка пахіснулася й цацкі сыпнуліся долу...
Усе напалохаліся — жах, асабліва жанчыны. Рынуліся, хто куды. Рыгор пачаў супакойваць:

— Дарэмная трывога, — кажа, — ня бойцеся… Гэта яму натхненьне падпёрла… Апарожніцца, і ўсё будзе ў парадку…
І праўда, нацадзілі Цымбальскаму конаўку, ён высмактаў і змоўк.
Калі мы ўжо залілі гэты спалох, слова забраў Сымон:
— Вось тут я чуў, што гаварылі пра новае шчасьце. А на які мне хрэн гэтае вашае шчасьце? Мне што трэба на гэты год? Марцыпаны? Не! Мне патрэбна спакойная праца, а ў выніку яе — скварка і чарка. І каб ніякі чорт не мяшаўся ў маё жыцьцё. Вось і ўся мая палітычная крэйда*. Дык ці многа я хачу на новы год? Хто скажа, што я хапіў лішняга? Ніхто? Дык чаго ж вы тады лезеце да мяне з усіх бакоў? Вы хочаце, каб я на вас працаваў! Дык не! Скулу вам у бок! Гэтага ня будзе!
Тут усе загаманілі:
— Выбачайце, Сымоне, мы гэтага ня хочам… Наадварот… Мы вельмі вас паважаем…
— Не! — крычэў Сымон, вы хочаце**…
Нарэшце Сымон змогся. І калі выпілі йшчэ па чарцы, казаў:
— А чорт яго дзяры. Няхай будзе, як хочаце, я вам не кумпанія…
Як скончылі банкет — не памятую…

**8 студзеня.** Паэта Цымбальскі бегае па ўсім горадзе, як вар’ят, і крычыць:
— Загінула ўсё! Канец ўсяму! Пагібель!
А што загінула? Можна ўважаць — глупства. Жонка ягоная прадавала стары цэбар і разам із цэбрам аддала зь вядро старое паперы, што там завалялася. Паленавалася вытрасьці. А гэтая папера, як на той грэх, якраз і былі самыя таленавітыя вершы Цымбальскага. Ну, ня згледзела баба, што гэта была мастацкая прадукцыя, а не ўжытковая папера. Можна было б бабе і дараваць.
Але Цымбальскі проста звар’яцеў:
— Век не дарую! — крычыць. — Загубіла! Зарэзала! Самыя актуальныя вершы. Яшчэ на выгнаньні пісаныя ў тысяча дзевяцьсот зацёртым годзе…
Людзі яму раяць, каб новыя напісаў:
— Што табе, — кажуць, — паперы шкада? Пішы нанова.
— Што людзі разумеюць, — сумуе Цымбальскі, — я туды душу сваю ўкладаў. Кроплямі ўласнае крыві паліваў гэныя радкі! Я,

— кажа, — сваё сэрца напароў на дзіды, а яны пра паперу. Мяшчане, кажа, вы ўсе. Абуваталі.
Чым скончыцца гэтае вар'яцтва — цяжка прадбачыць. Зусім проста, што чалавек і загіне.
Вось што значыць, калі змалку бацькі ня білі.
**10 студзеня.** Мікіту Гузака доктар пасадзіў на дыету: забараніў піць і загадаў тры разы на дзень есьці толькі рэдкую страву. Бо ў Мікіты, як казаў доктар, ад ненармаванага ўжываньня алькагольнага пітва зусім пераблыталіся сэрца й печанцы, і цяпер ніяк не намацаеце — дзе адно, а дзе другое.
Мікіта паслухаўся, пабіў усе шклянкі і сеў на дыету. Мы з Сымонам знарок хадзілі глядзець, як Гузак гэную дыету глытае. Прыйшлі сьнеданьнем. Жонка сядзіць скваряны булён сёрбае, а Мікіта выцадзіў у міску паўлітра, накрышыў туды хлебца, цыбулі й чэрпае лыжкай, быццам заціркy.
— Ліха яго матары, кажа, з гэтым пітвом. Калі доктар загадаў — нельга, знацца, нельга. Я магу й ня піць. Бо я ня вораг свайму здароўю.
Мы спыталіся, ці дапамагаюць яму гэтыя лекі.
— Ці дасьцё веры, кажа, лягчэй стала. Як высербаеш місу гэтае дыеты — дык адразу ад сэрца й адлягло... Адцягвае... Доктар таксама казаў, што я ўжо палепшаў. Надоечы хадзіў да яго на кантролю.
— Ну, як, — пытае, — кінулі піць?
— Ані кроплі, — кажу.
— Ну, то й добра.
Выстукаў гэта ён мяне малаточкам, праз трубку паслухаў і кажа:
— Ну, вось, цяпер чуваць, што ў вас і сэрца ёсьць, і ведаеце, шаноўны пацыента, нават большае, чымсь трэба...
Вось што значыць навуковыя лекі.
Толькі жонка Мікітава бедавала, што надта ўжо дарагія цяпер лекі пайшлі:
— Жартачкі, — кажа, — тры паўлітроўкі на дзень... Вельмі дарагія лекі.
— А ты чаго хочаш, — крычыць Мікіта, — каб у мяне ўсе ворганы пераблыталіся ў кучу? Мне здароўе даражэй. Чула ж, што доктар казаў. А супроць навукі ня пойдзеш, бо доктар ведае, каму якія кроплі загадаць...
Не такі Мікіта чалавек, каб яго доктар ашукаў...

**12 студзеня.** Апанас Дзюрка аднекуль прывалок піяніну. Кажа, што ягоны прыяцель, Мімікрыйскі, спрэзэнтаваў. Брэша! Дзе гэта ёсьць цяпер такія прыяцелі, каб піянінамі кідаліся. Недзе зблатаваў... А ў хаце цэлы гармідар. Апанасавы дзеці праз увесь дзень па гэтай музыцы дубасяць, а жонка лаецца:
— Заняў, — кажа, — усю хату гэтай гаргарынай — няма дзе і сьвінцы замяшаць.
— Дармо, баба, — суцішае Апанас, — хутка і ты будзеш на гэтай штуковіне выцілінгаваць.
— А каб цябе немач цілінгала, — злуецца Апанасіха, — мне дзяцей няма калі даглядзець, а ён з музыкаю.
Такія тэатры ў Апанаса цяпер цалюткі дзень.

**15 студзеня.** Піліп Дручок апынуўся на казённых харчох. А з–за чаго? З–за свае дурноты. Ад нейкае пары на яго пачала насядаць жонка. Пілуе і пілуе штодня.
— Усе, — кажа, — людзі, як людзі, а ты нейкая недарэка — ні сабе, ні жане. Або ты, — кажа, — будзь запраўдны мужык і сутрымвай жану, або кіну ўсё да ліхай матары. Бо я такіх, — кажа, — як ты, хоць дзесяць знайду, калі падамся па вайсковай лініі...
Праўда, пэнсія Дручка, як бухгальтара, на сяньня нічога ня вартая, можна сказаць, адзін міф, і на яе, ведама, жыць нельга. Але Піліп не ўлічыў ваеннае сытуацыі і ўважаў, што калі ён сяньня працуе, знацца, павінен і жыць.
— Ты, — казаў ён жонцы, — не агітуй. Мне ўжо й самому гэтае жыцьцё падпёрла пад самыя рэбры, але ж дзе выйсьце?
— А мне, — крычыць баба, — якая да гэтага справа? Ты, — кажа, — галава, ты й думай. А ня можаш — дык злазь з даху і ня псуй гонтаў.
Каб на іншага чалавека, то пасьля такіх слоў ён бы так усыпаў бабе і па даху, і па фундаманту, што век бы памятала. Але Дручок — чалавек просты, і яго нарэшце дапілавала баба да таго, што мусіў ужыць дадатковую прафэсію — пайшоў красьці сьвіньні.
Першыя дзьве апэрацыі правёў удала. Збалянсаваў на Пярэсьпе двух кабаноў на пудоў сем. Але на трэйцяе — балянс не сыйшоўся, — злавілі Дручка на самай гарачай справе. Цяпер сядзіць і плача. А суседзі сьмяюцца: „Не за сваю справу, браток, не бярыся: сьвіней красьці — не паперай шастаць: тут навука

патрэбна“.
А Сымон казаў, што і ў гэтай справе, як і ў кажнай, апрача навукі, патрэбен спрыт: — Быў, — кажа, — у нас у трэсьце таксама адзін бухгальтар. Той, здаецца, і чалавек быў зусім нікудышны. Калі звонку глянуць, дык толькі назоў, што чалавек. Але каб вы ведалі, якія ўнутры гэтага недарэкі сядзелі спрыт і розум! Ён праз чатыры гады скрабаў нажом бухгальтарскую кнігу, і ў яго заўсёды, як казаў, балянсаваліся ўсе капейкі, а лішнія рублі, што ён адтуль выскрэбваў, клаў сабе ў кішэню. Так і не злавілі, а касіў тышчамі. Вось гэта быў бухгальтар! А Піліп — дрэнь. Такі і кнігу паскрабаў бы і ніводнага рубля сабе не наскробаў бы. Спрыту ў руках няма.
**17 студзеня.** Бачыў, як упяцёх білі аднаго. Відовішча было надта цікавае. Я вельмі рагатаў, як яны яго з усіх бакоў абкладалі.. Але, шчыра кажучы, я не хацеў бы быць на месцы гэтага аднаго.
Сымон, які таксама наглядаў бойку, не падзяляў майго вясёлага настрою.
— Я, — кажа, — такога не хвалю. Бойка — гэта мастацтва, і мастацтва высокага гатунку. Толькі трэба сам–насам. Калі ж пяцёра ды на аднаго, ды, як гэта часам бывае, із зброяй, то гэта ўжо не мастацтва, а даруйце...
— Дык жа вясёла, — кажу.
— Дурань і на паховінах сьмяецца, — раззлаваўся Сымон, — і гэты сьмех дурны. Гэта ўсё роўна, як бы сказалі мне: „Сымон, вось табе стрэльба і страляй дзіцю“. То хіба я на гэта здольны? Хіба я пошасьць якая? Не! Сымон такога мастацтва не вызнае. Я із Сымонам ня згодны. Мне калі б’юцца, дык і сьмешна, абы не мяне білі.

**20 студзеня.** Сяньня пазнаёміўся з Рурыкавічам. Зайшліся гэта мы з Рыгорам у закусачную па дзьвесьце грамаў зрабіць, аж бачым тут нейкі здаравяка на сьцяну лезе:
— Я, — крычыць, — дваранін, я — Рурыкавіч! Мой дзед, — кажа, — за адну ноч 10 000 дзесяцін прапіў, а ты мне, гад, 200 грамаў паверыць ня можаш. Эх, ты, — кажа, — беларус!
Але гаспадар закусачнай трапіўся чалавек досыць вытрывалы.
— Я, — кажа, — із тваім дзедам гарэлкі ня піў, хоць можа ён і Рурыкавіч быў. А мне — грошы на бочку, і ніякіх князёў.
Як мы даведаліся, гэта аскалонак княскага роду прасадзіў у

закусачнай свой паўмесяцавы інжынэрскі заработак, а да поўнай формы не дапяў — не хапіла грамаў дзьвесьце. Мы з Рыгорам паставілі яму па сто грамаў і пазнаёміліся. Абяцаў нават дакумэнты паказаць, што ён Рурыкавіч.
Можа і так? У кажным разе з такім чалавекам пазнацца ня дрэнна. Калі і ня Рурыкавіч, то ўсё ж чалавек свой.
**23 студзеня.** На нашай вуліцы асяліўся заходні чалавек і адразу пачаў заводзіць свае парадкі. Пахадзіў гэта ён па хатах, пазнаёміўся із суседзямі, а пасьля хваліўся:
— Я, — кажа, — не магу так проста жыць, як вы. Я не магу так, як вы, у хату сунуцца, я павінен увайсьці па–культурнаму...
З гэтае, відаць, прычыны ён паказаў візытоўкі. Але ягоныя культурныя намеры адразу ж сустрэліся зь непераможнымі цяжкасьцямі. Пайшоў гэта ён да Мікіты Гузака купіць самагону, і толькі яму Мікіціха адчыніла дзьверы, ён адразу — шусь ёй візытоўку ў рукі. Тая ажна прысела зь пярэпуду: думала, што агент, які прыйшоў апаратуру зарыштаваць. Добра, у хаце быў Мікіта, які толькі што прыняў чарговую порцыю дыеты. Той не зьбянтэжыўся. Ён узяў у рукі візытоўку, прачытаў: „Мікола Сямёнавіч Дурмідаў: такі і такі асьветны чын“ — і вярнуў візытоўку назад.
— А ты мне, — кажа, — усялякіх паперак ня тыцкай. Ты мне, шаноўны, грошы гані наяўнымі знакамі: або фэнікамі, або іншай валютай — мне гэта ўсё роўна.
Мусіў Дурмідаў пакласьці сваю візытоўку назад у кішэню. Другая асечка здарылася ў Загржэмбіцкага. Пайшоў да яго Мікола Сямёнавіч прыдбаць якога тлушчу кавалак і таксама пачаў гандлёвыя дачыненьні зь візытоўкі. А баба Загржэмбіцкага (тутэйшая) ня надта спакушаная ў культуры — яна таксама гэную візытоўку ўзяла за ордэр на спэкулянцкі арэшт:
— Вы, — кажа, — пане, памыліліся. Мы людзі бедныя і самі ня штодзень сала купляем.
Так і не паказала яму свайго сала. Здарыліся яшчэ дзьве такія няўдалыя спробы зь візытоўкамі, і Дурмідаў мусіў выкінуць іх на сьметнік.
Значыцца, кажны зачын, апрача добрае волі, павінен мець яшчэ і пэўную глебу.
**14 лютага.** Юзік Загржэмбіцкі працерабіў шлях у Западную. На першы раз сам ехаць пабаяўся — накіраваў жонку. Тая,

набраўшы кошык рознае драбніцы, прывезла адтуль воз дабрыні.
— Там, казала, усялякага дабра ў гаспадароў больш, як у нас на складах.
Яно і зразумела: гэныя людзі яшчэ не паспыталі калгаснага хлеба, а таму і свой маюць. Юзік наладаваў повен воз тавару і спадзяецца вывезьці вялікі абоз дабра.
— Я, — хваліўся, — не люблю драбніцаю займацца. Мне адразу: або пан, або прапаў.
Такі чалавек, калі не памрэ, дык свайго дапне, бо кіпцюры мае надта войстрыя.
**17 лютага.** І жыць цяжка, і памерці ня лёгка. Учора ў садзе культуры і адпачынку знайшлі нежывую бабульку. Ну, ведама, пацікавіліся, чыя гэта бабулька, і як яна там апынулася. Намацалі і сваячкоў... „Якое–такое ў вас здарэньне з бабулькай?“ — пытаюць. Ну, прыціснулі трохі — яны і сазналіся: а ніякага, кажуць, здарэньня. Звычайна. Памерла бабулька, а мы яе пахавалі.
— Дык хіба ж так хаваюць? Хто вас такога навучыў?
— А мы ўсё чын–чынам — кажуць, — і дамавіну зрабілі, і хаўтуры справілі. А што дол прамёрз на два мэтры, дык мы тут не вінаватыя, бо паставілі мы ў садзе да часу, пакуль не адтане дол...
Можа яно так і было. Можа б яны і пахавалі бабку, але тым часам іншыя спажыўцы нагледзелі, што дамавіна стаіць без ужытку, бо на паверхні зямлі, і скарысталі для свайго пацыента, а бабульку вытрасьлі на сьнег.
Гэтае здарэньне нарабіла шмат гутарак на нашай вуліцы, і ніхто тых сваякоў не пахваліў. Толькі Наязноў спрабаваў даводзіць, што ў навуцы ведамыя такія спосабы паховінаў і што бываюць яшчэ і горшыя, але Сымон перапыніў ягоную лекцыю на самым пачатку.
— Вы, даражэнькі, із сваёй навукай жывеце, як хочаце, хоць на галаве хадзіце. Бо жыць можна ўсяк, але памерці мне, браток, дай па–чалавечаму, бо гэта ў жыцьці здараецца толькі адзін раз...

**19 лютага.** Учора нечакана трапіў на пажагнальную гарбатку — Арыентацкі паспрыяў. Што такое пажагнальная гарбатка — я даведаўся пазьней. Шчыра кажучы, ніякае гарбаты не было: быў

разьведзены сьпірытус і закусь. Але сэнс ня ў гэтым: сэнс у самой існасьці справы. А існасьць была ў тым, што праводзілі адну надта слынную асобу на яшчэ няведамы пасад.
Пацеха! Чаго я толькі тут не наслухаўся. Выступалі блізу ўсе, і кажны хваліў слынную асобу. І чаго толькі не наплялі! Здавалася, што гэтая слынная асоба ўвабрала ў сваё, дарэчы, досыць сьціплае тулава, усе чалавечыя годнасьці...
Арыентацкі прамаўляў, што такіх людзей, як гэная асоба, рэдка зямля носіць. Авечка Ахрэм — той жывымі сьлязьмі цадзіў у кілішак — ня мог паўстрымацца ад разьвітальнага жалю. Шчыра выступаў ажна тры разы. Праўда, ягоныя прамовы не зусім былі шчырыя, бо ён, хоць і хваліў, але разы два калупнуў– такі гэтую асобу, і досыць калюча. Тая ажно заёрзала. Калі не лічыць гэтага выпадку ды яшчэ прамовы аднаго здаравеннага дзецюка з чырвоным тварам, дык усё было надта прыстойна. Быў ужо і я разагнаўся на прамову, але тут неяк усе загаварылі разам, ня слухаючы адзін аднаго, і колькі я ні бразгаў відэльцам па кілішку — агульнае ўвагі не сабраў.
Дахаты ішлі разам з Авечкам і Арыентацкім. Авечка яшчэ не суняў свайго жалю і усё чмыхаў носам:
— Такая, — казаў, — страта... такая страта...
Арыентацкі, наадварот, выглядаў вельмі вясёлым.
— Я, — казаў, — хоць бы штодня ладзіў такія гарбаткі.
— Але ж у такім разе, — кажу, — вы рызыкавалі б за які месяц разьвітацца з усімі слыннымі людзьмі гораду...
— А такой бяды! Не былі б яны, былі б іншыя. Хіба ня ўсё роўна?
Я, ведама, цалком зь ім згодны, што для мяне гэта не было б стратай, але ўголас пра такое не сказаў. Хто яго ведае, што за чалавек Арыентацкі.
**21 лютага.** На суседняй вуліцы асяліўся пагарэлец. Пацярпеў ён, бядак, ад няшчаснага выпадку з вайсковай неасьцярожнасьці. Ледзь з душой выскачыў. А цяпер усунуўся ў голую хату, з голай сям'ёй.
— Ну, як ты жыць будзеш? — спачуваюць суседзі. — У цябе ж нават вяроўкі няма, каб на крук пачапіць...?
— А дармо, — кажа, — неяк пражыву: Дыяген і гэтага ня меў...
Нараілі яму схадзіць да сабедапамогі.
— Мы ж складаліся, дык вось табе акурат і будзе.
Пайшоў. Адважылі яму там тры кілё мукі і паўкілё солі.

— Ну, — кажуць, — папраўляйся, чалавеча. Не сумуй.
А чаго ж яму сумаваць, калі памагаюць?.. „Моцны выжыве, а нямоцны жыцьцё касуе“. Так казаў пра гэты выпадак Наязноў. Але, здаецца, ён і сам ня быў перакананы, што гэты выснаў можа хоць трохі задаволіць пагарэльца...

**25 лютага.** Мар'ю Іванаўну прасачыў із шофэрам. Усё зразумела!.. Зрада! Ашуканства! Безадкладна ўжыць станоўкія захады! Гэта чорт ведае што такое***.
**28 лютага.** „Любоўная лодка разьбілася аб быт“ — як пісаў той паэта. У мяне яна разьбілася ўдрузачкі. З Мар'яй Іванаўнай — квіты. Скончана ўсё. Перамовы ні да чаго не прывялі. „Разыдземся, — кажа, — Іван Іванавіч, добрымі сябрамі“. Нічога! Я яшчэ табе пакажу добрых сяброў. Будзеш памятаць...
**2 сакавіка.** Фэцкі, у выніку лічэньняў, прыйшоў да выснаву, што ў навуцы ўжо няма чаго рабіць: усё вынайдзена. І цяпер конча перакінуўся на практычную справу.
— Гандаль, — кажа, — асноўнае, што цяпер трэба чалавеку, бо гандаль — гэта рухавік усяе культуры.
Ухапіўся і ён за гэты рухавік. Але першыя ягоныя крокі былі не зусім моцнымі. Купіў на інкубатарнай станцыі 30 піскляў па рублі за галаву, а меркаваў прадаць па 10 рублёў. Такім парадкам ад гэтага рухавіка мусіла атрымацца пэўная культурная астача. Але, як кажуць, — рыба ў рацэ, ды не ў руцэ. Пакуль ён валок у сетцы гэтых 30 піскляў із станцыі, пяцёх па дарозе ўдалося задушыць. Рэшту пасадзіў на авёс. Піскляты адмовіліся ад аўсу. Ведама, які пісклячы розум, скуль ім ведаць, што паводле навукі ім належыць ужываць толькі гэтае зерне? Але Фэцкі конча пастанавіў прымусіць іх падпарадкавацца вымаганьням навукі і безадмоўна дзюбаць авёс. Пачалося ўпорыстае змаганьне. Піскляты вымагалі дробных крупак і дробна пасечанага тугога яечка, але Фэцкі яйка і крупы еў сам, а піскляў засыпаў градам аўсу.
У выніку трохдзённага змаганьня, праводжанага зь нясьціханай жосткасьцяй з абодвух бакоў, яшчэ 10 змагароў выбылі із варожага стану, а колькі атрымала цяжкія пашкоджаньні. Толькі тады Фэцкі змогся і рэшту недабіткаў выкінуў на рынак. Але тут яго чакала канчальная аварыя: піскляў ня толькі ніхто не купляў, але нават і дарма ня браў.
Ізноў навука падвяла.

— Усё было б добра, — казаў пра гэтую аварыю Сымон, — каб піскляты былі натуральныя. Тыя дык і авёс бы жэрлі! А тут — зробленыя электрыкай.
Зь ім згадзіўся і Мікіта:
— Ды хіба электрыкай можна жывое зрабіць? Піскляня — гэта, браток, не чалавек: у яго арганізма кволая. Дый чалавека, бадай, ці зробіш электрыкай.

*(Працяг быў)*

* Мабыць, трэба разумець *credo*. — *Л.К.* *(назад)*

** У гэтым месцы зь нейкае прычыны Ів.Ів. пяць радкоў вычыркнуў. — *Л.К.* *(назад)*

*** Тут колькі радкоў зацёрта. — *Л.К.* *(назад)*

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

*Вайна ў ARCHE 2(3)-1999* . [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **14-07-1999**

да Зьместу 2(3)-1999
***полымя***

# Юр. Монвід (Францішак Аляхновіч) Страшны год (успаміны нядаўніх дзён)

**Францішак Аляхновіч (1883—1944) — драматург, “беларускі Мальер XX стагодзьдзя”, аўтар хрэстаматыйных “Чорт і баба”, “Круці не круці...”, “На Антокалі”, “Пан міністр”, а таксама дакумэнтальнай аповесьці “У капцюрох ГПУ”. За цара — вязень Лукіскай турмы, за Саветаў — Салавецкіх астравоў. У вайну рэдагаваў штотыднёвік “Беларускі голас”. Ён заўсёды трымаўся думкі, якой ня надта ўтульна ў беларускіх сюжэтах: *“Я не палітык, я — культурнік, я — тэатральны работнік”*. Жыцьцё насьміхалася з правіла ды даравала яму ўсялякіх нягод.**

**З пачатку 1944–га яго ўспаміны пра перадваенныя туляньні пад назваю “Страшны год” друкаваў часопіс “Новы шлях”. З сакавіка ўвечары ў дзьверы віленскай кватэры Аляхновіча пазванілі. Не дапісаўшы чарговага сказу “Страшнага году”, гаспадар пайшоў адчыняць. Было двух візытантаў. Зайшлі. Аляхновіч павёў неспадзяваных гасьцёў у свой габінэт. Пэўны**

**час ішла спакойная размова. Каля восьмае гадзіны выбухнуў стрэл… Успаміны абарваліся на слове.**
**Пра Ф.А. таксама — у пасьлямове пры канцы “Страшнага году”.**
**Рэдакцыя дазволіла сабе зьмяніць падзел на абзацы з улікам таго, што ў 1944 годзе твор друкаваўся ў газэтным фармаце. Мусім заўважыць, што твор не свабодны ад ідэалягічных забабонаў свайго часу.**

**Нечаканыя госьці**

**Я** тады працаваў на электрычнай станцыі ў Вільні… У вячэрнія гадзіны тры разы на тыдзень мы зьбіраліся на лекцыі літоўскае мовы… Праз пару дзён ужо быў назначаны экзамэн, які меўся вырашыць пытаньне, хто з нас застанецца на працы, а хто — павялічыць лік беспрацоўных…
Гадзіна 6 увечары. Лекцыя скончылася. Разыходзімся. Я вяртаюся дахаты, думаючы аб блізкіх экзамэнах. Каб не “праваліцца”! Цяжка мне давалася літоўская мова!
І канчаючы ўжо шосты дзясятак гадоў майго жыцьця, я перанёсься ў шчасьлівыя дзіцячыя гады, калі пытаньне аб тым, ці вытрымаеш экзамэны і ці пяройдзеш у вышэйшую клясу, зьяўлялася найважнейшым. Цяпер пытаньне, што стаяла перада мной, было таксама не малой вагі: ці буду мець магчымасьць зарабляць на хлеб для сябе і сваёй сям’і? Сівы чалавек, бацька дзяцей, я перажываў перадэкзамэнацыйныя эмоцыі школьніка. Было мне і страшна, і сьмешна, і крыўдна… Прыбліжаючыся да Зялёнага мосту, я глянуў і — адзервянеў. Праз мост у бок Кальварыйскай вуліцы каціліся–грукаталі нейкія вазы–скрыні. З круглых, адчыненых на іх вежаў высоўваліся галовы у шэрых сьпічастых шапках…
Гэта былі яны: бальшавікі!..

Прафэсар М.Зьдзяхоўскі, які памёр перад сучаснай вайной у Вільні, не дачакаўшыся бальшавікоў, верыў, што бальшавізм зьяўляецца творам нячыстых сілаў. Ён, падыходзячы да справы містычна, зусім шчыра і паважна пісаў, што ў сучасны мамэнт пачынаюць збывацца прадбачаныя ў Апакаліпсісе падзеі…
Пры спатканьні з бальшавікамі мяне агартае страх. Гэта ня

толькі ведамы кажнаму чалавеку страх сьмерці. Тут ёсьць нешта болей. Хто з нас, пражыўшы больш за паўсотні гадоў, не глядзеў сьмерці ў вочы! Гэта іншы страх. Гэта страх дзіцяці, зачыненага ў цёмным пакоі, якое баіцца чагосьці нерэальнага. Гэта страх, які перажываем у сьне, змагаючыся зь нечым і ня могучы яго перамагчы, калі непаслухмяныя рукі ня могуць нанесьці забойчага ўдару, а ногі ня здолеюць варушыцца, каб уцячы...
І мне часам прыходзіць на дум, ці запраўды ў факце існаваньня бальшавізму няма чагосьці “патустароньняга”, бо, глянуўшы на гэтыя шапкі, на гэтыя чырвоныя зоркі, я перажываю містычны страх, нібы я спаткаўся з чортам...
Лепш у голым полі спаткацца са зграяй галодных ваўкоў, чымся неспадзявана пабачыць гэтыя шапкі, гэтыя зоркі, гэтыя скуластыя мангольскія твары, зь якімі, здавалася, ужо ніколі не сустрэнешся.

**Уцёкі**

Няздольны, як у сьне, да лягічнага разважаньня, я пабег да свае хаты. Там яшчэ нічога ня ведалі. “Бальшавікі прыйшлі!” — я першы прынёс гэтую вестку.
У гэты мамэнт мне здавалася, што я не павінен ні аднае ночы начаваць у сябе дома. Я сеў на аўтабус і паехаў у другі канец гораду да прыяцеля. Тут мы пачалі ўсебакова разважаць палажэньне. Мы прыйшлі да гэткага выснаву: бальшавікі тут ужывуць іншую тактыку, чымся ўсюды дагэтуль. Літва — незалежная дзяржава, Літва — што атрымала так нядаўна ад бальшавікоў Вільню, Літва — што падтрымоўвала прыязныя адносіны з СССР — перажыве працэс саветызацыі ў павольным тэмпе, шляхам эвалюцыйным. Ня будзе раптоўнай ломкі з НКВД, падваламі, расстрэламі. Яшчэ ня хутка пачне зямля гарэць пад нагамі. А цяпер яшчэ можна даўжэйшы час сядзець спакойна і глядзець, як будуць разгортвацца падзеі. Чорт яшчэ пакуль што будзе сядзець спакойна, схаваўшы свае капцюры ў рукавічках. Гэтак мы тады думалі, гэтак пацяшалі сябе ў гэты непацешны час.
Але ў сваёй хаце мне, аднак, начаваць не хацелася.
На другі дзень радыё апавясьціла, што ўцёк прэзыдэнт рэспублікі Смэтона.
На трэйці дзень я пайшоў да прыяцеляў і мы рашылі назаўтра

ўвечары перабірацца ў Нямеччыну.
Падзеі шпарка ішлі. Прыяцелі безь мяне пастанавілі прысьпешыць час выезду. Заміж увечары, выехалі ўраньні. Мяне не маглі паведаміць, бо мяне трудна было знайсьці — я не начаваў дома. Паехалі на граніцу, у бок Нямеччыны. Я застаўся. Даведаўшыся аб іхным ад'езьдзе, пагнаўся за імі. Цягнікі тады хадзілі акуратна. Я знайшоў іх на аўтобуснай станцыі ў Коўні. Мы паехалі ў прыгранічнае мястэчка Л. Добра. У кампаніі сьмялей.
Едзем. Ня маем яшчэ ніякага пляну датычна пераходу граніцы. На мейсцы пабачым, разьмяркуем, вырашым... За Коўняй на кажным масточку — савецкая варта. Кілёмэтар за кілёмэтрам пралятаем шпарка. Нарэшце, на нейкай рэчцы мост — бяз варты. Я штурхнуў у бок майго прыяцеля:
— Бачыш?
— Бачу.
— Тут іх няма...
— Няма...
Мы ўздыхнулі: бальшавікі да граніцы яшчэ не дайшлі.
А вось і мястэчка Л. Жыдкі абкружылі аўтабус. Публіка высядае. Прыехала пара ксяндзоў, літоўскі афіцэр, нейкія цывільныя, у іхным ліку і мы...
Мы знайшлі патрэбнае знаёмства... Пераначавалі... Знайшоўся і шофэр са сваім аўтам. Мы з камфортам паехалі да граніцы. Затрымаліся ў хутары чвэрць кілёмэтра ад граніцы. На стале зьявілася гарэлка і закуска. Наша прабываньне тут павінна мець характар вясёлага пікніку, на выпадак, калі б заглянула сюды пагранічная старожа. Мы глядзелі праз вакно: вось там, за гэтым гародам горка, на ёй бачна хатка. Гэта ўжо — за граніцай! Але каб было больш пэўна — тутэйшы чалавек правядзе нас праз гэты гародчык, паможа нам несьці нашыя клункі. Гэтак блізка! Там бальшавікі ўжо нас не дастануць! Прыбегла, задыхаўшыся, дзяўчына.
— Пагранічная старожка, — кажа па літоўску, — атрымала тэлефонную вестку: з мястэчка Л. дзьве гадзіны таму выехалі два грузавікі з бальшавікамі абстаўляць граніцу...
Нельга марнаваць часу. Гарэлка і закуска засталася стаяць на стале, як стаяла. Мы схапілі свае клункі. Кінуліся ў гарод. Адзін за адным, гуськом пабеглі мяжой у кірунку хаты, што стаяла на горцы. На самай граніцы — рэчка. Там нас

затрымала нямецкая старожа...

**За мяжой**

Спачатку прымежнікі гавораць з намі строгім тонам, пасьля, даведаўшыся, хто мы, перамянілі тон на больш ветлы. Вядуць нас у сваю старожу. Адносіны ўжо зусім добрыя. Трактуюць нас сваімі цыгарамі. Паслалі ў суседнюю вёску па хурманкі. Яшчэ перад захадам сонца павезьлі нас у найбліжэйшае мястэчка. Там мы пераначавалі ў камэндатуры. На другі дзень павезьлі нас цягніком у горад С. Мае таварышы ўжо даўно рыхтаваліся да выезду у Нямеччыну. Яны падрыхтавалі сабе грунт. У нямецкім прадстаўніцтве ў Коўні атрымалі дазвол на пераезд у Нямеччыну. Мой выезд быў непрадбачаны, дазволу я ня меў. Мае таварышы засталіся, мяне — скіравалі назад на граніцу. Ня я адзін апынуўся ў гэткім няўдалым палажэньні. Разам са мной скіроўвалі на граніцу аднаго зь віленскіх адвакатаў, які перабіраўся ў Варшаву. Яго ў горадзе С. судзілі, далі яму за нелегальны пераход граніцы тры дні астрогу і пасьля адсідкі перакідалі назад у Літву.

**Назад...**

У выгодным аўта ехалі мы... назад... Вось і пагранічная старожа. Прыехалі хутка. Цяпер палудзенная гадзіна. Мы расьселіся на траўцы, курылі папяросы і чакалі. Нявесела было нам. Вокны казармаў былі адчыненыя. Быў бачны рух у кухні, дзе кухаркі варылі страву для жаўнераў. Ужо сонца падыходзіла да небасхілу, калі мы пачулі ў кухні гутарку, ад якой нам мурашкі прабеглі па целе. А можа мы недачулі? Можа нешта ня так? Мой таварыш добра гаварыў па нямецку. Ён пайшоў да нашага сымпатычнага афіцэра, каб праверыць чуткі...

Але. Гэта была праўда. Нядаўна, пад вечар, ня больш гадзіны часу таму, на граніцу зьявіліся бальшавікі... Ужо і гэты адрэзак літоўска–нямецкай мяжы заняты бальшавікамі. Але што казаць бальшавікам, калі апынемся на іхным баку? Уцякаем зь Нямеччыны? А якія дакуманты? У мяне пашпарт, выдадзены ў Вільні і зарэгістраваны толькі ў Вільні. Казаць, што заблудзіліся? Але дзе былі? Мой кумпан раіць: скажам, што былі ў гасьцях у маёнтку. У якім? У каго? Няма што казаць, няма выкруту...

Гэтак мы мучыліся, перабіраючы ўсе магчымыя тлумачаньні... Я ведаў адно: калі не ўцячэм — гэта мой канец. Страшны канец. Буду ўцякаць, што ёсьць сілаў, колькі дазволіць маё немаладое сэрца, хай страляюць, хай заб'юць — гэта добра, каб толькі не застацца жывым у бальшавіцкіх руках.
Вечарэла... Загараліся першыя зоркі... Надыходзіць страшная часіна: пераход граніцы — туды! Назад! дзе чырвоная нечысьць "будуе новы сьвет"... Афіцэр выйшаў на панадворак. Значыцца, ужо хутка. Я здымаю боты, папраўляю свае шкарпэткі, каб нідзе ня ціснула нагу, бо цяпер увесь ратунак у нагах... Ну і ў сэрцы!... Каб сэрца вытрывала! Але яго не абкруціш ні лахманамі, ні ватай. А яно цяпер б'ецца моцна, быццам папераджаючы: "На мяне, браток, шмат не спадзявайся... Я ўжо зморанае, старое, слабое... Службу сваю ўжо адслужыла... Пара ўжо і на супачын..."
— Бітэ... Комэн зі...
Афіцэр кіўнуў на нас. Мы ўсхапіліся зь зямлі і пайшлі за ім... Падыйшлі да нейкага ручайка. Затрымаліся на мосьціку...

**Начное падарожжа**
Мы арыентаваліся па зорах. Гледзячы на Вялікую Мядзьведзіцу, мы ішлі на паўночны ўсход, спрачаючыся па дарозе. Мой камрат меў тэндэнцыю паварачваць больш направа, а я сьцьвярджаў, што трэба кіравацца больш улева. Мы не шукалі дарог. Ішлі проста праз палі, сенажаці, жыта. О, калі траплялі ў жыта, дык чуліся зусім добра! Трохі толькі схіліўшы галаву, мы ўжо ведалі, што нас тут ніхто ня ўбачыць. Калі спатыкалі на дарозе нейкі хутар, стараліся яго старанна абмінаць, каб ня ўбачылі нас людзі, не пачулі сабакі... А хто яго ведае, можа там пад страхой сядзяць бальшавікі...
У нас было пастаноўлена: будзем кіравацца на мястэчка Л. — гэтае самае, каля якога я перайшоў граніцу, ідучы ў Нямеччыну. Пад гэтым мястэчкам мой камрат меў знаёмага. Там мы меліся выспацца ў стадоле і нанач зноў ісьці далей, кіруючыся на Коўню.
Перасякаем нейкую дарогу. Зьлева нешта бліснула. Раптам на павароце зазіхацелі поўным сьвятлом два рэфлектары аўта. Ні перад намі, ні за намі няма ні кусточка, ні дрэўца, ні ямы. Толькі згараная зямля. Мы кінуліся тварам на зямлю. Цішыня. Ніхто нас не чапае. Аўта праляцела, не заўважыўшы нас. Я

асьцярожна падымаю галаву. Гляджу. Майго таварыша падарожжы няма. Што за ліха! Што сталася? Куды ж ён падзеўся?..
Месяц схаваўся за хмары, і навокал запанавала цемра. Я ўглядаюся ў цемру ночы. Раптам бачу: нейкі цень... Нехта ідзе ў маім кірунку. Уцякаць няма часу. Дагоніць. А мо' ня ўбачыць. Я зноў шчыльна прылягаю да зямлі... Нехта тармошыць мяне за плячо...
— Што з вамі? Вы жывы ці ўжо памёрлі?
Гэта вярнуўся мой камрат.
Як выясьнілася, пасьля праезду аўта ён падняўся і, думаючы, што я зрабіў гэтаксама, пайшоў далей. Адыйшоўшы крыху і ўбачыўшы, што мяне няма, ён вярнуўся і пачаў мяне шукаць... Ізноў ідзём. Ізноў спрачаемся. Я хачу паварачваць улева, ён кіруецца управа. Зноў месяц выпаўз з–за хмараў. Праклінаем гэты зрадлівы сьвет. Страшэнна піць хочацца. Паміж кустамі спатыкаем нейкае балотца. П'ём сваймі шапкамі гэтую цёплую, брудную, балотную жыжу. На небасхіле пачынае сьвятлець. Ужо золак. Хутка трэба будзе недзе спыніцца, адпачыць. Ужо пачынаецца ўсход сонца. Мы бачым раскінутае ўнізе пад намі нейкае мястэчка. Гэта ня Л. Мы прыглядаемся да касьцельных вежаў, да агульнага выгляду гэтага аселішча і аднагалосна сьцьвярджаем: але, гэта не мястэчка Л. Гэта іншае. Але якое? Дзе мы? На якой тэрыторыі? Каго спытацца? Як спытацца? Што людзі падумаюць, калі ўбачаць на досьвітку двух брудных, абмызганых балотам тыпаў з партфэльчыкамі пад пахай, якія пытаюцца, што гэта за мястэчка. Дык жа апошні дурань зразумее, што тут справа нячыстая. Мы рашылі не паказвацца людзям на вочы, праспацца ў жыце, а ўначы ізноў ісьці ў кірунку паўночна–ўсходнім.

**Папаліся**

Мой таварыш, як сьпіць, мае благую прывычку храпсьці. У мяне ж яшчэ горшы недахоп, вынесены яшчэ з Саловак. Калі я засну пасьля нейкіх цяжкіх перажываньняў, я ў часе сну стагну, енчу... Ня памятаю, што мне тады сьнілася. Але было нешта такое, што прымусіла мяне прачнуцца. Я падняў галаву і пачаў разглядацца. Мой камрат спаў і хроп, як мядзьведзь. Непадалёк чутны былі галасы і чуўся шум расхіляных рукамі каласоў. Ішлі да нас нейкія людзі. Я разбудзіў свайго храпуна.

— Ня сьпеце! Нехта ідзе!
Уцякаць ужо позна. Што будзе, то будзе. З трох бакоў зьяўляюцца між каласоў сярдзітыя сялянскія твары. Кажны зь сялян зь віламі ў руках... Справа няважная. Я ведаю, што зараз будуць нас пытацца, хто мы, адкуль, як мы тут апынуліся... Гэта вось гэтыя пытаньні, на якія мы не хацелі б даваць адказу, а прыдумаць нешта накшталтнае дапраўды нам не ўдалося. Я, крыху ведаючы літоўскую мову, стараюся ратаваць палажэньне. Галоўнае, каб адсунуць гэтую часіну, калі будуць нас пытацца. Я пачынаю плясьці розную неразьбярыху... Сьмяюся, дзякую, што нас разбудзілі, прашу прабачэньня, што мы патапталі жыта, паказваю свой пашпарт, пытаюся, якое гэта мястэчка, кажу, што былі ў знаёмых на выпіўцы, уначы заблудзіліся, ня ведаем, куды трапілі, хацелі супачыць крыху... і г.д.
Сяляне глядзяць на нас зь недаверам. Разглядаюць мой пашпарт. Круцяць галавой...
— Пашпарт, здаецца, як мае быць... Хто вас ведае, што вы за людзі...
Мястэчка, якое мы перад сабой бачым, — гэта Кальварыя. Цяпер справа была для мяне ясная, што нас затрымаюць, ня пусьцяць далей ісьці, аддадуць у рукі ўлады. Каб нам не сказалі: “Хадзеце з намі!”, я сам выклікаюся ісьці на хутар. Пытаюся, ці можна купіць малака. Прапаную ім закурыць. Закурваюць, але глядзяць на нас спадылба. Ідзём на хутар. Я ўвесь час бязупынна трайкачу то аб тым, то аб сім, з аднэй думкай, каб ня даць магчымасьці задаваць нам пытаньні...
У хаце нам далі малака. Прагавіта п’ём. Расказваюць нам, як нас знайшлі ў жыце. Пастушок непадалёк ад нас пасьціў жывёлу. Пачуўшы ў жыце нейкія стогны–храпы, падумаў, што там акалявае якійсьці паранены зьвер. Паведаміў людзей. Тры сьмялейшыя, узброіўшыся віламі пайшлі дабіваць непажаданага госьця... І былі надта зьдзіўленыя, убачыўшы ў жыце, заміж зьвера, двух падарожных... Гэты мамэнт уносіць крыху гумару ў нашы суадносіны. Гэта ўжо добра. Там, дзе сьмяюцца, там віламі ня колюць. Можа нават нас пусьцяць сваёй дарогай...

**Ізноў уцёкі**

Я глянуў праз вакно. Ля хаты стаяў хлапец, які майстраваў каля вэлясыпэду: пампаваў паветра ў кола... Мне зрабілася ясна: ён

сьпяшаўся ў мястэчка, каб там паведаміць каго трэба аб знойдзеных у жыце незвычайных падарожных. Я штурхануў свайго камрата: трэба ўцякаць. Ён зразумеў... Мы хутка разьвіталіся, за малако ад нас грошай ня ўзялі, і пайшлі... Прайшоўшы крокаў ля сотні, мы, не зважаючы ні на што, кінуліся бегчы. Беглі праз поле, праз сенажаці, стараючыся абмінаць людзкія аселішчы, так як і ўначы пасьля пераходу граніцы, з тым толькі адрозьненьнем, што тэмп нашых уцёкаў быў шмат шпарчэйшым за начное падарожжа... Людзі кідалі работу ў полі і доўга глядзелі нам усьлед. Але ніхто за намі ня гнаўся. Гэтак мы прабеглі каля трох кілёмэтраў. Нарэшце трапілі ў густое жыта. Тут звaліліся бязьсільна долу, цяжка дыхаючы і чакаючы пагоні. Але ніхто ня гнаўся, было ціха. Сонца падыймалася ўсё вышэй ды вышэй. Пачынаўся гарачы летні дзень. Мы парашылі ляжаць тут да ночы, а ўначы абыйсьці Кальварыю ды ісьці далей пехатой у напрамку Коўні. Мой таварыш быў таго пагляду, што зьяўляцца нам у Кальварыі небясьпечна.

Мы ляжалі ў жыце, чакаючы змроку. Нас мучыла страшэнная смага. У мяне гэтак высахла ў горле, што я ня мог гаварыць. Зь вялікай натугай вырывалася ў мяне з вуснаў слова, як у цяжка хворага чалавека... Нягледзячы на пратэсты, пераконваньні і просьбы майго таварыша падарожжы, я катэгарычна заявіў яму, што ня маю сілаў даўжэй тут заставацца, што пайду да людзей, няхай будзе, што мае быць, каб напіцца вады...

Піць! піць! піць! — адно было ў мяне жаданьне і яно было мацнейшае за страх.

Камрат неахвоча пайшоў за мной. Што яму было рабіць! Аставацца аднаму ў гэтай чужой мяйсцовасьці? Удвох усё ж сьмялей. Мы выйшлі з жыта і пачалі спускацца з горкі. Унізе відаць была дарога, а пры дарозе нейкія хаты. Там ужо ішоў дым з коміна, людзі варылі вячэру, спакойныя, мо' задаволеныя пераменаю ўлады, зараз лягуць спаць у сваёй хаце, сярод сваіх... О, як жа я зайздраваў цяпер гэтым няведамым мне людзям, якія жылі там, у гэных хатах!..

Пераступаем парог. “Лабас вакарас!”*

Просім вады напіцца. Людзі глядзяць на мяне зь дзівам. Відаць, ніколі ў жыцьці сваім ня бачылі, каб чалавек мог выпіць адзін за адным тры літры вады. Закурваю папяросу. Смага прайшла — вярнуўся страх. Апавядаем нейкія небыліцы, стараемся

паказаць сябе спакойнымі і вясёлымі. Просім, каб нам дазволілі пераначаваць на сене. — Добра, калі ласка, але трэба раней зьвярнуцца да солтыса, чужых людзей прыймаць на начлег без дазволу солтыса забаронена. — А дзе жыве солтыс? — А тут недалёчка. Дзе? У гэтай хаце, што там відаць пад горкай? Добра. Мы зараз пойдзем да солтыса. Папросім. Мы ж нікога не баімося. У нас дакуманты у парадку. Мы толькі любім падарожнічаць пехатой... Гэткія мы арыгіналы... Спартсмэны!... Але заўтра мы паедзем аўтабусам у Коўню... А цяпер да солтыса!..
** Добры вечар.*

**Ізноў у жыце**
Мы выйшлі з хаты. Сонца ўжо зайшло. Зьмяркаецца. Ідзём спакойна дарогай. Там, далей, відаць жыта. Мы азірнуліся. Тут нас ніхто ня бачыць. Бяз слова мы адзін аднаго зразумелі. Адзін вомірг — і мы зноў ляжым між каласамі, прытаіўшыся. Тут наш начлег. Тут праляжым да раніцы, а ўраньні — на аўтабус і ў Коўню. Я заявіў свайму кумпаньёну, што далей бадзяцца гэткім чынам і хавацца па начох у жыце і не зьбіраюся. Гэта ня менш небясьпечна, як зьявіцца сьмела сярод людзей, сесьці на аўтабус і ехаць. Дык жа ў нас не напісана на ілбе, што мы былі ў Нямеччыне, што спатканьне з прадстаўнікамі бальшавіцкай улады для нас вельмі непажадана і г.д. Мой камрат быў іншых паглядаў, бо ў яго дакуманты былі не ў парадку. Але мусіў са мной згадзіцца. Што яму было іншага рабіць!
Настала ноч. Навучаныя сумным дасьведчаньнем, мы ўжо не засыналі адразу абодвы, але па чарзе, паводле гадзіньніка. Адну гадзіну дзяжурыў адзін, другую — другі. І ў выніку гэтага мы абодвы ня спалі. Прача таго, мяне пачаў душыць кашаль. Я ўстрымоўваўся, як мага, ня мог дыхаць, затыкаў сабе рот хусткай — і раптам выбух кашлю вырываўся з грудзей няўстрыманай каскадай. Мой суначлежнік злаваўся на мяне, шыпеў як вужака: “ціха! што вы робіце! нас пачуюць! ды кіньце гэта!” — а я ня мог кінуць, ня мог устрымацца, пакуль ня мінуў параксызм кашлю. Бяссонная ноч цягнецца марудна. Пры сьвятле месяца заглядаем на гадзіньнік. О, як жа памалу пасоўваюцца гэтыя стрэлкі, якія мераць вечнасьць!..
Ша!... Мы ўстрымоўваем дых... Нешта далёка ад нас

заварушылася... Зашумелі каласы... Хто гэта? Вораг? Ці гэткі самы, як мы, загнаны зьвер?... Гэта, мабыць, ня вораг. Прытаіўся гэтаксама, як і мы. Ён нас баіцца, так як і мы яго. Хто гэта? Можа ўцёкшы з Кальварыйскага лягеру для палонных польскі жаўнер, мо' гэткі, як мы, бяздомны, а мо' нейкі крымінальны тып. Ці так, ці гэтак — новае знаёмства для нас непатрэбна. Ні мы яму, ні ён нам не паможа. Хай ідзе сваёй дарогай. Калі гэта ўцякач ад "бальшавіцкай справядлівасьці" — хай Бог яму памагае і сьцеражэ ад злой прыгоды...
Нарэшце, гэтая праклятая ноч канчаецца. Ужо сьвітае. Ужо на дарозе чутны галасы першых прахожых. Ужо да адыходу аўтабуса застаецца толькі тры з паловай гадзіны. Трэба яшчэ крыху пачакаць, бо ня сьлед паказвацца на шашы надта рана, каб ня ўзяць на сябе ўвагі... Ну вось, нарэшце, мы вылазім са свайго сховішча. О, благаславёнае будзь жыта! Зь цябе працавітая рука хлебароба вытварае хлеб, а мы цябе топчам, дратуем у часе сваіх імправізаваных начлегаў. Даруй нам. Хлеба для людзей хопіць, а наша жыцьцё нам раз толькі даецца... Абчышчаем сябе, як можам, ад пяску, ад каласоў, выпросташаем пакурчаныя нагавіцы, выходзім на дарогу... Ідзём спакойна, роўным крокам... Вось ідуць сабе два падарожныя... Хто падумае, што яны перажылі й перажываюць...

**У аўтабусе**

Аўтабус нясецца ў Коўню. Публікі поўна. Ёсьць пара маладых жыдкоў. Гавораць–па расейску. Захопленыя, узьнятыя, поўныя энтузіязму. Рэшта публікі сядзіць спакойна, ціха. Маўляў, баіцца. Маўляў, ня хоча нейкім нялоўкім словам увесьці дысананс у настрой маладых сыноў Ізраіля. Маўчым і мы, стараючыся нават не глядзець адзін на аднаго, каб у гэтым паглядзе нехта нешта не прачытаў. Вочы нашы глядзяць толькі на пэйзажы, якія мільгаюць перад вокнамі аўтабусу... Каб хутчэй да Коўні!... Адно толькі я шапнуў свайму кумпану:
— А што? Бачыце? Даўно гэтак трэ было зрабіць... А вы не хацелі мяне слухацца...
Кумпан кіўнуў галавой.

**Калі топішся, дык за брытву хопішся**

У Коўні мы разьвіталіся. У піўнушцы на Лайсвос Алеі выпілі

піва, прыпомнілі сабе свае пераживаньні апошніх дзён, пасьмяяліся крыху, бо часта жудаснасьць, калі яна ўжо ў мінуўшчыне, не выклікае страхаў, а пакідае пасьля сябе вясёлы ўспамін.
Іншая рэч — тое, што нас чакае ў будучыні. Перад намі — шмат неспадзяванак, страхаў; хто ведае, можа сьмерць ідзе нам на спатканьне і хто ведае, колькі часу гэтак прыйдзецца жыць? Паціснулі адзін аднаму рукі, паабяцалі адзін аднаму, што калі спаткае нас злы лёс, аб нашым знаёмстве і аб нашай падарожжы ня скажам ні слова — і разыйшліся...
Праз гэтыя апошнія дні, якія я патраціў на сваю падарожжу, Коўня яшчэ больш перамяніла свой вонкавы выгляд. На вуліцах поўна бальшавіцкага войска і — жыдзюкоў. Божа! Колькі іх тут! Ці затрымаешся, каб спытацца, як прайсьці на нейкую вуліцу, ці пачнеш таргавацца з хурманшчыкам, — усюды навокал цябе цікаўныя, што нахальна глядзяць у вочы, маладыя сыны Ізраіля, што напіраюць на цябе. Адчуваеш сябе як ува сьне, калі хочаш уцякаць ад нейкага страхацьця, а яно цябе не пускае, а ногі непаслухмяныя, ня маюць сілы адпіхнуць жудасьці; крычаць хочаш, а з горла вырываецца толькі цяжкі стогн. Але ад сну прачынаешся, а тут сон не спыняецца: усюды, на кажнай вуліцы, у кажным завулку ты бачыш сьпічастыя бальшавіцкія шапкі і жыдзюкоў, жыдзюкоў, жыдзюкоў... Куды падзецца? Тут у вадным манастыры ў мяне быў чалавек знаёмы, колішні салавецкі таварыш. Першая думка: паеду туды! Хоць гэта было недалёка, я ўзяў вазьніцу, каб ня блытацца сярод гэтага натоўпу...
У манастыры я прасіў, каб далі мне працу вартаўніка, памочніка агародніка, ці хоць што колечы... Гэта была неразумная просьба, манастыр — гэта была брытва, за якую хапаецца чалавек, які тонець. Мне адказалі так, як гэтага можна было спадзявацца:
— Даражэнькі! Куды вы лезеце! Дык жа ў нас вас хутчэй спаймаюць, як нейдзе ў іншым мейсцы.
Запраўды — шалёная думка хавацца ад бальшавікоў у манастыры!
Я меў у Коўні сваяка. У сваім безвыходным палажэньні я ня мог спакойна разважаць. Мне патрэбна была рада чалавека, які глядзіць на падзеі больш цьвяроза. Бо я кідаўся, як рыба аб лёд, ня ведаючы, што рабіць, куды ехаць, дзе хавацца. Майго сваяка

не было ў Коўні — ён выехаў. Пераначаваўшы ў гатэлі, я на другі дзень першым цягніком паехаў у Вільню.

**У Вільні**

Жонка вохнула: што сталася? чаму вярнуўся? Я расказаў аб сваіх злыбедах. І пачалося трывожнае віленскае жыццё. Першым чынам трэба было выявіцца з кватэры. Пасьля — не начаваць у хаце. Самая небясьпечная пара — гэта ноч. Бальшавікі, як усялякая нечысьць, як клапы, вошы, пацукі, мышы — праяўляюць найбольшую актыўнасьць уначы. Я начаваў у сваім складзіку. Там ляжала крыху саломы. Было яшчэ цёпла, было лета. Раніцай я прабіраўся ў сваю хату, сьнедаў і, узяўшы вудачку і кошык з правізіяй, ішоў далёка за горад на бераг ракі. Я не рыбалоў і не люблю гэтага занятку. Гэта была маска, каб надаць сабе выгляд бесклапотнасьці, каб выглядаць на чалавека, які нікога не баіцца і ў гэтыя жудасныя часы спакойна ловіць рыбку...

У адну ноч я пачуў сільны званок да вартаўніка. Званок быў вонкі, на панадворку, а кватэра вартаўніка была непадалёк ад майго складзіка. Я ўжо ў гэту ноч больш ня спаў.

У гэту ноч узялі майго суседа, былога польскага афіцэра.

**На хутары**

Сем кілёмэтраў за Вільняй мой знаёмы меў хутарок. Я папрасіўся да яго на працу. І зь дзівам пабачыў, што я тут не адзін: у гэтакім самым палажэньні земляроба–работніка тут ужо быў мой віленскі сябра, беларус Ш. Мы начавалі ў стадоле на сене, абмеркаваўшы добра, празь якую дзірку і куды ўцякаць, калі б быў начны налёт НКВД. Месца было вельмі добрае: навокал — кусты, горкі, недалёка лясок. На панадворку — злы сабака, які ў часе небясьпекі падымець трывогу. Адна бяда: мне, непрывыкшаму да сельскай гаспадаркі, цяжка было. Далі мне ў рэшце рэштаў найлягчэйшую работу — пасьціць жывёлу. Я меў пад сваёй апекай чатыры каровы, якія пасьціў на лясным квадраце, па бакох якога расьлі: жыта, бульба, капуста... Як я ні сачыў за свайміі кароўкамі, заўсёды адна ішла ў шкоду. Выганю адну з жыта, бачу — другая ўжо гаспадарыць у бульбе, выганю яе з бульбы, а тут трэйцяя ўжо пажырае капусту... І гэтак увесь час даводзілася кідацца з аднаго боку ў другі, прабіраючыся празь лясныя кусты, гальлё.

Набліжалася зіма. Што далей?
Я перабраўся ў Вільню.
Жонка мая тымчасам займалася шыцьцём. Я намаляваў ёй шыльду, якая стаяла на вакне. Мы ўмовіліся так: калі шыльда стаіць на вакне — усё спакойна, я, значыцца, магу зайсьці ў хату. Калі шыльды на вакне ня будзе, — значыцца, небясьпека...

**Мае начлегі**

Я раздабыў сабе сем начлегаў у Вільні ў сваіх прыяцеляў і знаёмых. Гэтыя начлегі былі падзелены паводле дзён тыдня. Гэткім чынам мне ня трэба было папераджаць свайго знаёмага, што прыйду да яго на начлег: кожны меў свой дзень у тыдні. Раніцай ішоў у сваю хату. Шыльда стаіць на вакне, значыцца, добра, ноч тут прайшла спакойна, можна зайсьці... І, зайшоўшы ў сваю хату, увесь дзень сядзеў несупакойны, гледзячы праз вакно на вуліцу. Кажны аўтамабіль, які затрымоўваўся непадалёк ад майго дому, будзіў трывогу. Ужо я хапаў паліто і шапку, гатовы выскачыць праз другое вакно, якое выходзіла на панадворак, гэтак аблічаючы час, каб бальшавікі не пасьпелі абкружыць дом...
Як зьмяркалася, я ішоў на начлег. Вокны НКВД ужо блішчэлі сьвятлом, там ужо пачыналася праца начной нечысьці. Праходзячы праз Лукіскую плошчу, я на сярэдзіне затрымоўваўся, глядзеў навокал. Нікога нідзе не відаць. Мяне ня сочаць. Ну, дзякуй Богу! Толькі асьветленыя вокны НКВД глядзелі моўчкі на мяне, кідаючы снапы сьвету на залітую восеньскім дажджом вуліцу.
Мой вонкавы выгляд зьіначыўся. Я аброс сівой барадой, адпаведна да гэтага перамяніў хаду, цяжка варушачы нагамі, як чалавек, зморaны жыцьцём і хваробай. Згорбіўся. Усклаў акуляры. Усё гэта з такім разьлікам, што фігура слабасільнага чалавека менш падазрона выглядае, чымся здаровага і дужага. Якая ж нямілая бывала для мяне неспадзеўка, калі нейкі знаёмы, спаткаўшы мяне ўвечары на вуліцы, клікаў: “А! Спадар Монвід! Як маецеся? Вы ў Вільні? Ня выехалі? Ня раю... лепш выяжджайце...”
— Як жа ж вы мяне пазналі? — пытаўся я са свайго боку зь вялікім дзівам.
— Вас?! Як жа ж вас не пазнаць! Я вас здалёк пазнаю...

Вось і не памагае ні барада, ні акуляры, ні старэчая хада... А каб цябе!

* * *

Увосені мне ўдалося дастаць працу пад Ляндваровам, 30 кілёмэтраў за Вільняй. Тут бальшавікі будавалі шашу. Я быў пастаўлены аблічаць вазы, якія прыяжджалі зь пяском. Трэба было сварыцца зь сялянамі за лік вазоў. Кажны зь іх хацеў, каб яму запісаць большы лік, як быў узапраўды.
Тут я жыў у сялянскай хаце, адчуваючы сябе ў сякой–такой бясьпецы.
Праз колькі дзён тэхнік заявіў мне, што трэба ісьці ў мястэчка Трокі, дзе была галоўная ўправа будовы, каб зарэстравацца і выпаўніць анкету.
Я ведаў, чым гэта пахне. У галоўнай управе я мог спаткацца зь людзьмі, якія мяне знаюць зь Вільні. Тады — капут! Ізноў трэба было вяртацца ў Вільню. Ізноў шукаць начлегаў. Спачатку ішло сяк–так. Знаёмыя прыймалі мяне ў сваю хату. Кажную ноч прыходзілася начаваць у іншым мейсцы. Пасьля напалоханыя бальшавіцкім тэрорам людзі ня так ахвотна дазвалялі мне начаваць у сваёй хаце. Бывала, што прыймуць вельмі ветла, патрактуюць вячэрай з гарэлкай, але калі ў канцы спытаюся: “Брацейкі! А ці ня можна ж было ў вас сяньня застацца нанач?” — адказ вельмі часта бываў гэткі:
— Ведаеш, браток, мы бы з ахвотай, але ў нас небясьпечна, тут побач жыве нейкі падазроны тып. Хто яго ведае, хто ён такі!
І прыходзілася ісьці далей.
Усяляк бывала. А бывала і гэтак: не прынялі мяне на начлег. Баяліся. На другі дзень я даведаўся, што ўначы у гэтай кватэры быў вобыск, арыштавалі гаспадарскага сына. Мне пашанцавала. А бывала і гэтак, што прыходзілася начаваць у людзей, якія спадзяваліся зь дня на дзень арышту. Што было рабіць, калі няма куды падзецца. Ужо зіма. У лесе або ў жыце не пераначуеш. Я клаўся не распранаючыся, гатовы кажную часіну, як пачуецца званок пры браме, выскачыць праз вакно ў агарод. Кусок хлеба, намазаны маслам, ляжаў напагатове, каб кінуць яго сабацы, як пачне брахаць. А там праз агарод, на другую вуліцу — і Бог бацька!...
У сваю собскую хату я ўжо рэдка зьяўляўся, а начаваць дык

зусім ужо ня мог. Адзін пакой быў заняты кватарантамі, другі заняў упраўдом на сваю канцалярыю, трэйці — “уплатнілі” — разам з маёй жонкай памясьцілі кватарантку з пакою, занятага пад канцэлярыю. Часьцей за ўсё я ішоў на могілкі і там, сеўшы перад нейкім помнікам, рабіў выгляд, быццам малюся за пахаваных тут сваіх сваякоў.

**Міласьціна**

Адзін раз увечары я затрымаўся перад кіёскам з папяросамі, каб купіць сабе курава. Каля мяне затрымаўся нейкі работнік. Быў крыху падвыпіўшы.

— А якія ж, бацька, папяросы курыш? — спытаўся.

— Я куру самыя танныя, — адказаў я.

Незнаёмы меў нейкія намеры. Мне здавалася, што хацеў распачаць са мной гутарку.

— Мусіць, калісь добра жылося, а цяпер...

І незнаёмы спагадліва пакачаў галавой.

Я адчыніў сваю папяросную бляшаную скрыначку, каб схаваць купленыя папяросы, як раптам нешта бразнула: у скрыначку пасыпаліся мэталёвыя грошы. Я быў зьдзіўлены.

— Што вы?... нашто гэта?... — пасьпеў я толькі крыкнуць, але мой незнаёмы ўжо прапаў у вячорнай цемры вуліцы.

Я палічыў кінутыя мне грошы. Там было 45 капеек, акурат на пачак папяросаў. Нешта мяне сьціснула за горла. Па твары пакацілася сьляза... Бальшавікам не ўдалося заразіць віленскія работніцкія масы клясавай нянавісьцяй.

**НКВД працуе**

Ужо даўно адбыліся “вольныя” выбары ў Сойм, ужо даўно адбылося “дабравольнае” прылучэньне Літвы да Саюзу Савецкіх Рэспублік, ужо бальшавіцкі тэрор быў ува ўсёй сваёй моцы. Лукіскі вастрог быў перапоўнены. Падвалы НКВД на Гэдыміна вул., дзе раней памяшчаўся суд, былі таксама поўныя вязьняў. Ад часу да часу нехта зь вязьняў, якога вялі на допыты, выскокваў з вакна на вуліцу. Часам падымалі з вуліцы чалавека з паламанымі нагамі, часам спрытнейшы, выскачыўшы, здолеў уцячы. На суседніх вуліцах рабілі аблаву, шукалі, урываліся ў памешканьні... Ці знаходзілі — ня ведаю. Цяжка было знайсьці сьлед чалавека, што трапіў у лапы НКВД. На Лукішках казалі, што арыштаваны, мабыць, сядзіць у

падвале НКВД, а там адказвалі, што яго няма, што трэба шукаць у Лукіскім астрозе. Людзей арыштоўвалі не дзясяткамі, ня сотнямі, а тысячамі... Ніхто, кладучыся спаць, ня ведаў, ці яму ўдасца спакойна праспаць гэту ноч у сваёй хаце. Начлегаў у мяне было ўсё менш ды менш. Няма дзіва. Найлепшыя прыяцелі неахвотна прыймалі мяне ў сваю хату. Я за гэта ня меў да іх ніякага жалю. Я на іхным мейсцы быў бы ня лепшы. Але начаваць недзе трэба.
У гэткім палажэньні чалавек робіцца нахальным.
Нецярпліва я чакаў вясны, калі будзе магчыма начаваць у лесе.

**Надзея**

І заўсёды зьяўлялася ў галаве пытаньне: як доўга гэта будзе трываць? Добра, калі месяцы. Ну, можна неяк вытрываць, калі год. А што рабіць, калі гэткае палажэньне пратрывае колькі гадоў? А можа гэтак застанецца ўжо назаўсёды?!
Адзін раз я спаткаўся на Сьніпішках з Улад. Казлоўскім. Мы затрымаліся з боку, на беразе Вяльлі і пачалі гутарку на гэтую тэму.
— Калі можа распачацца вайна? — пытаюся.
— Я думаю, — кажа Казлоўскі, — што не раней як за дзесяць год. Цяпер вайна з бальшавікамі немагчыма...
Божа мой! Празь дзесяць гадоў! Хто ж гэта вытрывае!
А тымчасам усюды і ўсе гаварылі пра вайну. Розныя палітрукі, упраўдомы на сходах, п'яныя камандзеры — усе гаварылі аб немінучай вайне. Усе бальшавіцкія агенты пагражалі кулаком у бок Нямеччыны і, не скрываючыся, казалі, што вось–вось пачнецца вайна. І гэткія змораныя, як я, людзі жылі толькі гэтай надзеяй. Бо бяз гэтай надзеі жыцьцё было б неўмагату, і калі часам у часіны пэсымізму гэтая надзея слабела, дык сілаў ужо не было далей хавацца, сілаў да жыцьця не было і ўжо чалавек хацеў выйсьці з падпольля і дабраахвотна аддацца у рукі бальшавікоў: каб хутчэй ужо быў канец... Але людзі ўпорыста шапталі: будзе хутка вайна — і гэтай надзеяй падтрымоўвалі сябе...

* * *

Было нас у Вільні трох салаўчан, гэта значыць людзей, якія былі на салавецкай катарзе і пасьля такім ці іншым чынам вызваліліся зь яе. Др. Ф. П., я і К. С. Апошні ўладзіўся за

тэхніка і працаваў 60 кілём. ад Вільні ў мястэчку А. пры пабудове мосту. Першы зь іх адразу, як прыйшлі бальшавікі, прапаў недзе. Як я пасьля даведаўся, уцякаў праз граніцу, там злавілі яго бальшавікі і пасадзілі ў астрог. Апошні з нашай тройкі абяцаў мне, што, як толькі будзе ваканс, уладзіць мяне за вартаўніка пры мосьце... Адзін раз, заглянуўшы ў сваю хату, я даведаўся, што К.С. быў у мяне зь весткай, што ваканс вольны, што сяньня трэба ехаць. Да адыходу цягніка ўжо заставалася мала часу. Я ўсхапіўся і пабег на вакзал. Пасьпеў. Уздыхнуў з палёгкай, седзячы ў вагоне і пакідаючы Вільню, дзе зямля ў мяне пад нагамі гарэла. Там, у мястэчку А., будзе шмат бясьпечней. І я не памыліўся.

**Спакойнае месца**

На беразе рэчкі Мэрэчанкі, два кілёмэтры ад мястэчка А., будавалі мост. Ужо другі год цягнуліся работы, а канца не было відаць. Былі дошкі, дык цьвікоў не хапала, былі цьвікі, дык іншага матар'ялу не было. Адным словам, усё ішло па–бальшавіцку. Вось пры гэтым мосьце я быў назначаны за вартаўніка. Пры мосьце была будка, дзе перахоўваліся інструмэнты: пілы, сякеры ды інш. Тутака, у гэтай будцы жыў, абеды варыў на вогнішчы перад будкай. Нідзе ня трэ было заяўляцца, толькі трэба было запісацца ў прафсаюз. Я пайшоў з гэтай мэтай у мястэчка і там зарэгістраваўся ў прафсаюзе як работнік зь дзеда–прадзеда і атрымаў прафсаюзную кніжку. Жылося ціха, спакойна, бясклопатна, а галоўная рэч — бясьпечна. Ніхто тут мяне ня ведаў, нікога са знаёмых я тут не спаткаю, ніхто тут не здагадаецца, хто я.

Быў ужо месяц травень. Ужо было цёпла. Можна было ўжо купацца. Блізка быў лес. Пасьля трывожных віленскіх перажываньняў тут я адчуваў сябе, як на летнім адпачынку. Працы не было ніякай. Раніцай трэ было выдаць работнікам інструмэнты, а пасьля — сядзі сабе з папяроскай на сонцы і раскошуйся жыцьцём.

Было нас трох вартаўнікоў на зьмену, кажны меў па восем гадзінаў дыжурства. Яны не цікавіліся шмат маёй асобай, глядзелі на мяне як на свайго таварыша, ні аб чым не распытваючы. Мой вонкавы выгляд зусім адпавядаў майму становішчу. Сядзеў я босы, вопратка на мне была падзёртая, латаная, дый усёй вопраткі на мне ў гэту летнюю гарачыню

былі толькі порткі ды кашуля... Калі хто ішоў ці ехаў каля маёй будкі, — не зьвяртаў на мяне ўвагі. Але вось раз затрымаліся каля мяне нейкія два праходзячыя інжынэры, каб прыкурыць папяросу. Пачалі гутарку.
— Вы тут хто гэткі?
— Я вартаўнік.
— Гм... Так... Цяпер усе... “былыя людзі” ў вартаўнікі пайшлі — заўважыў адзін з іх.
Гэтая гутарка вялася пры адным з работнікаў, што сядзеў пры мяне. Той глянуў на мяне падазрона. Пасьля, як пайшлі незнаёмыя, пытаецца:
— Яны вас ведаюць?
— Не. Першы раз бачу.
— А чаму ж яны гэта?...
Больш не сказаў нічога.
І запраўды я гэтых людзей першы раз бачыў. Хто яны: ворагі ці прыяцелі? — я дагэтуль ня ведаю. Але іхная гутарка была неасьцярожная.

**Што далей?**
Ня раз у галаву прыходзіла думка: а што рабіць, як мост ужо будзе закончаны? Бо ж нават пры бальшавіцкіх тэмпах працы мост у рэшце рэштаў калісь будзе збудаваны. А тады зноў шукаць з дня ў дзень новага начлегу ў Вільні, хавацца, як загнаны зьвер, і жыць у вечным страху і небясьпецы?
Тэхнік, мой салавецкі камрат, пацяшаў мяне, што ўладзіць мяне на зіму работнікам на дарозе. Але для гэтага патрэбны фізычныя сілы і трэба будзе жыць у вёсцы, значыцца, сярод людзей...

**22 чырвеня**
Быў цёплы сонечны дзень. Я сядзеў перад сваёй будкай і варыў на вогнішчы сьнеданьне. Глянуўшы на дарогу, я ўбачыў аднаго з маіх таварышоў–старажоў, які ішоў да мяне. На зьмену — яшчэ рана. Сяньня нядзеля. Мусіць выйшаў прагуляцца.
— Добры дзень!
— Добры дзень!
— Чулі?
— Што?
— Вайна.

— Ха–ха–ха! Жартачкі. У нас заўсёды гэткія незвычайныя навіны.
— Сяньня Молатаў гаварыў па радыё... Вайна!..
— Вы чулі?
— Не, я ня чуў, але мне сказаў чалавек, які чуў.
— Вось заўсёды гэтак: я ня чуў, але нехта чуў... калі вы самі ня чулі, дык і не кажэце...
— Калі ўсе ў мястэчку кажуць.
— Брахня. Ерунда. Ня веру.
Селі. Закурылі. Да нас падыйшоў работнік з суседняй фабрыкі, якая стаяла за мястэчкам, непадалёк ад майго маста. Ізноў:
— Добры дзень!
— Чулі?
— Аб чым? Аб вайне?
— Але.
— Не паверу...
Па дарозе з боку мястэчка паказаўся нейкі вэлясыпэдысты. Відаць было, як моцна націскаў пэдалі, сьпяшаючыся. Едзе ў кірунку маста, хоць дарогі праз мост няма, бо яшчэ нават падлога не пакладзена. Чаго яму сьпяшацца ў гэты цёплы, сьвяточны дзень? Куды імкнецца гэты спацелы, чырвоны, змораны вэлясыпэдысты? Параўнаўшыся з намі, саскочыў са сваёй машыны. Гэта быў нейкі малады жыдок, якога я першы раз у жыцьці бачыў.
— Хто тут стораж?
— Я! — адказваю, падняўшыся са свайго мейсца і падыходзячы яму на спатканьне.
— Ві стораж? Ві стойте на этот мост, не адхадіте, чтоб чаго тут не падлажылі... На вашу ответственнасть эты мост...
— Слушаю–с.
Незнаёмы жыдок сеў на сваю машыну і паехаў назад, гэтак сама сьпяшаючыся, як раней.

*

Цяпер мне стала ясна. Цяпер я паверыў. З радасьці я нават забыўся спытацца жыдка, хто ён і ад імя каго дае мне загад. Ці ня ўсё роўна? Самае важнае — вайна! Канец маіх мукаў, канец бадзячага жыцьця, я буду магчы вярнуцца ў сваю хату і жыць як чалавек. Ужо чырвоная нечысьць не дасягне мяне.

**Першыя “ластаўкі”**

Паявіліся на небе самалёты. Гэта былі нямецкія самалёты! Зь якой радасьцяй я ім прыглядаўся! Неўзабаве пачуліся гукі выбухаў. Гэта было для мяне найпрыгажэйшай мэлёдыяй, якую я чуў у сваім жыцьці...

У мястэчку было шмат жыдоў. Хутка мой лес за мостам пачаў напаўняцца жыдамі. Зь пярынамі, падушкамі, клункамі беглі яны ў лясны гушчар, каб схавацца ад выбухаў бомбаў. Я таксама пацягнуўся ў лес, дзе чакаў, што далей з гэтага будзе. Да мяне падыходзіць нейкі жыд. Закурваем папяросы. Гутарым.

— А я вас, здаецца, ведаю, — кажа раптам незнаёмы. — Мы з вамі спатыкаліся ў Вільні ў рэдакцыі. Вы — Монвід? Праўда?

Мурашкі прабеглі па маёй сьпіне.

— Вы памыляецеся, — кажу, — гэта мусіць нехта падобны да мяне. Часта мяне спутваюць зь некім... Я ня Монвід.

— Са мной можаце сьмела гутарыць. Аднак я ведаю, што вы Монвід.

У паветры лёталі нямецкія самалёты, але на зямлі яшчэ былі бальшавікі. Факт, што мяне пазналі, зусім мяне абяскуражыў.

**Бальшавікі ўцякаюць**

Нехта казаў, што адзін з бальшавіцкіх камандзераў заявіў насельніцтву, што ў мястэчку будуць жорсткія баі, што бальшавікі думаюць заядла бараніцца. Дык няхай лепш насельніцтва пакіне свае хаты.

І вось цягнуцца вазы, наладаваныя ўсячынай. На кучы клункаў сядзяць дзеці, жанчыны. Мужчыны ідуць побач, падганяюць каня, папраўляюць зьвіслыя з возу манаткі. Усе пруцца ў лес, каб схавацца ў гушчары. Рэчку можна перайсьці ўброд. Цяпер, у канцы чырвеня, вада даходзіць людзям да калена. Людзі і вазы імкнуцца праз рэчку на другі бок, каб далей ад мястэчка, каб глыбей у лес.

Аднак, да бітвы не дайшло. Бальшавікі ўцякаюць. Ужо на другі дзень раніцай праходзяць апошнія аддзелы. На дарозе застаюцца паламаныя вазы, папсаваныя машыны, стрэльбы, газавыя маскі. Недзе скубе траву пакінуты асядланы конь. Празь лясны гушчар прабіраецца нейкі невялічкі аддзел, чалавек мо з трыццаць. Заселі між кустамі. Але зусім ня маюць баявога выгляду. Адзін кідае на зямлю свой шлём, які яму гняце галаву. Іншы, каб пазбыцца лішняга багажу, адшпільвае

скрынку з газавай маскай. Не чуваць гутаркі. Няма аб чым казаць. Ува ўсіх у галаве адна думка... Гэта тыя, якія, чакаючы, пакуль праваліцца хваля ўцякаўшага войска, думаюць аддацца ў палон. Прытуліўшыся да сваіх вазоў, мястэчкавыя людзі з трывогай паглядаюць на гэтую маўклівую вайсковую групу, ня ведаючы аб ейных плянах...

**На другі дзень**
У панядзелак пад вечар зь мястэчка далятае гудзеньне мотораў, грымота зялезных машынаў. Па пясчаных дарогах пасоўваецца авангарда нямецкага войска. З трэскам мотораў імкнуцца матацыклістыя, выпераджаючы цяжкія, засеўшыя ў пяску машыны. Жаўнеры ў шэрых запыленых шынэлях, пот плыве па твары, мяшаючыся з пылам...

*недапісана*
*Францішак Аляхновіч быў забіты невядомым ва ўласнай кватэры 03.03.1944.*

***Лёс беларуса***
Усё сваё жыцьцё ён трымаўся думкі, гэткага нязьменнага правіла, якому ня надта ўтульна ў беларускіх сюжэтах: „Я не палітык, я — культурнік, я — тэатральны работнік“. А жыцьцё сваёй чаргою насьміхалася з правіла ды даравала яму ўсялякіх нягод.
У новай беларускай літаратуры Францішак Аляхновіч быў тады, на заранку нашага стагодзьдзя, адным з нешматлікіх людзей места. Ён нарадзіўся на год пазьней за Купалу й Коласа ў Вільні. У пяць гадоў сваіх ён ужо ведаў тэатар — і з маленства застаўся ў тэатры. Варшаўская драматычная школа, віленская журналістыка, жаніцьба, а тады й знаёмства зь беларускім рухам. У 1910–ым разам з Ігнатам Буйніцкім, Алесем Бурбісам і Леапольдам Родзевічам ён ужо рупіцца пра беларускі тэатар: рэжысэруе публічны спэктакль і грае ў ім адну з роляў.
І вось абрынаюцца перасьледы: прыходзіць позва ў суд за „крамольны“ артыкул у гумарыстычным тыднёвіку „Perkunas“. Аляхновіч едзе зь Вільні — на тры гады ў Галічыну, акторам у

польскіх правінцыйных трупах. У 1913–ым палітычная амністыя дазваляе вяртацца дадому. Жонкі ён не засьпявае, выяўляецца, што й ня ўсе вінавачаньні паздыманыя — суд дае яму год астрогу. „Сяджу — і пачынаю пісаць, — прыпамінаў пазьней Аляхновіч. — Віленскія Лукішкі... былі імпульсам да мае літаратурнае працы“. Ён піша першую п’есу „На Антокалі“, спачатку польскаю мовай, пасьля перастварае па беларуску. Пры канцы 1916-га п’еса пастаўленая на віленскай сцэне — Аляхновіч зазнае першае ўдачы й піша далей...

Усё, што ў ім намножылася да 33 гадоў, імкліва ўвасабляецца ў п’есах: камэдыі, драмы, фарсы, мэлядрамы йдуць адна за адной. Аляхновічавы партыі становяцца асноўнымі ў беларускім тэатры новага часу. Ён піша дынамічна й інтрыгоўна, таленавіта рэжысэруе й грае — у Вільні і ў Менску. Ён жэніцца другога разу — неспакой ваеннае пары кідае яго паміж абедзьвюма сталіцамі. Нарэшце ў Менску асталёўваюцца бальшавікі, і зь сярэдзіны 1920-га ён затрымліваецца ў Вільні — раскручвае вір тэатральнага жыцьця, закладае з калегамі Таварыства беларускае школы, рэдагуе тыднёвік „Беларускі звон“. А ў 1924-ым у сьвет выходзіць яго навуковая праца — „Беларускі тэатар“ — упершыню агляд тэатральнае нашае гісторыі ад старажытнасьці да новых дзён. Калі налета, у 1925–ым, Аляхновіч выпусьціў драму „Дрыгва“ — сямнаццатую за 10 год творчае працы — ніхто не дапускаў, што наступную п’есу ён напіша толькі праз 17 гадоў.

Увосень 1926-га яго запрасілі на менскую Акадэмічную канфэрэнцыю па рэформе правапісу й азбукі. Ехаў ён туды „бацькам беларускае драматургіі“. Пабыў у Менску ў Першым Беларускім дзяржаўным тэатры — і захапіўся. Калі запрашалі на адкрыцьцё БДТ–2 у Віцебск, ужо схіляўся застацца на жыцьцё ў ССРБ. Нават сустрэўся з гэтае нагоды з наркамам асьветы Баліцкім, але той, празарлівец, ня раіў заставацца — за фасадам тэатральнага ўзьлёту ў Савецкай Беларусі зеўрала крывавая сапраўднасьць. Аляхновіч яе ня ўбачыў, бадай, не пасьпеў убачыць: як госьць з–за заходняе мяжы ён дапускаўся адно на сьвяты. Сьвяточны стол, аднак, без адвалокі перамянілі яму на сталую прапіску там, дзе, як напіша ён пазьней, „чырвоная нечысьць будуе новы сьвет“.

Яго арыштавалі на чацьверты дзень пасьля атрыманьня ім савецкага грамадзянства — 1 студзеня 1927 году. Якуб Колас і

Язэп Лёсік зьбіралі подпісы ў абарону. Не памагло: маскоўская калегія ГПУ засудзіла Аляхновіча завочна на 10 год салавецкіх лягераў. Сьпярша быў год на востраве Мяч насупраць карэльскага мястэчка Колежма, ну а затым — Салаўкі. Вязьні стварылі там свой самадзейны тэатар — Аляхновіч хоць як мог, на далёкай чужыне, у найбрыдчэйшых умовах, але мог заставацца ў тэатры...

Выбаўленьне прыйшло ў 1933–ім — яго мянялі на Браніслава Тарашкевіча, тады польскага палітычнага вязьня, які йшоў у савецкае жыцьцё з надзеяй — ішоў на сваю загубу. Яны сустрэліся на памежным мастку — парукаліся, коратка перамовіліся і ўсё: для Аляхновіча гэта быў канец няволі. Тае няволі, дзе пытаньне „За што?“ выглядала марнаю марнасьцю. Вярнуўшыся, ён заўзята верыў, што такога больш як раз у жыцьці не бывае. У вечар пасьля вызваленьня ён сядзеў у шынку ў Стоўпцах і еў мясную вячэру. Еў праўдзівы валовы біфштэкс. З цыбуляй! З бульбай! Зь белым хлебам! Еў пасьля шматгадовае галадоўлі. А затым, уначы, яму сьніліся бальшавікі. Тады, у 33-ім, яго й іх разьдзяляла польска–савецкая мяжа.

Аляхновіч вярнуўся ў сваю Вільню. Жонка яго не чакала — другі раз разьбілася ягоная сям'я. Ён разумеў, што мусіць пасьведчыць аб перажытым. Кніга ўспамінаў „У капцюрох ГПУ“ выйшла ў 1935—37–ым на сямі мовах. У пару шалёнага разгулу чырвонае стыхіі гэтае дакумэнтальнае слова несла на сьвет цэлы праўду пра злачынствы ў краіне Саветаў. Бальшавіцкая агентура, цяпер ужо ў Вільні, не магла дараваць. ГПУ ня дрэмле. З Аляхновіча спрабуюць зрабіць у масавай сьвядомасьці сьпярша агента ГПУ, пасьля агента дэфэнзывы. „Нейкая блытаніна, хаос, сьмех“, — так успомніць пазьней тыя звыродлівыя спробы сам Аляхновіч. Сьмяяцца, аднак, не выпадала ў 1940–ым — мяжы для савецкае навалы больш не было. Улетку 40–га ён убачыў на вуліцах Вільні савецкія танкі. Ілюзіяў не засталося — ён ратаваўся як мог. Унікаючы расправы, уцякаў, блытаўся ў Вільні па знаёмых, штоноч у кагосьці іншага, пасьля маскаваўся — на падвіленскай будоўлі, пусьціўшы бараду, увесь у зрэб'і. Што далей? — дзень у дзень у страху й небясьпецы. Бальшавіцкі малёх высіляў дарэшты. І кожная патэнцыйная перамена чакалася як шанец — проста выжыць. Перамену прынесла нямецкая армада. „Самае важнае

— вайна! — Аляхновіч даваў волю эмоцыям. — Канец маіх мукаў, канец бадзячага жыцьця, я буду магчы вярнуцца ў сваю хату і жыць як чалавек“. Дома яго чакала жонка — у перадваенную шчэ пару ён трэйцяга разу жаніўся.
Падступная інтрыга жыцьця — прыход немцаў, чарговых нам акупантаў, станавіўся для яго збаўчым. Ці, праўдзівей, дазваляў перавесьці дыханьне. Навокал ужо дзеялі правілы новае чужое гульні, таксама на сьмерць. Наступная пастка ў непераборлівым часе. Ніхто ня ведаў, ці надоўга — было звычайнае для меншага з бакоў жаданьне не прапасьці. Аляхновіч бараніў беларусаў — як і заўжды ў сваім жыцьці, загнаны ў рамкі, накінутыя мацнейшым. Ён рэдагаваў тыднёвік „Bielaruski holas“, вярнуўся да драматургіі. У 43-ім выйшла яго новая камэдыя–батлейка, фантастычна–рэалістычны гратэск „Круці не круці — трэба памярці“. Таго ж году яму споўнілася шэсьцьдзесят: беларуская грамадзкасьць ушаноўвала юбіляра. У Маскве карэктавалі сьпіс асобаў, якіх належала зьнішчаць у першую чаргу. Быў там Францішак Аляхновіч.
Ён пасьпеў шчэ пасьведчыць пра перадваенныя туляньні — з пачатку 1944-га яго ўспаміны „Страшны год“ друкаваў часопіс „Новы шлях“. Успаміны, ня вольныя ад знакаў часу, абарваліся на слове. З сакавіка ўвечары ў дзьверы віленскай кватэры Аляхновіча пазванілі. Не дапісаўшы сказа „Страшнага году“, гаспадар пайшоў адчыняць. Было двух візытантаў. Зайшлі. Аляхновіч павёў неспадзяваных гасьцёў у свой габінэт. Пэўны час ішла спакойная размова. Каля восьмае гадзіны выбухнуў стрэл...
Яго хавалі на кальвінісцкім могільніку ў цэнтры Вільні. Хавалі, як вялікага беларуса, які загінуў ад бандыцкае кулі. „Чым быў Мальер для Францыі, тым Аляхновіч для Беларусі“, — пісаў пасьля пісьменьнікавай сьмерці беларускі крытык.
*Юрась Бушлякоў*

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]
Вайна ў ARCHE 2(3)-1999 · [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 9-05-2000**

[image]
[image] Vajna ъ 2(3)-1999 .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

da Џmiestu 2(3)-1999

*poiymia*

# Miensk siacnia

**Tekst nieviadomaha aъtara, padpisany kryptonimam X. Na dumku redakcyji ARCHE, aъtaram tekstu moh byж Franciљak Alachnoviи. Tekst byъ nadrukavany ъ 1943 h. u vilenskim tydnioviku “Bieiaruski hoias”, љto vydavaъsia iacinkaj. My dazvolili sabie џmianiж aryhinalny padziei na abzacy z uvahi na иasopisny farmat i skaraciж adnu z иastak artykuiu.**

**Na vulicy**

— Jak prajњci na Zacharaъskuju vulicu? — pytajusia ъ pradavaъљaj machorku pierad vakzaiam dziaъиynki.
Jana chvilinu dumaje, prypaminaje, pањla kaħa:
— Nie, takoj vulicy nia znaju.
Aha! Dyk ħa balљaviki pierajnaиyli. Daъniejљaja „Zacharaъskaja“ paиaia nazyvacca „Savieckaj“.
— A dzie Savieckaja vulica? — pytajusia iznoъ.
— A! Savieckaja — tut niedaloka: projdzie prosta i pањla pavierniecca naprava...
Niama dziva, љto maiadoje pakalecnie nia viedaje starych nazovaъ vulicaъ. Hetych nazovaъ jano ъħo nia иuia. Maia taho. Jano nia viedaia i nia иuia ab spakojnym ħyжci za mieħami Savieckaha Sajuzu, dzie nie byio иarhi pierad spaħyvieckimi kramami, dzie nie byio teroru, stachanaъљиyny, udarnictva i ъsich inљych vynachodak, jakija mieli na mecie zrabiж z иaiavieka niavolnika.
Na Savieckaj — Zacharaъskaj vui. trudna prajњci na druhi bok.

Doъhaja иarha hruzavikoъ, lohkich aъtamabilaъ i inљ. maљynaъ biazupynna jeduж z uschodu na zachad, z zachadu na ъschod. Idu pa vui. Rahniedy ъ redakcyju „Bieiaruskaje hazety“.

**Niespadziavanaja znachodka**

Paњla abiedziennaha pieraryvu my iznoъ sabralisia ъ kabinecie redaktara. Praъdu kaћuиy, hety malenieиki pakojиyk maia padobny na redaktarski kabinet. Heta ablubavany redakcyjny pakoj. Tut usie ц҃bilisia ъ kuиu. Tut i Kazioъski, i Adamoviи, i Arsiecnieva. Tut usiaki, chto choиa, prychodzie, vitajecca, siadaje, kuryж, havora. Vietiyja haspadary nikoli nikomu nia skaћuж: „Vybaиajcie, vy nam pieraљkadћajecie, prydzicie inљym razam“... A hoњsi mabyж nieraz љmat im pieraљkadћajuж. Bo voњ Adamoviи siadziж ц҃ piarom u ruce, papraъlaje aъtarski rukapis, pobaи Arsiecnieva pierahladaje tvory niejkaha maiadoha vierљaroba.

Rabota nie idzie hiadka. Prychodziж viestka z drukarni, љto linatypisty spaц҃niajucca z naboram, to papsavaiasia niejkaja maљyna, to zahareiasia niedzie raц҃litaja benzyna, to niechta zaљmat vypiъ samahonki... Hetak pracujuж byiyja ъdarniki i stachanaъcy. A jak na zioњж — drukarnia daloka, na druhim kancy horadu. Kab tam parańsi i pahladzieж, љto robicca, treba љmat иasu patraciж...

Adzin z supracoъnikaъ „Bieiaruskaj hazety“, S–ak ц҃viartajecca da red. Adamoviиa:

— Spadar redaktar! Dajcie mnie piaro, majo nia piљa...

— Zaraz. Adamoviи vyciahvaje љufladu, i ja иuju jaho kryk:

— Joњж!!! Uciakajcie!..

Usie vyskaиyli ъ kalidor.

Ja hladzieъ ц҃ dzivam na hetu scenu: mabyж heta niejkija ћarty.

— Иaho siadziљ? Uciakaj! Mina! — paиuъ ja kryk z kalidoru.

Ciapier tolki ъ mianie praњviatleia ъ haiavie. Ja hlanuъ u adsunutuju љufladu: tam laћaia nievialiиkaja skrynka, na jakoj zialonym aiavikom byio napisana:

[image]

Ja kinuъsia za inљymi ъ kalidor.

**Achviara**

Pasiali pa palicyju. Ц́javilisia maiadyja chiopcy. Adzin ц́ ich ћmieia vyciahnuъ љufladu i zaprapanavaъ:
— Nu, ciapier vyjmajcie svaje papiery.
Pad minaj laћaъ raman niejkaha niaviedamaha aътara.
— Nie! Nie! Nu ich da иorta hetyja papiery! Niasiecie von usio heta! — byъ adkaz.
Palicyjant, uћmichnuъљysia, panios љufladu razam ц́ nienadrukavanym ramanam.
My viarnulisia ъ „redaktarski kabinet“ i byli vielmi ъdziaиny S–ku, љto jon hetak uparu ц́viarnuъsia da redaktara z proћbaj daж jamu piaro. Raptam my paиuli niedzie niedaloka silny huk. Heta maвуж uћo razarvaiasia „naљa“ bomba.
— A љto! Dobry dla nas byъ narychtavany paиastunak! — skazaъ niechta.
U hety иas uvachodziж u redakcyju K. Kaћa:
— Ciapier na pioљiu bomba razarvaia иaiavieka...
Naљ sympatyиny palicyjant uћo nie ћyvie. Jaho proц́viљиa: Janиeъski Ћsciapan. Maiady chiapiec: 23 hady. Ja vyskaиuъ na vulicu. Na miescy katastrofy ъћo zastaiasia tolki kroъ, jakuju ludzi zasypali piaskom, padmiatajuiu pioљiu. Kroъ pahibљaha maiadoha Janиeъskaha, jaki z uћmieљkaj na vusnach nios bombu, kab kinuж jaje ъ niedalokija ruiny. Jaљие 2–3 minuty — i ъsio skoniиyiasia b љianљliva; Janиeъski byъ by ћyvy. A kali b red. Adamoviи na 2–3 minuty paц́niej adsunuъ svaje љufiiady — my ъsie ъ redakcyi — 5 asobaъ — byli b zabityja. Paљancavaia...
U hetakich umovach pracujuж u „Bieiaruskaj hazecie“ ъ Miensku.

**Na rynku**

— Kamu machorka? Kamu machorka?
— Kamu „viesta“? Kamu „viesta“?
— Hraћdanin! Moћiet kupitie palto?
— Valenki! Kamu valenki?
— Kamu haioљu? Kamu?...
Taъkatnia, љum, homan. Natoър ludzki karoљusca na nievialiиkaj pioљiu Suraskaha abo Иerviecskaha rynku, kuplajuiu, pradajuiu, љukajuiu patrebnych dla siabie reиaъ. Ћlapaja ћabraика piaje ab prychodzie Antychrysta. „Pa ъiunkach jahonych paznajecie jaho...“. Traskuiu hoias ћlapoj baby zahiuљaje prapazyki kupli valenak, machorki, „viesty“... Na љnurku visiж na jaje hrudzioch

blaљanka. Иas ad иasu niechta kidaje ъ blaљanku drobnyja manety.

**U staioъcy**
U adnej hramadzkaj staioъcy idzie hutarka na temu bieiarusizacyi. Haspadynia zvaraиajecca da haњsiej:
— Vot vy ъsie utvierћdajetie, љto my piocho hovorim po–bieiaruski. A vot ja siyљu, љto i vy niepravilno hovoritie, upotrieblajetie rusicizmy...
— Nu, naprykiad?
— Vot vy postojanno hovoritie: „pokrysie“...
— Nu, a jak?..
— Pa–bieiarusku nuћno hovorit’ nie „po krysie“, a „po pacuku“... Krysa vied’ eto nie bieiaruskaje siovo...
*X.*

---



---

E-mail redakcyji: **analityka@yahoo.com** Web-majstar Maksim Kapran: **mk**
**Иakajem vaљych mejlaъ z pytacniami abo kamentarami nakont hetaha sajtu.**
Copyright © 1999 ARCHE "Раиatak" magazine
**Apoљniaje abnaъliecnie: 10-05-2000**

[image]
Вайна ў 2(3)-1999 .
[image]
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 2(3)-1999
*слоўнік паняцьцяў*

# Вячаслаў Адамчык Леанарда Недапісаная навэля

**Вячаслаў Адамчык — майстар “заходнебеларускай прозы”. Аўтар эпічнай тэтралёгіі “Чужая бацькаўшчына” (1976), сцэнароў да дакумэнтальных фільмаў пра Мележа, Таўлая, Якуба Коласа. Ягоныя сыны таксама сталі пісьменьнікамі: яны друкуюцца пад псэўданімамі Адам Глёбус і Міраслаў Шайбак. Жыў на адной пляцоўцы з Уладзімерам Караткевічам. У 1998 годзе выйшла ягоная кніга “Развітальная аповесць” (“Мастацкая літаратура”), складзеная зь дзёньнікаў і прозы.**

Іх было пяцёра, сьмярдзючых ад тытуню і самагоннага перагару дужых мужчын, на яе адну, кволую, як падлетак, зь вялікімі перапалоханымі вачыма маладую настаўніцу. Навучыцельку, як казалі яшчэ на польскі лад тутэйшыя людзі. Страціўшы мужа — няхай крые Бог, яны пражылі разам усяго толькі месяц — і баючыся ўжо сама арышту, яна пры намове і помачы добрых людзей уцякла з гораду сюды, у прылясную вёску. Не спадзявалася, вядома, што і тут няма зацішку: партызаны разьбілі ўправу і застрэлілі інжынэра–дарожніка, што ўладкаваўся быў на працу дырэктарам тутэйшай пачатковай школкі.
Як ня ведала, што яны ўжо напытвалі і пра яе.

І вось яны, апранутыя хто як — у напалову вайсковае, у напалову цывільнае — але ўсе падпаясаныя шырокімі рамянямі, стаялі ў пройме асьвечаных малочнай поўняю дзьвярэй. І ўсе з ружжамі. Хоць не. Той, што насуплена пазіраў з–пад круглай фуражкі зь нізкай туліяй, уздымаў руку, зашчаміўшы ў ёй востradзюбы пісталет.
Яна і не адсунула б дзьвярэй, каб яе не абхітрыў знарок падасланы імі ціхі, сарамяжы Ільля — школьны вартаўнік. Савецкі бяжанец, як казалі на яго, прыбіўся сюды, у Косічы, зь Беластоку, дзе ён быў на практыцы — устанаўліваў у клюбе кінапраектар. Аглушаны, як і ўсе, першымі выбухамі бомбаў, першымі сполахамі пажару і першым, ніколі ня чутым стогнам і енкам параненых, ён сарваў з экрану шоўкавае палатно, запхнуў яго за пазуху і ўліўся ў паток бежанцаў. Ён уцякаў на ўсход, у Расію.
Але за Слонімам яго дагналі нямецкія танкі, а палатно, якое ён адрэзамі мяняў на харчы, таксама скончылася. Дайшоўшы да Косічаў, Ільля застаўся тут сьпярша парабкам, а потым, як адчынілася школка, перайшоў у яе вартаўніком, а заадное і прыбіральшчыкам.
Яна і паддалася на падман, калі гэты самы Ільля, асьцярожна пастукаўшы ў шыбу, ціхавата, з хітрай лісьлівасьцю папрасіў:
— Откройте, дело есть.

Накінуўшы лёгкі халацік, яна падышла да дзьвярэй.
Думалася пра ўсё благое — пажар, сьмерць, — толькі не пра тое, што ў яго за сьпінаю будуць стаяць яшчэ пяцёра, а ў пройму прыадчыненых дзьвярэй уткнецца руля вінтоўкі, каб ужо іх зачыніць яна не магла.
— Окошко занавесь и огонёк зажги, — загадаў той, што ў шчыліну між вушаком і дзьвярмі ўсадзіў вінтоўку і халоднаю руляю, што запахла нейкім мазутам і гарам, адапхнуў яе на сярэдзіну вузкай бакоўкі.
Яна зьняла з ложку лёгкае, пашытае з лапічкаў–ласкутоў коўдра, завесіла акно і тады ўжо на стале каля газоўкі пачала шукаць запалкі — малюсенькі карабок нямецкіх, кардонных зь вялікімі шыпучымі галоўкамі, што нядаўна купіла ў горадзе. Шыпучая запалка высьвеціла стол, стосік вучнёўскіх сшыткаў на ім, чарніліцу–невылівашку з драўлянаю разьбянаю ручкаю і пухірок газоўкі. А касьнічок дымнаватага агню, што захістаўся

на газоўцы ад скразьняку, бо дзьверы яшчэ не зачынілі, іх усіх — найперш іхныя чырвоныя ад перапою, адутлаватыя твары, а потым і чорныя рулі вінтовак, што былі ў іх за плячыма.
Ільля баязьліва таптаўся за імі ў парозе.
— Так вот какая ты, немецкая шлюха, — азваўся нарэшце той, што шчыміў у руцэ пісталет.
Пэўна старшы над імі. Акрамя пісталету, пра гэта сьведчыла і яго нягеглая, ужо добра паношаная фуражка на нізкай тулііі. У немцаў фуражкі седлаватыя, ганарыста задзёртыя, а гэтую нібы хто прыпляскаў на галаве.
— Да, ничавось птичка, — рагатнуў другі, мурлаты, у цывільнай кепцы і суконным, вясковае работы фрэнчы.
— Ну что же, ребята, крылышки мы ей почистим, — азірнуўся і сказаў сабе за плячо той, што ў фуражцы.
І маладая, падобная да дзяўчаці–падлетка настаўніца схаладзела душою. З жахам успомнілася ўжо тое, што тыдзень таму ёй сказала рупная, занепакоеная гаспадыня, у хаце якой яна і зьняла гэтую бакоўку з адным венскім акном і асобным ходам.
— Ой, дзяўча, ня ўпору ты прыехала. Спакою нямашука ў нас. Наўкруга лес, а ў ім ужо разьвяліся і віжуюць парцізанты. Яны, перадзеўшыся ў нямецкае, нават удзень прышлі і заарыштавалі Аўсяніка, што да цябе рабіў у нашай школе. І няхай сьцеражэ Бог, каб да цябе чаго ня мелі.
— Ці ёсьць у іх інтэрас да мяне?
— Гэ, дзеткі, — усьміхнулася гаспадыня, нейкім трохі касаватым вокам, агледзеўшы кватарантку, — цяпер бойся кожнага. Вайна. Ніхто ні на каго не зважае. Абы што, так за ружжа і хватаюцца. — І ўскінула абедзьве рукі, нібы адмахнулася ад сваіх слоў. — Во галава! Я ж не спытала, як жа зваць цябе?
— Леанарда. Баброўская Леанарда.
— Во моднае імя. Але ж ці дзіва — навучыцелька.
— Чаму ж моднае?
— Ня чула я.
— Тады кажэце проста — Лявонка.
— Во гэта іншая рэч, — гаспадыня паглядзела зноў гэтым сваім касаватым вокам.
— А як жа вас вялічаць? — спытала ўжо яна, кватарантка–навучыцелька.

— Ужо зь мяне такая вялікасьць, — нібы засаромелася і адвярнула галаву гаспадыня. — Ёўда я.
— Во і я першы раз чую такое імя, — задрыжалі ад сьмеху пухкія губкі ў валавокай, прыгожай з твару кватаранткі.
— Яно палескае. А па–тутэйшаму — Аўдоця.
Мой нябожчык Іванка, калі рабіў за Польшчаю на чыгунцы, знайшоў мяне ажно за Ганцавічамі і прывёз сюды, у Косічы. Во як было...
Цётка Ёўда, накульгваючы на левую нагу і нібы трохі перавальваючыся на левы бок, падышла да дзьвярэй, узялася за клямку, але не адчыніла:
— Я кажу — было. Немцы неяк стараною прайшлі ад нас. Толькі потым, ужо ўсьледа за хронтам тут на хутарох савецкіх байцоў выпорвалі. А з гэтай восені ўсё пагоршала. Ужо адныя за аднымі палююць: парцізанты за паліцыянтамі, паліцыянты за парцізантамі. Сьвет калоціцца, як на верацяне...

І вось іх пяцёра, першы раз убачаных, стаяць і цяжка, як загнаныя дыхавічныя коні, сапуць перад ёю, адзінокаю і бездапаможнаю маладзіцаю. Што ж рабіць ёй, як бараніцца ад іх, неразважных, п'яных і агідных?
— Ну, рассказывай, — ня ўстояў на нагах і пахіснуўся на яе той, што трымаў у руцэ сінявата–чорны пісталет.
— Што вам расказваць?
— А с каким заданием фашисты подослали тебя.
— Ніхто мяне нікуды не падсылаў, — сказала ўжо цьвёрда, спадзеючыся яшчэ, што тут выйшла нейкая абмылка. — Я прыехала сама. Уцякала ад нямецкай жандармэрыі, што застрэліла майго мужа.
— Да–да, от имени жандармерии открывать фашистские школы.
— Школа ў нас беларуская.
— Ха–ха, — зарагатаў мурлаты ў пляскатай кепачцы і ў суконным вясковым фрэнчы. — Школа с портретом Гитлера на стенке.
— Дзяцей трэба вучыць.
— Конешно, на немецкий лад.
Ім, мусіць, нічога не дакажаш. Яны настроіліся на адно: забіць ці згвалціць яе. Няўжо той кажан, рыжавата–сухі, як кажурынка, з сабачай мордачкай, што зачапіўся раніцаю за

лату над парогам, прынёс бяду. Леанарда, баючыся яго чапіць, паклікала тады гаспадыню.
Трымаючы, як у муфце, рукі пад шарым фартухом, старая падышла да парога, прыскаліла адно вока і, паказваючы ў роце чорны дуплявы зуб, глухавата, нібы сама сабе сказала:
— Нешта ліхое яго прынясло, гэтага кажана.
Старая азірнулася наўкруга сябе, убачыла пры плоце сухі арэхавы кій і парнула ім у ржавую сухую кажурынку. Але кажан толькі разявіў сабачую мызу з натапыранымі вушкамі, вышчарыў вострыя зубы і тоненька, як драцінка, зазьвінеў.
— Во, яшчэ й не ўцякае, нячыстая сіла, — гаспадыня прыцэлілася і зноў парнула доўгім кіем.
Ён нарэшце адарваўся ад латы, нячутна, па–матылінаму пырхнуў і ўлукаткі паляцеў пад стрэху блізкага гумна.
— Нядобрую ён табе новасьць прынёс, — зноў пацьвердзіла сваё цётка Ёўда і заківалася ў хату.
А яна, Леанарда, увесь дзень была як сама не свая. Прыгадвала Наваградак. Тую ж ноч, калі прайшла павальная аблава — нехта падклаў міну пад парог таго дому, дзе кватараваў гебітскамісар, але падарваўся ўсяго вартавы. Арыштоўвалі чамусьці найбольш беларусаў. Шукалі тых, хто калісьці палітыкаваў ці быў на прыкмеце, як падазроны. Хоць яе Франак ні з кім вельмі і ня знаўся.

Але во кажан прынёс новую бяду. Нібы не хапіла той, што прылучылася ў Наваградку. Праўду ж кажуць: бяда адною ня ходзіць. Яны толькі пабраліся, і ім нібы пашэнціла: Франак напытаў работу у транспартным аддзеле гарадзкой управы, а яе, Леанарду, узялі карэктарам у рэдакцыю павятовай газэты. Надарылася тым часам зьняць і кватэрку — вузкі пакой за дашчанаю перагародкаю ў шарай неашаляванай хаце заўсёды п'янага балагола — ці не татарына? — і яго рослай, заўсёды пакорна прыгорбленай, як яна сябе называла, — Разаліі.
Было яно гэтае мядовае шчасьце ці не, Леанарда разабрацца не пасьпела. Бо можа ня вельмі і любіла наіўнага і, здаецца, яшчэ нясьпелага як мужчыну свайго Франака. Ёй падабаўся яго таварыш, шыракаплечы з валасатымі рукамі Жэнік, што працаваў загадчыкам складу ў гандлёвай нямецкай фірме.
Але ў тую трывожную ноч яна якраз ня спала. Сэрца нібы чула бяду. У двары баязьліва цяўкнуў чуйны гаспадароў сабачка. Ад

яго брэху яна заўсёды прачыналася, як і ад Франка, калі ён гарнуў яе да сябе, і яго рука шкраблася ў яе між ног і нахабна, упарта разводзіла іх...
Перапуджана цяўкнуўшы, сабачка больш не аказаўся. Леанарда нават ня ведала, што сабакі, як і людзі, баяцца ўзброенага чалавека, — яны мусіць, чуюць, як пахне гарачаю сьмерцю настылая руля вінтоўкі.
Леанарда ўжо ня спала — прачнулася ад цяжкага і страшнага сну. Угнуўшы і пагрозьліва набычыўшы чорную голаў зь белай зоркай між шырока раскінутых вострых рог, на яе ішоў вялікі бык з кутасікам над шырокім чэравам. І гэты кутасік варушыўся.
Яна ўцякала, але ногі адымаліся. Спрабавала крычаць, але голасу не было. А ўбуялы, расовы бык, бушуючы і дзеручы пярэднім капытом зямлю і кідаючы яе на сябе, упарта і разьюшана блізіўся да Леанарды. Яна нават убачыла яго налітыя крывёю, вялікія, як сьлівы, лілова–сіняватыя вочы. Яна закрычала зноў, але бяз голасу... і прахапілася.
Дзесьці ў прыцемку ночы натужна вуркатала ценжароўка — можа тая, доўгая і чорная, з адсечаным радыятарам і накрытым кузавам, што была пры турме. У фортцы брамы востра дзынкнула жалезная зашчапка. У двары зноў ашалела заскавытаў і аціх перапуджаны сабачка.
Здаецца, мільганула, як начная трапяткая маланка, сьвятло кішаньковага ліхтарыка. Леанарда палахліва прыгарнулася да Франка, і яго халодная рука настойліва прасунулася ў мяккае цяпло яе ног. „Дурны“, — хацела сказаць, але ўжо ня трэба было: у гэты міг ў дзьверы моцна і адчайна загрукалі і каля акна шаргануўся нечы размыты цень. Мусіць, пільнавалі, каб ніхто ня выскачыў.
Дзьверы адчыняць пайшоў сам гаспадар. І счакаўшы, у сенях загаварылі то па–нямецку, то па–беларуску. У кватэры пад аранжавым абажурам засьвяцілася сьлепаватая жароўка–лямпачка. Загрукалі нямецкія шыпаватыя боты...
Раніцою яна прыбегла да турмы. Паліцыянты з вузкімі падбрытымі вусікамі, што адчыніў быў аконца, хаваючы свае вочы, каротка адсёк:
— Тут нікога не шукайце.
— А дзе ж?
— За кашарамі.

У Леанарды падкосіліся ногі. За даўнейшымі польскімі казармамі, дзе цяпер стаяла нямецкая вайсковая часьць, у ровішчах пры горадзе ў першы год расстрэльвалі савецкіх актывістаў, а ў гэтае жніўнае лета — набожна пакорных яўрэяў. Леанарда яшчэ зьбегала туды, але ўжо блізка да ямаў, дзе яшчэ ўспыхвалі адзіночныя тупаватыя стрэлы, яе не пусьціла старая жанчына ў чорным, зьедзеным мольлю плюшавым каптане, што падпасвала ў прышашэйнай канаве мігітлівую казу:
— Ня йдзі туды, маладзічка. Тут адзін мужчына быў пайшоў шукаць і напытваць сына і сам не вярнуўся.
У вузенькі завулак зь белымі двухпавярховымі мураванкамі, адную зь якіх займала рэдакцыя, яна ўжо ледзьве дабрыла. Нізенькі, сыта–ружовы рэдактар, прыладжваючы абедзьвюма рукамі за вушы свае рэдзенькія, напамаджаныя валасы, для прыліку толькі паспачуваў:
— Але чым жа ж я вам памагу. Мы ўсе пад памялом.
А потым і падстрашыў:
— Я баюся, каб не арыштавалі і вас.
Як абязьвечаная, Леанарда вярнулася ў свой цемнаваты кабінэт, што адным акном выходзіў у заслонены дрэвамі двор, села за столік насупраць рыжавата–агністае машыністкі, што перастала ляскаць па старэнькім рэмінгтоне, і затрасла худзенькімі плячыма ад нестрыманага плачу.
— Ня траць часу, — неяк трохі суха і нібы абыякава сказала машыністка. — Зайдзі ў аддзел народнай асьветы, да інспэктара. Ён у недалёкую школу напытвае настаўніка...
У Косічы, здаецца... Перачакай бяду там.
І вось яны, Косічы, дзе Леанарда хацела знайсьці зацішак і ўратавацца ад арышту, гвалту, сьмерці... А перад ёю стаяць пяцёра ўжо гатовых на ўсё страшнае і агіднае дурнавата–п'яных мужчын.
Ня дзіва, што сёньня ў школу прыйшла менш як палова дзяцей. Непакою ці чагосьці таемнага, загадкавага дадала яшчэ бялявая дзяўчынка з другога класу ў доўгай плаценкавай сукенцы з нашытымі ў падоле чырвонымі паскамі і ў зморшчаных скураных хадаках.
Цярпліва стоячы каля стала і пазіраючы з–пад краплістай хусткі валошкавымі вачыма на Леанарду, яна нарэшце адважылася і спытала:
— Скажыце, пані навучыцелька...

— Цяпер трэба называць мяне грамадзянка настаўніца, — падказала Леанарда.
— Ага, грамадзянка, — пацёршы кулачком свой нос, паўтарыла бялявая дзяўчынка. — Чаму ўсе кажуць, што ня трэба хадзіць у нямецкую школу?
— А хто кажа?
— Ня ведаю. Але мы баімося, што нас могуць пастраляць.
— Хто? — сумелася Леанарда.
— Усе: і немцы, і партызаны.
— А за што ж вас, малых дзяцей? Глупства гэта.
— О, не кажыце так. Бо і вучыцеля вунь забілі.
Толькі цяпер Леанарда здагадалася, чаго на вочы не паказваўся Ільля. Недзе ўсё туляўся. Значыць, нешта ведаў. Пэўна ж баяўся, каб ня выдаць сябе. І цяпер туліцца ў парозе, як пабіты сабака. Хаваецца за шырокія сьпіны гэтых пяцёх.
— Анутка, Илья, — махнуў чорным, зашчэмленым у руцэ пісталетам старшы сярод іх. — Напомни ей, какие она немецкие агитки привезла с собой.
— Да, привезла, — зноў нясьмела з прыцемку адгукнуўся вартаўнік, але на сьвятло газоўкі ня выйшаў. — Журналы с портретами всяких гебельсов.
Ах, Божа, гэта ж ён віжаваў за ёю і ўсё пераказваў ім. Ці ж не яго гэта справа — адзін скрадзены нумар „Новага шляху“. Усім класам па чарзе яны чыталі зь яго апавяданьне пра санітарку.
— Ну, так скажы, кто тебя подослал сюда? — перад ёй зноў махаецца гэты чорны пісталет.
— Мне даў накіраваньне школьны інспэктар.
— Инспектор, говоришь, — той мурлаты, што быў у суконным вясковым фрэнчы, імгненна выцягнуў зь вінтоўкі чорны востры шомпал.
Але яго перапыніў ён, старшы:
— Пастой маленько. Она нужна нам чистенькая...
Аднак шомпал разьюшана сьвіснуў над ёю. Як ад удару перуна, яна заплюшчыла вочы. І ёй убачыўся той высокі пагодны дзень бабінага лета, калі яна на спадарожнай фурманцы ехала сюды з сваім невялікім пажыткам — плеценаю карзінаю. Дарэчы, вёз яе не абы–хто, а тутэйшы багатыр, саракагадовы, усмалелы, як корч, гарбаносы і чорны, як корч, з навіслымі бровамі і сінімі хітрымі вочкамі Гервас Сапега.
Памогшы ёй з карзінаю і пасадзіўшы поруч з сабою ў

фацэтную, з прэтэнзіяй на нейкае шляхецтва, рысорную брычку, ён адразу і назваўся:
— Гервас буду, а па прозьвішчы — Сапега, — махнуўшы выгінастымі прыгожымі вейкамі, ён неяк сарамяжа заплюшчыўся, а потым раскаціста зарагатаў: — Кажуць, знакамітая княжацкая фамілія. А тут, наўкруга нашых Косічаў, яе носіць столькі галадранцаў, што і не зьлічыць.
Пад'ехаўшы да самое школы, што была ўпрытык з управаю — прыгожым драўляным домам пад нямецкі вугал, крытым драніцаю і з прычолкам, падпёртым дзьвюмя выштукаванымі калёнамі, нечакана запрапанаваў:
— А можа паедзем да мяне. Хата вялікая, на два канцы. Не раўня гэтай школцы.
Зазірнуў у вочы і вялікаю жорсткаю далоняю злавіў яе руку:
— Мне гаспадыня патрэбна.
— А што вы кажаце, дзядзька.
— Во яшчэ і дзядзькам называе, а я — нежанаты.
— Даруйце, як вас па–бацьку? — сумелася Леанарда.
— Бацьку Цімохам называлі, — ён неяк паволі, нібы ня хочучы, зьняў з брычкі яе плеценую карзіну і паставіў на зялёную мураву каля шырокае сьцежкі. — Я чалавек адкрыты, прызнаюся. Адчыняю ў горадзе краму. Буду гандляваць шапкамі. Мы аднога жыдка краўца прыхавалі. Ён ужо іх шые. Мне патрэбны граматны супольнік ці памочнік. А што ваша школка? Ці пратрывае да зімы. Тут партызаны ўсё спрытком паляць — і ўправы, і школы. Што ні ноч, то пажар. Вунь колькі ўжо згарэла двароў і фальваркаў.
— А як жа дзеці? Без навукі? Не, буду трымацца школы.
— Дарма даяце ганьбу майму дому. Я ж платы не вазьму. А ў мяне і садок, і пчалярня...
Яго рысорная брычка доўга і, здаецца, зласнавата падляскавала на ружовым выбоістым бруку вуліцы.
А назаўтра, знайшоўшы нейкую зачэпку, зазірнуў да гаспадыні. Потым і яе, Леанарду, перастрэў на падворку. Нацягваючы яшчэ ніжэй барашкавы каўпак і пільна азіраючы яе сінімі быстрымі вочкамі, загаварыў:
— Еду ў горад. Можаце што заказаць. Сахарыну, ніткі, іголкі...
— Ой, што вы, дзякую, нічога покуль ня трэба, — як магла аднеквалася Леанарда.
Яго жаўтлявая вялікая рука тым часам пакапашылася ў

адтапыранай кішэні шарага ў клетку пінжака і выцягнула колькі цёплых, мусіць толькі з печы, падсушаных груш.
— Цукровыя, — падказаў Гервас і, варухнуўшы чорнымі навіслымі бровамі, цераз парог у сені падаў іх старой Ёўдзе.
— О, дагаджае вам, — сьмяялася і паказвала чорную шчарбіну ў роце ўедлівая старая.
— Кінь перад сабою, знойдзеш за сабою, — трапна, слова на слова, адказваў хітраваты Гервас.
А потым, нібы незнарок, уцягнуўся да яе ў баковачку, агледзеў адзін табурэцік, налёгшы на яго, праверыў, ці моцны і стойкі, і ўжо папрасіў:
— Я з вашага дазволу прысяду?
— Садзіцеся, што ўжо зробіш з вамі.
Зьняўшы з чорнай густой чупрыны, што ўжо іскрылася першай сівізною, свой барашкавы каўпак, загаварыў:
— Я ж вам ужо казаў, што хачу мець пры сабе пісьменнага чалавека. Знаюся ў арыхмэтыцы, але з драбямі рэч благая.
— І што пры вас буду рабіць я?
— Памагаць у рахунках.
— І ня болей? — зьедліва ўсьміхнулася тады яна.
— А калі прыгледзіцца адзін да аднаго, то...
— Ну, дагаворвайце.
— А хіба вы ўжо не дагадваецеся?
— Ня вельмі, бо намёкаў шмат.
— Прызнаюся, шкада мне вас, маладзенькую.
— Нешта страшыце, ці што?
— У страху, як кажуць, вочы вялікія... Бо наўкруга столькі брыды. І на вас, адзінокую і харошую з твару, кожны спакусіцца.
— Во пра што вы загаварылі.
— Неласкавая вы нашто са мною, — ён зарыпеў табурэтам, падняўся зь яго. У парозе яшчэ сказаў. — А я вам хачу дапамагчы і заступіцца.
Хітраваты і трохі як нахабны Гервас гаварыў праўду — як на тое ідзе: яны, гэтыя пяцёра п'яных начных гасьцей, будуцца дамагацца яе. Яна ўжо адчувае, як прагна гараць іх асалавелыя з шкляным водбліскам вочы, як яны разьюшана дыхаюць.
І яна, трацячы над сабою ўладу, ужо крыкнула ім у чырвоныя, налітыя крывёю твары:
— Што вам трэба ад мяне?

— А разве не знаеш, что мужыкам надо?..
— Пайшоў вон, брыда! — крыкнула яна ўжо таму рыжаватаму, у пілётцы, што высунуўся наперад і намагаўся схапіць яе за руку.
— Слушай, Шубін, — закамандаваў старшы. — Сделай кляп і закрой ей хайло.
Леанарда забегла за стол, нібы ён мог яе ўратаваць. Але сюды ўладна ступіў стрыжаны пад нулёўку, на галаве ў якога шырока разьлезлася зьлінялая пілётка з чырвонай, аблушчанай на адным куце зоркай.
Ён і схапіў Леанарду за грудкі, моцна, да болю, рвучы на ёй леткі халацік. Яна нават не пасьпела апомніцца, як бразнулася плячмі ўпоперак ложку. Леанарда закрычала зноў, але яе дыханьне перахапіла ўваткнутая ў рот, гаркаватая ад тытунёвай пацярухі нейкая анучка, што была ў некага зь іх заміж насоўкі.
— Ильюха, давай, первым пойдёшь? — нечыя халодныя дужыя рукі схапілі яе за аголеныя калені, якія яна сілілася стуліць.
—Ильюха, не трусь, целина у неё уже вспахана, — нехта душыўся ад рогату з прадчуваньнем блізкае асалоды.
— Ты что, плачешь?
— Ну, это от радости, — расшпільваючы дрыготкімі рукамі рамень і пазвоньваючы спражкай, крычаў той, што апошнім станавіўся ў калейку.
— Зырь, Ильюшка не дотерпел.
— Га–га! Пацан ещё...
„Якая пакутлівая, якая зьдзеклівая і нечалавечая сьмерць у мяне“, — яшчэ падумала Леанарда, сілячыся супраціўляцца гэтым пяцём. Пасьля ўжо, зьнясіленая, ледзьве памятная, учула, як першы ўдар штыка палыхнуў ніжэй жывата, а потым яшчэ адзін, гарачы, як агонь, нібы дзеля збаўленьня ад доўгіх мук, знайшоў яе сэрца...
Старая Ёўда прачнулася ад першага стуку ў суседняе акно. Падумала адразу пра благое. Гэтаксама і ў гэткую пару стукалі тады, калі забіралі нядаўняга кватаранта, прыгожага рослага мужчыну з бародкаю і ў скураной карычневай куртцы, што толькі і пасьпеў парабіць у школе ня больш як месяц. І, на табе, прыйшлі за ёю, ціхенькаю, прываблівaю і адзінокаю маладзіцаю.
Сьпешна, блытаючыся ад страху і перадрагі ў спадніцы, старая

праз голаў нарэшце нацягнула яе, знайшла на біле ложку кофту. Косы слупок мройнага, вадзяністага сьвятла ляжаў на стале — месяц, набраўшы вышыню, пераходзіў на другі бок хаты. Старая, адшморгнуўшы фіранку, прыпала да халоднай шыбы. На вуліцы пры плоце цямнела фурманка. Нехта нецярпліва і размашыста расходжваў каля каня. За сьцяною ў бакоўцы чуліся глухаватыя неразборлівыя галасы, цяжкае і невядомае грукатаньне, нібы хто падаў.
Тады як арыштоўвалі кватаранта, такога грукату не было — забіралі яго сьцішком, нібы крадучыся.
Ах, Божа сьвяты, што робіцца там? Што чыняць яны над безабароннаю маладзіцаю. У яе і так ледзьве ліпіць душа. Можа рашыцца на ўсё і зьбегаць паглядзець? Але ж ці будуць гэтыя злыдні зважаць на тваю старасьць. Заб'юць ці ўкалечаць — і ня знайся.
Ёўда, як сама не свая, як адрашоная, пасядзела на лаве пры акне, а потым рашуча ссунулася і парыўна падышла да дзьвярэй, націснула на язычок клямкі і з усяе моцы папхнула іх. Яны, нямазаныя колькі гадоў, моцна і ржава зарыпелі на петлях. Ажно ў яе ад страху перахапіла дых і прапала раптоўная гарачая рашучасьць.
Неўзабаве на падворак выкаціўся сыты рогат. Цэлаю плоймаю, нясучы за плячыма страхатлівыя вінтоўкі, яны, нехрысьці, ішлі да фурманкі.
Старая вярнулася да лавы, прыкленчыла на яе адною нагою і зноў лобам ткулася ў халодную шыбу.
Загрукаціўшы коламі, фурманка нарэшце зьнікла ў сутоках вуліцы.
Вобмельгам, выскачыўшы з хаты, старая Ёўда абабегла яе і спынілася каля дзьвярэй бакоўкі. Наўкруга шапаткім звонам сыпалася цішыня і старая адно чула, як тахкае і разрываецца яе сэрца. Яна пастукала ў зачыненыя дзьверы, але за імі ніхто не адклікаўся. „А можа забралі яе, як таго кватаранта?“ — старая пацягнула за клямку і ў зеленаватым месячным сьвятле на ложку ўбачыла белае цела. Леанарда лежала ўпоперак ложку, бездапаможна зьвесіўшы на падлогу аголеныя ногі.
У бакоўцы пахла газаю, але газоўка ўжо не гарэла.
— Лёнька, Лявонка! — закрычала старая, трасучы яшчэ цёплую, але ўжо маўклівую Леанарду.
Нахіліўшыся бліжэй над мёртвым целам, старая нарэшце

ўбачыла анучу ў роце і на абедзьвюх грудзях чорныя, мусіць ад штыка, ранкі. Адна зь іх, як у Хрыста на абразах, была з падцёкам крыві ніжэй карычневага зморшчанага саска. Як здагадалася старая, штык прышоўся якраз у сэрца.
Ёўда дзіка, адчайна заенчыла, асунулася на каленкі і пачала хрысьціцца.
*7—23 красавіка 1999 г.*

---

[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image]



---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **9-05-2000**

[image]
[image] .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima



да Зьместу 2(3)-1999

***слоўнік паняцьцяў***

# Абвесткі

**Іван Кавалёў**,
Былы сакратар камуністычнае партыі
ў Заслаўі і да апошняга часу кіраўнік
Менскага бандыцкага камітэту,
**23 студзеня**
**ў дэпо майстроўняў дзяржаўнае чыгункі гаворыць**
**пра бязглуздасьць супраціву проці немцаў**
(Кавалёў будзе выступаць яшчэ
й на іншых сходах жыхарства Беларусі,
аб чым будзе своечасова паведамлена).

**Папраўка.**
У новых прадуктовых картках катэгорыі “Б” (для работнікаў цяжкое працы), выдадзеных на пэрыяд ад 22/II па 21/III — 43 г., зь віны друкарні ёсьць наступныя памылкі:
1) На першым талёне зь левага боку карткі з надпісам “Хлеб I” павінна быць напісана “300 грам”, а не “500 грам”.
2) Першы талён з надпісам “Хлеб III — 500 грам” трэба лічыць за талён “Хлеб II — 500 грам”.
3) Апошні талён на хлеб з надпісам “Хлеб IV — 200 грам” зьяўляецца лішнім, і яго зусім ня трэба лічыць.
У сувязі з гэтым даводзіцца да ведаму, што выдача хлеба на вышэйуспомненыя карткі будзе праводзіцца з выпраўленьнем гэтых памылак, гэта значыць, будзе выдавацца на кажны тыдзень па 2.300 грамаў хлеба, як і на карткі папярэдняга пэрыяду.
**Гаспадарчы аддзел Менскага Гарадзкога Камісарыяту**

**ЗГУБЛЕНЫ**
на вуліцы Мясьнікова
АДЗІН ЖАНОЧЫ ЧАРАВІК
сьветлага колеру.
Просьба вярнуць за ўзнагароду
на адрас: г. Менск, Варшаўская вул.,
дом №47, кв. 1, ЦЕЛЯКОЎСКАЙ.

**Лётарэя**
У першы дзень розыгрышу Першае бліскавічнае лётарэі БСП у г. Менску выйгралі:
Трахімовіч, удава-пэнсіянэрка — 40 райхсмарак, Ніхіеўскі Адвард, работнік аўта-рамонтнага заводу — 40 райхсмарак, Дзеравяга Зьмітра, кладаўшчык БСП — 100 райхсмарак.
**Лётарэйная камісія БСП.**

Паведамленьне Гарадзкога Камісара Менску
**Аб Падбіваньні Падэшваў да Абутку**
Паводля распараджэньня сп. Гэнэральнага Камісара Беларусі, у часе ад 1 красавіка да 1 кастрычніка 1943 г. забараняецца падбіваньне скураных падэшваў да абутку. Процідзеяньні будуць караццa.

Менск, 29 сакавіка 1943 г. Гарадзкі Камісар Янэцкэ.

**ТРАМВАЙ**
Пайшоў
Ад сыботы пайшоў ізноў Менскі трамвай! Тымчасам ходзіць ён на лініі былога №1 ад Камароўскага парку й пакуль да Ліповае вуліцы (б.Валадарскага), паступова асвойваючы й далейшыя дзялянкі ў кірунку да пасажырскага вакзалу. На ўсёй лініі ўстаноўлена 10 упынак.
Дык–жа віншуем із гэтым нашых чытачоў, якія павінны цяпер ужо дараваць неаднаразовыя паведамленьні ў нашай газэце, якія не маглі спраўдзіцца сваім часам.

**Не Загульвайцеся**
На Вуліцах!
Дажджыстае надвор'е гэтага лета ўсім абрыдла. Таму, як

здарыцца пагодны вечар, дык усе радыя, высыпаюць на вуліцы і гуляюць там, балазе дні цяпер даўгія. Але тут забываюцца, што з прычыны трывожнага часу хадзіць можна толькі да 21–ае гадзіны. Таму ўсім нашым чытачом раім старацца на гэтую гадзіну быць ужо ў хаце.

**Менскія Навіны.**
Газавая Камара.
Пачатая будова паказальнае газавае камары ў гор. Менску пры Менскай паветавай вэтэрынарнай лякарні (якая знаходзіцца пры Грушаўскай вуліцы). Пабудова гэтае газавае камары павінна быць закончаная ў верасьні месяцы сёлета. Газавая камара разьлічаная на лячэньне на каросту хворае жывёлы навейшым мэтадам — абкурваньнем сярнічастым газам, якое дае вельмі хуткае і радыкальнае лячэньне. Лячэньне будзе праводзіцца пад кіраўніцтвам загадчыка Менскае паветавае вэтэрынарнае лякарні, добрага спэцыяльнага вэтэрынарнага лекара Ўладзімера Аляксандрава.
*К. Пракаповіч.*

**Паведамленьне**
Да ведама Гаспадароў Жывёлы
У дадатак да распараджэньня Гаспадарскага аддзелу Менскага Гарадзкога Камісарыяту ад 15.II.1943 г. аб забароне продажу і забою жывёлы без дазволу Гарадзкога Камісару даводзіцца да ведама ўсіх гаспадароў жывёлы, што ў выпадку, калі жывёла здохла, труп ейны павінен абавязкова быць здадзены на Мылаварны зав. Менскага Гарадзкога Камісарыяту (Завальная вул., 8) і квітанцыя аб здачы пададзеная ў гаспадарскі аддзел Менскага Гарадзкога Камісарыяту (пакой №17) для зьняцьця з урахунку.
Асобы, якія не здадуць трупу здохлае жывёлы, будуць аштрафаваныя.
**28.IV.43 г. Гаспадарскі Аддзел Менскага Гарадзкога Камісарыяту.**

**Прыблудзілася**
каза.
Даведацца: г.Менск, Стара-Віленская 6, кв. 10, Шаев В.В.

**УВАГА!**

Ад 17 да 23 кастрычніка
зацямненьне ад 17, 07 да 7, 06.

**Беларускія Паліцыянты, Памятайце:**

Што апрача бальшавікоў ня меншым вашым ворагам зьяўляецца алькаголь,

Што п'янствам вы атручваеце сваё цела і душу і ганьбіце сваё імя паліцыянта перад сваім народам,

Што сумленна могуць выканаць свае ганаровыя абавязкі паліцыянта ў змаганьні з бальшавізмам і ў службе народу толькі цьвярозыя людзі.

Што інтарэсы беларускай нацыі вымагаюць у гэтай вайне быць у саюзе зь немцамі,

Што Вы зьяўляецеся першымі беларускімі жаўнерамі,

Што праз Вашае сумленнае выкананьне абавязкаў паліцыянта, як змаганьне з бандытызмам, вартавай службай і да г.п. народ бярэ ўдзел у гэтай вайне.

Што Вы — косьць ад касьці і кроў ад крыві Беларускага Народу;

Што Вы павінны быць дзеля гэтага ягонымі найлепшымі абаронцамі, дарадчыкамі і апекунамі ў кажнай патрэбе;

Што кажны Ваш добры ці благі ўчынак можа заважыць на лёсах вашага народу і Бацькаўшчыны.

Што вы служыце вашай Бацькаўшчыне — Беларусі,

Што няма на сьвеце рэчы важнейшай,
прыгажэйшай і больш ганаровай, як служыць
сваёму народу,

Што найвышэйшым выразам гэтае службы, якая
акрывае людзей несьмяротнай славай, —
аддаць жыцьцё за свой народ і Радзіму.

Што дысцыпліна — гэта сумленнае выкананьне
сваіх абавязкаў,

Што моц народу залежыць ад дысцыпліны
ягоных грамадзян,

Што незалежнасьць могуць здабыць толькі
народы дысцыплінаваныя.

Нацыянальныя абрады — гэта ёсьць
праяўленьне душы народу на вонкі.

Чым багацейшая народная абраднасьць, тым
вышэйшая духоўная культура народу.

Любіць і шанаваць свае нацыянальныя абрады
— гэта любіць і шанаваць свой народ.

**ГУМАР**

— Ваша маршалкаўская вялікасьць, — паведамляе камандзір чырвонае арміі Сталіну, — нашая дывізыя перайшла да немцаў.
— Расстраляць дзьве з тых, што засталіся, — загадаў Сталін.
Спаткаліся аднаго разу два чужаземныя прадстаўнікі і разгаварыліся. Амэрыканскі прадстаўнік кажа: “Ах, які геніяльны наш Рузвэльт, ён адвучыў жыхарства Злучаных Штатаў піць гарэлку”.
“Ну што ж тут такога”, — зьдзівіўся савецкі прадстаўнік. — “Наш Сталін даўно ўжо адвучыў народ есьці, і гэтым у нас ніхто ня хваліцца”.
Далей той жа самы чужаземец пытае: “А што азначае СССР?”
“Тры Срулі і Адзін Рускі”, — адказвае савецкі прадстаўнік.

**Узрост Сталіна**

У першай клясе народнае савецкае школы настаўнік,

расказваючы аб вонкавым выглядзе Сталіна, пытае дзяцей:
— Хто ведае, якога ўзросту Сталін?
— Я ведаю, — адказвае адзін хлопчык, — сто шэсьцьдзесят тры сантымэтры.
— Адкуль ты гэта ведаеш? — зьдзіўляецца настаўнік.
— Я зьмерыў.
— Як, ты зьмерыў Сталіна?
— Не, тату. Мой тата заўсёды кажа, што Сталін яму вось так. — Пры гэтым хлопчык правёў сабе рукой па горле.
Жаўнер уваходзіць да аднае сялянскае хаты і, пабачыўшы шмат дзяцей, пытае гаспадыню: “Чаму ў цябе, гаспадынька, так шмат дзяцей? Ці ж гэта так прыемна іх узгадоўваць?” Запытаная адказвае: “Узгадоўваць то ня вельмі прыемна, але… але прадукцыя дзяцей мне вельмі падабаецца”.
У Слонімскай акрузе адзін зьвяз беларускага батальёну сустрэўся з партызанскім атрадам. Пачалася перастрэлка.
У выніку яе партызаны з клічам: “Гура, за Сталіна, за Родзіну”, кінуліся ўцякаць.

**Тры Мовы**

Маці — да сына, які служыць у паліцыі: — Як ты размаўляеш з “партызанамі–бандытамі”?
Сын: — На трох мовах: куляй, гранатай, штыхом, залежна ад далечыні!
На вуліцы ў Менску “беднае дзіцянё”: “Спадару, дайце капеечку. Я хачу пайсьці да мамкі”.
Спадар, даючы паўмаркі, пытае: “А дзе ж твая мамка?” — “Мамка з суседам пайшла ў кіно”.

**Ад Рэдакцыі**

У №4 нашага часапісу ў “Песьні жаўнера” Міхася Кавыля закралася памылка. У другой страфе з гары ў другім вершы замест: — у жаўнера ў сэрцы шэра… належыць чытаць: — у жаўнера ў сэрцы вера…

**Загад**

Усім настаўнікам усіх школ Беларусі
Беларуская Нацыянальная Самапомач хоча арганізаваць дапамогу дзецям-школьнікам так, каб яны ў 10 гадзін даставалі сьнеданьне, якое будзе складацца з кавалка хлеба — 100 грамаў, памазанага павідлам, ці патакай, ці чым іншым,

што будзе пад рукой.
Таму загадываю ўсім настаўнікам памагаць у гэтай акцыі ворганам БНС, а калі б такога воргану, гуртка ў вёсцы, дзе ёсьць школа, дагэтуль не было, дык запрапанаваць свае сілы да помачы цэнтрам БНС праз раённыя ці акруговыя аддзелы БНС і ўзяць на сябе арганізацыю гуртка БНС.
Справа гэтая вельмі паважаная, і таму загадваю аднесьціся да яе з максымальнай энэргіяй і ахвотай.

**За Гэнэральнага Камісара Беларусі** **Кіраўнік Інспэктарыяту Беларускіх Школ**
**з даручэньнем** **пры Гэнэральным Камісары Беларусі**
**Др. ВЭБЭР** **СІВІТЦА.**

*Падрыхтаваў Анатоль Прасаловіч*
*паводле “Беларускай газэты”, часопісаў “Беларус на варце”, “Беларуская школа” і “Жыве Беларусь” за 1941—1944 гады пры ўдзеле Юрася Бушлякова..*

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

*Вайна ў ARCHE 2(3)-1999* . [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 14-07-1999**

[image]

[image] .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 2(3)-1999

***успаміны***

# Юры Туронак Вацлаў Іваноўскі і беларускае адраджэньне

**Юры Туронак (нар. 1929) — адзіны беларус–каталік у Польшчы, паводле вызначэньня Алега Латышонка. Сын Браніслава Туронка, беларускага дзеяча 30–х гадоў, які ўдзельнічаў у выданьні “Крыніцы”, уваходзіў ва ўправу Беларускага Сялянскага Саюзу і прабыў 3 месяцы ў польскім астрозе за сваю дзейнасьць. Дарэчы, Юры Туронак прысьвяціў свайму бацьку кніжку “Памяці Браніслава Туронка” (выйшла нядаўна — Нью–Ёрк, 1990 — але ўжо стала рэдкасьцю). Сам сп. Туронак піша сябе ў ёй ня Юр’ем, а Юркам. Род Туронкаў паходзіць зь Дзісненшчыны. У гады вайны Юры Туронак вучыўся ў 1–й Віленскай гімназіі. Пасьля другой сусьветнай вайны — у Польшчы. Па адукацыі эканаміст. Ад 1956 году працаваў у газэце “Rynki zagraniczne”. Доктар гісторыі габілітаваны (1987). Ягоная кніга “Беларусь пад нямецкай акупацыяй” у перакладзе з польскай вельмі добра прадавалася (“Беларусь”, 1993). Другая найбольш значная ягоная праца “Вацлаў Іваноўскі і беларускае адраджэньне” па–беларуску пакуль не друкавалася. Мы падаем тут**

**частку гэтай кнігі, прысьвечаную найбольш драматычнаму пэрыяду жыцьця яе героя — 1939—1943 гадам.**

**Разьдзел VI. Новы шанец**

**В**ацлаў і Юры Іваноўскія выехалі з Варшавы не пазьней 11 верасьня 1939 году, бо на наступны дзень усе дарогі, што вялі з сталіцы на ўсход і на поўдзень, былі перарэзаныя войскамі Вэрмахту. Яны разьвіталіся ў Любліне, гэтым разам назаўсёды. Юры падаўся да Румыніі, а адтуль да Францыі і Вялікабрытаніі, падзяліўшы лёс новай польскай эміграцыі. Вацлаў жа, ачуняўшы пасьля кантузіі, якую ён атрымаў падчас бамбардаваньня Любліну, накіраваўся ў Вільню.

Мы ня ведаем, перад ці пасьля 17 верасьня рушыў ён зь Любліну да Вільні, і ці разумеў ён, што апынецца на тэрыторыі, захопленай Чырвонай Арміяй. Апошняе, безумоўна, высьветлілася падчас падарожжа, якое мусіла заняць некалькі дзён. Аднак уваход савецкіх войскаў не зьмяніў кірунку ягонага шляху: Вацлаў не завярнуў з дарогі назад і каля 20 верасьня дабраўся да Вільні. Не скарыстаў ён і пазьнейшыя легальныя магчымасьці, каб вярнуцца ў Варшаву. Ён хацеў быць у Вільні. Гэтае рашэньне Вацлава потым зробіцца прадметам шматлікіх і разнастайных камэнтараў — бо накіраваўся ён усё ж такі “да бальшавікоў”. Спаміж ягоных сваякоў гаварылася, што да выезду з Варшавы Вацлава схілілі не палітычныя матывы, а заклік палкоўніка Ўмястоўскага[1]. Іван Касяк, у сваю чаргу, пісаў, што прычынай выезду было закрыцьцё варшаўскай Палітэхнікі, у выніку чаго Вацлаў мусіў шукаць працы. Але аўтар гэтай вэрсіі забываецца, што ў верасьні 1939–га лёс Палітэхнікі яшчэ ня быў вырашаны[2]. І ўжо зусім фантастычна гучалі “цьверджаньні” савецкіх аўтараў, паводле якіх Вацлаў застаўся пад нямецкай акупацыяй, заснаваў Беларускі камітэт у Варшаве і зрабіўся намесьнікам старшыні Галоўнай рады Беларускага камітэту самапомачы ў Бэрліне[3].

Адзінае сэнсоўнае вытлумачэньне гэтага рашэньня Вацлава можна знайсьці ў сьведчаньні інжынэра Віктара Чарвіньскага, які вучыўся ў Іваноўскага ў Палітэхніцы. Перад самай вайной Чарвіньскі кіраваў будаўніцтвам фабрыкі штучнага валакна на Віленшчыне і ўвосень 1939 г. выпадкова сустрэў свайго былога прафэсара ў Вільні. “Што Вы тут робіце, пане прафэсар?” —

зьдзіўлена запытаўся Чарвіньскі. На што Іваноўскі адказаў: “Чакаю выезду ў Менск, каб будаваць Беларусь, бо я ж беларус, як Вам вядома. Хачу быць у цэнтры падзеяў”[4].
Верагоднасьць такога дыялёгу не выклікае сумневу, бо не магло існаваць важнейшых прычын, якія б змусілі 59–гадовага Вацлава пакінуць сваякоў ды працу па спэцыяльнасьці, каб туляцца па ваенных дарогах. Наіўным таксама было б меркаваць, што тут адыгрывалі нейкую ролю заклікі палкоўнікаў ці спадзяваньні на сытнейшае жыцьцё ў Вільні. Усё гэта ня мела аніякага значэньня ў параўнаньні з новым шанцам папрацаваць дзеля беларускай дзяржаўнасьці, які зьявіўся ў выніку распаду міжваенных палітычных структураў у Эўропе. Іваноўскі чакаў такога шанцу амаль дваццаць год, а досьвед гэтага пэрыяду, у прыватнасьці, зруйнаваньне Беларускага Дому на ўсходзе, узмацняў ягоную ідэю адбудаваць Беларусь, абапіраючыся на Польшчу. У думках ён ізноў вяртаўся да канцэпцыі фэдэрацыі.

Тымчасам і надалей не існавала аніякіх рэальных умоваў для ажыцьцяўленьня ягонае ідэі. Па–першае, яна супярэчыла інтарэсам Масквы і Бэрліну, па–другое — не знаходзіла разуменьня ў Парыжы, Лёндане і Вашынгтоне, і, урэшце, па–трэцяе — большасьць польскіх і беларускіх дзеячаў, грунтуючыся на міжваенным досьведзе, лічыла гэтую канцэпцыю амаль што нацыянальнай здрадай.Такія настроі падмацоўвала верасьнёвая параза Польшчы. У той час, калі ў польскім асяродзьдзі пераважала жаданьне змагацца, каб аднавіць перадваеннае *status quo*, абсалютная большасьць беларускіх дзеячаў ухваляла вынікі скасаваньня Рыскага трактату і вітала аб’яднаньне ўсіх беларускіх земляў у адной савецкай рэспубліцы. Тым больш, што першыя крокі новай улады сьведчылі, што яна нібыта рэалізоўвае найважнейшыя сацыяльна–эканамічныя, моўныя ды культурна–асьветніцкія патрабаваньні беларусаў, праігнараваныя ў міжваенным часе польскімі ўладамі.
Аднак неўзабаве надышлі першыя расчараваньні. Савецкая ўлада, што праўда, надзяляла сялян зямлёй, давала магчымасьць вылучыцца людзям з сацыяльных нізоў, абвясьціла беларускую мову афіцыйнай, уводзіла яе ў школьнае выкладаньне і выдавала на ёй газэты, але адначасова

распачала фізычную ліквідацыю вядомых дзеячаў беларускага нацыянальнага руху. У кастрычніку 1939 г. у Вільні былі арыштаваныя Антон Луцкевіч, Аляксандар Уласаў, Ян Пазьняк, Вячаслаў Багдановіч і іншыя прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі. Дэпартацыі закранулі таксама чальцоў КПЗБ ды пракамуністычных арганізацыяў. Гэтыя рэпрэсіі спараджалі сярод беларускіх дзеячаў боязь за ўласны лёс, але ў прынцыпе не аслабілі сымпатыі да СССР.
Станоўча паставіліся да новай рэчаіснасьці нават беларускія хрысьціянскія дэмакраты, якія здаўна былі прадметам нападак з боку камуністаў, а таму — як магло б падацца — мелі найменш падставаў, каб ухваляць савецкую ўладу. У студзені 1940 г., гэта значыць, ужо пасьля далучэньня Вільні да Літвы, хадэцкая “Крыніца” пісала:

“Верасьнёвы разгром Польшчы даў магчымасьць Савецкаму Саюзу выступіць у ролі абаронцы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ад панскага прыгнёту і такім чынам выправіць несправядлівасьць дваццацігадовага падзелу Беларусі ды Ўкраіны (...) Беларусы, украінцы, расейцы ды казакі з сапраўдным захапленьнем сустрэлі гэты паход і ўзялі ў ім удзел, бо мэты яго былі добра зразумелыя, блізкія і вельмі папулярныя, бо аб’яднаньне беларускіх ды ўкраінскіх земляў успрымалася як гістарычная справядлівасьць і доўгачаканая неабходнасьць. Многія з тых, хто да нядаўняга часу — як у СССР, так і на эміграцыі — крытыкаваў савецкі лад, ня толькі даравалі ранейшыя крыўды, але зьмянілі ў лепшы бок стаўленьне да СССР, бо палічылі свае патрыятычныя памкненьні спраўджанымі”[5].
Магло б падацца, што вядомы сваім рацыяналізмам Іваноўскі на гэты раз пачаў разьлічваць на цуд. Сапраўды, калі ўсе навокал адхілялі саму ідэю польска–беларускай фэдэрацыі, толькі ягонае цьвёрдае пераканаьне дапамагала яму верыць у будучыню гэтай ідэі, а таксама спадзявацца, што разьвіцьцё ваенных падзеяў зьменіць погляды палітычных дзеячаў абедзьвюх краінаў. Ня выключана, што ён разьлічваў і на падтрымку Юрыя ў прапагандзе сваёй ідэі сярод эмігрантаў, а таксама на большае паразуменьне ў Менску, дзе зь вялікім скептыцызмам назіралі за заходнебеларускай эўфарыяй. Кастрычніцкія арышты абмінулі Вацлава Іваноўскага, на што,

відаць, паўплывала яго шматгадовая адсутнасьць на беларускай палітычнай сцэне. У канцы гэтага месяца ў Вільні прыйшла да ўлады літоўская адміністрацыя, а выезду ў Менск яму давялося чакаць яшчэ два гады. Вось жа, Іваноўскі мусіў неяк уладкавацца ў Вільні. Спачатку ён жыў у свайго старога сябра, інжынэра–архітэктара Лявона Дубяйкоўскага, на вуліцы Падгорнай і пачаў выкладаць у Індустрыяльным ліцэі на Антокалі, дзе да канца 1939 году навучаньне вялося па–польску. Дарэчы, тут у Іваноўскага вучыўся сын Антона Луцкевіча, Лявон. Адначасова Іваноўскі інтэнсіўна дасканаліў сваю літоўскую мову. Калі адзін зь літоўскіх прафэсараў пахваліў яго, заўважыўшы ў авалоданьні літоўскай мовай вялікі “прагрэс”, Вацлаў паправіў: “Ne progresas, o pazanga” (Не прагрэс, але посьпехі).
У лістападзе 1939 г. Вацлаў сустрэўся з сваім малодшым братам Тадэвушам, прафэсарам заалёгіі Ковенскага ўнівэрсытэту. Іх аб’ядноўвала агульнасьць поглядаў на важнейшыя палітычныя праблемы Беларусі і Літвы. У студзені 1940 г. Тадэвуш узначаліў катэдру заалёгіі Віленскага ўнівэрсытэту і паспрыяў таму, каб Вацлаву даручылі катэдру хімічнай тэхналёгіі ў гэтым жа ўнівэрсытэце. На той пасадзе Вацлаў Іваноўскі працаваў да чэрвеня 1941 г., г.зн., да нямецка–савецкай вайны, выкладаючы па–літоўску. Апроч таго, ён працаваў кансультантам у віленскім Торфавым трэсьце[6].
На той час у Вільні сабралася амаль уся сям’я Іваноўскіх. Апроч Вацлава, Тадэвуша і Станіслава, што ўжо жылі тут, прыехала зь Лябёдкі Сабіна зь дзецьмі Стэфанам, Вацлавам і Ганнай, а таксама сястра Алена Скіндарова, мужа якой дэпартавалі на ўсход. Як “эксплюататары”, яны баяліся рэпрэсій з боку савецкіх уладаў і хаваліся ў Вільні, якая цяпер была на літоўскай тэрыторыі. Апусьцелы фамільны фальварак быў разбураны і вынішчаны. Быў раскіданы таксама дом Юрыя ў Галавічполі, збудаваны калісь Дубяйкоўскім. Мясцовыя шукальнікі скарбаў у сваім вандалізьме не пашкадавалі нават памёрлых: фамільную труньніцу разьбілі, а парэшткі павыкідалі з трунаў. Потым дзеці гулялі ў футбол чэрапамі Леанарда і Ядзьвігі. Ніхто ім не забараняў...[7].

Увесну 1940 г. сытуацыя ў Эўропе яшчэ больш абвастрылася. Пад націскам пераможнага Вэрмахту здаліся Данія, Бэльгія,

Галяндыя, Нарвэгія і Францыя, пачалася вайна за Вялікабрытанію. Вырасьлі таксама і тэрытарыяльныя апэтыты СССР, пра што сьведчыў напад на Фінляндыю, а таксама акупацыя румынскай Букавіны ды Бэсарабіі. У Літве пакуль панаваў адносны спакой, але мала хто верыў у ягоную трываласьць. Самую вялікую няпэўнасьць спараджалі савецка–нямецкія стасункі. Нічога ў гэты момант ня сьведчыла пра іх пагаршэньне, аднак з разьвіцьцём падзей расло агульнае перакананьне, што канфлікт паміж дзьвюма таталітарнымі дзяржавамі непазьбежны.

Палітычная сытуацыя ў Эўропе была няўстойлівая, незразумелая, шмат яе элемэнтаў магло яшчэ зьмяніцца, але ўвесну 1940 году прыйшла пара акрэсьліць стратэгічны сцэнар дзеяньня і распачаць адпаведныя прыгатаваньні. Гэтаю справаю Вацлаў Іваноўскі заняўся разам зь Янкам Станкевічам — вядомым з даваеннага часу палітыкам, мовазнаўцам і гісторыкам, прыхільнікам польска–беларускага збліжэньня, за што яго шматкроць крытыкавалі беларускія суполкі — ад камуністычных да хадэцкіх. У акадэмічным 1939–40 годзе Станкевіч таксама працаваў у Віленскім унівэрсытэце выкладчыкам беларускай мовы, што спрыяла кантактам паміж ім і Вацлавам Іваноўскім. Янка Станкевіч быў адным зь нешматлікіх дзеячаў, каму Іваноўскі сапраўды давяраў. Зрэшты, яны ведалі адзін аднаго з часоў першай сусьветнай вайны, калі разам працавалі ў Менску і Вільні, а потым — у Польскім інстытуце нацыянальных справаў у Варшаве. Іваноўскі і Станкевіч зыходзілі з прыпушчэньня, што немцы наўрад ці адолеюць Савецкі Саюз — зь ягонымі бяскрайнімі прасьцягамі, зь вялікім людзкім ды матэрыяльным патэнцыялам. І, значыць, акупацыя Беларусі будзе толькі часовай. Як і дзеячы польскага падпольля, яны лічылі, што з гэтай вайны абедзьве вялікія дзяржавы выйдуць вельмі саслабелымі, а паваенным ладам у Эўропе будуць кіраваць краіны заходняга альянсу. Сумняваючыся, аднак, што гэтыя краіны будуць зацікаўленыя ў стварэньні беларускай дзяржавы, і ня маючы аніякіх магчымасьцяў для дзейнасьці на міжнароднай арэне, Іваноўскі і Станкевіч спадзяваліся, што беларускае пытаньне можа быць вырашана толькі ў лучнасьці з адбудовай польскай дзяржавы. Фармальнай праўнай падставай гэтага працэсу мелася быць фэдэрацыя Польшчы і Беларусі як

дзьвюх незалежных дзяржаваў.
Каб ажыццявіць такую канцэпцыю, трэба было намовіць да яе польскі эмігранцкі ўрад, які б адстойваў яе перад заходнімі дзяржавамі. Іваноўскі і Станкевіч верылі ў плённасьць сваёй ініцыятывы, якая, на іх думку, прынесла б карысьць абедзьвюм краінам. У інтарэсах Польшчы было б стварыць беларускі буфэр, які б аддзяліў яе ад Расеі, а калі б сюды далучылася яшчэ і Ўкраіна, магла б паўстаць абсалютна новая палітычная сыстэма ва Ўсходняй Эўропе — сыстэма, здольная супрацьстаяць расейскай ды нямецкай экспансіі.
Гэтая далёкасяжная ідэя, якая ў галоўных рысах уяўляла сабой фэдэрацыйныя праекты 1919–20 гадоў, павінна была перш за ўсё знайсьці прыхільнікаў сярод кіраўніцтва польскага падпольля ў Варшаве — бо гэта ад яго залежаў зьмест высыланых да ўраду справаздачаў і прапановаў. Для Іваноўскага і Станкевіча паўстала неабходнасьць навязаць кантакты з кіраўніцтвам падпольля, хаця пакуль было незразумела, як гэта зрабіць.
Задача была нялёгкай зь некалькіх прычынаў: па–першае, трэба было пераадолець прынцыповыя тэрытарыяльныя разыходжаньні і, па–другое, абодва дзеячы не зьбіраліся выступаць у ролі вартых жалю просьбітаў. Яны разьлічвалі на рост беларускага нацыяналізму ўва ўмовах верагоднай нямецкай акупацыі, асабліва на тое, што атрымаецца заняць адміністрацыйныя пасады і стварыць уласныя ўзброеныя сілы. Але супрацоўніцтва зь немцамі аніяк не стасавалася б з пазыцыяй польскага падпольля і перакрэсьлівала б усе шанцы польска–беларускага дыялёгу. Тады і была вымысьлена адмысловая тактыка, якая прадугледжвала двайную гульню: Іваноўскі меўся заняцца афіцыйнай дзейнасьцю, а Станкевіч — стварыць кансьпірацыйнае задзіночаньне, якое польскія падпольшчыкі не змаглі б абвінаваціць у сувязях зь немцамі. Згодна з гэтай дамоўленасьцю, за некалькі дзён да ўваходу Чырвонай Арміі ў Літву, Латвію і Эстонію, які адбыўся 15 чэрвеня 1940 г., Станкевіч выехаў у Варшаву. Іваноўскі жа застаўся ў Вільні і працягваў працаваць ва ўнівэрсытэце. Неўзабаве няўзброеным вокам стала бачна, што каля нямецкай мяжы канцэнтруюцца вялікія злучэньні савецкіх войскаў. Гэта пацьвярджала, што СССР рыхтуецца да вайны, а разам з тым сьведчыла і пра слушнасьць прадбачаньняў Іваноўскага. У

чэрвені 1941 г. ён пражыў масавую дэпартацыю літоўцаў на ўсход, якая і гэтым разам шчасьліва яго абмінула. У той час Іваноўскі часта мяняў кватэры і не выяўляў палітычнай актыўнасьці. Чакаў выбуху вайны і вынікаў місіі свайго сябра ў Варшаве.

Прыехаўшы ў Варшаву, Янка Станкевіч пасяліўся на вуліцы Бэднарскай, у доме нумар 17 і далучыўся да дзейнасьці Беларускага камітэту, які тады разьмяшчаўся па адрасе: вуліца Ксёнжэнца, 4. Станкевіч вёў курсы беларускай мовы, чытаў лекцыі па гісторыі Беларусі. Адначасова ён распачаў стварэньне канспірацыйнай групоўкі пад назвай Партыя беларускіх нацыяналістаў (ПБН), ад імя якой плянаваў выступаць перад польскім падпольлем. Напрыканцы 1940 г. ён пазнаёміўся з Зосяй Дабрыньскай, якая адыграла ў гэтай гісторыі важную ролю. Зося Дабрыньская (у дзявоцтве Корсак), родам з Бардзіловічаў на Віцебшчыне, у 30–я гады настаўнічала ў Варшаве. І польская, і беларуская мовы і культуры з маленства былі для яе роднымі, яна вырасла ў атмасфэры, дзе шанаваліся абедзьве нацыі (у 1905 г. яе маці кіравала нелегальнай беларускай школай — гл. разьдзел III), і таму Дабрыньская лёгка паразумелася із Станкевічам. Станкевіч намовіў Дабрыньскую ўступіць у ПБН, дзе яна атрымала псэўданім “Ціна Арген”, а разам з тым і ў ZWZ–АК. Увесну 1941 г. па рэкамэндацыі графіка Гайкоўскага яе ўзялі ў Бюро інфармацыі і прапаганды Галоўнага ўпраўленьня ZWZ–АК. У БІПе Дабрыньская працавала ва ўсходнім нацыянальным сэктары пад кіраўніцтвам дацэнта Ўладзіслава Тамкевіча (“Кшыштафа”), дзе ёй даручылі беларускія справы. Там яна мела псэўданім “Эва”. Адначасова яна ўдзельнічала ў канспірацыйных сходах на вуліцы Бэднарскай, на кватэры Станкевіча[8].
На гэтых сходах Дабрыньская пазнаёмілася з Самуілам Кастравіцкім і Вітольдам Буткевічам, якія таксама круціліся па двайной арбіце. Абодва яны паходзілі зь Беларусі і былі стрыечнымі братамі: маці Вітольда, Марыя, была роднай сястрой бацькі Самуіла, Амброзія Кастравіцкага, якога з Вацлавам Іваноўскім яднала прыязнасьць, фэдэралістычныя пераканаьні і дзейнасьць на беларускай ніве падчас першай сусьветнай вайны. У 1920 г. бацькі абодвух братоў выехалі зь

Меншчыны і атрымалі невялікую гаспадарку ў Лідзкім павеце, аднак Амброзі шмат гадоў жыў у Варшаве, дзе працаваў лекарам. Іваноўскі ведаў Самуіла здаўна, што дазволіла ім лёгка знайсьці агульную мову ў поглядах на кансьпірацыйную дзейнасьць. Факты сьведчаць, што гэта адбылося ў канцы верасьня альбо ў кастрычніку 1939 г. у Вільні, дзе Самуіл хаваўся пасьля верасьнёвай паразы.

Увосень 1939 г. Самуіл выехаў у Варшаву і працаваў там у вайсковых кансьпірацыйных арганізацыях. У канцы 1940 г. зь ім увайшоў у кантакт Станкевіч — безумоўна, з падачы Іваноўскага. Самуіл стаў чальцом ПБН, куды прывёў таксама свайго стрыечнага брата Вітольда. Такім чынам уся тройца, г.зн. Дабрыньская, Кастравіцкі і Буткевіч, распачала дзейнасьць на два бакі, што, на іх думку, мелася служыць адной вялікай справе: адбудове з дапамогай Польшчы беларускай дзяржаўнасьці.

Яны мусілі быць вельмі асьцярожнымі і захоўваць таямніцу, каб пазьбегнуць магчымых абвінавачваньняў як з боку дзеячаў польскага падпольля, так і з боку беларускіх прыхільнікаў супрацоўніцтва з Райхам, што ў абодвух выпадках пагражала б трагічнымі вынікамі. Бо на ўлучаных у склад СССР заходнебеларускіх тэрыторыях ані на трохі не саслабелі міжнацыянальныя антаганізмы, якія гэтым разам востра адчулі на сабе палякі. Невыпадкова Юзаф Мацкевіч, уважлівы назіральнік тагачасных падзеяў, так ахарактарызаваў двайную гульню Кастравіцкага і Буткевіча ў акупаваным немцамі Менску:

“Так. Але вернемся да нашых справаў. Што, калі з нашымі навязаць кантакт? — спытаў Генрык.

— З нашымі? З кім? Зь Пекарчуком? Ці з Буткевічам, ці з тым новым Кастравіцкім? Я нічога пэўнага сказаць не магу. Я магу толькі сказаць, што ня ведаю, хто чыёй рукой грае...”[9].

Увесну 1941 г., калі ўжо ў паветры вісела, што немцы нападуць на СССР, да дзеяньняў у Беларусі рыхтавалася таксама выведка Галоўнага ўпраўленьня ZWZ–АК (ZWZ — *Zwiazek Walki Zbrojnej* —кансьпірацыйная вайсковая арганізацыя, створаная польскім эміграцыйным урадам (фактычна створаная на пачатку 1940). Асноўны кірунак дзейнасьці — дывэрсійна–сабатажная работа; камэнданты — ген. К. Сасноўскі (з VI 1940); у 1942 годзе перайменавана ў Армію Краёвую. — *Зацем рэдактара.*).

Палкоўнік Тамаш Зан апавядае, што ў тым часе ён быў прызначаны кіраўніком выведкі на паўночна–ўсходняй тэрыторыі, якая ахоплівала Беларусь, Літву, Латвію і Эстонію, і атрымаў загад рыхтаваць кадры для вывядоўчых групаў. Тады да яго зьвярнуліся Кастравіцкі і Буткевіч: яны прасілі залічыць іх у вывядоўчыя службы ў Беларусі, матывуючы гэта паходжаньнем зь Меншчыны і веданьнем беларускай ды расейскай моваў. Пасьля адпаведнага інструктаваньня Зан прызначыў Кастравіцкага кіраўніком філіі Другога аддзелу Галоўнага ўпраўленьня ў Менску, а Буткевічу даручыў мясцовае аддзяленьне.
Як пісаў Буткевіч, “каб аблегчыць сабе выезд і потым матываваць сваё знаходжаньне на ўсходніх тэрыторыях, мы яшчэ ў Варшаве — па дамоўленасьці з Занам — запісаліся ў Беларускі камітэт, які знаходзіўся на вуліцы Ксёнжэнцай. Гэты камітэт разглядаў сваіх чальцоў як будучых кандыдатаў на розныя пасады ў цывільнай адміністрацыі на Беларусі. Нас Камітэт накіраваў у Менск, паабяцаўшы, што па дамоўленасьці з обэрбурмістрам мы зоймем якіясьці пасады ў цывільнай беларускай адміністрацыі на тамтэйшых абшарах”[10].
Тамаш Зан у прынцыпе пацьвердзіў цытаваную справаздачу Буткевіча, дапоўніўшы яе, зрэшты, істотнымі заўвагамі. Па–першае, візыт у Камітэт адбыўся ўлетку 1941 г., калі ўжо ішла нямецка–савецкая вайна, па–другое, размова вялася зь Янкам Станкевічам, які аформіў дакумэнты на выезд, і, урэшце, па–трэцяе — не было патрэбы загадваць Буткевічу і Кастравіцкаму, каб яны ўвайшлі ў Беларускі камітэт, бо яны ўжо да таго былі ягонымі чальцамі. Хутчэй наадварот — якраз Буткевіч прывёў Зана ў Камітэт і адрэкамэндаваў яго Станкевічу, а дакумэнты Зан атрымаў разам зь імі (на прозьвішча “Воўк”), бо ён таксама зьбіраўся паехаць на ўсход[11].

Падаецца, што на момант пачатку нямецка–савецкай вайны Станкевіч быў ня надта задаволены вынікамі сваёй місіі. Так, ён уладкаваў Дабрыньскую ў БІП, што было нямала, але ж яе намаганьні дагэтуль былі безвыніковымі і не прывялі да размоў з кіраўніцтвам падпольля. На гэта паўплывалі як недавер да Станкевіча і несур’ёзнае стаўленьне да рэпрэзэнтаванага ім аб’яднаньня, так і нежаданьне ZWZ весьці дыскусіі на прадмет будучыні заходнебеларускіх земляў, якія дагэтуль лічыліся

неад'емнай часткай Рэчы Паспалітай. Яшчэ Станкевічу ўдалося далучыць да супрацоўніцтва Кастравіцкага і Буткевіча, але ён недаацэньваў важнасьці іхнае дзейнасьці ў сфэры выйсковай выведкі. Гэта ён пакідаў Іваноўскаму.

Тым часам фронт шпарка пасоўваўся на ўсход. 24 чэрвеня нямецкія войскі ўвайшлі ў Вільню, 28 чэрвеня — у Менск, а 16 ліпеня занялі Смаленск. Ужо ў ліпені сьледам за нямецкімі войскамі на беларускія і літоўскія абшары накіраваліся дзеячы ZWZ–АК. Яны, згодна з інструкцыямі Зана, пачалі арганізоўваць сетку вывядоўчых групаў і падпольных вайсковых структураў. Аднак Кастравіцкі і Буткевіч марудзілі з ад'ездам у Менск і да канца лістапада заставаліся ў Варшаве. Толькі аднойчы — у жніўні — Кастравіцкі ненадоўга выехаў у Баранавічы і Вільню і, спаткаўшыся зь Іваноўскім, вярнуўся ў Варшаву. Чаго яны чакалі? Тут прасочвалася сувязь з паводзінамі Іваноўскага, які ўсё яшчэ знаходзіўся ў Вільні. Відаць, Кастравіцкі і Буткевіч ня бачылі магчымасьці абсталявацца ў Менску безь ягонай дапамогі. Ня выключана, што на затрымку з ад'ездам паўплывала жнівеньскае спаткаьне Кастравіцкага зь Іваноўскім, падчас якога яны пра нешта дамовіліся.

Іваноўскі таксама не сьпяшаўся ў Менск. У ліпені, за нямецкімі войскамі, туды прыехалі Радаслаў Астроўскі, Мікола Шчорс, Вітаўт Тумаш, Адам Дземідзецкі–Дземідовіч, Усевалад Родзька, былі там студэнты Іваноўскага — Міхал Вітушка і Мечыслаў Контаўт, былі і іншыя дзеячы, якія спадзяваліся заняць пасады ў адміністрацыі і стварыць часовы беларускі ўрад, — а ён усё сядзеў у Вільні.

Цяжка з пэўнасьцю сказаць, якія былі на тое прычыны. Магчыма, Іваноўскі чакаў палітычнай дэклярацыі Гітлера наконт захопленых тэрыторыяў альбо хацеў стварыць сабе ў Вільні спрыяльную стартавую пляцоўку для далейшай дзейнасьці ў Менску — бо, у адрозьненьне ад іншых дзеячаў, ён дагэтуль ня меў кантактаў зь нямецкімі ўладамі і мог быць успрыняты як "чалавек з вуліцы". Урэшце — што найбольш верагодна — Іваноўскі чакаў правалу маланкавай вайны, бо толькі ў гэтым выпадку ён мог разьлічваць на ажыцьцяўленьне сваіх плянаў.

Напачатку ліпеня 1941 г., дзякуючы намаганьням Уладзіслава Казлоўскага, дзеяча беларускага руху нацыянал–сацыялістаў,

нямецкія вайсковыя ўлады дазволілі аднавіць працу Беларускага нацыянальнага камітэту, зачыненага ў 1938 годзе віленскім ваяводам. Паводле рапарту нямецкай службы бясьпекі, Камітэт павінен быў утварыць процівагу для “надта актыўнага літоўскага руху”[12]. Неўзабаве адбыўся ўстаноўчы сход з удзелам больш чым 60 мясцовых дзеячаў, на якім было абранае кіраўніцтва БНК. Старшынём быў абраны Вацлаў Іваноўскі, яго намесьнікамі — Язэп Малецкі і Баляслаў Грабінскі, сакратаром — Язэп Найдзюк, скарбнікам — Уладзіслаў Казлоўскі, рэфэрэнтам у справах культуры і асьветы — Усевалад Кароль[13].
Камітэт рэпрэзэнтаваў перад нямецкімі ўладамі інтарэсы беларускага насельніцтва Літвы і меўся арганізоўваць беларускае школьніцтва, а таксама нават і вайсковыя адзінкі, кіруючыся інструкцыямі свайго старшыні, Іваноўскага: “(...) няма для нас як для абаронцаў народу іншага выйсьця, як толькі пераняць уладу, узяць зброю ў свае рукі і паралізаваць дзейнасьць нашых нацыянальных ворагаў”[14]. Неўзабаве, аднак, давер да Камітэту зь нямецкага боку пачаў памяншацца. Гэта было наступствам паліцэйскага сачэньня, якое паведамляла пра “цалкам незразумелыя і непрыдатныя выказваньні наконт нацыянальных задачаў”, прамоўленыя правадырамі Камітэту. У асноўным гэта датычыла Іваноўскага[15]. У выніку гарадзкія ўлады адмовіліся ад палітыкі “процівагі” літоўцам і перасталі падтрымліваць беларусаў.

У верасьні 1941 г. Іваноўскі наведаў Менск з кароткім азнаямляльным візытам. Дабіраліся туды на спадарожных грузавіках, ён і два ягоныя паплечнікі — Станіслаў Грынкевіч ды Язэп Найдзюк. Менск пасьля ваенных дзеяньняў выглядаў жахліва, адусюль зеўрала нэндза. Усю тройцу прыняў бурмістар, д–р Вітаўт Тумаш. Ён хацеў як найхутчэй зьехаць зь Менску і прапанаваў Іваноўскаму сваю пасаду, абяцаў нават узяць на сябе неабходныя фармальнасьці перад нямецкімі ўладамі[16]. Іваноўскі ў прынцыпе даў згоду, але хацеў яшчэ крыху счакаць з гэтым і вярнуўся ў Вільню.
Вестка пра тое, што Іваноўскаму прапануюць пасаду бурмістра Менску, хутка даляцела да Кастравіцкага ў Варшаве. Той паведаміў навіну Зану, і апошні, спадзеючыся на магчымае супрацоўніцтва, вырашыў асабіста паразмаўляць зь Іваноўскім.

Але дамо цяпер слова самому Зану (ліст да аўтара ад 24 жніўня 1979 г.):

*“Шаноўны пан Туронак!*
*У сувязі з Вашым пытаньнем паведамляю абставіны маёй сустрэчы з прафэсарам Вацлавам Іваноўскім.*
*Увесну 1941 г. я быў прызначаны кіраўніком выведкі ZWZ на паўночна–ўсходняй тэрыторыі, якая магла быць захоплена немцамі падчас плянаванай вайны. Калі вайна распачалася, улетку 1941 г. я пачаў арганізоўваць вывядоўчыя цэнтры Другога аддзелу на гэтых тэрыторыях. Кіраўніцтва менскім вывядоўчым цэнтрам я даручыў Самуілу Кастравіцкаму.*
*Перад маім выездам з Варшавы ў Вільню ў верасьні 1941 г. Кастравіцкі параіў мне скантактавацца з праф. Вацлавам Іваноўскім, які на той час жыў у Вільні. У мяне быў адрас праф. Януша Івашкевіча, і той зьвёў мяне з праф. В.Іваноўскім.*
*Нашая размова адбылася пасьля 25 верасьня 1941 г. у кватэры праф. Івашкевіча на вуліцы Зыгмунтоўскай. Мы ведалі, што праф. Іваноўскі неўзабаве павінен заняць нейкую высокую пасаду ў Менску, у сувязі з чым ён мог быць карысны для нашай працы. Тады ж я выклаў Іваноўскаму фэдэрацыйную канцэпцыю паваеннага дзяржаўнага ўладкаваньня Польшчы, Літвы ды Беларусі.*
*Падчас тае размовы праф. В.Іваноўскі не пагадзіўся на ніводную з маіх прапановаў аб супрацоўніцтве, адказаўшы мне так: “Я вам дапамагаць ня буду і перашкаджаць ня буду”. Навогул быў ён тады вельмі асьцярожны.*
*Мы разьвіталіся, ні да чаго не прыйшоўшы. У выведцы ZWZ я працаваў да лютага 1942 г. Ведаю, што да гэтага часу супрацоўніцтва з праф. В.Іваноўскім не было. Потым я перайшоў на дывэрсійную дзейнасьць і ніякіх кантактаў з праф. Іваноўскім ня меў.*
*Тамаш Зан,*
*пс. “Олесь”*
Паўстае пытаньне, чаму Іваноўскі адхіліў прапанову Зана, калі сам жа разьлічваў на супрацоўніцтва з польскім падпольлем. Па–першае, Іваноўскі ведаў, што пададзеная канцэпцыя паваеннай фэдэрацыі адлюстроўвае асабісты погляд Зана, а не пазыцыю польскага ўраду ў Лёндане і ягоных падпольных мясцовых структураў. Па–другое, Іваноўскі хацеў не

падпарадкоўвацца, а быць палітычным партнэрам Польшчы ў змаганьні за беларускую дзяржаўнасьць, і вырашаць такое было не ў кампэтэнцыі Зана. Аднак Зан атрымаў абяцаньне, што польскай выведцы ў Менску ня будуць перашкаджаць, а гэта ў тагачасных умовах было нямала.

Іваноўскі выехаў у Менск толькі ў сярэдзіне лістапада 1941 г., калі нямецкі наступ угруз у падмаскоўных сьнягах. Гэта стварала пэрспэктывы зацяжной вайны, а, значыць, паўставалі розныя варыянты яе працягу і заканчэньня. Іваноўскі, вядома, ня мог здагадвацца, што Сталін тады быў гатовы аддаць Германіі Беларусь, прыбалтыйскія рэспублікі і некаторыя іншыя тэрыторыі СССР, каб толькі заключыць з Гітлерам мір[17]. Перад ад'ездам Вацлаў даручыў сваёй дачцэ Ганьне вывезьці зь Вільні ў Лябёдку дзьвюх жанчын–гэбраек: Эму Альтбэрг і яе сястру Марыю Арнольдаву, зь якімі Іваноўскі пазнаёміўся ў 1904 г. у Плоцку. У 1979 г. Марыя з удзячнасьцю прыгадвала клопат Іваноўскага, які ўратаваў яе і сястру ад гета і ад сьмерці.
Засьцярогі віленскай паліцыі не ўзбуджалі даверу да Іваноўскага і ў Менску, таму ён атрымаў пасаду не бурмістра, а намесьніка бурмістра. Відавочна, акупацыйныя ўлады спадзяваліся знайсьці на пасаду бурмістра больш адпаведнага кандыдата. 17 лістапада Тумаш перадаў Іваноўскаму свае абавязкі і ад'ехаў у Бэрлін[18]. Такім чынам, да чэрвеня 1942 г. дзейнасьцю менскай гарадзкой управы кіравалі два намесьнікі бурмістра: Вацлаў Іваноўскі (пытаньні асьветы і культуры) і Адам Дземідзецкі–Дземідовіч (гаспадарчыя пытаньні).
Амаль цэлы год — зь лістапада 1941 г. да восені 1942 г. — Іваноўскі жыў на адной кватэры з сваім сакратаром зь віленскага БНК Язэпам Найдзюком, які выехаў у Менск крыху раней і працаваў у Выдавецтве школьных падручнікаў. Іхныя тагачасныя бытавыя ўмовы Найдзюк апісваў так:

*"Я жыў разам з прафэсарам Іваноўскім у кватэры на вуліцы Ленінградзкай. У нас была агульная аканомка, цётка Алена, якая варыла нам есьці. Мы займалі тры пакоі і кухню. Кожны меў свой пакой, а адзін быў агульны, там спыняліся госьці, якія да нас наязджалі. У тыя часы я бліжэй пазнаёміўся з прафэсарам Іваноўскім і пераканаўся, які гэта добры, інтэлігентны і*

*адукаваны чалавек. Ён не захапляўся ідэямі і праграмай Гітлера, ня быў германафілам. Імкнуўся з усіх сіл арганізаваць якое–колечы жыцьцё ў Менску, каб хоць людзі не галадалі, і марыў адчыніць у Менску беларускі ўнівэрсытэт. (...)*
*У Менску мы жылі вельмі сьціпла. Часта елі чэрствы, не найлепшай якасьці чорны хлеб, час ад часу траплялася каніна. Увесну найчасьцей елі мы зялёную салату з цыбуляй, а пазьней гатаваную і сьвежую капусту з сольлю ды моркву. Замест цукру ўжывалі патаку. Салату і капусту мы елі безь сьмятаны ці шкварак. Часам знаёмыя з правінцыі прывозілі трохі сыру, сала ды яек. Тады ў нас было вялікае сьвята"*[19].
А вось што ўспамінае Лявон Галяк, які таксама жыў у доме на вуліцы Ленінградзкай:

*"Памятаю сустрэчу Новага 1942 году ў Іваноўскага (...) Калі аціхла страляніна, якой немцы віталі надыход Новага году, нас прыйшоў павіншаваць адміністратар будынку, немец. Іваноўскі вынес яму на калідор кілішак гарэлкі і канапку на талерцы, падзякаваў і разьвітаўся. Я назіраў за гэтай сцэнкай зь вялікай прыемнасьцю: часьцей, на жаль, даводзілася бачыць удыганьне перад немцамі, але Іваноўскі здолеў паводзіць сябе годна"*[20].
Тымчасам у Беларусі панавала палітычная блытаніна, нарасталі грамадзкія канфлікты. Гітлер, які перад нападам на СССР шмат разоў абяцаў утварыць пад пратэктаратам Германіі асобную беларускую дзяржаву, у часе вайны аніяк не выказваўся на гэты конт. 17 ліпеня 1941 г. ён выдаў дэкрэт, якім утвараў вялікі аддзел акупацыйнай цывільнай адміністрацыі — Райхкамісарыят Остлянд. Гэты аддзел ахопліваў Беларусь, Літву, Латвію і Эстонію[21].
А пакуль дэкрэт рыхтаваўся, уладу ў Беларусі ажыцьцяўляў Вэрмахт. Паколькі не было дырэктыў Гітлера наконт палітычнага статусу Беларусі, вайсковыя ўлады, адказныя за арганізацыю мясцовай адміністрацыі, кіраваліся не нацыянальнымі крытэрамі, а прагматызмам. На заходнебеларускіх абшарах, якія ў міжваенным часе належалі да Польшчы, вайсковыя ўлады ахвотна даручалі кіраўнічыя пасады ў адміністрацыі і паліцыі палякам, якія сюды вярталіся. Рабілася гэта галоўным чынам таму, што палякі мелі прафэсійны досьвед і антыкамуністычныя перакананьні.

Апанаваньне мясцовага апарату ўлады абуджала надзеі польскіх дзеячаў на стварэньне ва ўмовах акупацыі такога стану, які б фактычна спрыяў адбудове польскай дзяржаўнасьці на заходнебеларускіх тэрыторыях. Таму палякі імкнуліся выключыць з палітычнай гульні беларусаў, якія безадносна да сваёй арыентацыі — незалежніцкай ці савецкай — разглядаліся як перашкода ў дасягненьні вышэйназванай мэты. Да таго ж, палякам карцела адпомсьціцца за вядомыя падзеі 1939–1941 гадоў, і яны пачалі зводзіць асабістыя рахункі. Пасыпаліся даносы на беларусаў як на камуністаў, што ў першыя тыдні акупацыі выклікала шмат ахвяраў, асабліва сярод беларускай інтэлігенцыі.

Эскаляцыя польска–беларускага канфлікту рабілася непазьбежнай, хаця пакуль што нешматлікая і разьяднаная беларуская інтэлігенцыя, над часткай якой вісела суровае абвінавачваньне ў падтрымцы савецкай улады, не магла супрацьстаяць актыўнасьці палякаў. Мала дапамагло і тое, што немцы прывезьлі з эміграцыі групу беларускіх адміністрацыйных работнікаў — іх было ўсяго некалькі дзясяткаў, і большасьць зь іх асела ў Менску. Тут іх чакала вялікае расчараваньне. Неўзабаве пасьля прыезду ў Менск іх пачалі “вучыць і пераконваць”, што весьці палітычную дзейнасьць, прынамсі пакуль, — бессэнсоўна. Адначасова ім даводзілася, што ня трэба рабіць пасьпешлівых унёскаў пра стаўленьне немцаў да беларускага пытаньня — бо наконт яго ўсе яшчэ чакалі рашэньня Гітлера.

Сытуацыя зьмянілася пасьля стварэньня ў верасьні 1941 г. акупацыйнай цывільнай управы, якую ўзначаліў генэральны камісар Беларусі Вільгельм Кубэ. Нягледзячы на шматгадовы досьвед палітычнай дзейнасьці, ён акрэсьліў як беспрэцэдэнтную задачу, якую атрымаў на гэты раз. Краіна, куды накіраваў яго Гітлер, ня мела традыцыйнага дзяржаўнага самакіраваньня, вынікам чаго быў нізкі ўзровень нацыянальнай сьвядомасьці беларускага народу, затое моцныя расейскія ды польскія культурныя і палітычныя ўплывы. Найлепей сьведчыла пра гэта мясцовая адміністрацыя, нацыянальны склад якой у вельмі малой ступені супадаў з назвай краіны. Невыпадкова Кубэ занатаваў: “Перадусім Беларусь была ня больш чым цьмяным геаграфічным паняткам, у непасрэдным значэньні гэтага слова”[22].

У адрозьненьне ад афіцыйнай бэрлінскай палітыкі, якая зводзілася да гаспадарчай эксплюатацыі акупаваных абшараў, Кубэ ад пачатку сваёй дзейнасьці ў Менску імкнуўся аднавіць нацыянальную тоеснасьць Беларусі. Такую магчымасьць давала яму моцная асабістая пазыцыя, бо яго падтрымліваў Гітлер. У артыкулах і інтэрвію Кубэ часта прапагандаваў прынцыпы сваёй палітыкі, даводзячы, што ва ўмовах нямецкай акупацыі, вольных ад расейскага ды польскага палітычнага дамінаваньня, беларускі народ атрымаў шанец за кароткі час нагнаць гістарычнае спазьненьне ў разьвіцьці сваёй нацыянальнай сьвядомасьці. Дзейнасьць акупацыйных уладаў у палітычным пляне мелася накіроўвацца на прысьпешваньне гэтага працэсу, на пераадоленьне чужых ідэалёгіяў і ўзмацненьне беларускіх нацыянальных элемэнтаў — перш за ўсё, праз разьвіцьцё школьніцтва, культуры і працы сярод моладзі. Гэтая новая дарога разьвіцьця павінна была прывесьці Беларусь да эўрапейскай супольнасьці народаў і дзяржаваў. Генэральная Акруга Беларусь, — сьцьвярджаў Кубэ, — такім чынам, павінна выконваць ня толькі адміністрацыйныя функцыі, прадыктаваныя ўмовамі вайны, яе прызначэньне — стварыць айчыну для беларускага народу[23].

Гэтыя прынцыпы Кубэ пачаў ажыцьцяўляць адразу пасьля свайго ўступленьня на пасаду ў Менску. Пад лёзунгам “Беларусь для беларусаў” ён прапагандаваў ідэю нямецка–беларускай лучнасьці інтарэсаў і супрацоўніцтва, клапаціўся пра адбудову школьніцтва і культурных інстытуцыяў, абараняў менскія музэі і бібліятэкі ад разрабаваньня іх войскам, раздаў сялянам усю калгасную зямлю, супраціўляўся ў Галоўнай управе бясьпекі Райху вынішчэньню жыдоў. У рэшце рэшт ён прызнаў неабходнасьць паступовай беларусізацыі адміністрацыі, праваслаўнай і каталіцкай царквы ды іншых галінаў грамадзкага жыцьця.

Палітыка Кубэ аддавала перавагу беларусам, але не магла вокамгненна зьмяніць кадравую сытуацыю, асабліва ў адміністрацыі і паліцыі, створаных у свой час цывільнай управай. Нягледзячы на арганізаваныя падрыхтоўчыя курсы, надалей адчуваўся вялікі недахоп беларускіх спэцыялістаў, здольных альбо ахвочых працаваць. Беларускія дзеячы, прыгнечаныя тым, што ня могуць напоўніцу выкарыстаць перавагі, якія ім давала палітыка Кубэ, прычыну сваіх няўдач

бачылі ў занадта лібэральным стаўленьні цывільнай управы да палякаў. Усё гэта прадукавала далейшыя канфлікты. У верасьні 1941 г. данясеньні паліцыі інфармавалі, што працягваюцца спробы выстаўляць беларускіх службоўцаў як камуністаў, але цяпер такія заявы правяраліся больш уважліва, і ў выпадку беспадстаўных абвінавачваньняў даносчыкі прыцягваліся да адказнасьці. Гэтыя меры дапамаглі зьменшыць колькасьць даносаў. Затое ўзрос лік антыпольскіх інсынуацыяў з боку беларускіх дзеячаў, якія хацелі такім чынам перамагчы польскую дамінацыю.

Вось жа, Кубэ мусіў лявіраваць паміж дэклярацыямі ды рэаліямі. Хаця ён і пагадзіўся з фактычным станам мясцовай адміністрацыі, але ж, з прычыны яе нацыянальнага складу, ня мог на ёй будаваць сваю беларускую палітыку. Тады ён пачаў ствараць беларускую надбудову ў выглядзе цэнтральнай адміністрацыйнай інстанцыі, якая павінна была дзейнічаць у кірунку паступовай беларусізацыі мясцовых зьвёнаў. Паколькі бэрлінскія ўлады гэтага выразна не забаранялі, стварэньне такой інстанцыі ў верасьні 1941 г. падавалася магчымым — вядома ж, не як ураду, але як дапаможнага органу генэральнага камісарыяту ў Менску.

Напачатку верасьня Кубэ вылучыў на гэтую кіраўнічую пасаду Радаслава Астроўскага — на той час адзінага вядомага беларускага дзеяча на менскай палітычнай сцэне. Кубэ прызначыў Астроўскага галавой управы менскай акругі, свайго роду *Nebenbureau* — мясцовага адпаведніка генэральнага камісарыяту. Такім чынам, Астроўскі заняў важны пост у надзеі стварыць зь цягам часу, на базе ўправы сталічнай акругі, цэнтральную беларускую адміністрацыйную інстанцыю.

Але ў канцы кастрычніка ўсе ягоныя пляны неспадзявана рухнулі ў сувязі з прыездам у Менск Івана Ермачэнкі, якога Альфрэд Розэнбэрг, міністар акупаваных усходніх тэрыторыяў, прызначыў кіраўніком Беларускай народнай самапомачы (БНС). У прынцыпе абедзьве гэтыя інстанцыі маглі функцыянаваць паралельна, хаця было відавочна, што пасьля спадзяванай легалізацыі цэнтральнай управы Астроўскага БНС будзе падпарадкаваная яму. З такой пэрспэктывай не хацеў пагадзіцца Ермачэнка, які таксама меціў на ролю беларускага правадыра. У канфлікце паміж імі Ермачэнка займаў мацнейшую пазыцыю — ня толькі таму, што быў прызначаны

Розэнбэргам, але і таму, што меў доказы супрацоўніцтва Астроўскага з камуністамі і польскімі ўладамі, і гэтыя доказы ён выкарыстаў супраць свайго суперніка. У выніку Астроўскі страціў давер Кубэ і, каб уратавацца ад магчымых рэпрэсіяў, выехаў у Смаленск, губляючы тым самым магчымасьць непасрэдна ўплываць на сытуацыю ў Менску.

Інцыдэнт з Астроўскім не ўзмацніў даверу Кубэ да беларускіх дзеячаў. Аднак у яго не было выбару. Ён прызнаў Ермачэнку, які аказаўся спаважным супрацоўнікам і доўгі час адыгрываў галоўную ролю на менскай палітычнай сцэне як старшыня БНС — адзінай санкцыянаванай Бэрлінам беларускай грамадзкай арганізацыі. Пасьля гэтага інцыдэнту Кубэ быў больш асьцярожны і стрымана паставіўся да невядомага яму раней Іваноўскага, прызначыўшы яго намесьнікам бурмістра. Відавочна, ён не хацеў новага скандалу.

Іваноўскі, аднак, бясспрэчна выйграваў у вачах Кубэ і адказваў яму тым самым. Абодва цалкам сыходзіліся ў поглядах на адраджэньне беларускай культуры і нацыянальнай сьвядомасьці. Абодвух яднала любоў да мастацкай літаратуры і тэатру. Урэшце, Іваноўскі быў адным зь нешматлікіх беларускіх дзеячаў, хто дасканала валодаў нямецкай мовай. Гэта спрыяла іх бліжэйшаму знаёмству і ўзбагачала веды Кубэ пра Беларусь — паводле ягоных словаў, “найменш вядомую краіну Эўропы”, пра яе мінуўшчыну і надзённыя праблемы. Такое паразуменьне двух дзеячаў істотна паўплывала на рост прабеларускіх сымпатыяў Кубэ, а таксама — як мы неўзабаве пераканаемся — на лёс Іваноўскага.

Затое дзеячы некаторых беларускіх аб’яднаньняў сустрэлі Іваноўскага непрыязна. Што праўда, яны прызнавалі заслугі Іваноўскага перад беларускім рухам, ён быў апошнім з жывых пачынальнікаў таго руху, але разам з тым (якраз з прычыны памянёных абставінаў) у ім бачылі патэнцыйнага канкурэнта ў барацьбе за ўладу. Гэтых засьцярогаў не адмяняў факт, што Іваноўскі заставаўся ўбаку ад дзейнасьці мясцовых груповак. Зь недаверам ставіліся да яго Ермачэнка, а таксама ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі — ідэялягічны лідар радыкальнага нацыянальнага задзіночаньня, які выконваў у Менску функцыі галоўнага школьнага інспэктара.

Вельмі варожа выступілі супраць Іваноўскага некаторыя праваслаўныя дзеячы, прыхільнікі Астроўскага. Ужо ў сьнежні

1941 г. менская служба бясьпекі (SD) атрымала ад іх данос, дзе Іваноўскі называўся падпарадкаваным віленскай курыі католікам, які дзейнічае на карысьць пальшчызны ды каталіцызму і маскуе свае сапраўдныя памкненьні клопатам пра беларусізацыю каталіцкага касьцёлу. Аўтары даносу абвінавачвалі Іваноўскага ў тым, што ён намагаецца адцягнуць увагу нямецкага кіраўніцтва ад польска–каталіцкай экспансіі[24]. Непасрэднай зачэпкай для даносу было выданьне пры падтрымцы Іваноўскага напрыканцы 1941 г. у Менску беларускага катэхізысу ксяндза Юзафа Рэшаця, што, відаць, было ўспрынята як пагроза для праваслаўя. Гэта была апошняя беларуская кніга, выдадзеная намаганьнямі Іваноўскага[25].
У канцы лістапада ў Менск прыехаў Самуіл Кастравіцкі — з мэтай арганізаваць мясцовую вывядоўчую групу ZWZ. Разам зь ім прыехаў Вітольд Буткевіч, які меўся ўзначаліць выведку ў правінцыі. Абодва яны зьявіліся да Іваноўскага, але пасьля размовы зь ім іх пляны рэзка памяняліся. Так, Буткевіч ня выехаў у правінцыю, а быў прызначаны Іваноўскім на працу ў менскую гарадзкую ўправу, затое Кастравіцкі не ўзначаліў менскае аддзяленьне выведкі, але празь некалькі дзён вярнуўся ў Варшаву[26]. Буткевіч пісаў у справаздачы, што Кастравіцкага адклікалі назад з Варшавы, але гэта не адпавядала сапраўднасьці. Апошняе пацьвердзіў і Зан у размове з аўтарам, дадаючы, што пры тагачасных умовах сувязі не магло быць і гаворкі, каб за такі кароткі адрэзак часу з Варшавы прыйшлі нейкія загады.
Падобна, што абодва афіцэры выведкі больш слухаліся Іваноўскага, чымся сваіх камандзіраў. Але Іваноўскі не перакрэсьліў плянаў Другога аддзелу, бо менская філія выведкі ўсё ж была ўтворана, толькі пакуль ёю кіраваў Буткевіч. Іваноўскі забясьпечыў яго кватэрай у доме, дзе жылі работнікі гарадзкой управы, на вуліцы Ленінградзкай, і даў яму пасаду кантралёра, а потым начальніка аддзела кантролю. Як пісаў Буткевіч, “пасада гэтая потым вельмі дапамагала мне ў маёй вывядоўчай дзейнасьці. Я меў магчымасьць часта выязджаць на пэрыфэрыю, уздоўж і ўпоперак зьмераў стратэгічныя шляхі Менск–Слуцак, Слуцак–Баранавічы і чыгуначныя каляіны Менск–Бабруйск і Менск–Берасьце. Дзякуючы сваёй пасадзе я меў вольны ўваход на ўсе гарадзкія прадпрыемствы і на многія заводы, якія пераважна працавалі на немцаў. На нарадах у

бурмістра я часта сустракаўся з прадстаўнікамі акупацыйных нямецкіх уладаў і нярэдка браў удзел у паседжаньнях, на якіх абмяркоўваліся і плянаваліся розныя цікавыя для нашай выведкі распараджэньні”[27].

У канцы студзеня 1942 г. у Менск прыехала Гражына Ліпіньская (псэўд. “Данута”, якая неўзабаве ўзначаліла аддзяленьне ZWZ–АК і кіравала ім да канца нямецкай акупацыі. Яна таксама разьлічвала на дапамогу Іваноўскага, якога ведала з часоў вучобы ў варшаўскай Палітэхніцы. Аднак у новых умовах старое знаёмства магло не спрацаваць, і таму “Данута” папярэдне скантактавалася з Буткевічам.

“Буткевіч быў расчараваны, — успамінае Ліпіньская, — што Галоўнае ўпраўленьне прыслала жанчыну. Ён гаварыў, што тут небясьпечна, што пагражаюць немцы і бальшавікі, што лепей адсюль зьязджаць. Але я засталася і папрасіла ягоных парадаў наконт арганізацыі прадстаўніцтва. Буткевіч відавочна не хацеў гэтым займацца і сказаў: “Няхай пані сама арганізуе прадстаўніцтва, бо я прыехаў з Варшавы зь іншымі заданьнямі”. Напачатку я зразумела яго так, што ён адмаўляецца ад працы, але Буткевіч растлумачыў, што ягоныя заданьні датычаць беларускіх справаў, аднак паабяцаў працаваць таксама і для вайсковай выведкі”. Толькі празь некалькі дзён я накіравалася да прафэсара Іваноўскага. Думаю, што Буткевіч ужо пасьпеў зь ім паразмаўляць і параіць маю кандыдатуру. Ва ўсякім выпадку, пры першай сустрэчы прафэсар Іваноўскі абяцаў мне сваю дапамогу, заўважыўшы, што яго не цікавіць, навошта я прыехала ў Менск. Ён даў мне працу ў гарадзкой управе — спачатку даручыў зьбіраць каляровыя мэталі, а потым прызначыў інструктаркай па прамысловасьці. Такая праца давала мне магчымасьць езьдзіць па раёнах, што было вельмі істотна для вывядоўчай дзейнасьці”[28].

Вось такім парадкам пад адным крылом Іваноўскага пачала дзейнічаць ячэйка акоўскай вайсковай выведкі, а пад другім хаваўся Баляслаў Бэрут, у будучыні прэзыдэнт Польскай народнай рэспублікі. Як вынікае з справаздачы ўдзельнікаў польскага падпольля ў Менску, дапамога Іваноўскага была бясспрэчна вялікай[29]. У суме ён значна перавыканаў абяцаньне не перашкаджаць дзейнасьці ZWZ–АК, дадзенае Зану ў верасьні 1941 г.

Стаўленьне Іваноўскага да польскага падпольля заслугоўвае

ўвагі зь некалькіх прычын. Па–першае, тут адлюстравалася ягоная нэўтральнасьць да ўзброенай барацьбы. Па–другое, Іваноўскі ўсьведамляў, што дзейнасьць аддзелу выведкі безвыніковая: назапашаная ім ваенная інфармацыя магла б цікавіць толькі кіраўніцтва Чырвонай Арміі, у той час як гэтая інфармацыя перадавалася, звычайна раз у месяц, з дапамогай кур'ераў у Варшаву, дзе яе апрацоўвалі і высылалі ў штаб Галоўнакамандуючага пры польскім урадзе ў Лёндане. Усё гэта займала, як правіла, некалькі месяцаў, у выніку чаго інфармацыя безнадзейна старэла і рабілася бескарыснай для апэратыўных рашэньняў, можна нават сумнявацца, ці перадавалі яе ў Маскву. Урэшце, па–трэцяе — акоўская філія ў Менску не была патрэбная Іваноўскаму і не пасярэднічала ў ягоных кантактах з кіраўніцтвам польскага падпольля. У гэтым рэчышчы дзейнічалі Кастравіцкі з Буткевічам, стварыўшы асобную і незалежную сыстэму сувязі.
Дзейнасьць менскай філіі станоўча ацэньвалася ў Варшаве, затое ў Менску спараджала падазрэньні і даносы ў SD — галоўным чынам на Іваноўскага, якога называлі польскім агентам, што дзейнічае на шкоду Беларусі[30]. Асаблівую актыўнасьць тут выяўляў Іван Касяк, які з даваеннага камуністычнага дзеяча ператварыўся ў супрацоўніка гестапа. Як піша Раіса Галяк, падобныя даносы пісаў і ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі. Гэта стварала вакол Іваноўскага пагрозьлівую атмасфэру, а ягоны сусед па кватэры Юзаф Найдзюк, які быў сьведкам прыезду незнаёмых людзей з Варшавы, гаварыў, што "ў Іваноўскага зямля гарыць пад нагамі", і баяўся зь ім жыць[31]. Іваноўскі тады пазьбегнуў арышту галоўным чынам дзякуючы генэральнаму камісару Кубэ. Іх дачыненьні ўсё паляпшаліся. Кубэ абараніў Іваноўскага ад беспадстаўных нападак, а ў чэрвені 1942 г. адмовіўся ад сваіх першапачатковых засьцярог і пагадзіўся прызначыць яго бурмістрам Менску. Гэтае рашэньне прынесла Іваноўскаму вялікую асабістую прыемнасьць — ён заняў урэшце пасаду, якую калісьці займалі ў гэтым горадзе ягоныя продкі.

Тагачасны Менск быў невялікім горадам — ён налічваў трохі больш як 100 тысяч жыхароў, напалову менш, чым перад вайной. Затое вельмі вялікімі былі разбурэньні, як выкліканыя налётамі нямецкай авіяцыі, так і зробленыя савецкімі войскамі

пры адступленьні. Адносна менш пацярпелі прамысловыя прадпрыемствы, якія разьмяшчаліся на ўскраінах гораду, але нармальна працаваць яны не маглі ў тым ліку і празь вялікі недахоп рабочай сілы — гарадзкія кварталы ляжалі ў руінах, а людзі часьцяком пераязджалі на вёску ў пошуках даху над галавой. Цяжкасьці павялічвала нястача паліва, прадуктаў, адзеньня і іншых прадметаў першай неабходнасьці.

Таму асноўнай задачай гарадзкой управы быў клопат пра элемэнтарныя патрэбы людзей. Іваноўскі надаваў таксама шмат увагі духоўным патрэбам. Кіраваны ім аддзел асьветы і культуры ўтрымліваў у горадзе каля дваццаці пачатковых беларускіх школаў, этнаграфічны музэй, арганізоўваў выставы жывапісу і народнага мастацтва. Вось толькі не атрымалася адчыніць пэдагагічны інстытут. Затое Іваноўскі арганізаваў у прадмесьці Менску досьледную станцыю (так званая “Балотная станцыя”), дзе вывучаліся мэтады разьвядзеньня цукровых буракоў на беларускіх глебах[32]. Па гэтай тэме ён у свой час абараніў доктарскую дысэртацыю.

Важнай галіной культурніцкіх зацікаўленьняў Вацлава Іваноўскага была дзейнасьць гарадзкога тэатру. Дырэктарам яго спачатку быў Ян Краўчонак, потым Пятро Булгак. Паколькі опэрны тэатар заняло нямецкае войска, спэктаклі ішлі ў будынку цяперашняга тэатра імя Янкі Купалы. У адным тэатры працавалі тры акторскія ансамблі — драматычны, опэрны і балетны. Зь цяжкасьцю ўдалося сабраць актораў, знайсьці рэквізыт і абсталяваньне. Іваноўскі часта запрашаў актораў, рэжысэраў і драматургаў у гарадзкую ўправу на сустрэчы, падчас якіх абмяркоўваўся рэпэртуар і вырашаліся праблемы, зьвязаныя з матэрыяльнымі цяжкасьцямі. Іваноўскі ахвотна наведваў артыстаў, таварышыў зь імі. Артыстка тэатру Яўгенія Седліц была ягоным апошнім каханьнем.

Вось рэпэртуар менскага гарадзкога тэатру на сэзоны 1941/42 і 1942/43 гг.:

**Беларуская клясыка**: “На Антокалі”, “Пан Міністар”, “Шчасьлівы муж” Ф.Аляхновіча; “Міхалка” Далецкіх (В.Іваноўскага); “Пінская шляхта” В.Дуніна–Марцінкевіча.

**Замежная клясыка**: “Кармэн” Бізэ; “Вольны стралец” Вэбэра; “La Locandiera” Гальдоні; “Затонуты звон” Гаўптмана; “Разьбіты кубак” Кляйста; “Лялечны дом” Ібсэна, “Лекар міжволі” Мальера, “Зачараваная жалейка” Моцарта, “Яўгені Анегін”

Чайкоўскага; “Інтрыга і каханьне” Шылера; “Цыганскі барон” Штраўса[33].
Як трапна сказаў гісторык беларускага тэатру Ўладзімер Сядура, “у тыя змрочныя гады менскі гарадзкі тэатар нёс гараджанам сьвятло мастацтва”[34]. Сапраўды, калі ўзяць пад увагу цяжкасьці ваеннага часу ды беларускую спэцыфіку, колькасьць і якасьць названых рэпэртуарных пастановак уражваюць. Пасьля вайны дырэктар тэатру Булгак заплаціў за гэта многімі гадамі савецкіх лягераў.
Пад заўсёднай апекай Іваноўскага былі дзевяць менскіх Дамоў дзіцяці, для якіх ён перш за ўсё стараўся даставаць прадукты. Да гэтага спрычыніўся і ягоны супрацоўнік, начальнік аддзелу забесьпячэньня гарадзкой управы Баляслаў Бэрут.

Увесну 1942 году сытуацыя ў Беларусі працягвала абвастрацца. З аднаго боку, узмацнілася актыўнасьць савецкіх партызанаў, з другога — Галоўная ўправа бясьпекі Райху распачала ліквідацыю польскага падпольля. Гэтая акцыя спустошыла мясцовую адміністрацыю — многія службоўцы–палякі былі арыштаваныя і закатаваныя, іншыя ратаваліся ўцёкамі. У гэтай сытуацыі Кубэ, раздражнёны нігілістычнай палітыкай Бэрліну, вырашыў зрабіць стаўку на актывізацыю беларускага нацыяналізму. У прыватнасьці, ён палічыў неабходным сфармуляваць такую палітычную канцэпцыю, якая б заахвоціла беларусаў да супрацоўніцтва.
У канцы чэрвеня Кубэ ўтварыў інстытуцыю Мужоў Даверу, зрабіў Ермачэнку сваім дарадцам, дазволіў стварыць Галоўную раду Беларускай народнай самапомачы і значна пашырыць кампэтэнцыю гэтай арганізацыі, у рамках якой узьнік шэраг аддзелаў, як, напрыклад, палітыкі, вайсковых справаў, школьніцтва, культуры, прапаганды і аховы здароўя. Такім чынам ствараўся апарат, які ў адпаведны момант быў бы гатовы ўзяць уладу ў Беларусі. Асаблівае значэньне меў дазвол Кубэ на арганізацыю Корпусу беларускай самаабароны пад кіраўніцтвам Ермачэнкі.
Далей–болей. Былі ўтвораныя Беларускае навуковае таварыства, прафэсійныя саюзы, судовы апарат, Ліга жанчын, легалізавана беларуская нацыянальная сымболіка — сьцяг і герб “Пагоня”, арганізаваны Цэнтральны саюз каапэрацыі. Неўзабаве Кубэ выдаў распараджэньне, згодна зь якім

ранейшыя “раёны” атрымалі назву “акругаў”, а бурмістры пачалі звацца “гарадзкі галава”, “акруговы галава” і “валасны галава”. Пачаліся размовы на прадмет адкрыцьця ўнівэрсытэту ў Менску.

У атмасфэры эўфарыі, выкліканай саступкамі з боку Кубэ, у канцы ліпеня 1942 г. у Менску адбыўся зьезд БНС. Зьезд адзначыў, што за кароткі час БНС зьмяніла свой характар і апроч дабрачыннай дзейнасьці кіруе цяпер у агульнадзяржаўным маштабе школьніцтвам, культурніцкай дзейнасьцю, палітыкай, прапагандай, прыступіла да арганізацыі войска, адбудовы гаспадарчага жыцьця і г.д. “З гэтага вынікае, — гаварылася ў справаздачы зьезду, — што БНС зрабілася цэнтрам пачынаньняў усяго беларускага жыцьця, ягоным кіраўнічым штабам”. Зьезд запатрабаваў зьменаў у статуце БНС і прызнаньня яе фармальных правоў на самакіраваньне[35].

Ермачэнка быў у зэніце кар’еры, усё бліжэйшай падавалася яму пасада прэм’ера беларускага ўраду, на якую яго вёў Кубэ. Генэральны камісар глыбока верыў у жыцьцёвасьць сваіх плянаў — якраз у гэты час на Эльбрусе залунаў сьцяг Райху, а нямецкія войскі дайшлі да Волгі. Ермачэнка пачуваўся дастаткова моцным, хаця ўсё ж асьцерагаўся магчымай канкурэнцыі з боку Іваноўскага: ён не ўключыў апошняга ў склад Галоўнай рады БНС. Іваноўскаму гэта патлумачылі так: маўляў, культурна–асьветніцкая праца ў Менску была так добра арганізаваная гарадзкой управай, што Галоўная рада ўжо ня мусіла пра яе клапаціцца. Толькі пасьля таго, як умяшаўся Кубэ, Іваноўскі быў кааптаваны ў Раду і як яе сябра падпісаў у ліпені заклік уступаць у атрады самаабароны[36].

Пэрспэктыва мець уласныя ўзброеныя сілы здавалася ў той час цалкам рэальнай — найярчэй пра гэта сьведчыла адкрыцьцё ў Менску і іншых мясьцінах Беларусі курсаў падрыхтоўкі афіцэраў і сяржантаў. Гэта натхняла ўсе беларускія аб’яднаньні да актывізацыі сваёй дзейнасьці. У ліпені 1942 г., падчас зьезду БНС, пад кіраўніцтвам Усевалада Родзькі была створана Беларуская незалежніцкая партыя (БНП). Яна выдавала свой бюлетэнь і заклікала бескампрамісна змагацца за незалежнасьць Беларусі зь немцамі, палякамі і савецкімі партызанамі.

Разгортвала сваю дзейнасьць таксама і Партыя беларускіх

нацыяналістаў (ПБН), лідар якой, Янка Станкевіч, з восені 1941 г. знаходзіўся ў Менску, шчыльна супрацоўнічаючы зь Іваноўскім. У акоўскім рапарце за ліпень 1942 г. пісалася: “ПБН, якая робіць стаўку на Англію і Польшчу, налічвае каля 500 чалавек. Яе ўзначальвае Цэнтральны камітэт, старшынём якога зьяўляецца Станкевіч. ЦК у цяперашні момант месьціцца ў Менску, складаецца з 8 заходнікаў і 4 усходнікаў (нацдэмаў). Партыя пабудаваная сыстэмай пяцёрак. У большасьці раёнаў ёсьць свае партыйныя асяродкі. Камунікацыйныя цяжкасьці абмяжоўваюць прыём у партыю: спаміж прыдатных да працы і ідэалягічна роднасных асобаў прымаюць толькі тых, службовае становішча якіх робіць іх неабходнымі партыі. Абавязак кожнага чальца партыі — стварацъ вакол сябе як мага шырэйшае “магнэтычнае поле” з мэтай фармаваньня сапраўдных беларусаў”[37].

Тактыку ПБН рапарт апісваў наступным чынам: “Хаця беларусы хочуць дзейнічаць у паразуменьні з Польшчай, у гэты момант яны вымушаны манэўраваць так, каб не адштурхнуць ад сябе немцаў, прынамсі, пакуль ня будзе ўтворана беларускае войска (яно мае налічваць 150 000 чалавек), таму цяпер галоўная задача — ўкараняць сваіх людзей у вайсковыя аддзелы з тым, каб яны ўтваралі партыйныя ячэйкі, аж да поўнага апанаваньня войска і паліцыі. (...) Беларусы імкнуцца мірным шляхам атрымаць ад немцаў як мага больш, а рэшту забраць, калі немцы будуць цалкам разгромленыя”[38].

Рэалізацыя палітычнай стратэгіі ПБН, г.зн. атрыманьне падтрымкі ў Англіі і Польшчы, залежала, аднак, у вялікай ступені не ад актыўнасьці на мясцовым узроўні, але ад вынікаў місіі Кастравіцкага, які пасьля візыту да Іваноўскага ў канцы лістапада 1941 г., ігнаруючы дырэктывы Зана, раптоўна вярнуўся ў Варшаву. Фармальна кажучы, гэта была несубардынацыя, невыкананьне загаду, што магло б кепска скончыцца для Кастравіцкага. Такім быў кошт двайной гульні, дзе Кастравіцкі мусіў таксама ўлічваць інтарэсы беларускага боку. Але ня здарылася нічога благога.

У студзені 1980 г. Бэрнард Закшэўскі, былы начальнік контравыведкі Галоўнага Ўпраўленьня ZWZ–AK (псэўданім “Оскар”) растлумачыў аўтару прычыну незразумелых паводзін Кастравіцкага. Калі Кастравіцкі вярнуўся ў Варшаву, то накіраваўся не да Зана, а да начальніка штабу Галоўнага

ўпраўленьня, генэрала Тадэвуша Пялчыньскага (“Гжэгожа”), якому перадаў прывезеную ад Іваноўскага важную інфармацыю. Пасьля гэтага Пялчыньскі адрэкамэндаваў Кастравіцкага Закрэўскаму і загадаў уладкаваць яго у аддзел контрвыведкі на пасаду кіраўніка ячэйкі “996”, у кампэтэнцыі якой знаходзіліся ў тым ліку беларускія справы.
Працуючы на гэтай пасадзе, Кастравіцкі намагаўся стварыць у Галоўным упраўленьні спрыяльны клімат для перамоваў з прадстаўнікамі ПБН, пра што безвынікова спрабаваў дамовіцца Станкевіч увесну 1941 г. Нам не вядомыя падрабязнасьці, але вядома, што ў выніку Галоўнае ўпраўленьне зьмяніла сваё стаўленьне да кантактаў з ПБН. Так, калі раней ў рапартах падкрэсьлівалася ў асноўным беларускае супрацоўніцтва зь немцамі, з пачаткам 1942 г. у данясеньнях камэнданта ZWZ–AK Стэфана Равецкага зьяўляюцца новыя адценьні: ён піша, што сярод беларусаў у Менску расьце антынямецкая апазыцыя, якая шукае кантактаў з палякамі, і нават што беларусы гатовыя падтрымаць польскае паўстаньне, плянаванае пад канец вайны[39].
Пазыцыю Галоўнага ўпраўленьня выразна акрэсьліў адмысловы рапарт наконт беларускага пытаньня, адасланы Сікорскаму ўвесну 1942 г. У рапарце адзначалася, што сярод беларускіх кіраўнікоў і народных масаў расьце вера ў паразу гітлераўскай Германіі, у сувязі з чым “некаторыя дзеячы, ня згодныя з палітыкай Шчорса, шукаюць кантактаў з польскімі групоўкамі, жадаючы паразумецца на грунце супольнай абароны ад Расеі. Гэтыя людзі прагнуць вызваліць усю Беларусь з дапамогай Польшчы і ўтварыць з намі шчыльную фэдэрацыю, аднак высоўваюць максымальныя тэрытарыяльныя прэтэнзіі і вызначаюць будучую мапу Беларусі ад Рослаўля да Бяла–Падляскі ўлучна. Праграма нацыяналістаў, якія дзейнічаюць на месцах, зводзіцца, у сувязі з эвэнтуальнай паразай Германіі, да як мага паўнейшага апанаваньня краінай у адміністрацыйным, гаспадарчым і культурным пляне, каб потым паставіць перад фактам усіх будучых прэтэндэнтаў на гэтую тэрыторыю”[40].
У рапарце падкрэсьлівалася, што “калі мы пакінем бяз водгуку спробы беларусаў знайсьці кантакты з польскім бокам, гэтыя спробы могуць быць перакрэсьленыя новымі канцэсіямі (у тэксьце памылкова — канцэпцыямі. — *Ю.Т.*) немцаў”. Для аб’яднаньня беларускіх масаў прапаноўваліся наступныя крокі:

— выдаць адозву польскага ўраду да беларусаў пра супольнае жыццё абодвух народаў пасьля вайны, у якой асабліва падкрэсьліваліся б пытаньні эканамічныя (рэформа сельскай гаспадаркі) і культурныя;
— запрасіць прадстаўнікоў беларускага грамадзтва ў лёнданскую Раду Народаў;
— тэрмінова распачаць на месцах прапаганду, якая б нэўтралізавала антыпольскія аргумэнты;
— зьвярнуцца ад імя польскага ўраду да Ватыкану з прапановай прызначыць для этнічна беларускіх рэгіёнаў біскупа беларускай нацыянальнасьці.
Асаблівую ўвагу заслугоўвае пададзеная ў рапарце прапанова "тэрмінова скантактавацца з тымі беларускімі дзеячамі, якія шукаюць падтрымкі ў Польшчы", а таксама скіраваная да Сікорскага просьба выдаць дырэктыву, "шчыльна зьвязаную з плянаванай акцыяй паўстаньня і авалоданьня нашымі ўсходнімі тэрыторыямі, дзе жыве беларускі народ"[41]. Гэта азначала, што Галоўнае ўпраўленьне прыняло прапанову Партыі беларускіх нацыяналістаў аб перамовах, але толькі пры захаваньні *status quo* ў тэрытарыяльным пытаньні.
Гэты рапарт патрапіў у Лёндан адносна хутка, а вынікам яго было перададзенае тэлеграфам 25 чэрвеня 1942 г. распараджэньне пашырыць дыяпазон інфармацыі зь Беларусі, атрыманай праз друк і непасрэдна на месцах, а таксама падаць падрабязныя зьвесткі аб беларускіх дзеячах. Эміграцыйны ўрад, аднак, устрымаўся ад якой–кольвечы ацэнкі рапарту і ад выданьня дырэктываў, пра якія прасіла Галоўнае ўпраўленьне[42]. У гэтай сытуацыі кіраўніцтва АК самастойна вырашыла ажыццявіць некаторыя з прапановаў, пра якія ішла гаворка ў вышэйзгаданым рапарце. Адным з такіх крокаў была распачатая ў сярэдзіне 1942 г. прапаганда сярод палякаў і беларусаў з мэтай стварыць настрой узаемнай зычлівасьці, гатоўнасьці да яднаньня і супольных абарончых дзеяньняў. Але гэтая акцыя, якой асабіста цікавіўся Равецкі, не дасягнула плянаваных вынікаў, а ўлёткі, выдаваныя ў тым ліку і на беларускай мове, траплялі на неспрыяльную глебу[43]. І тады было прынята рашэньне распачаць перамовы з ПБН.
Першая сустрэча адбылася ў канцы ліпеня 1942 г. у Менску, куды накіравалася прадстаўніца Галоўнага ўпраўленьня Дабрыньская ("Эва"). Як вынікае зь яе падрабязнай

справаздачы, пасьля яе прыезду і ўсталяваньня кантактаў з Станкевічам ён склікаў паседжаньне Цэнтральнага камітэту Партыі беларускіх нацыяналістаў, які пацьвердзіў імкненьне да супрацоўніцтва з Польшчай, так акрэсьліваючы сваю пазыцыю і патрабаваньні:
— прызнаецца немэтазгодным распачынаць узброеную барацьбу зь немцамі; да часу стварэньня беларускага войска захоўваецца ўяўная ляяльнасьць;
— ствараецца беларуская дзяржава з заходняй мяжой уздоўж лініі Керзона;
— пасьля вайны ствараецца польска–беларуская дзяржаўная унія з агульным міністэрствам замежных справаў:
— польскі ўрад рэпрэзэнтуе беларускае пытаньне перад урадам Вялікабрытаніі;
— палякі адкідаюць намеры заняць адміністрацыйныя пасады ў Заходняй Беларусі, а беларусы адначасова спыняюць антыпольскую прапаганду[44].
Вызначаючы сваё стаўленьне да часткі высунутых патрабаваньняў, Дабрыньская заявіла, што хаця польскія ўлады маюць жаданьне супрацоўнічаць з ПБН, з прынцыповых поглядаў яны ня могуць адмовіцца ад рыскай мяжы. Станкевіч, відаць, прадбачыў такі адказ польскага боку і прапанаваў лічыць спрэчныя тэрытарыяльныя праблемы адкрытым пытаньнем, што магло б паспрыяць прагрэсу ў абмеркаваньні астатніх праблемаў. Дамовы з палякамі Цэнтральны камітэт ПБН хацеў захаваць у таямніцы ня толькі ад немцаў, але і ад большасьці чальцоў сваёй партыі, матывуючы гэта тым, што ў беларускім грамадзтве існуе падазронасьць і нядобразычлівасьць да Польшчы. Канстатацыя цяжкасьцяў і разыходжаньняў па пэўных праблемах не скасавала, аднак, двухбаковых надзеяў на паразуменьне, вынікам чаго стала запрашэньне Станкевіча ў Варшаву для працягу перамоваў[45].
Перамовы, распачатыя паміж Галоўным Упраўленьнем АК і Партыяй беларускіх нацыяналістаў, выклікалі незадавальненьне Прадстаўніцтва ўраду. Як сьведчаць заўвагі на палях справаздачы “Эвы”, пазыцыя БНП ацэньвалася Прадстаўніцтвам як двухаблічная кан’юнктурная палітыка, а прапанова аб супрацоўніцтве, абвешчаная ў Менску прадстаўніцай Галоўнага ўпраўленьня, прызнаная беззаконнай. Пры гэтым Прадстаўніцтва ўраду ніяк не акрэсьліла свайго

стаўленьня да патрабаваньняў беларускага боку, заўважыўшы, што спачатку ПБН павінна падтрымаць супольную ўзброеную акцыю супраць Германіі, а ўжо потым весьці гаворку пра нейкае магчымае паразуменьне. Аднак у чарговай справаздачы Прадстаўніцтва перад урадам пра гэта не было ні слова, затое не пашкадавана фарбаў для крытыкі ПБН. Гаварылася, што праальянская арыентацыя ПБН — гэта “толькі тэорыя”, што хаця партыя сапраўды антынямецкая, але яе чальцы супрацоўнічаюць зь немцамі, а дзейнасьць самой партыі “абмяжоўваецца ў гэты момант вынішчэньнем польскасьці рукамі акупанта”[46]. Як бачым, Прадстаўніцтва было катэгарычна супраць стасункаў зь беларускім падпольлем і, відаць, намагалася такім чынам паўплываць на пазыцыю Сікорскага, які абяцаў у найбліжэйшым часе выслаць дырэктывы наконт беларускага пытаньня[47].

Але неўзабаве ў Варшаве наступіла пэўнае пацяпленьне ў стаўленьні да ПБН. У значнай ступені гэта было выклікана зьменай на пасадзе Прадстаўніка ўраду, якую пасьля сьмерці Ратайскага ў верасьні 1942 г. заняў сябра Народнай партыі Пекалкевіч. Ён быў большым прыхільнікам паразуменьня зь беларусамі, чымся ягоны папярэднік. Таму старшыня ЦК ПБН Станкевіч (“Гжацкі”), які прыехаў у Варшаву ў канцы сьнежня, безь вялікіх цяжкасьцяў дамовіўся з Тамкевічам (“Кшыштафам”) правесьці 26–28 студзеня 1943 г. канфэрэнцыю па пытаньнях супрацоўніцтва. У канфэрэнцыі павінны былі ўзяць удзел у тым ліку і сябры Прадстаўніцтва ўраду. На пазасталы да канфэрэнцыі час Станкевіч выехаў у Прагу і Кракаў. Інфармуючы пра сваю сустрэчу з Станкевічам, Тамкевіч зьвяртаў увагу кіраўніцтва, што ПБН праз сваё віленскае аддзяленьне здолела паразумецца зь літоўцамі, мае шчыльныя кантакты з чэхамі і вельмі разьлічвае на іхную дыпляматычную дапамогу, а таксама намагаецца дамовіцца з украінцамі[48]. Цяжка сказаць, у якой ступені гэтая інфармацыя адпавядала сапраўднасьці, а ў якой была прызначана ўзмацніць становішча ПБН перад надыходам канфэрэнцыі. Але фактам ёсьць тое, што інфармацыі быў нададзены афіцыйны характар. Паводле справаздачы Дабрыньскай — адной з арганізатараў і ўдзельнікаў канфэрэнцыі — у ёй бралі ўдзел Макавецкі і Тамкевіч з Галоўнага ўпраўленьня АК, а таксама сябры Прадстаўніцтва ўраду і палітычных партыяў — сацыялістаў і

народнікаў[49]. Як можна бачыць з ужо згаданага рапарту Тамкевіча (“Кшыштафа”) ад 21 сьнежня, Станкевіч хацеў абмеркаваць пытаньне аб незалежнасьці беларускай дзяржавы, якая б “у той ці іншай ступені абапіралася на Польшчу”, а таксама аб выданьні польскім урадам дэклярацыі пра неабходнасьць стварэньня такой дзяржавы. Але старшыня ЦК ПБН і надалей ня бачыў патрэбы рыхтаваць антынямецкую збройную акцыю, затое пагаджаўся распачаць прапагандысцкую дзейнасьць на карысьць паразуменьня з Польшчай.

Згодна зь сьведчаньнем Дабрыньскай, у бурлівай дыскусіі дамінавала, аднак, тэрытарыяльная праблема, прычым ніводны з бакоў не хацеў саступаць са сваёй пазыцыі. Можна здагадвацца, што не прайшла і прапанова пакінуць праблему мяжы ў якасьці адкрытага пытаньня. У выніку дыскусія пра асноўныя патрабаваньні ПБН рабілася беспрадметнай. Адначасова польскі бок настойваў, каб беларусы абавязкова далучыліся да супольнай антынямецкай вайсковай акцыі, на што Станкевіч у рэшце рэшт пагадзіўся. Удзел ПБН у гэтай акцыі пакуль мусіў выражацца ў арганізацыі на Беларусі сеткі базаў для Арміі Краёвай. Такім чынам, адзіным пытаньнем, па якім на варшаўскай канфэрэнцыі ўдалося дасягнуць згоды, было абмежаванае ваеннае супрацоўніцтва. Аднак абодва бакі зьвязвалі з гэтым розныя разьлікі. Станкевіч бачыў тут магчымасьць падтрымліваць кантакт з польскім падпольлем — у надзеі, што польскі ўрад прызнае незалежніцкія памкненьні беларусаў. Польскі бок, у сваю чаргу, спадзяваўся, што ПБН падтрымае пазыцыі польскага ўраду па пытаньні ўсходняй мяжы. На думку палякаў, пасьля разгрому немцаў пад Сталінградам пазыцыя польскага боку была больш рэальнай, чым канцэпцыя беларускіх нацыяналістаў.

Пра гэта сьведчыць наступная дэпэша Пекалкевіча наконт канфэрэнцыі з Станкевічам, накіраваная да ўраду 12 лютага 1943 г.: “Адбылася размова з старшынём беларускай незалежніцкай арганізацыі, які вяртаўся з Прагі. Ён хоча супрацоўнічаць з намі, але жадае, каб былі фармальна замацаваныя правы, якія беларусы атрымаюць у Польшчы. Мы вылучылі прапанову аб роўных правах беларускай і польскай моваў у судах першай інстанцыі, у староствах і мясцовым самакіраваньні, а таксама аб пачатковых і сярэдніх беларускіх

школах. (...) Прашу вашых інструкцыяў наконт беларускага пытаньня”[50]. Такім чынам, Паўнамоцны прадстаўнік ураду нават не назваў праблемы, якія цікавілі кіраўніцтва ПБН, а замест таго сфармуляваў пытаньні чыста ўнутрыдзяржаўнага характару.

Падобным чынам паводзіла сябе і Галоўнае ўпраўленьне АК. Для польскай палітыкі было б вельмі карысна аб’яднаць беларусаў і ўкраінцаў, пісаў Равецкі ў Лёндан. І працягваў: “Гэта магло б (...) забясьпечыць нам падтрымку англасаксаў наконт памянёнага пытаньня (аб усходніх тэрыторыях. — *Ю.Т.*) і абцяжарыць гульню расейцам. Каб дасягнуць такой мэты, неабходна мець выразную дэклярацыю пра раўнаньне ў правах гэтых меншасьцяў і пра забесьпячэньне ім магчымасьці культурнага разьвіцьця. Не дастаткова будзе адных абяцаньняў, трэба было б выдаць адпаведныя дэкрэты і распараджэньні. Калі мы ўтрымаем ўсходнія землі, гэтыя акты так ці йнакш прыдадуцца, а калі не — дык усё адно не зашкодзяць”[51].

Акрэсьліць правы беларусаў і ўкраінцаў патрабавала ад ураду таксама рэзалюцыя Пагаджальнага палітычнага камітэту, ухваленая 14 лютага 1943 г. галасамі народнікаў, сацыялістаў і старшыні. Супраць рэзалюцыі галасавала Нацыянальная партыя і Партыя працы[52]. Аднак урад не зьмяняў сваёй ранейшай пазыцыі. Як сфармуляваў прэзыдэнт РП Рачкевіч у сваёй навагодняй прамове, “адзіным рэальным і найтрывалым апірышчам польскай дзяржавы на ўсходніх землях ёсьць перш за ўсё карэннае польскае насельніцтва. (...) Першая і галоўная задача нашай палітыкі на ўсходніх землях — узмацненьне польскага элемэнту, на які павінна абапірацца ўся палітыка ў дачыненьні да тамтэйшых нацыянальных меншасьцяў”[53].

Тэндэнцыі да паразуменьня зь беларусамі зь цяжкасьцю трымаліся ў Прадстаўніцтве ўраду толькі ў пэрыяд пяцімесячнага знаходжаньня на пасадзе Пекалкевіча. Пасьля ягонага арышту 19 лютага 1943 г., чарговым Паўнамоцным прадстаўніком ураду быў прызначаны сябра Партыі працы Янкоўскі. Адбыўся паварот да папярэдняга курсу, і цяпер дамінавалі погляды Нацыянальнай партыі і Партыі працы. Істотна паўплывала на радыкалізацыю пазыцыі Прадстаўніцтва разарваньне ў красавіку 1943 г. дыпляматычных стасункаў СССР з польскім урадам, у выніку чаго перасталі дзейнічаць ранейшыя тактычныя погляды на ўсходнюю палітыку. Так, у

дасланых у ліпені ў Лёндан “Нататках аб нашай міжнароднай палітыцы” Прадстаўніцтва прапаноўвала затрымаць Чырвоную Армію на мяжы паводле Рыскага трактату і нават адсунуць гэтую мяжу далей на ўсход, далучыўшы да Польшчы Менск і Камянец–Падольскі ў якасьці рэпарацыі[54].
Пры такіх плянах беларускае пытаньне дачыста зьнікала з поля зроку Прадстаўніцтва. “Беларускі народ, — сьцьвярджала яно сьледам за Нацыянальнай партыяй, — не стварыў аж да цяперашняй вайны ані на нашай, ані на савецкай тэрыторыі нічога накшталт уласнае культуры, традыцый, літаратуры, ані эліты, здольнай кіраваць лёсамі нацыянальнага ці дзяржаўнага жыцьця”, у сувязі з чым Прадстаўніцтва ня бачыла падставаў для стварэньня буфэрнай дзяржавы і выказвалася за поўную палянізацыю беларускіх крэсаў зь Меншчынай улучна[55].

На пачатку 1943 г. перад Іваноўскім замаячыла пустэча. Ён мог нарэшце ўсьвядоміць: разьлік на тое, што Польшча падтрымае пытаньне беларускай дзяржаўнасьці, быў абсалютна памылковы. Пра гэта сьведчыла інфармацыя, атрыманая ад Станкевіча і Кастравіцкага, у гэтым пераконвала навагодняя прамова прэзыдэнта Рачкевіча. Польшча не хацела Беларусі. Усе неверагодныя высілкі Іваноўскага, якія схілілі кіраўніцтва польскага падпольля да перамоваў, аказаліся марнымі, яны не прынесьлі нічога, хіба што засьведчылі намеры беларусаў. Непатрэбнай была і сыстэма сувязяў з Варшавай, функцыянаваньне якой спараджала толькі фантазіі руплівых даносчыкаў[56].
Можна, аднак, думаць, што нягледзячы на непрыхільнае стаўленьне Варшавы і Лёндану, Іваноўскі і на гэты раз ня выракся канцэпцыі беларуска–польскай фэдэрацыі, да якой яго падштурхнула ў 1919 г. пазыцыя Леніна. І хаця ён сапраўды ня бачыў ніякай магчымасьці рэалізаваць сваю ідэю пад час гэтай вайны, але ж таксама ня бачыў аніякай альтэрнатывы ёй у будучыні. У гэтым пераканаьні яго замацоўвалі вынікі савецкай нацыянальнай палітыкі, зь якімі ён штодня сутыкаўся ў Менску. Менавіта з гэтай прычыны Іваноўскі не лічыў магчымым вырашыць праблему беларускай дзяржаўнасьці ў межах СССР і адхіляў неаднаразовыя прапановы супрацоўнічаць з савецкім падпольлем[57].
Верагодна, яго моцна ня ўзрушыла параза нямецкіх войскаў

пад Сталінградам — Іваноўскі даўно ня верыў у зваяваньне Расеі і таму не разьлічваў адбудаваць беларускую дзяржаву з дапамогай Германіі. Тым больш ня мог ён разьлічваць на гэта на пачатку 1943 г., калі пачалося масавае адступленьне войскаў Вэрмахту на ўсходнім фронце. Такім чынам, сытуацыя была безнадзейная. У гэты момант Іваноўскі мог толькі ці адмовіцца ад палітычнага жыцьця і зьехаць зь Менску, ці ўступіць на хісткі шлях. Ён выбраў апошняе, спадзеючыся на ўзмацненьне нацыянальных сіл у выніку палітыкі Кубэ. Разьвіцьцё падзей у Беларусі ставіла, аднак, гэтыя спадзяваньні пад вялікі пытальнік. Пашыралася дзейнасьць савецкіх партызанаў, якімі кіравалі і якіх падтрымлівалі з–за лініі фронту. Партызаншчына правакавала ўзмацненьне карных паліцыйных акцыяў, якія суправаджаліся паленьнем вёсак, вынішчэньнем альбо дэпартацыяй жыхароў, падазраваных у дапамозе партызанам, і іншымі злачынствамі. Падчас такіх акцыяў загінула каля 100 тысяч беларускіх сялянаў, у большасьці гэта былі старыя, жанчыны і дзеці.
Кубэ ўсьведамляў, што злачынствы супраць мірных жыхароў з боку SS і паліцыі перакрэсьліваюць усю ягоную палітыку, разьлічаную на заваёву сымпатый насельніцтва. З гэтай прычыны, а таксама з гуманістычных пабуджэньняў ён распачаў барацьбу з SS, абараняючы нявінных людзей. Кубэ ня мог аддаваць загады паліцыйным уладам, але ён выкрываў злачынствы карных аддзелаў, інфармаваў пра іх вышэйшае кіраўніцтва ў Бэрліне і разьлічваў, што ягонае заступніцтва прынясе плён. На гэтай глебе разгарэўся востры канфлікт, і кіраўніцтва SS паспрабавала выжыць Кубэ зь Менску.
У сьнежні 1942 г. паліцыйныя ўлады Бэрліну і Менску распачалі кампанію, накіраваную на палітычную дыскрэдытацыю Кубэ як ініцыятара “супярэчных” інтарэсам Германіі беларускіх нацыянальных рухаў. У першую чаргу ўзяліся за кіраўніцтва БНС, зьбіраючы доказы яго “злачыннай дзейнасьці”. Галоўны ўдар прыйшоўся па Ермачэнку, супраць якога высунулі найцяжэйшае абвінавачваньне ў дзяржаўнай здрадзе. Кубэ, аднак, абараняў Ермачэнку, а разам зь ім і прынцыпы сваёй палітыкі, якая ўсё ж такі мела прыкрыцьцё ў рашэньнях вышэйшых нямецкіх цывільных уладаў. Таму сьледзтва занялося аналізам гаспадарчай дзейнасьці БНС, дзе яно выкрыла злоўжываньні. Ермачэнка быў вымушаны сысьці з

пасады і 27 красавіка 1943 г. пакінуў Менск.
Ратуючы Ермачэнку, Кубэ абараніў сваю асабістую пазыцыю, але заплаціў за гэта разбурэньнем усяго палітычнага мэханізму, які ён пасьлядоўна ствараў зь верасьня 1941 г. Пад націскам паліцыйных уладаў увесну 1943 г. былі зьліквідаваныя ўсе не прадугледжаныя статутам БНС структуры, у тым ліку і Галоўная рада. Дазволілі толькі дзейнасьць у галіне грамадзкай апекі і аховы здароўя. Спыніла сваё існаваньне таксама інстытуцыя Мужоў Даверу БНС, а ў красавіку 1943 г. была распушчана Беларуская самаабарона. Арыштавалі і закатавалі ксяндза Гадлеўскага. А Іваноўскага зноў абвінавацілі ў спрыяньні польскім элемэнтам і хацелі зьняць яго з пасады бурмістра Менску. Яго ўратавала толькі тое, што SD не знайшло доказаў яго сувязі зь Ермачэнкам[58]. Пэўна, і на гэты раз не абышлося без дапамогі Кубэ.
Атакі паліцыйнай апазыцыі (іх узначальваў прызначаны Гімлерам кіраўнік SS і паліцыі на Беларусі брыгадэнфюрэр Курт фон Готбэрг) ня змусілі Кубэ адмовіцца ад прабеларускай палітыкі, якую натхняў і падтрымліваў Іваноўскі. Але на гэты раз Кубэ дзейнічаў больш асьцярожна і ўсе важнейшыя ініцыятывы ўзгадняў з бэрлінскім міністэрствам па справах акупаваных усходніх тэрыторыяў.
Так, у сакавіку 1943 г. Кубэ выдаў распараджэньне аб узбуйненьні зямельных надзелаў, што мела на мэце стварыць рацыянальныя з эканамічнага гледзішча гаспадаркі. Рэформа пачала ажыцьцяўляцца. Посьпехам скончыліся ягоныя намаганьні адчыніць мэдыцынскі інстытут — першую вышэйшую навучальную ўстанову ў Беларусі, створаную пад нямецкай акупацыяй. У чэрвені быў арганізаваны Саюз беларускай моладзі, а таксама Беларускае навуковае таварыства зь Іваноўскім на чале. Разам з мэдыцынскім інстытутам яно стварала кадравыя падставы і фармальны прэцэдэнт для адкрыцьця ўнівэрсытэту і тэхналягічнага інстытуту ў Менску, пра што ўвесь час марыў Іваноўскі. Адхіленьне Ермачэнкі і абмежаваньне кампэтэнцыі БНС перакрэсьлілі надзеі Кубэ стварыць на базе гэтай арганізацыі цэнтральны беларускі орган самакіраваньня. Ён не адмовіўся ад гэтай задумы, але нежаданьне Гітлера рабіла яе безнадзейнай. Таму, атрымаўшы згоду Розэнбэрга, 27 чэрвеня 1943 г. Кубэ ўтварыў Камітэт даверу ў якасьці інтэгральнай

часткі генэральнага камісарыяту, што ахоўвала яго ад лёсу кіраўніцтва БНС. Камітэт Даверу разглядаўся як сымбалічнае пакуль беларускае нацыянальнае прадстаўніцтва, якое ў спрыяльных умовах магло б быць санкцыянавана Бэрлінам і пераўтворана ў орган самакіраваньня.
Камітэт даверу (больш вядомы пад назвай Рада даверу) складаўся з 16 асобаў, ніводная зь якіх не ўваходзіла ў каманду Ермачэнкі. Гэта, безумоўна, таксама было зроблена з мэтай абараніць яго ад нападак SS–аўскай апазыцыі. Старшынём Камітэту Кубэ прызначыў Вацлава Іваноўскага, але, памятаючы пра ранейшыя даносы на яго, функцыі старшыні даручыў яму часова: тэрмінам на адзін год. Такім парадкам Кубэ, відаць, падстрахоўваўся ад магчымых неспадзяванак.
У выступленьні з нагоды скліканьня Камітэту даверу Кубэ паўтарыў сваю тэзу, што “мы прыйшлі сюды як пераможцы, але пераможцы бальшавізму, а не беларусаў, для якіх мы ёсьць вызваляльнікамі”, і заклікаў Камітэт так арганізаваць беларускі народ, “каб ён быў на ўзроўні эўрапейскіх народаў”. Асаблівай увазе Камітэту Кубэ даручыў тры задачы: клопат пра разьвіцьцё школьніцтва і выхаваньне моладзі; адбудову эканомікі і клопат аб пражытку; і, урэшце, дапамогу ў барацьбе з партызанамі[59].
Па гэтых пытаньнях Камітэт абавязаны быў выпрацаваць прапановы да супольнага паседжаньня зь нямецкімі ўладамі. Гэтае паседжаньне — першае і адзінае — адбылося 23 жніўня 1943 г., у ім удзельнічалі чальцы Камітэту, Кубэ і іншыя вышэйшыя функцыянэры генэральнага камісарыяту, а таксама афіцэры SS і паліцыі на чале з Готбэргам. Як пісаў Аўген Калубовіч, былы сябра Камітэту даверу і ўдзельнік паседжаньня, разглядаліся тры пытаньні: рэпрыватызацыя нерухомасьці, школьніцтва і мэтады барацьбы з партызанамі. Дакладчыкам па першым пытаньні быў Іваноўскі. Ён запатрабаваў у інтарэсах адбудовы беларускай эканомікі вярнуць былым уладальнікам нерухомасьць, нацыяналізаваную савецкай уладай. Калубовіч рэфэраваў пытаньне аб школьніцтве, просячы дазволіць адкрыцьцё ўнівэрсытэту, не чыніць перашкодаў у стварэньні сярэдніх школ і прысьпешыць выданьне школьных падручнікаў. Абодва гэтыя пытаньні ня выклікалі вялікіх спрэчак і былі прынятыя да выкананьня.
Па трэцім пытаньні выступаў Аляксандар Русак. Ён падаў сабраныя Камітэтам даверу доказы злачынстваў паліцыйных

аддзелаў у часе антыпартызанскіх карных акцыяў. Выражаючы пратэст Камітэту супраць такіх мэтадаў, выклаў наступныя прапановы: а) спыніць спальваньне вёсак і рэпрэсіі супраць нявіннага насельніцтва; б) стварыць умовы і рэальныя гарантыі бясьпекі для асобаў, якія б вярнуліся зь лясоў дадому; в) стварыць нямецка–беларускую камісію, якой даручыць выдачу адпаведных распараджэньняў і кантроль за іх выкананьнем. Паводле Калубовіча, выкладзеная Русаком пазыцыя Рады даверу выклікала абурэньне прысутных афіцэраў SS і паліцыі. “Але мы былі зьдзіўленыя, — пісаў Калубовіч, — калі Кубэ (...) пачаў апраўдвацца перад Радай даверу, тлумачыць, што ягонай віны тут няма, што гэта робяць незалежныя ад яго органы і што ён нібыта скардзіўся ў Бэрлін наконт такіх дзеяньняў. Нашыя засьцярогі, што Раду даверу арыштуюць, ня спраўдзіліся. Іваноўскаму не давялося чытаць Дэклярацыю незалежнасьці, якая ляжала ў нутраной кішэні ягонага пінжака (яна была загадзя падрыхтаваная на выпадак магчымага арышту Камітэту. — *Ю.Т.*). Але потым мы яшчэ доўга баяліся, што немцы могуць расправіцца з намі (...). Не выключалі мы і мажлівасьці, што органы SD і SS не даруюць таксама і В.Кубэ”[60].

Асьцярогі чальцоў Камітэту былі не беспадстаўныя. Пасьля безвыніковых спробаў выдаліць Кубэ зь Менску, у якіх прымалі ўдзел найвышэйшыя, аж да самога Гімлера, прадстаўнікі SS, 22 чэрвеня ў менскім тэатры на яго быў арганізаваны замах. Міна пад сцэнай павінна была выбухнуць, калі Кубэ выступаў з урачыстай прамовай з нагоды ўтварэньня Саюзу беларускай моладзі. Але выбух адбыўся пазьней, у часе спэктаклю, на якім Кубэ ўжо не прысутнічаў. Загінула 13 чалавек і некалькі дзясяткаў было паранена. Прамаўляючы над брацкай магілай, Іваноўскі не паўтараў сьледам за прэсай “адкрыцьцяў” наконт бальшавіцкіх агентаў, а пасьля пахаваньня ў вузейшым коле сказаў: “Дзякуем і за вызваленьне, і за гэтыя ахвяры”[61].

Затое ўдаўся наступны замах на Кубэ, у ноч з 21 на 22 верасьня, і такім чынам пацьвердзіліся прадбачаньні чальцоў Камітэту. Для Іваноўскага гэта быў шок. Надыходзіў канец эпохі, якая, нягледзячы на цяжкасьці ваеннага часу, стварала сэнс дзеяньня ва ўмовах акупацыі. Кубэ быў адзіным уплывовым нямецкім палітыкам, які паважаў і падтрымліваў беларускае нацыянальнае пытаньне, бачачы ў пэрспэктыве

ягонае вырашэньне ў выглядзе беларускай дзяржавы пад пратэктаратам нямецкага Райху. І хаця ваенная сытуацыя перакрэсьлівала гэтую пэрспэктыву, пазыцыя Кубэ ішла насустрач чаканьням беларускіх нацыянальных колаў і рабіла магчымым дасягненьне вынікаў, якія ў будучыні маглі б выступаць у якасьці гістарычных аргумэнтаў. Асаблівае значэньне мела вялікамаштабнае разьвіцьцё нацыянальнай сьвядомасьці, да нядаўняга часу блякаванай і нішчанай савецкімі ды польскімі ўладамі.
Такая ацэнка Іваноўскім дзейнасьці Кубэ ўтрымлівалася ў заяве Камітэту даверу, зробленай пасьля сьмерці генэральнага камісара. Заява заслугоўвае ўвагі яшчэ й таму, што чальцы Камітэту паўстрымаліся назваць выканаўцаў замаху "маскоўскімі агентамі". Вось яе зьмест:

*"22 верасьня загінуў ад рукі трусьлівага злачынцы генэральны камісар Беларусі, гаўляйтар Вільгельм Кубэ. Вестку пра гэтую трагічную сьмерць беларусы сустрэлі з глыбокім абурэньнем. У асобе памерлага беларускі народ страціў свайго найлепшага сябра і супрацоўніка ў барацьбе за інтарэсы Беларусі. Беларусы верылі і адчувалі, што іх жаданьні будуць спраўджаныя з дапамогай генэральнага камісара Кубэ. Жыцьцё і дзейнасьць гэтага дзяржаўнага дзеяча былі перашкодай для нашых ворагаў. Таму яны намагаліся зьнішчыць яго. У сувязі з трагічнай сьмерцю гэтага чалавека беларускі Камітэт даверу выказвае ад імя свайго народу глыбокае спачуваньне нямецкаму народу і ўраду нямецкага Райху"*[62].
Адразу пасьля забойства Кубэ, раніцай 22 верасьня чальцы Камітэту даверу Вацлаў Іваноўскі, Юры Сабалеўскі, Аўген Калубовіч і Міхал Ганько накіраваліся да начальніка палітычнага аддзелу генэральнага камісарыяту, д–ра Маркуса з просьбай не пачынаць рэпрэсій супраць жыхароў Менску за сьмерць Кубэ. Як пісаў Калубовіч, просьба была выканана, і нікога не рэпрэсавалі[63].
У сувязі з пахаваньнем Кубэ 24 верасьня ў Бэрлін выехала дэлегацыя Камітэту (Іваноўскі, Сабалеўскі, Калубовіч). Назаўтра дэлегацыя нанесла візыт сталаму намесьніку міністра акупаваных усходніх тэрыторыяў, Альфрэду Маеру, і выклала яму свае патрабаваньні, што датычылі эканомікі, школьніцтва, самакіраваньня і аб'яднаньня ўсіх беларускіх земляў. Маер

паставіўся да гэтага прыхільна, абяцаў разгледзець патрабаваньні Камітэту і прыслаць адказ у Менск. Неўзабаве, пасьля кароткага знаходжаньня ў Вене, дэлегацыя вярнулася ў Менск[64].

У той дзень, калі Іваноўскі размаўляў з Маерам, Чырвоная Армія заняла Смаленск, а назаўтра — Хоцімск, першы павятовы горад на тэрыторыі Беларусі. Такім чынам, гэта была апошняя спроба Іваноўскага стварыць "гістарычныя аргумэнты". На нішто болей ён ня мог разьлічваць і не разьлічваў. Пасьля сьмерці Кубэ Іваноўскі меў дачыненьне зь ягоным пераемнікам — начальнікам SS і паліцыі фон Готбэргам, які глядзеў на беларускае пытаньне як на выдумку салённых палітыкаў і не цікавіўся нічым, апроч бясьпекі ў тылавых рэгіёнах ды іхнай эканамічнай эксплюатацыі. Быў ён, зрэшты, рэалістам і, рыхтуючыся да хуткай эвакуацыі зь Менску, распачаў мініраваньне найважнейшых аб'ектаў.

У гэтай сытуацыі Камітэт даверу не выяўляў ужо ніякай актыўнасьці, і Готбэрг меў намер яго распусьціць. Нежаданьне Готбэрга ставіць на беларускую карту паглыблялася ягоным стаўленьнем да Іваноўскага: Готбэрг не забыў жнівеньскае паседжаньне і пратэст Камітэту супраць барбарскіх карных мэтадаў SS. Затое ніхто больш не абвінавачваў Іваноўскага ў спрыяньні польскім элемэнтам: бо ўвосень 1943 г. сам Готбэрг пачаў заігрываць з акоўскімі аддзеламі на Беларусі ў надзеі, што тыя дапамогуць яму справіцца з савецкімі партызанамі. Усё ж ён неяк цярпеў Іваноўскага — мог жа лёгка скінуць яго з пасады старшыні Камітэту даверу ці бурмістра Менску, ды нават і арыштаваць зь якой–небудзь нагоды.

Сьмерць Кубэ мела яшчэ адзін вынік: яна дазваляла Астроўскаму вярнуцца ў Менск. Пасьля канфлікту зь Ермачэнкам ён два гады правёў у Смаленску, працаваў там у мясцовай адміністрацыі, супрацоўнічаючы з штабам фэльдмаршала Клюге, камандзіра цэнтральнага ўчастку фронту і смаленскай службы бясьпекі (SD). Шукаючы магчымасьці адыграць галоўную ролю ў Беларусі, Астроўскі таксама зьвяртаўся па дапамогу да кіраўніцтва польскага падпольля. У кастрычніку 1942 г. ён прыехаў у Варшаву і скантактаваўся з Тамкевічам ("Кшыштафам") зь БІПу, прапануючы яму арганізаваць перамовы аб польска–беларускім супрацоўніцтве. Аднак прапанову Астроўскага ў Варшаве

праігнаравалі.
Пасьля эвакуацыі з Смаленску ён кароткі час знаходзіўся ў Магілёве і толькі пасьля замаху на Кубэ, у канцы верасьня ці на пачатку кастрычніка 1943 г., вярнуўся пакуль у Баранавічы, куды эвакуяваўся штаб Клюге. А ў Менску разьмясьцілася смаленская SD. Падтрымліваючы кантакты з вайсковымі і паліцыйнымі ўладамі, Астроўскі разьлічваў на іх рэкамэндацыі і падтрымку перад Готбэргам.
Намаганьні Астроўскага, якому пасярэднічала смаленская SD, пераканалі Готбэрга ў мэтазгоднасьці стварыць беларускі прадстаўнічы орган, які ў няспыннай партызанскай вайне можна было б выкарыстаць у якасьці эфэктыўнага сродку прапаганды. Камітэт даверу не надаваўся да гэтай мэты, як з прычыны ягонага фармальнага статусу (Камітэт дзейнічаў на прынцыпах камісіі генэральнага камісарыяту, г.зн. нямецкай інстытуцыі), так і дзеля нежаданьня Іваноўскага адыгрываць такую ролю. Аднак бяз згоды Гітлера склікаць фармальны прадстаўнічы орган было немагчыма. І каб абысьці гэтую перашкоду, Готбэрг пагадзіўся "актывізаваць" наяўны Камітэт даверу, што не вымагала адмысловых праўных актаў.
Справа, аднак, зацягвалася з увагі на пэрсаналіі. Даручыць Астроўскаму кіраўніцтва "закатывізаваным" Камітэтам не падавалася рэальным, пакуль яго старшынём быў Іваноўскі. І тады агенты Астроўскага пачалі рыхтаваць замах, магчыма, безь непасрэднага ўдзелу паліцыі, але зь яе ведама і згоды. Пра гэта сьведчыць выступленьне Готбэрга на канфэрэнцыі ў міністэрстве па справах акупаваных усходніх тэрыторыяў 22 лістапада 1943 г., падчас якога Готбэрг падкрэсьліў, што замах будзе выкананы рукамі саміх беларусаў[65].
Спачатку арганізатары замаху падкідвалі ананімныя цыдулкі з пагрозамі ў дом Іваноўскага на вуліцы Ратамскай, дзе ён разам з дачкой Ганнай жыў з восені 1942 г. Такім чынам яны хацелі змусіць яго выехаць зь Менску. Пра магчымы замах папярэджвалі яго таксама супрацоўнікі беларускай паліцыі. Аднак Іваноўскі не пакінуў Менску, хаця небясьпекі ігнараваць ня мог: ён зрабіўся нэрвовы, падазроны, шукаў міны ў падмурку дому. Урэшце 6 сьнежня, калі ён вяртаўся дадому з гарадзкой управы, на яго напалі два чалавекі і некалькі разоў стрэлілі з пісталета. Іваноўскага адразу ж прывезьлі ў шпіталь, дзе ён і памёр на наступны дзень, 7 сьнежня 1943 г.

Факт, што Готбэрг ужо ў канцы лістапада ведаў пра падрыхтоўку замаху, яскрава сьведчыць пра падбухторваньне зь ягонага боку, і таму падаюцца ня вельмі ўжо істотнымі дэталі гэтай апэрацыі. Вось жа, падобным чынам, як і ў выпадку з Кубэ, у Менску без папярэдняга сьледзтва была абвешчаная афіцыйная вэрсія, згодна зь якой Іваноўскага забілі савецкія партызаны. Нават сьмерць гэтага нестара беларускага адраджэньня была выкарыстана ў прапагандысцкіх мэтах дзеля барацьбы з партызаншчынай.
Пасьля вайны нямецкую вэрсію падхапілі савецкія публіцысты. Галоўную ролю ў яе папулярызацыі адыграў раман Івана Новікава “Дарогі скрыжаваліся ў Мінску”, шмат разоў выдадзены вялікімі накладамі. Новікаў, аднак, пралічыўся: ня ведаў, што інфармацыя Готбэрга пра замах была ўнесена ў пратакол і захавалася.
* * *

Сьмерць Вацлава Іваноўскага, “бацькі горада”, як яго звычайна называлі, ахінула смуткам жыхароў Менску, а ягонае пахаваньне 11 сьнежня вылілася ў сапраўдную масавую дэманстрацыю жалю, шанаваньня і ўдзячнасьці. Са сваякоў за труной ішлі толькі ягоная дачка Ганна і былая жонка Сабіна[66]. Не абышлося, аднак, без ускладненьняў нават пасьля сьмерці. Адзіны ў Менску каталіцкі сьвятар, літоўскі вайсковы капэлян, ксёндз Зянон Ігнатавічус, адмовіўся адпяваць Іваноўскага як разьведзенага. Затое не такім прынцыповым аказаўся намесьнік мітрапаліта Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы архіяпіскап Філафей, і такім чынам Іваноўскі пасьля рыма–каталіцкага хросту, эвангелісцкага (другога) шлюбу атрымаў яшчэ і праваслаўнае пахаваньне з удзелам шматлікіх прадстаўнікоў духавенства. Спачывае ён, аднак, на каталіцкіх могілках — менскай Кальварыі.
Перад пахаваньнем адбылася афіцыйная жалобная цырымонія ў гарадзкім тэатры. Як можна бачыць з справаздачаў у друку, цырымонія была лягічным працягам правакацыйнага замаху на жыцьцё Вацлава Іваноўскага і выкарыстоўвалася як “пераканаўчы” аргумэнт у антыбальшавіцкай прапагандзе. Ён атрымаў тое, чаго найбольш не хацеў.

1 *Zycie i dzialalnosc polityczna prof. Waclawa Iwanowskiego*. Dyskusja na posiedzeniu Senackiej Komisji Historii i Tradycji Uczelni RW w dniu 14 II 1984 r., s.42, Archiwum Pracowni II wojny swiatowej Instytutu Historii PAN, A 772/85.
2 І.Касяк. Заўвагі да артыкулу аб Іваноўскім, “Беларуская думка”, 1984, N 29, с.34.
3 Л.Цанава. Всенародная партизанская война в Белоруссии против фашистских захватчиков, т. II, Менск, 1951, с.645 і 682.
4 Сьведчаньне прафэсара Яна Карыткоўскага ад 27.09.1978 г.
5 Савецкі Саюз і Сялянства, “Крыніца”, 13.01.1940 г., N 5.
6 Сьведчаньне Еж’я Кеўліча, былога дырэктара Торфавага трэсту, ад 08.11.1978 г.
7 Вацлаў Іваноўскі. Да 110–годдзя. 1880–1943, Мінск, 1990, с.32; T.Ivanauskas, Memuarai, машынапісны рукапіс, захоўваецца ў сям’і.
8 Сьведчаньне З.Дабрыньскай ад 1979 г.
9 J.Mackiewicz, *Nie trzeba glosno mowic*, Londyn 1985, s.125.
10 Ліст В.Буткевіча да Бэрнарда Закрэўскага (“Оскара”) ад 29.05.1971 г.
11 Сьведчаньне Т.Зана ад 1979 г.
12 Ereignismeldung UdSSR, 9 VII 1941, AAN, mf. aleksandryjski, r.233/2721449.
13 Я.Малецкі, Пад знакам Пагоні, Таронта 1976, с.45; Я.Найдзюк–Александровіч, ліст да аўтара ад 13.11.1978 г.
14 Ю.Малецкі, op.cit., с.53.
15 Ereignismeldung UdSSR, 13 VII 1941, AAN, mf. aleks., r.233/2721486.
16 Ліст Ю.Найдзюка–Александровіча да аўтара ад 13.11.1978 г.
17 Н.С.Хрущев. Воспоминания, “Огонёк” 1989, август; Н.Павленко. Трагедия Красной Армии, “Московские новости”, 07.05.1989 г.
18 “Раніца”, 10.12.1941 г.
19 Ліст Ю.Найдзюка–Александровіча да аўтара ад 13.11.1978 г.
20 Л.Галяк. Успаміны, USA 1982, с.161.
21 Палітычную сытуацыю ў Беларусі ў 1941–1944 гг. я ахарактарызаваў у сваёй кнізе *Bialorus pod okupacja niemiecka*, Warszawa–Wroclaw 1989, да якой адсылаю чытачоў, зацікаўленых у дакумэнтах тагачасных падзеяў.
22 W.Kube, *Ein Jahr Zivilverwaltung*, “Deutsche Zeitung im Ostland”, 30 VIII 1942.

23 Тамсама; H.Bengtsson, *Das unbekannteste Volk Europas*, "Preussische Zeitung" 1942, nr.237.
24 Ereignismeldung UdSSR, 12 I 1942, AAN, mf. aleks., T–175, r.234/2723568.
25 Катэхізыс быў падрыхтаваны да друку кс. д–рам Станіславам Глякоўскім, а надрукаваны ў канцы 1941 г. у друкарні менскай гарадзкой управы. Папярэдні бурмістар др. Вітаўт Тумаш пацьвердзіў, што катэхізыс быў выдадзены пасьля ягонага выезду зь Менску (ліст да аўтара ад 28.06.1979 г.), г.зн. пасьля заняцьця пасады Іваноўскім. Кніга выйшла безь нямецкай цэнзуры.
26 Ліст Буткевіча да Закрэўскага ад 29.05.1971 г.
27 Тамсама.
28 Сьведчаньне Г.Ліпіньскай ад 12.08.1979 г.; гл.таксама яе *Jesli zapomne o nich...*, с.192 і далей.
29 *Zycie i dzialalnosc profesora Waclawa Iwanowskiego...*, (аповеды В.Буткевіча, Г.Ліпіньскай і М.Майжук).
30 І.Касяк. Заўвагі да артыкулу аб Іваноўскім..., Л.Галяк. Успаміны, ч.2, USA 1983, с.62.
31 Л.Галяк. Успаміны, ч.1, USA 1982, с.159.
32 "Раніца", 13.06.1943 г.
33 V.Seduro, *The Byelorussian Theater and Drama*, New York 1955, s. 168–173.
34 Тамсама.
35 "Раніца", 16.08.1942 г.
36 Тамсама, 26.07.1942 г.
37 Справаздача "Эвы" аб падарожжы ў Менск, CA KC PZPR 203/VII–45, k.19.
38 Тамсама.
39 *Armia Krajowa w Dokumentach* t.II, Londyn 1973, s. 193 i 331.
40 Матэрыялы ўсходняй сэкцыі Прадстаўніцтва "Спэцыяльны рапарт — Беларускае пытаньне". Дакумэнт бяз даты. З тэксту вынікае, што ён быў напісаны ў сакавіку ці красавіку 1942 г., CA PZPR 202/III–201, k. 105–106 a.
41 Тамсама.
42 Тэлеграма ад ураду, CA PZPR 202/I–2, k. 23.
43 *Polskie Sily Zbrojne w drugiej wojnie swiatowej*, t. III, Londyn 1950, s. 287.
44 Справаздача "Эвы" аб падарожжы ў Менск, k. 17–23.
45 Тамсама, k. 21.

46 Пошта ва ўрад: Нацыянальныя пытаньні ў пэрыяд з 15.07.1942 г. па 15.09. 1942 г., CA PZPR 202/I–31, k. 94–95.
47 Тэлеграма Сікорскага ад 5–6 жніўня 1942 г. CA PZPR 202/I–9, k. 4.
48 Рапарт “Кшыштафа” аб размове з “Гжацкім” ад 21.12.1942 г., CA PZPR 203/VII–37, k. 94–95.
49 Паводле сьведчаньняў Дабрыньскай ад 1979–1980 гг., размовы адбываліся на кансьпірацыйнай кватэры БІПу на вул. Ракаўскай.
50 Тэлеграма ва ўрад, CA PZPR 202/I–7, k. 11.
51 *Armia Krajowa w dokumentach*, t. II, Londyn 1973, s.403, тэлеграма Равецкага Сікорскаму ад 12.01.1943 г.
52 Тэлеграма Прадстаўніка ва ўрад ад 18.02.1943 г., CA PZPR 202/I–7, k. 12.
53 *Mowa prezydenta Rzeczypospolitej*, “Wschod” 25 I 1943.
54 *Uwagi o naszej polityce miedzynarodowej*, CA PZPR 202/I–34, k. 57–60.
55 Тамсама.
56 У той час быў арыштаваны Буткевіч. У даносе пісалася, што ён не беларус, а паляк, і што ён вядзе ў Менску дывэрсійную работу. Іваноўскі выкарыстаў свае магчымасьці, каб вызваліць Буткевіча: прывёз зь Ліды дакумэнт, які сьведчыў, што Буткевіч — патомны беларус, і паручыўся за яго асабіста. Іваноўскі адчуваў маральную адказнасьць за бясьпеку Буткевіча, якога ўладкаваў на працу ў гарадзкую ўправу.
57 І.Новікаў, Выбраныя творы, т.3, Мінск, 1988, с.12.
58 Ліст д–ра Крафта ў Бэрлін ад 12.12.1942 г., AAN, mf. aleks., T–454, r.21/1283.
59 “Беларуская газэта”, 03.07.1943 г.
60 Апрацоўка Калубовіча для аўтара ад 14.03.1979, часткова надрукаваная ў “Беларускай думцы”, 1983, NN 27–28.
61 “Беларуская газэта” ад 30.06.1943 г. (прамова); інфармацыя Антона Адамовіча для аўтара ад 18.04.1985 г. “Вызваленьне” тут — гадавіна выбуху нямецка–савецкай вайны.
62 “Deutsche Zeitung im Ostland”, 23 IX 1943.
63 Апрацоўка Калубовіча для аўтара ад 14.03.1979 г.
64 Тамсама.
65 Справаздача з канфэрэнцыі з Готбэргам у днях 22–23 лістапада 1943 г., AAN, mf. aleks., T–454, r. 23/484.
66 *Zycie i dzialalnosc prof. W.Iwanowskiego*... (аповед Ганны

Іваноўскай–Карнецкай).

*Пераклала з польскай Віялета Кавалёва*
*паводле Turonek Jerzy,* Waclaw Iwanowski i odrodzenie Bialorusi*, Warszawa 1992.*

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

Вайна ў ARCHE 2(3)-1999 . [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **9-05-2000**

[image]

[image] .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 2(3)-1999
***слоўнік паняцьцяў***

# Валерка Булгакаў
# Правільны выбар

Калі ў школе празвінеў званок, у клас, як бы не спяшаючыся, увайшла настаўніца Кацярына Мацвееўна. Вопытны педагог, яна аддала школе ўжо амаль дваццаць год свайго жыцця.
„Так, каго сёння няма“, — Кацярына Мацвееўна прывычна ахінула позіркам вучняў. Не хапала двух чалавек.
„Дзе Утачкін і Пракоп’ева?“ — твар настаўніцы раптам спахмурнеў, паміж вачэй пралягла вялікая маршчына.
„Утачкін учора на веліку катаўся і недзе там за плотам паваліўся“, — хорам адказалі школьнікі.
„Дзе катаўся, дзе паваліўся?“ — сама пастава Кацярыны Мацвееўны выражала недаўменне. „Хай нехта адзін мне растлумачыць, што ж там здарылася. Дзе ў нас Патрыкеева?“
Наташа Патрыкеева была дачкой вадзіцеля тралейбуса і ў свае 13 мела славу ўсёзнайкі. Дзяўчынка ўсхапілася і тонкім голасам заверашчала:
„Ды ўчора, калі мы з Зінкай Лістраценка пайшлі за марожаным, раптам Вова (так звалі Утачкіна) так разагнаўся, так разагнаўся на сваім веліку. А пасля задняе кола паслізнулася на нечым, і ён з усяго размаху як паваліцца!“
Вочы яе выражалі нічым не прыхаванае захапленне гэтай прыгодай. „Відаць, па тэліку фільмаў наглядзеўся, таму і пабіў ножку“, — нечакана скончыла яна і весела заматляла галавой.
„Дзе ён цяпер — дома, у бальніцы?“ — голас Кацярыны Мацвееўны прыкметна памякчэў, хоць і захоўваў строгасць, цяпер ужо напускную.
„Воўка дома ляжыць, яму спіцы будуць ставіць“, — на гэты раз зароў Вася Грышанаў, які меў сярод аднакласнікаў рэпутацыю

задзіракі.
„Якія ж вы яшчэ бесталковыя“, — прамільгнула ў думках настаўніцы, і яна ўслых сказала:
„А з Пракоп’евай што?“
„Пракоп’евай сёння на фізкультуры кепска стала, і яна з трэцяга ўрока адпрасілася“, — аўтарытэтна заявіла стараста класа Таня Смаляга. І дадала:
„Яе завуч адпусціла“.

„Растуць дзеткі, растуць, не заўважыш, як яны пераженяцца і замуж павыходзяць“, — падумалася Кацярыне Мацвееўне. Гэтая думка даставіла ёй амаль фізічную пакуту — вось ужо год, як яна страціла мужа.
„Так, чаму дошку ніхто не выцер, я вас пытаюся“, — у рэпліцы настаўніцы скразілі ноткі растучага раздражнення. Клас стаіўся і перастаў выдаваць хоць які шум. Вучні вінавата прытупілі вочы.
„Колькі ж гэта будзе працягвацца? Вы што, хочаце мяне зусім даканаць?“
Першай узяла сябе ў рукі стараста. Ёй было не ўпершыню прымаць на сябе такі націск, і яна хутка знайшлася:
„Гэта мы лабараторку па хіміі ўвесь перапынак пісалі, нам часу не хапіла“.
„Заўсёды вам часу хапаць не будзе, ахламоны. Вы тут для таго і вучыцеся, каб вам часу хапала“. Кацярына Мацвееўна адчула, што сказала глупства, і вырашыла неўпрыкмет перавесці гаворку на іншую тэму.
„Якое ў нас было на сёння дамашняе заданне?“, — проста–такі міліцэйскім тонам запыталася настаўніца.
„Вы нам верш Пім*е*на Панч*а*нкі на памяць вучыць задавалі“, — гукнуў нехта з глыбіні класа. Гэта быў Дзіма Валашанок.
„Ты, Валашанок, нават не ведаеш, як нашага славутага паэта і земляка завуць. Пра што з табой яшчэ можна размаўляць“, — гэта прагучала так бязлітасна, як судовы прысуд. Аднак на гэтым усё яшчэ не скончылася.
„Валашанок, ты хоць верш вывучыў?“ — вочы настаўніцы драпежна засвяціліся.
Валашанок сядзеў моўчкі і не рухаўся.
„Валашанок, гэта да цябе адносіцца“, — усё яшчэ неяк зычліва, па–добраму звярталася Кацярына Мацвееўна.

Валашанок не тое, каб знерухомеў, а проста здранцвеў, ператварыўся ў бязмоўную матэрыю. Сказаць, што яму заняло мову, значыць нічога не сказаць — здавалася, што ў ім перастала біцца сэрца.
Па ўсяму было відаць, што немінуча насоўваецца бура.
„Валашанок, скаціна, дзённік на стол!“ — нават не закрычала, а проста загаласіла настаўніца.
Валашанок здрыгануўся, вінавата падышоў да настаўніцкага стала і падаў дзённік. Ад перанапружання ў яго задрыжалі каленькі.
„Хто яшчэ не вывучыў, падняць рукі!“ — гэтыя словы, ператвораныя ў загад, напоўнілі сабой усё класнае памяшканне. Аднак ніхто рукі не падняў.
„Што, усе ведаюць?“, — здзекліва данеслася ад настаўніцкага стала. — „Будзем правяраць“.
„Будзем правяраць“, — нейкім унутраным рэхам зазвінела ў галаве вучняў так, што ў роце Валашанка перасохла сліна.
„Да дошкі ў нас пойдзе... да дошкі ў нас пойдзе... пойдзе ў нас да дошкі... Ва–ла–ся–коў“.
Адкуль Кацярыне Мацвееўне было знаць, што ўчора Сярожа Валасякоў толькі тым і займаўся, што вучыў на памяць Пімена Панчанку. І ёй нічога не заставалася, як паставіць Сярожу адзнаку „пяць“.
І Наташа Патрыкеева атрымала адзнаку „пяць“. А вось Васю Грышанаву паставілі „чацвёрку“, бо ён пераблытаў у вершы два апошнія радкі. Што ж, усякае бывае.
Кацярына Мацвееўна супакоілася і прайшлася паміж першым і другім радам.

Вучні сядзелі ціха, як мышы.
Настаўніца зрабіла разварот і наблізілася да дзвярнога праёму.
Недзе далёка за акном раздаліся звонкія дзіцячыя галасы — гэта сёмы „Б“ вяртаўся з фізкультуры.
Кацярына Мацвееўна неяк раптоўна адхінулася ад класа, села на сваё настаўніцкае крэсла і пагрузілася ў свае думкі.
Думалася ёй нешта няпэўнае, але дужа павабнае.
У класе настала напружаная цішыня.
Тут першай знайшлася Соня Самасонава, якую аднакласнікі справядліва паважалі за дасціпнасць і знаходлівасць.
„Кацярына Мацвееўна, Кацярына Мацвееўна, а гэта праўда, што

ваш дзядуля быў чырвонаармеец–ейцам?“ — з нейкім дзіўным прыдыханнем, як бы задыхаючыся прагугнявіла яна.
Настаўніца ад нечаканасці чуць не падскочыла на месцы.
„Усё вы, дзеці, ведаеце, нічога ад вас не схаваць“, — нават не сказала, а выдыхнула настаўніца. А пасля здагадалася — артыкул пра яе дзядулю Віктара Пятровіча Палкіна, геройскі загінуўшага ў час Вялікай Айчыннай вайны, быў на тым тыдні змешчаны ў адной з цэнтральных газет.
„Кацярына Мацвееўна, Кацярына Мацвееўна, а раскажыце нам пра свайго дзядулю“, — цяпер было чуваць ужо некалькі галасоў.
„Не, дзеці, нам трэба ісці далей — вывучаць творчасць Петруся Броўкі“, — строга адцяла яна. Першы націск быў пераадолены. Каб развіць поспех, Кацярына Мацвееўна сама перайшла ў атаку.
„Вось якія вершы гэтага пісьменніка вы ведаеце?“ — грозна прамовіла яна.
У класе на нейкі момант ізноў запанавала маўчанне.
„А мы самі на наступны ўрок падрыхтуемся, самі падрыхтуемся. Ну раскажыце, калі ласачка“, — адказ вучняў не прымусіў сябе чакаць. На гэты раз колькасць галасоў павялічылася ўдвая.
Сэрца педагога не вытрымала — гэтае „калі ласачка“ пратнула яго наскрозь, выклікаўшы салодкую стому.
„Ну, добра, слухайце. Толькі, каб на наступны раз усе былі падрыхтаваныя. Што з вамі паробіш“, — развяла рукамі Кацярына Мацвееўна, і вусны яе склаліся ў трубачку.
Маршал Блюхер спяшыў прыехаць у вёску N завідна. Вёска трывожна не спала. Дзед Кузьма паставіў самавар. Дзед Рыгор пачасаў бараду і закурыў цыгарку. „Не к дабру гэта ўсё, не к дабру“, — падумаў дзед Мікіта і загасіў у хаце газніцу.
Вечарэла. На шэрым пукатым злавесным небе нічога не было відаць. Месяц схаваўся за хмарамі. Недзе за рэчкай завухкала пралятаючая сава. Сабакі пахаваліся ў сваіх будках. Дарафей Кульчыцкі рашыў выйсці на двор, але пасля перадумаў. Пачаў імжэць дробны паскудны дождж.
Праз гадзіну карціна заставалася ранейшай. Вёска засынала, каб канчаткова адысці ка сну. Толькі ў адной з хат было заўважна ажыўленне. Гэта была хата падпольшчыка Дзмітрыя Іванавіча Кабанава. Чуліся гучныя размовы, вясёлы рогат,

нехта спяваў народныя песні.
„Ціша, трэба захоўваць дысцыпліну і пільнасць“, — звярнуўся да прысутных упаўнаважаны з цэнтра. Усе змоўклі і засяродзіліся.
„Час цяпер ваенны. Вайна ідзе“, — дадаў ён для большай яснасці. — „Парушальнікаў дысцыпліны будзем караць па законах ваеннага часу, без усялякай літасці“, — твар упаўнаважанага выражаў халодную адвагу і рашучасць.
Вёска N была адной з тых шматлікіх беларускіх вёсак, якія вось ужо тры гады чакалі вызвалення. Мала сказаць чакала, яна яго набліжала. Сярод аднасяльчан было створана падполле. Праз былога агранома калгаса „Бальшавік“ Масюкіна была наладжана сувязь з партызанскім атрадам імя Варашылава.
Не прайшло і дваццаці мінут пасля захода сонца, як у хату Кабанава няспешна ўвайшоў маршал Блюхер. Прысутныя ўзялі пад казырок. „Усе ў зборы?“ — кіўнуў ён галавой у бок упаўнаважанага з цэнтра. „Усе, толькі вось разведчык Віктар Палкін з Зубрылавіч нешта спазняецца“, — па–ваеннаму суха адрапартаваў упаўнаважаны. „Што ж, пачакаем. А пакуль вырашым бягучыя пытанні“, — маршал прамовіў гэта ціха, сабе ў вусы, а потым хітравата ўсміхнуўся — „Па інфармацыі, паступіўшай толькі што з цэнтра, у сетку партызанскага руху быў лоўка ўкаранён варожы агент“. У гэты момант на лобе ўпаўнаважанага з цэнтра праступілі чуць заўважныя кропелькі поту. „Здарылася гэта па халатнасці лётчыка, з самалёта якога быў дэсанціраван двойчы Герой Савецкага Саюза Сідар Кірылавіч Машонкін. Замест таго, каб прыбыць у квадрат 56/72, ён прыбыў у квадрат 32/43, ці, іншымі словамі, прама ў варожую засаду. Камандзір экіпажа адхілены ад палётаў. Вядзецца следства“. Здавалася, што маршал Блюхер на гэтым скончыў, аднак гэта было памылковым уражаннем.
На ганку пачулася конскае іржанне, і ў хату імкліва пранёсся Віктар Палкін. Убачыўшы маршала Блюхера, ён адразу ўзяў пад казырок.
„Распалагайцеся, Віктар Пятровіч. Пачувайцеся як дома“, — па–гаспадарску і адначасова па–бацькоўску цёпла запрасіў да стала маршал Палкіна.
„Дык вось, немцы доўга катавалі, а пасля забілі Машонкіна“, — фальцэтам прашыпеў Блюхер. „Але ён так і не выдаў немцам усіх сваіх ваенных сакрэтаў. Слава героям“, — гучна выдыхнуў

ён.
„Слава героям“, — у адзін голас падхапілі ўсе прысутныя.
„Якраз Машонкін павінен быў прыбыць да нас у якасці ўпаўнаважанага з цэнтра“, — твар маршала выражаў глыбокі смутак і горыч.
Прысутныя з падазронам і з нескрываемай агідай паглядзелі ў бок, дзе стаяў так званы „ўпаўнаважаны з цэнтра“. Яго гідлівы твар скурчыўся, шыя пачала трэсціся.
„Гутэн таг, хер Айхзер. Фрыдрых Айхзер. Што, будзем гаварыць?“ — неяк абыякава кінуў маршал.
„Русіш швайн, ніхт капітулірэн“, — пачуўся адказ фрыца.
„Слухай, Айхзер, мы не будзем біць і мучыць цябе, калі выкладзеш нам свае яўкі, тайнікі, канспіратыўныя мянушкі і, самае галоўнае, раскажаш нам, як з табой падтрымлівае сувязь нямецкая контрразведка“, — маршал Блюхер добра ведаў, што гаворыць.
„Ін дэр тат?“ — здзівіўся раскрыты вораг.
„Канечне, толькі скажы нам, хто ваш сувязны“, — умяшаўся ў размову партызанскі разведчык Віктар Палкін.
„Гут, гут, іх эрцэле зі алес“, — няўзброеным вокам было відаць, як гэта жалкае падабенства чалавека гатова пайсці на ўсе, абы захаваць сваё нікчэмнае жыццё.
Пасля нязмушанага допыту, які працягваўся каля дзвюх гадзін, была ў дадатак здабыта інфармацыя аб маючым адбыцца контрнаступленні гітлераўцаў на адным з участкаў паўднёва–заходняга фронту.
„Што будзем рабіць у склаўшайся сітуацыі?“ — зацягнуўся дымам ад цыгарэты маршал.
„Прапаную з мэтай удакладнення і ўпарадкавання звестак узяць „языка“ — высокапастаўленага фашысцкага афіцэра, таварыш Першы“, — прапанова Палкіна была сустрэта воклічамі адабрэння. Больш за ўсіх стараўся гаспадар хаты Кабанаў, мабыць, ужо прадчуваючы кепскае. Ад невядомасці ён адчуваў глыбокі і востры боль недзе вышэй пупка. Эх, навошта я адлучаўся з хаты за трохлітровікам самагона ў самы разгар допыта, — не знаходзіў ён сабе спакою — можа, мой гаспадар Айхзер і пра мяне прагаварыўся.
„Але перад гэтым неабходна пазбыцца яшчэ аднаго фашысцкага памагатага — ілжэпадпольшчыка Дзмітрыя Кабанава, завербаванага гестапа год таму назад“, — давёў да

лагічнага завяршэння сваю думку Палкін. Ён падышоў да Кабанава, прыставіў дула пісталета яму да шыі і націснуў на курок — на ўсё было патрачана не больш 15 секунд. З утварыўшайся на супрацьлеглым боку шыі адтуліны пырснуў струменьчык крыві і нечага светла–зялёнага.
„Во цяпер мы ў бяспецы, во цяпер можна гаварыць“, — адлягло на душы ў Блюхера.
„Сабаку — сабачая смерць. Цацкацца з такімі здраднікамі — злачынства, таварыш Галоўнакамандуючы“, — твар Палкіна пасвятлеў.
Звязаны па рукам і нагам, з кляпам у роце, гітлераўскі бандыт Айхзер пачаў шалёна міргаць.
„Немца ў расход нельга пускаць, ён яшчэ многа чаго расказаць можа“, — здавалася, Палкін перахапіў ініцыятыву.
„Дабро“, — маршал нават не зварухнуўся у адказ.
„І да таго ж, пасля перапраўім яго на вялікую зямлю“, — з паніжэннем інтанацыі выпаліў разведчык.
„Дабро“, — Блюхер нахмурыўся.

Наступіла паўза.
„Так што, я тады на заданне — „языка“ браць“, — Палкін першы перарваў цішыню.
„Куды вы накіроўваецеся?“ — пастава военачальніка выражала ледзяную засяроджанасць.
„У вёску Анучкіна, там апорны пункт сувязі праціўніка. Шмат афіцэраў“.
„У які гэта бок?“
„На паўднёвы ўсход“.
„Што ж, пажадаю вам удачы“.
„Служу Савецкаму Саюзу!“
„Калі вас чакаць назад?“
„Думаю, што з першымі промнямі сонца на зары“.
„Бывайце“.
„Дзе ж я згубіла гэты гадзіннік“, — баба Маня, пра якую ў Анучкіне хадзілі легенды, старанна абышла ўсе пакоі ў хаце, зазірнула пад кожны ўслончык, але так нічога не знайшла. Памкнулася была залезці ў падпечак, але старыя косці не дазволілі. Тым часам за сценамі нешта непамысна зашкрабатала. „Нядобры гэта знак“, — падумала баба Маня і вырашыла прылегчы адпачыць.

Змяркалася. На вуліцы не было відно людзей, адно бегалі сабакі і адорвалі адзін аднаго дробным брэхам. Яны то збіраліся ў адну кучу, то разбягаліся і лёталі паасобку. Спаборніцтва ў брэху паступова перарастала ў паветраную гімнастыку па–сабачаму: жывёлы ўскоквалі на больш слабых і з пераможным выглядам працягвалі свой шлях у цямрэчу.
„Добра, што мы жывем у Нямеччыне, а не ў Расіі“, — вылецела з рота бабы Мані. Яна магла сабе дазволіць гаварыць шчыра, таму што вакол не было ніводнай душы. „Я раблю толькі затым, каб атрымліваць грошы“, — старая ведзьма ўпарта гнула сваю лінію.
Звечарэла. У хату Варвары Крук, крайнюю ў вёсцы, хістаючыся, цягнуўся партызанскі ўзрыўнік Іван Боцян. Сёння яго напаткала сапраўдная ўдача — камандзір яго атрада Макулаў выехаў на стрэчу з камандуючым партызанскім злучэннем „За Ільіча“ Фількіным. Па гэтаму поваду ў першай палове дня лясныя салдаты займаліся сваімі бягучымі справамі. На палітінфармацыі пасля абеду Боцяну было загадана часова перапыніць выплаўку тола з трафейных снарадаў і накіравацца ў дазор. Прасядзеўшы ў засадзе да глыбокага вечара і забіўшы 12 гітлераўцаў і іх пасобнікаў, Іван рашыў паразмяць косці і схадзіць у госці да Варвары, якая прыходзілася яму ўнучатай пляменніцай.
Як чалавек выхаваны, Боцян ішоў у госці не проста так — сваімі каравымі пальцамі ён пяшчотна сціскаў паўкіло селядцоў, якія нядаўна былі перакінуты разам з дэсантам з вялікай зямлі. Аднак надзвычайная стома сказвалася, Боцяна вадзіла з боку ў бок, па дарозе ён некалькі разоў засынаў і прачынаўся, і, натуральна, Варвара селядцоў так і не ўбачыла. Убачыў іх сабака Шарык, які ад няма чаго рабіць цёрся сваёй белай з праталінамі шубкай аб Варварын плот. Шарык стрымгалоў падляцеў да пакунка (давала аб сабе знаць працяглае недаяданне), асцярожна панюхаў яго змесціва і са звярыным ашчэрам кіпцюрамі і зубамі пачаў дзерці на шматкі прамасленую кардонку. Цяжка сказаць, ці даставіла яда яму задавальненне — настолькі сутаргавай і непрацяглай яна была. Пасля Шарык доўга, як бы ратуючыся, хлябтаў калюжную ваду. Але дарэмна ён, шукаючы ратунку, высалоплівaў язык — на працягу гадзіны сабака непраўдападобна разбух і, не могучы ісці, асуджана глядзеў на ваду. Падобны да яшчэ невядомага

звера, ён асуджана завыў на Месяц.
З бярозкі ўпаў лісток. Іван Боцян сноўдаў па завуголлях, усё яшчэ да канца не развітаўшыся з думкай знайсці гэты злашчасны пакунак. У галаве то наплываў, то адліваў вір напаўзабытых карцін. Вось ён яшчэ хлопчыкам бясстрашна круціць каровам хвасты, а вось ён садзіцца на свінню і, даўшы мурзатымі ножкамі ёй пад чэрава і ўчапіўшыся рукамі за яе вушы, едзе на лесапілку. Ужо ў малым узросце ў Вані прачнулася нянавісць да паноў. І таму, калі прыйшлі немцы, ён, не вагаючыся, спаліў сваю хату, плюнуў і пайшоў у лес. Вёска адыходзіла да сну. Боцян, шпарка аддаляючыся ў невядомым накірунку, здавалася, плыў над зямлёй. Цемра станавілася ўсё чарнейшай, скрадвала адлегласці і дыстанцыі. Толькі ў хаце бабы Мані гарэў агеньчык. Бабе не спалася. Яна набожна пераварочвалася з боку на бок, згіналася і разгіналася, мармытала нешта сабе пад нос, кленчыла, не зводзячы вачэй з правага верхняга вугла хаты. Там нешта шкрабуцела. „Трэба схадзіць да фельчара, можа, якую траўку дасць“, — нервы ў бабы Мані былі ні к чорту. Ад нерваў у яе пачынаў нязносна свярбець жывот, пасля шыя, урэшце свёрб перакідваўся на галаву, дзе і звіваў сабе надзейнае гняздо.
„Цьфу ты, чорт“, — прыўзняўшыся і ўпільнаваўшы аддаляючагася Боцяна, Маняша (так яе з павагай называлі ў вёсцы) не магла не вылаяцца. Ад такой нечаканасці захацелася піць. Папіўшы малачка са збаночка, баба адчула, што хутка засне. Заплюшчыўшы вочы, яна ляжала і амаль не дыхала.
„Чаму ў мяне такая нялюдская мянушка — „Пятух“? Хіба праўду балакаюць людзі, што бацька, калі я была зусім маленькай, паддаўся на мае ўгаворы прынесці з седзіва кураня. І калі бацька пайшоў да седзіва па яго, пятух моцна яго цяў. Так, пятух цяў бацьку. І што бацька? Што ж бацька? Бацька быў?“ — баба Маня, па–старэчаму перакасіўшыся, пазяхнула. Бацька ў яе сапраўды быў. Ды яшчэ які бацька! Калі пачалася рэвалюцыя, Кузьма Пятух рашыў, што трэба дзейнічаць. Прынёсшы да мясцовага графа петыцыю паўстаўшага сялянства з патрабаваннем неадкладна раздаць коней і вупраж земляробам, ён нядобра прышчурыў левае вока. Граф Ніцкі, які меў дурную славу чарнакніжніка, хацеў пачаставаць сельскага пасланца каньяком і вырашыць канфлікт палюбоўна, але Кузьма быў настроены рашуча. Размова не вязалася. „Што ты

вылупляешся, што ты вылупляешся“, — думаў сам сабе Кузьма. Пераканаўшыся, што граф не гатовы ісці на саступкі, Кузьма дастаў схаваную пад поясам сякеру. „Ну што?“ — самалюбаваўся Кузьма. Граф зніякавеў і зрабіў спробу ўцёкаў. Кузьма быў начыку. Першы ўдар прыйшоўся графу па калену. Напоўніўшы свае харомы лямантам, Ніцкі ўпаў. Каб замацаваць поспех, Кузьма доўга і каварна біў графа тапаром па галаве. Пасля, калі ўсё было скончана, Кузьма ўстаў, кракнуў і задумаўся: „Крэпка гэта я сёння даў“.

Баба Маня тым часам пагрузілася ў глыбокі сон. Але і ў сне яе мучылі цяжкія думы. Вось хтосьці вялікі і азызлы ў чорным накідваецца на яе: „Мужыкі мазгі адпілі, бабы мазгі ад’елі“. Вобраз рэзка пераламляецца, і на вачах Маняшы разыгрываецца наступная сцэнка з удзелам дзвюх сельскіх жанчын з непакрытымі галовамі:

„Сабака, чуць нос мне не адкусіў“, — напаўскардзіцца– напаўплача да канца няясны вобраз першай бабы, на твары якой адсутнічаюць губы і рот.

„З табой усё ясна“, — нават не збіраецца супакойваць яе першая.

„Ці до?“ — ашарашана мяняе тэму ініцыятарша размовы.

„До, до. Даліпан до“, — на гэты раз без правалочак пагаджаецца яе апанентка.

„От жа ацяжэла, не магу ўсярэдзіну ўвысці“, — зноў хоча выклікаць да сябе прыліў жаласці першая.

„А царква дзе?“ — сваім адказам другая суразмоўніца як бы хоча апракінуць дагары нагамі размову — пачаць весці ў ёй рэй.

„Тамака, дзе гэна баба йдзе“, — чуецца меланхалічны, з унутраным надломам адказ.

„Гаварыць з табой, як у лесе з бараной“, — вар’яцее ад нечаканай роспачы тая, якая неспадзеўкі павяла рэй. — „Пакуль сабака не пакачае, не зможа з’есці“, — безапеляцыйна падагульняе яна.

Далей дзеянне працягваецца ў партызанскім лагеры. Абліччы партызанаў няясныя, многія дэталі твару адсутнічаюць або скажоныя да непазнавальнасці — баба Маня ніколі не была ў такім лагеры і не бачыла, як выглядаюць гэтыя партызаны. Ёй здаецца, што яна з цяжкасцю разумее мову, на якой гавораць лясныя салдаты. Палякі ці літоўцы, здагадваецца баба Маня і

пераносіцца ў партызанскую сталоўку. Партызанскі повар аб нечым гучна размаўляе з камандзірам атрада. Сёння, на свята, трэба пачаставаць хлопцаў нечым адметным, распараджаецца ён. Ёсць прапанова пакаштаваць „маскаля“. Повар — Маняша не можа паверыць сваім вачам — адразу згаджаецца, відаць, ён на гэтым ужо набіў руку. Прыводзяць „маскаля“. Гэта худзенькі хлопчык гадоў сямнаццаці, голы да пояса, на целе якога відаць сляды ад пабояў. „Не забівайце мяне, дзядзенькі, я ў мамы адзін“, — тоненька выводзіць ён. „Што–што, То–омас?“ — перапытвае камандзір у байца, які канваіруе палоннага. „Нічаво, жыць хоча“, — ніводзін мускул на твары ў байца нават не здрыгануўся. „Ну дык паглядзім, якая ў чырвоных кроў“, — паціраe потныя ад нецярпення рукі военачальнік і загадвае сваёй ахвяры з металічнымі ноткамі ў голасе, — „На калені, тваю маць, на калені!“ „Жывым яго ў чане зварым, як таго белабрысага на тыя выхадныя?“ — дзелавіта пытаецца повар у камандзіра. „А–адставіць такія разгаворчыкі. Белабрысы так забаяўся, што ў чане — хі–хі — аблысеў. Я пасля тры дні яго валасамі пляваўся“, — грымаса агіды праходзіць на твары камандзіра. „Дык галоўку можна... таво“, — аж прысвістваe ад узбуджэння повар. „Дзела гаворыш“, — да камандзіра вяртаецца ранейшы добры настрой. І пасля невялікай паўзы ён дадае: „Зганяй за Вітаўтасам“.

Вітаўтас, ён жа палкавы экзекутар, прыходзіць з шабляй нагала. Хлопец нерухома стаіць на каленях, белы, як палатно. Вітаўтас з усіх бакоў абыходзіць ахвяру, яхідна прышчурваецца — ён прымерваецца, яго слепіць сонца. Ніхто, здаецца, не ўбачыў размаху — толькі фантан крыві, узмятнуўшыся ў паветра, і падаючая ўніз галава электрычным разрадам працінаюць прысутных. Хлопец яшчэ нейкае імгненне стаіць на каленях, а пасля пачынае плаўна асядаць на зямлю. Яго галава ўжо ляжыць побач, з яе вывальваецца язык. Вітаўтас стаіць на месцы і не рухаецца. Ён абыякава глядзіць на не сказаць каб маленькую лужыну крыві. Камандзір атрада пераключае на яе ўвагу. Ён кідае ў лужыну свой недапалак. Недапалак аглушальна шыпіць. „Так, добра, пайшлі“, — гучыць загад байцам. Уміратвароныя, яны сыходзяць і пакідаюць сам–насам повара і труп...

Баба Маня расплюшчыла вочы і не сваім голасам закрычала. Такога яна не сніла ніколі. Сон, як павук, згроб яе ў свае ліпкія

абдоймы. Нейкае гідлівае змешанае пачуццё асабістай адказнасці за адбыўшаеся і непрыхаванай агіды ад карцін разні ў сваёй уласнай галаве імгненна авалодала ёй. Ад патоку перажыванняў яна так знясілела, што доўга не магла падняцца з ложка.

„От, каб жа цябе кадук...“

Калі наступіла вайна, фашысты прыехалі ў вёску на роварах. „Нейкія смешныя такія, як дзеці“, — любіла гаварыць пасля баба Маня. „Ай вы хлопчыкі, ой вы мае малойчыкі“, — утарыла ёй прыдуркаватая малодшая сястра Глаша, якая традыцыйна адчувала на сабе недахоп мужчынскай ласкі. „Яйка, матка, яйка“, — гергеталі фрыцы, навучаныя рабаваць і забіваць людзей у Польшчы. „Што, майка?“ — не дачуўшы, лыпала вачыма баба Маня, якая пэўны час жыла ў горадзе. Прыйшоўшы ў сябе, яна рушыла ў хлеў да сваёй адзінай карміцелькі, каровы Рагулі, пяшчотна прытулілася да яе вуха, і ўпаўголас прамовіла: „Адна ты мяне разумееш“. Мокрая морда Рагулі выражала поўную згоду.

Назаўтра Маняша не далічылася аднаго кабанчыка.

Тым часам разведчык Віктар Палкін на калёсах па лесе прасоўваўся ў глыб варожай тэрыторыі. Конь бег трушком, раз–пораз іржаў. „Но–но“, — адказваў яму на гэта разведчык. Зорнае неба пералівалася зіхоткімі агеньчыкамі, у лёгкія рэгулярна паступаў кісларод. „Дзе ж ты, мая Маруся“, — чырвоны водбліск ад недакурка заблішчэў у руках воіна. Мілая ты мая дзевачка, мая Палачка, мая касатушка, — на вачах Віктара ледзьве не з’явіліся слёзы, — дзе цябе, мая ягадка, вецер носіць. Аднак адказ на гэта пытанне быў вядомы наперад. Маруся Палкіна, каханая жонка гвардыі маёра Чырвонай Арміі Віктара Палкіна, была своечасова эвакуіравана ў глыбокі тыл нашай радзімы, у горад Іркуцк, дзе ўладкавалася нянечкай у яслі–сад ад чыгуначанага дэпо №2. „А работы, а работы“, — Віктар летуценна закінуў галаву ўверх. І тут раптам нешта так захапіла яго ўвагу, так што ён засяродзіўся, выраз яго твару стаў больш строгім, а ход думак больш ясным. У начным небе нарастаў гул самалётаў. „Свае ці чужыя?“ — разведчык не адводзіў вачэй з празрыстай павалокі нябёсаў. Роўна праз пяць хвілін сумненняў ужо не было — іх развеяла фашысцкае павуцінне на фюзеляжы самалёта і тоўстыя чорныя крыжы на крылах механічнай птушкі. Гітлераўскі сцярвятнік на

невялікай вышыні баразніў паветраную прастору. Рашэнне саспела адразу — Пятровіч спешна развярнуўся і пачаў шукаць схаваны ў сене чамадан са зброяй. „Во гэты найлепш пойдзе“, — разведчык пяшчотна правёў далоняй па ствалу кулямёта Дзегцярова і рэзка выгукнуў: „Гэта за Сярожу, Грышу і Алёшу!“ Стрэлы ўзарвалі крохкую цішыню леса. За імі паследавала яшчэ адна чарга. І яшчэ адна.

З крайняга левага боку самалёта пачаў сцяліцца густы дым. Лётчык спрабаваў манеўраваць, але самалёт на вачах губляў вышыню. Зразумеўшы бязвыхаднасць сітуацыі, ас „Люфтвафе“ выскачыў у паветраны эфір з парашутам, а нікім не кіруемы самалёт разарваў начную цемру яркай успышкай сярод лесу. Гэтая падзея ніяк не паўплывала на выкананне задання разведчыкам. Ён з усяго размаху перацягнуў бізуном каня і, яўна павесялеўшы, працягваў прасоўвацца ў раён вёскі Анучкіна, дзе ва ўмоўленым месцы яго чакаў сувязны. Аж раптам конь пачуў няладнае. Бег іх ног істотна паскорыўся, але гэтага ўсё роўна было недастаткова. З паўночнага ўсходу да фурманкі імкліва набліжалася зграя галодных ваўкоў. Халодным д’ябальскім агнём гарэлі іх вочы, аднекуль зблізу данасілася кляцанне іх вострых зубоў. Конь ад страху пачаў шалець — круціць мордай, падкідаючы грыву. Цвяроза ацаніўшы абстаноўку — страляць было нельга, так як да ўмоўленага месца сустрэчы з сувязным заставалася зусім нічога, нейкія паўкіламетра — Пятровіч рашыў дзейнічаць. Ён яшчэ некалькі разоў выцяў конскі круп, дзікавата азірнуўся, а пасля натрэніраваным рухам пачаў падпальваць запалкамі салому з калёсаў і кідаць яе ў кляцаючыя ваўчыныя морды. Такі ход дапамог дасягнуць многага, ён разрадзіў сітуацыю, ваўкі засталіся ззаду, а коні пабеглі наперад. Акрылены поспехам разведчык не вытрымаў і закурыў цыгарэту. Прыбыўшы куды было дамоўлена, на лясную палянку непадалёк сяла Анучкіна, лясны салдат злез з калёсаў і троху прайшоўся, каб размяць зацёкшыя ногі. Сувязнога яшчэ не было, а з боку сяла даносіліся жаночы і мужчынскі голасы.

„Дождж зараз пойдзе“.

„Не, не пойдзе“.

„Кажу табе, пойдзе“.

„А табе — не“.

„Не злуй мяне, чуеш“.

„Я знаю адно слова, і калі яго скажу, ты праз два дні памрэш“.
„Не гавары глуму“.
„Розум жабі ў цябе“.
„Зашыліся ў тыя гарады, пачэзнеце як рудыя мышы“.
Захоплены адбыўшайся недзе побач размовай, малады разведчык не заўважыў, як па траве прашуршалі кірзавыя боты сувязнога.
„А ты спі!“ — выпаліў сувязны скарагаворкай. Гэта быў пароль.
„А я сплю“, — спакойна і дастойна парыраваў Палкін.
„Таварыш гвардыі маёр, у нас непрадбачаныя ўскладненні“.
„Што такое?“
„Немцы пранюхалі пра нашу падпольную сетку“.
„Што!? Як ваша самаадчуванне?“
„Праведзены арышты і паказальныя расстрэлы. У прыватнасці, паў смерцю храбрых падпалкоўнік Лашадкін“.
„Вашы прапановы?“
„З боем прабівацца на вялікую зямлю“.
„Адставіць... Хто віноўнік правалу?“
„У навакольных сёлах лютуе банда паліцаяў на чале не то з Вазняком, не то Пазняком. Ім удалося пранюхаць пра падполле і правесці карную аперацыю“.
Пятровіч прызадумаўся, пачухаў патыліцу.
„Самае галоўнае, гэта не папасца на вудачку фашыстаў і іх мясцовых прыхвасняў. Таму загадваю: ніякіх мер па гэтаму здарэнню не прадпрымаць, а засяродзіцца на выкананні задання, калектыўна распрацаванага намі пад кіраўніцтвам маршала Блюхера“.
І для таго каб сувязному ўсё стала ясна, дадаў: „Языка трэба ўзяць, Са–аша“.
„Зверым гадзіннікі: на маім цяпер 23.46“, — закончыў сваю тыраду разведчык.
У сувязнога гадзінніка не было, але ён пасунуў рукаво на левай руцэ і заклапочана зірнуў на запясце — для адводу вачэй ён насіў там вяровачку.
„І на маім“, — хапатліва пагадзіўся Саша. Як стане зразумела пасля, якраз гэтая неасцярожнасць сувязнога сыграла сваю ракавую ролю.
„Роўна ў 2.30 збіраемся ў хляве, што стаіць з левага боку апорнага пункту сувязі праціўніка, затым здымаем вартавых, пранікаем у памяшканне, бяром языка і даем драла. Пытанні

ёсць? Пытанняў няма“.
У намечаны час маёр Палкін па–пластунску пралез праз спецыяльна падрыхтаваны на гэты выпадак лаз у хлеў селяніна–бедняка Ціхана Гібкага. „Ну дык нішто сабе. Вось бы яшчэ сюды малачка“, — воін прыемна быў здзіўлены тым, што гаспадар хлеву нанасіў для яго групы моху і саломы. Не доўга думаючы, ён прылёг на свой імправізіраваны ложак. У хляве было надта вільготна, аднекуль звонку ўнутр пранікалі разнастайныя пахі. Узяўшы ў рот пажаваць саломку, маёр сцішыўся і пачаў напружана чакаць сувязнога. Сувязны не паяўляўся. Разведчык кінуў хуткі позірк на цыферблат свайго гадзінніка. Стрэлкі паказвалі 2:31.
Знянацку яго ўвагу прыцягнулі набліжаючыяся галасы, якія даносіліся з варожага аб’екта. „Вартавыя фрыцы да бабы збіраюцца“, — адразу ўлавіў ніць адбываючагася чырвонаармеец. Сувязны ўсё яшчэ не паяўляўся. Пятровіч падлез бліжэй да маленькага закратаванага акенца, каб лепш было бачыць. На падворку стаялі два фрыцы і аб нечым па–гусінаму гугнявілі. У той жа час набітым вокам разведчык запрыкмеціў у бінокль ледзьве заўважнае змяненне абстаноўкі — у цемрыве ночы замаячыў чыйсьці няясны сілуэт. Гэта быў сувязны Аляксандр. Фрыцы перасталі гугнець і здзіўлена ўтаропіліся на падпольшчыка. „Хальт, хэндэ хох“, — гартанны крык узняў у паветра адзінока сядзеўшую на прылеглай бярозцы варону. „Фігу вам“, — злобна азваўся Аляксандр і кінуўся бегчы стрымгалоў. Рука аднаго з фрыцаў павольна пацягнулася да пояса, павольна адшпіліла супрацьтанкавую гранату і рэзкім штуршком шпурнула ўслед уцякаўшаму. „Ман мус эрблікен, вас гешэйт даміт“, — такую матывацыю свайму ўчынку знайшоў фашысцкі галаварэз.
Усё адбылося так хутка, што, здавалася, нічога не адбылося — толькі на тым месцы, да якога яшчэ імгненне таму назад дакранулася нага Аляксандра, утварылася невялікая варонка. Фрыцы павесялелі, адзін з іх сплюнуў і падышоў да таго ўчастка дарогі, дзе выбухла граната. Папярэдне адламіўшы ад бярозкі дубчык, ён пачаў калупаць ім у толькі што ўтворанай ямцы. У ямцы нічога не было. Задаволены такім вынікам праведзенай работы, ён даў знак свайму саўдзельніку, што пара ісці па справах.
Тое, што сітуацыя істотна пагоршылася, не выклікала

сумненняў у маёра Палкіна. І тое, што неабходна рашуча і тэрмінова дзейнічаць, таксама было ясна, як божы дзень. Праявіўшы строгую лагічнасць і паслядоўнасць, разведчык вылез праз добра схаваны лаз з хлява на двор, абтросся і азірнуўся па баках. Два вартавыя ў далечыні, паступова набіраючы хуткасць, кіраваліся да мясцовай распусніцы і садаміткі Сонькі Грыб. „Наш Смаленск мы вам ніколі не даруем“, — пастава чырвонаармейца выражала максімальную канцэнтрацыю, — „а цяпер уперад, у фашысцкае асінае гняздо“.
Нямецкі сувязіст Ганс фон Зідлаў сядзеў у крэсле развалiўшыся. На галаве ў яго быў блакітны шлем з кукардай. На прыборнай панэлі, усталяванай справа на фанерным шчыце, пералiваліся рознаколерныя агеньчыкі. Уключаліся і выключаліся датчыкі. Пад сталом стаялі масіўныя тэлефонныя апараты, прызначаныя для работы ў палявых умовах. Частка з іх была няспраўная, і задача Ганса заключалася ў тым, каб удыхнуць у іх жыццё. Зверху, дзе сыходзілася правая сцяна і столь, тырчэлі розныя серабрыстыя трубачкі, бляшаныя дроцікі, абрыўкі ізаляцыі. На сцяне вісела вялікая карціна з подпісам „Гітлер — асвабадзіцель“. На падлозе было брудна, бы ў свінарніку. Дзе–нідзе валяліся недакуркі, шматкі паперы, стрэляныя гільзы, гарошыны попелу, коркі і затычкі ад пляшак, пацучыны памёт, цельцы мёртвых мух і камароў.
Зморшчыўшы і без таго мізэрны лобік, акупант зняў з рычажкоў трубку і пачаў набіраць нечы нумар. На стэндзе высвеціўся населены пункт, куды быў адрасаваны званок — сяло Забалотнае. „Хало, Людвішч, ці не закусаў там вас гэты рускі гнюс“, — Ганс фон Зідлаў валодаў спецыфічным пачуццём гумару. Трубка нешта хрыпла адказала. „Першы, першы, я другі, прыём“, — нечакана вырашыў памяняць тэму размовы сувязіст. Трубка вымавіла тое, што і ў першы раз. „Я восень, я восень, зіма, зіма, адказвай, прашу пацвердзіць прыём“, — не сунімаўся фрыц. Трубка пасля кароткай паўзы выдала стандартны адказ. „Хало, я сава, я сава, выклікаю, выклікаю дзятла. Дзяцел, дзяцел, вы мяне чуеце?“ — упарта гнуў сваю лінію першы. З трубкі даляцела нейкая адзіночная рэпліка, і размова спынілася.
Не думаў фрыц, што прыйшоў яго час, што немінучая адплата ў асобе маёра Палкіна знаходзіцца ад яго ў чатырох з палавінай метрах. Тым большай была яго спалоханасць і разгубленасць,

калі ён адчуў холад метала, прыстаўленага да скроняў (маёр Палкін па–майстэрску пранік у памяшканне, не зрабіўшы на сваім шляху ніводнага непатрэбнага руху, як кошка прыпаў да падлогі, каб выпрастацца, ужо прыставіўшы пісталет да галавы працiўніка). Заспеты знянацку, немец пачаў дробна трэсціся і касавурыцца. „Так, устаў, і на выхад“, — з металам у голасе распарадзіўся разведчык. „Стой, стой, блін“, — засярчаў ён, калі фрыц надта хутка памкнуўся да дзвярэй. „Стаяць!“ — на гэты раз Пятровіч раз'юшыўся і прыкладам аўтамата добра–такі прыклаўся да фрыцавых плячэй. Той войкнуў і спыніўся.
З палоненым фрыцам шмат чаго не выходзіла ці выходзіла кепска — ён не хацеў роўна класціся ў калёсы, увесь час скуголіў, енчыў, прасіўся сікаць, прасіў цыгарэту. Вось дзе сказалася адсутнасць напарніка! Аднак савецкі афіцэр ведаў, што рабіць — трэба было дабрацца да лесу, а пасля прасёлкам і толькі партызанам вядомымі сцежкамі скіравацца да сваіх. Першая частка плана была выканана разведчыкам на славу. З ваеннапалонным немцам ён памысна дабраўся да лесу, дзе спыніўся на кароткі прывал. Як высветлілася пазней, гэта была памылка. Трэба было выйграць час і прабірацца далей у лес, замятаючы сляды, бо азлобленыя стратай самалёта стратэгічнага прызначэння фашысты арганізавалі карную аперацыю па прачэсванню мясцовасці, у раёне якой упаў самалет, а таксама па пошуку і выратаванню лётчыка. Але аб усім па парадку.
Прысеўшы на пень і закурыўшы цыгарэту, маёр Палкін не зводзіў вачэй з фрыца. Твар апошняга, перакасіўшыся, пайшоў чырвонымі плямамі. „Эге, ды нам кранты“, — па няўлоўных прыметах чырвонаармейцу стала абсалютна ясна, што яны з палонным у лесе не адны. Нельга было губляць ні секунды часу — небяспека немінуча набліжалася. І тут немец... і тут немец, відаць, ад ясна ўсвядомленай ім безвыходнасці ўласнага становішча спачатку зашыпеў, а пасля гэтае шыпенне перайшло ў немы крык. „Эс лебэ Дойчланд“, — як баба, галасіў Ганс фон Зідлаў. „Замаўчы, прыдурак“, — рэакцыя маёра Палкіна была запозненай, але вельмі бескампраміснай. Каб падмацаваць свае словы, Палкін падышоў да ляжачай на зямлі тушы і з размаху тнуў яе ботам. Гітлеравец нарэшце змоўк. Камандзір асобага батальёна дывізіі СС „Відэргебаў“ Роберт Кліма быў паталагічным забойцам. Калі ён у дзень уласнаручна

забіваў менш чым 15 чалавек, у яго адразу парушаўся сон, узнікалі праблемы са страўнікам. Гойсаючы са сваімі бандытамі па лесе, ён крыважэрна прынюхваўся да начной цішыні. Крык, а таксама слоўная перапалка на паўднёвым ускрайку леса каля сяла Анучкіна не толькі прыцягнулі яго ўвагу, але і паведамілі накірунак дзеяння. Даўшы сваім верным псам знак, ён пабег трушком, на хаду зараджаючы свой аўтамат. Намер эсэсаўцаў быў вельмі просты: узяць праціўніка ў кальцо, адрэзаўшы яму шляхі для адступлення. Не дабегшы недзе метраў з дваццаць да таго месца, дзе стаіўся маёр Палкін, фашысты пачалі раззасяроджвацца, каб утварыць вакол яго пятлю, і затым адным махам зацягнуць яе, узяць, так сказаць, праціўніка ў мяшок.

Пятровіч, аднак, не губляў часу дарма — пачаў хуценька акапвацца па перыметру. „Будзеш мне жывым шчытом, а то ўсё роўна ніякага толку ад цябе не даб'ешся — становішча абавязвае“, — як апраўдваючыся, кінуў ён свайму, калі так можна сказаць, нямецкаму спадарожніку. Калі акоп стаў дастаткова ўмяшчальным, ён вырашыў перахапіць ініцыятыву і першым пачаць пальбу.

За пару мінут разгарэўся сапраўдны бой. Лес, здавалася, нема замычаў ад стогнаў, якія ўспышкамі скаланулі дзёран. Палкін біў прыцэльна, не падпускаючы праціўніка больш чым на дваццаць метраў бліжэй да сябе. Вось грузнай тушай асунуўся першы нямецкі ваяка, вось неяк вычварна паляцеў у нікуды другі. Аднак ворагі і не думалі адступаць. Яны пасля непрацяглай паузы рашылі прымяніць другую тактыку: закідаць чырвонаармейца гранатамі. Але і тут фашысты пралічыліся: глыбокі і цёплы акоп як маці прыняў у сябе ўсяго Пятровіча без астачы. Толькі вось нямецкаму сувязісту Гансу фон Зідлаў не пашанцавала — спачатку яму ўзрыўной хваляй адарвала правае вуха, затым сноп агня раструшчыў яму правую нагу, ну, і нарэшце яго тулава надламілася, пераўтварыўшыся ў дзве непрапарцыйныя часткі. Адна, пачынаючы з ног, была меншай, другая, пачынаючы з галавы, была большай. Толькі цяпер маёру Палкіну з усёй яснасцю ўявіўся сэнс фразы „трэба пазарэз“ — на кожную загадку павінна быць адгадка. Нішто сабе ўдаўся „рэз“, тут табе і разрэз, і парэз.

Калі ўдарылі варожыя мінамёты, стала відавочна, што ратунку ў акопе няма. Кожны наступны стрэл мог быць апошнім. Міны

са звярыным воем сыпаліся зусім побач, і, каб не панесці непрадбачаных страт, нападаўшыя адступілі. Канчаткова ўсвядоміўшы бесперспектыўнасць далейшага знаходжання ў акопе, які ў любы момант мог ператварыцца ў магілу, маёр Палкін рашыў выскачыць з яго і памчацца ў паўночна–заходнім накірунку, дзе забалочаная мясцовасць стварала спрыяльныя ўмовы для адыходу. Адкуль яму было ведаць, што па злой іроніі лёсу на яго першы крок па роднай зямельцы прыпадзе разрыў варожай міны. Удар быў тупым, як быццам бы з усяго размаху пляжнуцца вобзем.
Савецкі разведчык ачнуўся ўжо ў акопе, лежачы нагамі ўверх. Спроба змяніць становішча прынесла невыносны боль. Здавалася, балела ўсё. Мулкім абцякальным болем балелі рукі, жудасным усеабсяжным болем балелі ногі, дробным трапяткім болем балела тулава, гарачачным вогненным болем балела галава, рэжучым, ідучым унутр болем балелі вочы. Пальцы... пальцаў на правай руцэ ўжо не было, а сама рука была падобная хутчэй не да рукі, а да асмаленай бярцовай косткі парсюка.
„Жывым не дамся“.
„Жывым не дамся“.
„Жывым не дамся“.
„Ах, як мне баліць!“
„Ах!“
Краем вока Пятровіч заўважыў густую нітачку крыві, якая выбягала з грудной клеткі і тлустай плямай клалася на зямлю. Каб не згубіць ужо назаўжды прытомнасць, гвардыі маёр прыняўся ўспамінаць. Вось ён і яго маладая дзябёлая мама ў напоўненым святлом пакоі. Яна лашчыць сыночка па галоўцы, шукае яму ў валасах, з пяшчотай кладзе яму свае рукі на плечы. „Віця, слухай, як хораша, што мы з табой удваіх разам тут — ты і я“, — гаворыць матуля, і ў пацверджанне сваіх слоў рыўком прытуляе хлопчыка да свайго мяккага цела. Пасля яна доўга частуе Віцю яблыкамі і памідорамі, старанна збіраючы ўсе костачкі ў далонь. „Тата прыехаў з камандзіроўкі, пара класціся спаць, Віцечка“, — меланхалічна ківае галавой Віцева мама. Віцю гэта яўна не падабаецца, ён надта не любіць, калі яго называюць „Віцечкам“ — так яго дражняць хлопчыкі і дзяўчынкі з суседняга двара. Заўважыўшы цень збянтэжанасці на Віцевым твары, матуля спрабуе здагадацца наконт яго

прычынаў: „Што, перад сном памыцца хочаш, Віцечка? Пойдзем, я намылю табе спінку“. Пагружэнне цела ў цёплую ваду таза суправаджаецца яе пераліваннем цераз край. „Не рухайся, сынок, я сама ўсё вытру“, — супакаяльна кажа гэта вялікая прыгожая жанчына, і на гэтым успамін абрываецца.
„Ах, як мне баліць...“
„Жывым не дамся!“
А вось яны дваравой камандай гуляюць у індзейцаў. Маленькі Віця з усіх сіл хоча стаць індзейцам, але па злой іроніі лёсу яго прызначаюць канкістадорам. Ён лезе на высокую ліпу, — адтуль яму загадана падаваць сігнал. „Давай каня“, — грубымі мужчынскімі галасамі крычаць хлопчыкі. „Не зловіш, не зловіш, ты такі тоўсты, жыртрэст ты паганы“, — цвяліць індзеец Андруша канкістадора Пецю, які быў сапраўды хворы на атлусценне. „Дзе запасы вады, дзе запасы вады“, — чуваць крыкі з галоўнага канкістадорскага штабу. Сядзець на ліпе Віцю падабаецца — далягляды адкрываюцца завоблачныя, і да таго ж можна звіць сабе гняздо, адрываць і скідваць уніз ліпавую кару або віць з яе вяроўкі. „Агня давай, агня давай“, — хлопчыкі ў штабе разышліся не на жарт.
Так, відаць, якраз тады ён вырашыў стаць ваенным, прысвяціць усё жыццё арміі, узброеным сілам. Абароназдольнасць сваёй краіны заўсёды глыбока хвалявала яго, не пакідалі яго абыякавым і яшчэ да канца не выкараненыя недахопы ў войску. Ну, і канечне, вайсковая форма... Асабліва яму падабалася скураная партупея і кабура для нагана. У іх было нешта язычаскае, нешта раннегрэчаскае! Альбо як рыпяць хромавыя афіцэрскія боты на марозе! Немагчыма адвесці вушэй, цяжка перавесці дых.
„Ах, як мне баліць“.
„Ах“.
Боль з новай сілай пачаў ахопліваць цела, быццам невядомы злы чараўнік сотнямі іголак прайшоўся па спіне і карку. Выключыць, вырваць з сябе гэты боль, ад якога пруцянее цела, дае сабе каманду Пятровіч і паволі, як бы баючыся, заплюшчвае павекі. Гэта было ...гэта было ...у Беластоку. Народ сустракаў савецкіх вызваліцеляў радасна, закідваў кветкамі, дзяўчаты распускалі косы. Быў пагодны вераснёўскі дзень. Нашы паказалі сябе малайцамі: трымаліся годна, ішлі размераным крокам, ніхто не курыў і, тым больш, не пляваўся. Усюды

панавала ўсеагульнае ўзрушэнне, весялосць, хацелася ўзяць і гучна закрычаць. Ён тады ўжо ўмеў шчыльна зачыняць дзверы, чым справядліва заслужыў давер'е з боку высокага начальства. Нездарма пасля гэтага яго перавялі пад Ленінград змагацца з белафінамі. Гэтую кампанію ён запомніць на ўсё астатняе жыццё — яшчэ б, яму ледзь не давялося згубіць нагу. Выратавалі нашы медыкі, і асабліва дапамагла кірпатая, чарнавокая медсястрычка Маруся. Чым дапамагла? І шчырым клопатам, і пільнаю ўвагаю, і сваёй незлапамятнасцю. Ды ці мала чым. А далей была Каракалпакія, куды яго са спецзаданнем выслала партыя і савецкі народ. Нядоўга доўжылася яго асабістае і сямейнае шчасце — яго прызначылі народным камісарам культуры Каракалпацкай АССР, а Марусю ўдалося ўладкаваць у мясцовы тэхнікум выкладчыцай фізкультуры. І праўду сказаць, моцна яго прытамілі ўсе гэтыя нарады, выезды на месцы, ушанаванні за асаблівыя заслугі мясцовых работнікаў культуры. Ён ніколі не любіў і не прымаў руціну ні ў якай форме, імкнуўся быць там, дзе крыніцай біла жыццё, дзе вырашаўся лёс краіны. І хоць двойчы яму свае нарысы прысвячала газета „Правда", адразу пасля вераломнага нападу фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз ён добраахвотнікам пайшоў на фронт.

„Ах, як мне баліць!"

„Ах, мая мама!"

„Пацярпі мой родненькі, пацярпі мой міленькі", — вушы Пятровіча ажно спацелі ад нечаканасці. Што, сапраўды, недзе тут яго мама, бо ён чуе яе распеўны голас. Гэта ў сне ці на яве? Дзе ён? Што здарылася? Што ж гэта робіцца навокал? Дзе свае, дзе чужыя?

У паветры лёталі белыя мухі. Іх павольнае кружлянне прымушала паверыць, што гэта на самай справе не кружлянне, а ціхі развітальны танец прыроды. Верасень... і раптам снег. Што за чорт? А гэта што там далей — вершнік з кап'ём, які прыціснуўся да крупу каня? А вось цяпер, здаецца, дзынкнула так горача ім любімая мандаліна, разносячы па наваколлі свае саладжавыя гукі? Што... зямля яго ўцягвае ў сваё ўлонне, не дае яму выпрастацца, не дае яму засяродзіцца. Зямля хоча яго... да канца ўвабраць у сябе, праглынуць без астачы. Трэба змагацца, трэба супраціўляцца, не даць закапаць сябе жыўцом. Што там? Бусел ці лебедзь. Усё роўна, але як нязносна ён

лапоча сваімі крыламі, нібы з усяго размаху б’е імі па галаве. Вось цяпер ён прыпадымецца і... Дзе немцы? Хто гэта там у жоўтым, а хто ў чорным? Што за маскарад! Знайшлі час галаву дурыць! А можа, гэта немцы? Так, па ўсяму відаць, што фашысты арганізуюць наступную атаку. За яго яны гатовы заплаціць дарагую цану! Толькі аднаго яны, як заўсёды, не ўлічылі — рускія проста так не здаюцца.

„Жывым не дамся“.

Пот, пыльны пот з дробнымі каменьчыкамі засціць вочы. Рэзь у вачах адгукаецца вогненнымі шарамі ў мозгу. Чалавек пачынае гарэць з галавы — з мазгоў агонь перакідаецца на скроні і патыліцу. Затым наступае чарга тулава і канечнасцей. Пасля, калі ўсё ўжо ў агні, пачынае гарэць пясок і трава. Вогненнае вецце ў начной цішы непасрэдна гаворыць з небам, пасылае нябёсам знак. Першы знак прайшоў незаўважаным, другі ўзвіўся куродымам, зліўся з куртатым начным воблакам. Цяпер і гэтае воблака складаецца з агню, цяпер і яно агонь, што ляціць па небу. Вогненныя косы неба... Гэй, неба, перадаю табе прывет!

Якая халодная зямля ў верасні! Раніцай і ўдзень, нагрэтая сонцам, яна здаецца жаданым прытулішчам, якое валодае нераадольнай сілай прыцягнення, якое вабіць і не адпускае, чаруе і не дае адвесці вачэй. Здарожанаму спадарожніку цяжка не прысесці на духмяны дзірван, прылегчы на маладую атаву, закінуць галаву назад і закурыць цыгарэту. А птушыныя спевы! Не ўсе птушкі са сваімі птушанятамі паляцелі ў вырай. Многія прадстаўнікі пярнатых так яшчэ і не рашыліся на такое паветранае падарожжа. Ды і нашто, праўду кажучы, некуды ляцець, калі лес ажно поўніцца дарамі прыроды. На балотных кочках развалам ляжаць журавіны, на зарослай мохам зямлі красуюцца гронкі брусніц у акружэнні баравікоў і лісічак. Хоць збірай іх лапатай і грузі ў самазвал!

„Ах, як мне баліць!“

„Ах!“

„Пра мяне забыліся. Пра мяне, канечне ж, забыліся. Хто я цяпер? Мяне папросту кінулі. Вось так уладжана жыццё — працуеш, працуеш, не пакладаючы рук, не шкадуючы сіл, а як прыходзіць твой судны дзень, усе адварочваюцца ад цябе, быццам убачыўшы ў першы раз. Госпадзе! Дзе тылы, дзе агнявая падтрымка? Чаму маўчыць вялікая зямля? Мяне

выкінулі, як непатрэбнае смецце, як выкідаюць попел з печкі. А можа, усё было так спецыяльна падстаўлена? Можа, нехта хоча звесці са мной рахункі? Чаму спазніўся гэты сувязны, чаму ён так неабачліва праставаў па вуліцы? Што гэта: выпадковая халатнасць або добра спланаваная акцыя? А можа, сам маршал Блюхер прадаўся... здрадзіў радзіме. Не, пра маршала Блюхера так думаць нельга. Маршал Блюхер — народны герой. Хто–хто, толькі не маршал Блюхер. Ці ўсё–такі шпіён? Нямецкі агент. Варожы лазутчык. Эх, каб жа можна было зазірнуць яму ў нутро, пакалупацца там пальцам, зрабіць нечым падмацаваны вывад! А немец–сувязіст! Відаць па ўсім, што ён таксама нешта чуяў, нешта падазраваў, бо надта гладка ўсё прайшло. А што, калі гэты немец... падсадная вутка?“

„Ах, як мне баліць!“

„Ах!“

„Мне ўжо не ўстаць. Я прыкаваны да зямлі, звязаны з ёй нябачнымі ланцугамі. Яшчэ зусім нядаўна я мог паварушыць пальчыкамі, падняць ручку... і паляцець. Усё было мне пад сілу. Сіла біла ўва мне ключом. Плечы мае былі як ветразі, сцёгны, як барты акіянскага лайнера. А цяпер усё ператварылася ў чырвань. Усё наўкола чырвонае — чырвоныя елкі сцеляць свае чырвоныя галінкі па чырвонай зямлі. Чырвоныя птушкі разрываюць чырвоную павалоку чырвонага неба. Чырвоныя лесуны ашчэрваюць свае чырвоныя зубы, чырвоныя чаплі ловяць чырвонымі дзюбамі чырвоных жаб. Чырвоныя грыбнікі збіраюць чырвонымі рукамі чырвоныя грыбы. Чырвоны вудзільшчык ловіць на чырвоную вудачку чырвонага ласося — яму карціць пакаштаваць яго чырвонай ікры. Чырвоныя мядзведзі пакідаюць сваімі чырвонымі лапамі чырвоныя сляды. Чырвоныя камары сваімі чырвонымі хабаткамі п’юць чырвоную кроў. Чырвоны харчавік абдорвае чырвонымі цукеркамі чырвоных дзетак. Праўду, хіба, казала бабка: што чырвана, тое й пекна“.

„Ах, як мне баліць!“

„Ах!“

„Колькі ж мне год? Памяць — штука капрызная. Не паспееш азірнуцца... і ты ўжо... гатоў... Трыццаць? Трынаццаць? Дваццаць восем? Сорак шэсць? Далоў умоўнасці! Я ўжо зусім вырас! Я дарослы! Я мужчына ў сталым веку, у мяне ёсць форменныя вусы! Я экіпіраваны, на мне гімнасцёрка і штаны

галіфэ. Ува мне б’ецца вялікае чырвонае сэрца. А гэтыя зялёна–мышыныя злодзеі хочуць забіць мяне, які ўвесь чырвоны як... сталь“.
„Ах, як мне баліць!“
„Ах!“
„Ты мужык ці баба? Не, ты прызнайся сам сабе — ты мужык ці баба? Што ты тады носам хлюпаеш, нюні развесіў? Не, ты, Палкін, не мужык... Калі б ты быў мужыком, то...“
Адным махам Пятровіч слабеючай здаровай рукой выхапіў з кабуры наган і запусціў яго сабе ў рот. Імгненна раздаўся амаль нячутны стрэл.
„Кацярына Мацвееўна, ніколі больш не расказвайце нам такіх сумных гісторый“, — не прамовіла, а прыхрыпела Наташа Патрыкеева і гучна расплакалася.

*Астанкі гвардыі маёра Віктара Пятровіча Палкіна былі выяўлены пошукавым дзіцяча–юнацкім атрадам „Дружба“ на чале са старшым лейтэнантам у адстаўцы П.Дз.Бідонавым 23 мая 1983 года. Праз тыдзень яны былі ўрачыста перапахаваныя ў сяле Анучкіне Свыгоіцкага раёна Марвілаўскай вобласці. На магіле быў устаноўлены мемарыяльны знак.*

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]
Вайна ў ARCHE 2(3)-1999 · [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **17-01-2000**

[image]
[image] .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima



да Зьместу 2(3)-1999

***міталёгія***

# Андрей Екадумов Великая отечественная: миф плюс история

**Андрэй Екадумаў — беларускі філёзаф, аўтар дысэртацыі «Сацыядынаміка сучаснай экасьвядомасьці й дыялёг культур», стваральнік часопісу «менскага культурнага аўтсайду» «Alter Alternative». У мінулым нумары часопісу «ARCHE» друкаваўся ягоны артыкул «Бяздомная нацыя з эўрапейскага дому».**

**Коммунизм и война**

**Р**азбирая, каким козырем была великая отечественная война для коммунистической мифологии, не обойтись без оговорок о роли войны в коммунистическом мировосприятии вообще. Зинаида Гиппиус в своих дневниках из красного Петрограда писала: коммунизм и война неразделимы. Сейчас, оглядываясь назад, мы можем убедиться в справедливости этих слов.

Состояние войны — коммунистическая стихия. Реальный коммунизм — военный коммунизм, и только в состоянии войны эта модель социального управления может быть эффективной. Коммунистическому правительству труднее функционировать в условиях мира, чем в условиях войны. Коммунистическая партия как партия монополии на власть утвердилась в войне. Коммунистическая элита, устраняя угрозу своей монополии, обезглавила народы Российской империи, вычистив или ассимилировав национальные элиты, способные

ей противостоять. Ликвидировав интеллигенцию и старых конкурентов — дворянство и буржуазию, компартия ликвидировала на одной шестой части суши — на какое–то время — способы управления и контроля, альтернативные привычным ей моделям.
Коммунисты создали универсальную монополию, в которой экономическая, политическая, юридическая и духовная (идеологическая) власть срослись воедино, образовав невиданный тоталитарный гибрид. Более того, с ликвидацией рынка, зачатков представительной демократии, свободы прессы и суда присяжных коммунистическая элита разрушила систему прямых–обратных связей в обществе и государстве, на которой держалась Западная Европа и США. Именно эта система зарекомендовала себя как наиболее эффективная в посттрадиционном обществе, и именно эту систему худо–бедно осваивала Российская империя в канун первой мировой войны. Оставшись без опробованной на практике, но негодной по идеологическим и мессианским соображениям модели социального устройства, все с тем же военным менталитетом, да еще в условиях отнюдь не дружелюбного внешнего окружения, большевики и их наследники обречены были умышленно или непроизвольно внедрять клише военного времени в мирную жизнь.

**Этика войны**
Советский человек — строитель коммунизма (вчерашний подданный Российской империи или его потомок в первом–втором поколении) — вовсе не был рожден для счастья, которое ему надлежало строить для следующих поколений. По крайней мере, официальная этика нового общества, начавшего отстраиваться сразу на костях, своих и врагов, была далека от гедонизма. Потомков экс–подданных российского государя императора растили для борьбы, в которой мирный труд приравнивался к войне. О таком отождествлении мира и войны красноречиво свидетельствует сертификат человеческого качества, ходивший на просторах Союза Нерушимого — значок ГТО: «готов к труду и обороне».
На милитаризацию советского сознания работал сам характер социального проекта, чью реализацию взяли на себя члены большевистской партии и сочувствующие. В отличие от

несовершенной демократической системы, примирявшей социальную явь с максимами христианской этики, коммунистическая система страдала патологическим изъяном: отсутствием реальной, социально–технологической связки между прозой социального бытия и прожектами индоктринированного сознания. В фундаменте коммунизма — не отвлеченной идеи о государстве всеобщего благоденствия, царстве Божием на земле, а реальной исторической практики — изначально лежит противоречие великой цели и средств ее достижения. За это критиковали коммунизм и русские философы Серебряного века, и западные теоретики тоталитаризма.

Ради будущего освобождения человека следовало приносить жертвы настоящим, ради должного жертвовать сущим. Надо было закабалить миллионы и миллионы, подчинив волю каждого индивида выполнению цели, торжество которой сам он уже не застанет. Несколько поколений уже рожденных людей должны были совершить подвиг отречения во имя будущих, еще не родившихся поколений. Основным пафосом коммунистической морали стало самопожертвование личным во имя общественного — и героизм навязывался в качестве жизненной нормы. Ментальные клише, схемы управления и взаимодействия, характерные для войны и перенесенные в мирную жизнь, дополнялись особой коммунистической этикой, этикой героизма.

Героическая этика была мощным орудием эксплуатации советских людей коммунистической элитой. В рамках такой этики нормальный налаженный быт, который мы наблюдаем в Европе, становился аморальным, поскольку забота о бытовом обустройстве есть проявление заботы о себе, а воплощение коммунистического проекта требовало ставить личное ниже общественного. Военный подвиг, непосредственно связанный с наивысшей степенью самопожертвования индивида во имя социального целого, — апофеоз героической этики. Официальная коммунистическая этика — не этика мирной жизни, но этика войны.

**Кровь вместо почвы**

Многонациональный характер новой, советской империи препятствовал сплочению населения вокруг

националистической идеологии, основанной на мифологеме почвы и крови. В многоконфессиональной, многоэтнической, многокультурной стране, сочетающей элементы индустриализма и патриархального общества, новая элита не могла фабриковать тотальную идеологию, отсылающую адепта к местной этнокультурной традиции. По этому пути шли национал–социалисты в Германии. Древнегерманский эпос поставлял первосортный материал для переработки в ультранационалистическую идеологию, в новый миф о Великом Райхе. Национал–социалистический миф ассимилировал эпос и историю германского этноса. Что касается советского мифа, то русская идея Москвы — третьего Рима, из которой Н.А.Бердяев выводил коммунистическую идеологию в новой России, более–менее эффективно сплачивала сам русский этнос, худо–бедно группировала восточных славян. Но оставался еще тюркский элемент, на который так упирают новоявленные евразийцы, кавказский и закавказский. Идеологема почвы в такой ситуации играла не консолидирующую, а дезинтегрирующую роль.

Идеологическое сплочение советского народа шло по линии крови. Базовая коммунистическая мифологема выражается не национал–социалистической формулой «почва и кровь», а формулой «кровь и еще раз кровь».

Национал–социалистический миф опирается на мистификацию национальной истории, взывает к племенной религии, коммунистический сразу подминает под себя мировую историю. Восстание Спартака в Риме или желтых повязок в Китае, крестьянская война в Германии или пугачевщина в России: непринципиально, чья кровь определила цвет знамени — рабов, пролетариев или крестьян. Общность исторических целей угнетенных масс определяет их родство, кровь, та, что пролита во имя будущего, где эти цели воплотятся, и та кровь, что еще предстоит пролить, объединяют не народы, а трудовые массы всего мира. С точки зрения притязаний коммунизма на место, отведенное мировой религии, не важно, Европа ли это, Африка или Латинская Америка, Россия или Беларусь, что и выражает принцип пролетарского интернационализма. Для многонационального государства, исповедывающего этот принцип, за неимением глубоких исторических корней для такого исповедания, при радикальном разрыве с прежней

религиозной традицией и политико–правовой системой, война и угроза войны становятся обязательным условием сплочения масс.
Кстати, по поводу крови. Как заметил железный германский канцлер Отто Бисмарк, царства объединяются железом и кровью. На примере второй мировой войны, получившей название великой отечественной, его афоризм заиграл новыми оттенками. Для идеологического сплочения империи необязательно ведение захватнической войны, победоносная освободительная война для идеологии, провозгласившей построение справедливого и счастливого общества подходит еще лучше (особенно если она при этом еще и дает возможность присоединить пол–Европы). Вторая мировая война идеологически закрепила итоги гражданской войны по повторному завоеванию национальных окраин империи и последующих чисток национальных элит. Объединение железом и кровью в гражданскую было завершено отечественной, когда разные нации и народности СССР породнились пролитой кровью. *Новая историческая общность советский народ* получила свой собственный, наднациональный эпос — историю великой отечественной войны, отредактированную в соответствии с коммунистическим идеологическим каноном.

**Мифологизация истории**
Для эпоса как формы коллективного сознания характерно смешение исторической фактуры с мифологическим материалом. Исторические события, преломляясь сквозь систему стереотипов мифологического мировоззрения, образуют синтез мифологии с историей. Возникает сказание о героическом прошлом, которое помещается где–то посередине между мифологическим временем сотворения мира, войны богов с силами тьмы и хаоса, и сегодняшним, повседневным историческим временем. Эпос — это связь человека, погруженного в профанное время реальной истории, с сакральным временем, когда боги создавали мир.
Разрыв между мифологическим и историческим временем, людьми и богами заполняет полубог, герой — человек, обладающий сверхчеловеческими качествами, будь то Ахилл, Беовульф или Кухулин. Эпос германцев, эллинов, римлян,

кельтов отображает и транслирует этические нормы эпохи и культуры, в которой он сформировался. Героика эпоса — удобная основа для этики тоталитарных и авторитарных режимов, позволяющей мобилизовать массы, заставлять их покорно принимать лишения как в военное, так и в мирное время.

Чтобы космогонический революционный миф, миф о сотворении нового социального мира, подменил собой память о реальной истории, должны были уйти люди, которые творили эту самую историю, для которых не существовало сакрального прошлого, а было историческое прошлое. Историческая память, тем более недавняя, опасна для социального мифотворчества. Она грозит мифу разоблачением, для чего достаточно обнародовать некоторые исторические документы и дать выговориться свидетелям реальных событий. Гражданская война не годилась на роль эпоса. Постулируя *новую историческую общность советский народ*, компартия нуждалась в таком эпосе, который сплачивал бы нации и народности Советской империи не только по классовому, но и по кровнородственному признаку. Гражданская война была войной своих против своих. Великая Отечественная уже одним своим названием стимулировала восприятие исторических фактов в определенной, выгодной для коммунистического мифа интерпретации. Это была отечественная война не для белорусского, русского или любого другого народа, а для всего народа СССР. Недостаток этнокультурного родства компенсировался родством по пролитой крови. Каждый, защищая свою малую родину, защищал общее Отечество Советский Союз. Отечественная война была оборонительной войной против общего внешнего врага, и в этом смысле была идеальным материалом для героического эпоса, призванного обслуживать интересы коммунистической элиты по идеологическому сплочению разных этнокультурных общностей. Советская система воспитания–образования использовала идеологические дивиденды с великой отечественной при производстве граждан наднациональной державы.

**Воспитание героев**

Коммунистическая мифология интернациональна, и основной

упор в эксплуатации тем великой отечественной войны делался и делается именно на ее интернациональном характере. «Разам змагалися руския и беларусы, украинцы и азербайджанцы, казахи и якуты», — из года в год повторяют дикторы белорусского радио. Национальное растворилось в интернациональном, белорусское или русское — в советском. Принцип комплектования вооруженных сил, как и система распределения выпускников вузов в бывшем Союзе предполагали постоянную перетасовку представителей разных этносов и культур, разрушение старой этнокультурной идентичности в ущерб новой идеологической. Тотальный характер великой отечественной позволял использовать ее мифологизированную историю в воспитании подрастающего поколения именно на основе интернационализма. Поскольку нельзя уничтожить предшествующую культурную традицию, не предложив какого–либо замещения, насаждалась традиция пролетарского интернационализма. Но лишенная универсальной религиозной или культурно–правовой основы, она сама нуждалась в историческом обосновании именно в качестве традиции. Эпос о великой отечественной подводил под нее историческую основу, но при этом оберегал неприкосновенность советского мифа.

Помимо ценностей интернационализма, этот эпос поставлял советской педагогической системе культурные образцы, ориентируясь на которые, подрастающее поколение должно было усваивать героическую этику. Все примеры для подражания, предоставленные к усвоению советским школьникам, были образцами жертвы и мученического подвига. Свой пантеон мучеников–святых–героев был у каждой возрастной группы. Пионеры–герои, молодогвардейцы, коммунисты–подпольщики. Система воспитания изначально благословляла человека на мученическую жертву во имя Родины, партии, народа, но не закладывала установок на нормальную добросовестную работу во имя собственного блага. Эпическая личность достигала самореализации в той мере, насколько воплощала в своей жизни образцы подчинения личного общественному. Если Российская империя так и не перешла к идеалу суверенной личности и общества, построенного на договоре людей–суверенов, то с насаждением коммунизма это отставание от Европы перешло в регресс —

дехристианизация разрушала то, что успело сформироваться от идеала автономной нравственной личности в период христианства. Образцы высоконравственного поведения поставляла война и труд в условиях, приближенных к боевым. Этика труда, создавшая цивилизованный Запад, была задавлена этикой подвига и жертвы.

Идеал отречения внедрялся в детское и юношеское сознание постоянно и не обязательно явно. После второй мировой в советской доперестроечной культуре развивалось явление, которое, в стиле психоанализа, можно назвать «Вина перед отцом». Не страх, а именно вина пред представителями старшего поколения, наиболее адекватно воплотившими в своей судьбе героическо–мученический идеал строителя коммунизма. Именно их смертями и страданиями покупалось послевоенное благополучие молодого поколения. В сознание молодых внедрялась установка оценивать жизненный уровень не от наилучшего, а от наихудшего. В любом роду, почти в каждой семье был человек, который мог и имел моральное право сказать младшим по поводу их недовольства жизнью: «Вы настоящего горя не видели». Моральный террор на уровне связи поколений действовал гораздо эффективнее пропаганды, списывавшей изъяны советской экономики на последствия войны.

Подвиг старшего поколения вовсю эксплуатировался советской пропагандой. Идеологическая машина постоянно подменяла понятия «государство», «партия», «народ», примеры мужества, героизма и самоотречения обязательно подшивались в реестр коммунистических достижений. Изъян моральных ориентиров коммунизма был не в самих поступках людей, чьи образы использовались в пантеоне героев, а в смешении образцов экстремального и повседневного человеческого существования. Недаром в СССР не было ничего более постоянного, чем временные трудности. Герои не занимаются благоустройством быта. Они поглощены великими свершениями и не обращают внимания на незначительные бытовые неудобства.

**Беларусь как богатырская застава**

В целом специфика той или иной нации или народности нивелировалась в мифологеме общего советского дома, за исключением географического расположения населяемой

территории. Место и роль белорусского этноса в советском коммунистическом мифе после второй мировой определялось в первую очередь его пограничным положением. Миф о коммунистической Беларуси расцвел именно после второй мировой. У Беларуси именно в Великую Отечественную появился особый мифологический статус — статус пограничья нового социального космоса, за которым начинался враждебный империалистический мир, царство зла и тьмы. Прояснить эту схему мифологического сознания, цементировавшую советскую мифологическую картину мира, удобно на примере скандинавской мифологии, где миру людей и светлых богов предшествует мир инеистых великанов. В советском мифе новое гуманистическое общество возникает из негуманного капиталистического, но мир капитала не гибнет полностью, он со всех сторон обступает государство рабочих и крестьян, как удгард древних великанов, родившихся прежде богов, — человеческий серединный мидгард в древнескандинавском мифе. Если мифологизированная история о революции и гражданской войне повествовала о сотворении нового мира на обломках старого, то эпос о Великой Отечественной рассказывал о войне за спасение нового мира от натиска сил тьмы и смерти.

В соответствии с мифологическими схемами мировосприятия, укорененными в человеческом бессознательном, Советский Союз имел свою типическую, не географическую, а мифологическую карту, в центре которой располагалось Сердце Родины Москва, кремль и Мавзолей. Далее расстилалось в принципе гомогенное мифологическое пространство, населенное *советским народом*, — теми самыми *«своими»* архаического сознания, людьми в полном смысле этого слова, *соплеменниками*, имеющими общего культурного героя–прародителя в лице Ленина. Только из–за полиэтнического и поликультурного состава империи эти *свои* определялись не по этнокультурному, а по идеологическому признаку. За пределами государственных границ, очерчивающих наподобие магической линии коммунистический мидгард, дом *своих*, советских людей, начинался иной мир, капиталистический удгард, где действуют иные законы и правят силы, враждебные человеку. Основная угроза новому миру исходит с Запада, из страны

Заката, где простираются земли, подчиненные воле Мирового Капитала (мирового зла). Соответственно, территория, лежащая на рубеже миров, оказывается сакральной зоной — Последней заставой, оберегающей мир света от сил зла. Именно эта роль согласно геополитическому раскладу до и после второй мировой войны легла на Беларусь. Кроме того, этнокультурное родство белорусов и русских создавало более выгодные предпосылки внедрения ассимилированной советским коммунизмом русской идеи именно на территории Беларуси, где своя интеллектуальная элита размывалась, поглощаясь то русским, то польским культурным пространством.

Если за Москвой сохранялась мифологема Третьего Рима, то Беларусь оказывалась третьеримским лемосом, оборонительной зоной на самом важном — западном направлении. Это был геополитический, этнокультурный и попросту территориальный буфер между Москвой–Третьим Римом и враждебным Западом, центром коммунистической ойкумены и царством нелюдей за ее пределами. Но в эпосе великой отечественной функция буферной территории приобретала особый привилегированный статус.

Страшная статистика — каждый четвертый житель погиб в той войне, была одновременно свидетельством избранности нашего народа. Именно ему историей и географией была уготована участь в наибольшей степени воплощать идеал Великой героической жертвы. Когда российские деятели культуры и искусства высказывались по поводу недавних договоров о единении русских с белорусами, белорусам в непременную заслугу ставилось то, что они костьми ложились на пути западного врага в Россию.

Миф о спасительной миссии России, несущей миру спасение и нравственное очищение, получает в Беларуси особое развитие также во многом именно благодаря великой отечественной. Если миссия России в религиозном или социально–нравственном спасении мира, то братская Беларусь получает собственную миссию при миссии России — прикрывать великую Россию от врага, способного воспрепятствовать ее правому делу. Прикрыли. Погиб каждый четвертый. Создалась почва для еще одного важного белорусского мифа XX века, виктимистического — мифа невинной жертвы.

Оцени! 5 - отл. 4 - хор. 3 - уд. 2 - неуд. 1 - ...
br.gis.com.by

---

[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima
[image]

*Вайна ў ARCHE 2(3)-1999* . [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **14-10-1999**

[image]

[image] .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 2(3)-1999
*слоўнік паняцьняў*

# Дэніэл Голдгаген Добраахвотныя памочнікі Гітлера. Звычайныя немцы й Галакост

**Дэніэл Голдгаген — прафэсар Гарвардзкага ўнівэрсытэту. Ягоная кандыдацкая дысэртацыя “Добраахвотныя памочнікі Гітлера. Звычайныя немцы й Галакост” стала, што называецца, навуковым бэстсэлерам і выклікала бурную дыскусію ў Нямеччыне і іншых краінах. Аўтар разглядае пытаньне, ці вінаватыя звычайныя немцы ў злачынствах гітлерызму, і адказвае на яго станоўча. Кніга цікавая ня толькі сваім зьместам, але й тым, як пішацца навуковы бэстсэлер.**

**Частка III**
**Паліцыйныя батальёны:**
**звычайныя нямецкія грамадзяне ў якасьці добраахвотных забойцаў**

“Я хачу гэтым сказаць, што я зусім ня думаў аб тым, што гэтыя загады могуць быць няправільнымі. Праўда, я ведаю, што да задачаў паліцыі належыць абарона нявінных, але ж тады я быў перакананы, што жыды не бязьвінныя, а вінаватыя. Я верыў прапагандзе, што ўсе жыды — злачынцы і недачалавекі, і што

яны — прычына заняпаду Нямеччыны пасьля першай сусьветнай вайны. Вось жа ў мяне не было нават думкі супраціўляцца ці ўнікаць загаду на ўдзел у зьнішчэньні жыдоў. Я выконваў гэтыя загады, бо яны зыходзілі ад найвышэйшага кіраўніцтва дзяржавы, а зусім не таму, што баяўся".

*Курт Мёбіус, былы жаўнер паліцыйнага батальёну, што выконваў службу ў Хелмна,*
*у сваіх паказаньнях 8 лістапада 1961 г.*

**Разьдзел 6**

**Паліцыйныя батальёны:**
**падручныя генацыду**

**У** ажыцьцяўленьні Галакосту паліцыя парадку (Ordnungspolizei) адыгрывала гэтаксама істотную ролю, як карныя групы (Einsatzgruppen) ды СС[1]. Да паліцыі парадку належалі і ахоўная паліцыя ўлучна з паліцыйнымі батальёнамі, і жандармэрыя; аднак паліцыйныя батальёны ў якасьці найбольш мабільнага й надзвычай гнуткага ў выкарыстаньні аддзелу паліцыі парадку былі наймацней уцягнутыя ў ажыцьцяўленьне Галакосту. Характар гэтых частак і зьдзейсьненыя імі злачынствы яскрава асьвятляюць некаторыя важныя аспэкты Галакосту.

...Тут ідзецца перадусім пра тры галоўныя прыкметы паліцыйных батальёнаў:

1. Значную частку складу гэтых адзінак станавілі зусім звычайныя немцы, якіх не абіралі паводле вайсковай ці ідэалягічнай прыдатнасьці. Часьцяком на службу ў гэтых аддзелах мужчынаў набіралі зусім выпадковым чынам; у батальёны часам бралі нават непрыдатных рэкрутаў і ніяк адмыслова не правяралі.
2. Апынуўшыся ў паліцыйных батальёнах, гэтыя мужчыны, ад якіх не выпадала надта шмат чакаць у ваенным дачыненьні, вучыліся зброі, вайсковай тактыцы і асновам кіраваньня, аднак якасьць асьветы была ніжэйшая за сярэдні ровень. Ідэалягічная апрацоўка й выхаваньне былі да сьмешнага павярхоўнымі і неэфэктыўнымі.
3. Паліцыйныя батальёны не былі "нацыянал–сацыялістычнай" арганізацыяй ва ўласным сэнсе слова. Яны былі ня больш ідэалягізаванымі, чымся нямецкае насельніцтва ўвогуле, і таму рэпрэзэнтатыўнымі для нацыфікаванага грамадзтва.

На пачатку вайны ў паліцыі парадку служыла 131 000 чалавек, улучна з афіцэрамі[2], у пачатку 1943 г. асабовы склад станавіў

ужо 310 000, у ліку якіх было 132 000 рэзэрвістаў (42%)[3]. Гэта была немалая і даволі значная сілавая структура. З пашырэньнем асабовага складу і ўзмацненьнем кантролю над акупаванымі тэрыторыямі, населенымі прадстаўнікамі “непаўнавартасных расаў”, у батальёнаў зьявіліся новыя задачы: змаганьне з партызанамі, перасяленьне мясцовага насельніцтва і вынішчэньне цывільных жыхароў, то бок найперш і пераважна жыдоў. Таму паліцыю парадку 1942 году ўжо нельга параўноўваць з даваеннай паліцыяй. Хоць яе арганізацыйная структура збольшага засталася нязьменнай, колькасьць байцоў ад 1938 году павялічылася ў чатыры разы. З прафэсійнай паліцыі, якая першапачатна была адносна дэцэнтралізаванай — паліцыянты базаваліся пераважна побач родных мясьцінаў — цяпер яна вырасла ў структуру, якая абдымала ўсе акупаваныя тэрыторыі і мела на мэце падтрыманьне каляніяльнай улады над Эўропай. Жаўнеры ж ейныя, ня маючы спэцыяльнай паліцыйнай адукацыі, кантактавалі з варожымі народамі, кожны зь якіх гаварыў на сваёй мове, жыў паводле сваіх звычаяў ды спадзяваньняў.
У паліцыйных і рэзэрвовых паліцыйных батальёнах служыла вялікая колькасьць немцаў[4]. Гэтыя адзінкі складаліся ў сярэднім з шасьцісот чалавек і выконвалі шмат задачаў як у Нямеччыне, так і на акупаваных тэрыторыях. Напачатку ў кожнай частцы было па чатыры роты й штаб, на чале якога стаяў капітан ці маёр. Пазьней колькасьць ротаў зьменшылі да трох. Кожная рота падзялялася на тры зьвязы, якія ў сваю чаргу складаліся з дружынаў па 10–15 чалавек. Першапачатна яны мелі выконваць функцыі звычайнай рэгулярнай паліцыі, накшталт рэгуляваньня руху й аховы будынкаў, што і пачалі рабіць яшчэ ў 1939 годзе; яны ўдзельнічалі таксама ў перасяленьнях жыхарства акупаваных абшараў, прыкладам у 1940 у Польшчы[5]. Паводле дамовы з вэрмахтам яны павінны былі таксама ў разе патрэбы ўдзельнічаць у ваенных апэрацыях і змагацца з партызанамі ў тыле. Так, паліцыйныя батальёны бралі ўдзел у нападзе на Польшчу ў 1939, у вайне супраць Францыі ў 1940, пасьля ў нападзе на Савецкі Саюз. Калі не лічыць удзелу ў баях, яны выконвалі цалкам звычайныя задачы паліцыянтаў на акупаваных тэрыторыях пад час вайны. На звычайны паліцыйны аддзел не ўскладалі вялікіх спадзяваньняў, таму й выбарам людзей асабліва не займаліся, і

ўзбройвалі лёгка, і вучылі часта абы–як. Ніводная справаздача, ніводнае выказваньне ці загад ня сьведчаць аб тым, быццам у 1939 праводзілася якая–колечы падрыхтоўка паліцыйных батальёнаў да ўдзелу ў генацыдзе.

Людзей для паліцыйных батальёнаў рэкрутавалі й навучалі хутчэй бязладна. Гэта адпавядала нізкаму статусу паліцыі парадку ў нямецкіх сілах бясьпекі і збройных сілах, — стан, які прыводзіў таксама да трывалых кадравых праблемаў пад час вайны[6]. Паводле ацэнак самой паліцыі парадку, у лістападзе 1941 ёй неставала амаль 100 000 чалавек (яе агульная колькасьць на той час складала менш за 300 000) і тэрмінова патрабаваліся дадатковыя 43 000[7]. Каб задаволіць свае кадравыя патрэбы[8], паліцыя парадку мусіла прымаць у свае шэрагі мужчынаў, якія, уласна кажучы, былі непрыдатныя да паліцыйнай ці вайсковай службы, пры гэтым бралі нават тых, хто пераступіў мяжу нармальнага прызыўнога веку ці не адпавядаў неабходным фізычным патрабаваньням для паліцыйнай службы. Тлумачыліся такія кампрамісы “цяперашнім цяжкім кадравым становішчам у паліцыі парадку”[9].

Дык ня дзіва, што паліцыя парадку мабілізоўвала апошнія рэзэрвы. 83–ці паліцыйны батальён у сваёй сядзібе, верхнешлёнскім горадзе Гляйвіцы нават рэкрутаваўшы ўсіх мужчынаў да апошняга, ня здолеў укамплектаваць адну са сваіх адзінак[10]. Нацыстоўскі рэжым не рабіў ніякіх спробаў укамплектаваць паліцыю парадку здаровымі, здольнымі ці асабліва адданымі нацыянал–сацыялістам мужчынамі. Апроч таго, вывучка гэтых людзей таксама сьведчыла, што кіраўніцтва ад іх шмат не чакала.

Мужчыны, прызваныя ў паліцыю парадку, сапраўды былі далёка не супэрмэнамі. Большасьць зь іх ніколі не праходзіла ніякай вайсковай падрыхтоўкі. Яны былі ўжо немаладыя, у сваіх сем’ях — старэйшыя, у грамадзтве яны ўжо займалі пэўныя прафэсійныя пазыцыі, і таму імі было цяжэй кіраваць, чымся маладымі мужчынамі. Нездарма ваенныя і палітычныя арганізацыі больш любяць набіраць сабе маладых, бо тысячагадовы досьвед даводзіць, што з маладога матэрыялу прасьцей ляпіць патрэбную форму і што яны нашмат хутчэй прасякаюцца мэтамі й мэтадамі вайсковай арганізацыі. Таму паліцыя парадку, дарма што ейныя апэратыўныя задачы былі

нескладанымі, сутыкалася зь істотнымі праблемамі што да шкаленьня рэкрутаў. Сытуацыю дадаткова ўскладніла нястача часу, бо людзі патрабаваліся тэрмінова.
...
У часе навучаньня ідэалягічнаму шкаленьню зазвычай прысьвячалі толькі дзьве гадзіны на тыдзень. Пры гэтым штотыдзень з пытаньняў, закладзеных у сьветапоглядны рамкавы плян, разглядалася новае, у тым ліку шмат стандартных нацыянал–сацыялістычных тэмаў — Вэрсальская мірная дамова, думкі пра кроў і помсту, ідэалёгія фюрэра — але часу, каб дайсьці да глыбіняў, нестава́ла[11]. Павярхоўнае ідэалягічнае выхаваньне хіба што знаёміла навабранцаў са сьветапоглядным падвалінамі нацыянал–сацыялізму, але наўрад ці магло справіць большы эфэкт, чымся колькі прамоваў Гітлера — а іх гэтыя людзі, безумоўна, ужо чулі. Тымі тыднямі інтэнсіўнага й стомнага навучаньня колькі гадзінаў такіх палітінфармацыяў былі хутчэй адпачынкам, чымся дзейснымі індактрынацыйнымі захадамі[12].
Падчас вайны ідэалягічнае шкаленьне мусіла працягвацца, і штодзень, штотыдзень і штомесяц для гэтага прадугледжваліся гадзіны. ... Штотыдзень трэ было абмяркоўваць партыйную працу і выхаваньне характару, раз на месяц — спэцыяльную, вызначаную ўстановай Гімлера тэму, пераважна якое–небудзь актуальнае пытаньне сьветапогляднага характару. Усё гэта сьпярша можа падштурхнуць да высновы пра грунтоўны ідэалягічны ўплыў на жаўнераў, адылі — нават калі інструкцыі выконваліся дасканала — на штотыднёвыя заняткі заставалася зусім мала часу, так што ўзьдзеяньне на людзей было абмежаваным. Штодзённыя палітінфармацыі мелі на мэце проста паведамляць й растлумачваць навіны, якія зводзіліся пераважна да франтавых зводак. Апроч таго, усе гэтыя заняткі праводзіліся пэдагагічна некампэтэнтнымі афіцэрамі саміх паліцыйных батальёнаў, а не спэцыяльна падрыхтаванымі інструктарамі. Палітінфармацыя, найважнейшы інструмэнт сталай ідэалягічнай індактрынацыі, мела доўжыцца ня больш за 30–45 хвілінаў; пры гэтым трэ было апускаць усё, “што магло б падарваць іх баявы дух”[13].
...

Вялікая частка жаўнераў падалася да паліцыі, каб абмінуць

адкрыта ваенную службу — у СС ці вэрмахце. Гэта напэўна ня сьведчыць пра асаблівую схільнасьць да вайсковай дысцыпліны і салідарных дзеяньняў, а таксама да забойства людзей. Вельмі імаверна, што сярод гэтых людзей было шмат бацькоў сямействаў, то бок далёка не васемнаццацігадовых юнакоў без жыцьцёвага досьведу, якія б лёгка падпарадкоўваліся вайсковым патрабаваньням. Гэтым паліцыянтам не была ўласьцівая юнацкая бесклапотнасьць, яны былі дарослымі людзьмі з самастойным мысьленьнем. З улікам іхнага ўзросту, сямейнага становішча й духоўных перадумоваў паліцыя парадку і ў асаблівасьці паліцыйныя рэзэрвы складаліся хутчэй зь людзей, што ў асабістым пляне былі ўзглядна незалежнымі ад уяўленьняў пра норму, якімі яны былі ў нацыстоўскай Нямеччыне.

Паліцыя парадку не была, такімчынам, нацыстоўскай, прасякнутай ідэямі рэжыму. Афіцэры паводле тагачасных нямецкіх мерак не былі надта нацыфікаванымі, а шараговы склад — яшчэ менш. Рэжым ня надта намагаўся запоўніць яе шэрагі перакананымі нацыянал–сацыялістамі. На “адданасьць партыі” зважалі толькі пры прасоўваньні па службе афіцэраў, але ў будзённай службе сьветапогляды амаль не іграліролі[14].

Паліцыя ня спраўджвала ідэалягічных поглядаў навабранцаў; мінімальная ідэалягічная апрацоўка наўрад ці магла істотна ўзмацніць нацыстоўская настроі або, тым больш, пераканаць тых, хто вагаўся. У параўнаньні з штодзённай ідэалягічнай індактрынацыяй нямецкага насельніцтва, індактрынацыя паліцыйных батальёнаў была нават слабейшая.

Паліцыя парадку, такім чынам, не складалася ані з ахвочых да вайны жаўнераў, ані з нацыянал–сацыялістычных звышчалавекаў; у ёй не гадавалі выканаўцаў генацыду. І тым ня менш, менавіта гэтым часткам нацыстоўскі рэжым неўзабаве даручыў карныя акцыі і пераканаўся, што звычайныя немцы, не атрымаўшы ў якасьці ідэалягічнай зброі нічога, апроч пашыраных у Нямеччыне культурных уяўленьняў, лёгка зрабіліся падручнымі генацыду.

Нашыя веды пра дзеяньні паліцыйных батальёнаў пад час вайны адрывістыя й аднабаковыя. Тым ня менш, нельга абысьці ўвагай чыннасьць паліцыйных батальёнаў на акупаваных абшарах[15]. Адміністратыўна яны падначальваліся Вышэйшаму Фюрэру СС і Паліцыі (ВФССП) таго рэгіёну, дзе яны апэравалі.

ВФССП быў адказны за ўсе сілы СС, паліцыі й бясьпекі, якія дзейнічалі ў межах ягонай акругі[16]. Загады на карныя апэрацыі амаль заўсёды перадаваліся ў вуснай форме — у асабістых размовах ці праз тэлефон. У залежнасьці ад кшталту “акцыі” і ад таго, якія шчэ інстытуцыі бралі ў ёй удзел, афіцэры й шараговы склад паліцыйных батальёнаў былі то больш, то менш аўтаномнымі ў выкананьні загадаў. Увогуле паліцыйны батальён праводзіў апэрацыі ўсялякага роду, калі ў сіле батальёну, калі ў сіле роты; часам задзейнічалі адно некалькі чалавек. Дзеля таго, што батальён у першую чаргу меў выконваць паліцыйныя функцыі і падтрымліваць парадак у прыдзеленай яму — часта варожай — акрузе, звычайна ён мясьціўся ў казармах у адным горадзе. Роты маглі базавацца таксама і паасобку ў розных гарадах аднаго рэгіёну. Гэтыя базы слугавалі яму зыходнымі пунктамі для вылазак у навакольле. Людзі паліцыйных батальёнаў дзеялі альбо самастойна, альбо ў зьвязку зь сіламі іншых адзінак, у тым ліку вэрмахту, з карнымі камандамі, СД, ахоўным пэрсаналам канцлягераў, жандармэрыяй і нямецкай цывільнай адміністрацыяй — карацей, ледзь не з усімі складнікамі нямецкага апарату кіраваньня й бясьпекі на акупаваных абшарах. Хоць часам паліцыйныя батальёны маглі заставацца на адным месцы доўгі час, яны ўсё–ткі, перадусім ва Ўсходняй Эўропе, заўжды былі ў руху, бо нямецкая паліцыя цярпела ад агульнай нястачы пэрсаналу. Калі недзе патрабаваліся дадатковыя сілы, туды на падмацунак дасылалі людзей якога–небудзь батальёну, што месьціўся паблізу.

Пры гэтым батальёнам даручалі самыя разнастайныя заданьні; найчасьцей гэта былі функцыі, якія ня мелі нічога супольнага з генацыдам: звычайныя паліцыйныя задачы, ахова камунікацыяў і будынкаў, гэтак званае змаганьне з партызанамі. Некаторыя нават ваявалі поруч з вэрмахтам на фронце. Але менавіта гэтая паліцыя зганяла людзей для вывазу ў Нямеччыну ці ў лягеры, часьцяком у лягеры сьмерці. Менавіта гэтая паліцыя ўдзельнічала ў забойствах — часта гэта былі масавыя забойствы.

Якія б даручэньні яны ня мусілі выконваць — жаўнеры паліцыйных батальёнаў усё ж мелі шмат вольнага часу. Хаця пра гэта мала што ведама, нельга ігнараваць гэты бок іхнага жыцьця. Бо калі мы хочам зразумець і іхныя злачынствы, то

мусім уведаць цэлы жыццясьвет гэтых людзей і ня можам разглядаць іх у адрыве ад іхных сацыяльных сувязяў, бо йнакш мы замянялі б іх у карыкатуры на іх самых. Гэтыя людзі дзейнічалі не ізалявана і не былі паняволенымі. І падчас службы яны таксама хадзілі ў царкву і ў кіно, ладзілі спартовыя спаборніцтвы, радаваліся вакацыям і пісалі лісты на радзіму. Забаўляліся ў барах і шынках, пілі, танчылі, мелі палюбоўныя прыгоды і гутарылі міжсобку. Як усе іншыя людзі, яны, мусіць, разважалі аб сваім жыцьці і сваіх учынках. Як усе жаўнеры вайсковых ці паліцыйных адзінак, яны гаварылі міжсобку — у групах, у вузкім коле й адзін з адным. Пры гэтым яны, мусіць, закраналі надзённыя тэмы, гэтаксама як вайну ці іхную забойніцкую “працу”. Яны ўсьведамлялі, што іхныя ўчынкі мусілі пакінуць адбітак на той гістарычнай эпосе, на іхнай краіне й іхным жыцьці — незалежна ад таго, ці выйграюць яны вайну, ці прайграюць. Яны забівалі, ажыццяўляючы генацыд, і разам з тым вялі ў паліцыйных батальёнах адносна нязмушанае й часта бестурботнае жыцьцё.

Удзел паліцыйных батальёнаў у маштабных карных апэрацыях у рамках генацыду пачаўся зь нямецкага ўварваньня ў Савецкі Саюз 22 чэрвеня 1941 году. Масавыя экзэкуцыі, ужо зьдзейсьненыя некаторымі паліцыйнымі батальёнамі ў Польшчы, былі шчэ бессыстэмнымі і не зьяўляліся часткай сплянаванага генацыду. Цяпер байцамі 9–га паліцыйнага батальёну былі дапоўненыя тры з чатырох карных групаў, якія сталіся галоўным рухавіком масавага вынішчэньня жыдоў у Савецкім Саюзе. Кожнай з гэтых карных групаў была падпарадкаваная адна рота 9–га паліцыйнага батальёну, жаўнеры якой, зноў жа, прыдзяляліся да розных карных і асобых камандаў, так што ў кожнай камандзе колькасьцю ад ста да ста пяцідзесяці чалавек паліцыйны аддзел станавіў трыццаць–сорак чалавек. У сьнежні 1941 г. 9–ты паліцыйны батальён быў адведзены й заменены праз 3–ці паліцыйны батальён. Байцы абодвух батальёнаў падчас апэрацыяў падначальваліся карным групам, выконваючы амаль тыя ж задачы і ўжываючы тыя самыя мэтады, што й яны[17]. Карныя групы ў заваяваных савецкіх раёнах забілі больш за мільён жыдоў. На паліцыйныя батальёны, складзеныя збольшага з рэзэрвістаў, прыпадае немалая частка гэтай лічбы.

Жыдоў у Савецкім Саюзе забівалі ня толькі два батальёны,

прыдзеленыя карным групам. Іншыя паліцыйныя батальёны таксама забілі дзясяткі тысяч жыдоў, часткова ў супрацоўніцтве з аддзеламі карных групаў, часткова самастойна. Тры батальёны 10–га паліцыйнага палку (45–ты, 303–ці і 314–ты паліцыйныя батальёны) і 11–га паліцыйнага палку (304–ты, 315–ы і 320–ты паліцыйныя батальёны) дзеялі пад кіраўніцтвам ВФССП “Руслянд–Зюд” і ўдзельнічалі ў зьнішчэньні ўкраінскіх жыдоў[18]. За трыма батальёнамі паліцыйнага палку “Руслянд–Мітэ” (307–мы, 316–ты і 322–гі паліцыйныя батальёны) цягнецца шырокі крывавы сьлед па Беларусі[19].

Адна зь першых зьверскіх карных апэрацыяў супраць савецкіх жыдоў была зьдзейсьненая іншым паліцыйным батальёнам, 309–тым. Колькі дзён пасьля пачатку “пляну Барбароса” ён наладзіў у горадзе Беластоку жахлівую крывавую лазьню, якой лёсіла набыць высокае сымбалічнае значэньне.
Афіцэры й шараговы склад прынамсі адной роты 309–га батальёну яшчэ да моманту, калі яны пераступілі савецкую мяжу, ведалі, якую ролю яны павінны былі адыграць у заплянаваным вынішчэньні савецкіх жыдоў[20]. 27 чэрвеня 1941 г., па ўваходзе ў Беласток, які быў заняты немцамі, як і многія іншыя гарады, без барацьбы, камандзір батальёну Эрнст Вайс загадаў сваім людзям “прачасаць” жыдоўскі квартал і сагнаць усіх жыхароў мужчынскага полу. Хоць канцавой мэтай гэтай апэрацыі і было забіцьцё жыдоў, на той момант яшчэ не было ніякіх загадаў пра тое, якім чынам гэта мела адбыцца. Увесь батальён узяў удзел у аблаве, якая праводзілася з надзвычайнай лютасьцю. Немцам, што бралі ў ёй удзел, нарэшце трапілася магчымасьць накінуцца на жыдоў, абсалютна ня стрымліваючы сябе. Адзін жыд прыгадвае: “Адразу як матарызаваная частка ўвайшла ў горад, жаўнеры расьсеяліся па вуліцах і без дай–прычыны распачалі моцную страляніну, відаць, для таго каб застрашыць людзей. Страляніна была жахлівая. Стралялі ўсьляпую нават па дамах і вокнах, не зважаючы, ці там хто стаіць. Стрэлы трывалі праз увесь дзень”[21].
Жаўнеры батальёну ўрываліся ў кватэры людзей, якія нават не спрабавалі супраціўляцца, выцягвалі з дамоў, білі нагамі, прыкладамі стрэльбаў, расстрэльвалі. Вуліцы былі засеяныя трупамі[22]. Гэтыя зьверствы й забойствы, зьдзейсьненыя

індывідуальна, па собскай волі, былі самавольнымі й непатрэбнымі. Дык чаму ж гэта здарылася? Самі немцы ў сваіх публікацыях пра вайну замоўчваюць гэтыя падзеі. Аднак па некаторых сьведчаньнях можна судзіць аб тым, што там адбывалася. Падчас аблавы адзін жыд, імя якога невядомае, толькі троху прачыніў свае дзьверы, каб сачыць небясьпечную сцэну, што разыгрывалася знадворку. Лейтэнант батальёну заўважыў шчыліну, скарыстаўся з нагоды і праз вузкую адтуліну застрэліў жыда[23]. Для выкананьня загаду яму до' было адвесьці жыда да зборнага пункту. І ўсё–ткі ён застрэліў яго. Наўрад ці выпадае думаць, што немец адчуў згрызоты сумелньня, калі ягоная ахвяра павалілася пасьля прыцэльнага стрэлу.

Іншая сцэна: некалькі жыўнераў батальёну прымушалі старых жыдоўскіх мужчын таньчыць перад сабой. Гэтае відовішча відавочны цешыла іх, у дадатак яны яшчэ й кпілі з жыдоў, абражалі іх, выстаўляючыся сваёй уладай, асабліва тады, калі абраныя ахвяры былі старэйшыя за нямецкіх мужчынаў і з гледзішча нармальных паводзінаў заслугоўвалі павагі і пашаны. На сваё няшчасьце, жыды танчылі недастаткова спрытна, і тады немцы падпалілі ім бароды[24].

У іншым месцы, блізка жыдоўскага кварталу, двое жыдоў у роспачы ўклякнулі перад нямецкім генэралам, просячы абароны. Адзін жаўнер 309–га паліцыйнага батальёну, які быў сьведкам гэтай просьбы, палічыў, што трэба пракамэнтаваць яе на свой лад: ён расшпіліў нагавіцы і памачыўся на людзей, што стаялі на каленях. Антысэміцкая атмасфэра й практыка, што панавалі сярод немцаў, дазволілі яму бессаромным чынам высьцяцца на вачах у генэрала, каб гэткім спосабам выказаць сваю пагарду. Ён не баяўся ніякага пакараньня за парушэньне вайсковай дысцыпліны; ані генэрал, ані хтосьці іншы не спрабавалі ўтрымаць яго ад гэтага ўчынку[25].

Вось, напрыклад, іншыя дэталі, якія шмат што праясьняюць: немцы абшукалі шпіталь з мэтаю зьнішчэньня жыдоў–пацыентаў. Яны былі захопленыя сваёй задачай, бо хацелі расправіцца з жыдоўскімі ворагамі, існуючымі ў іхным уяўленьні. Параненыя савецкія салдаты, узьбекі, што ляжалі ў гэтым самым шпіталі, іх не цікавілі. Яны хацелі адно жыдоўскай крыві[26].

Людзі 309–га паліцыйнага батальёну сабралі жыдоў на

рынкавай плошчы побач з жыдоўскім кварталам. Папалудні зьявіўся нейкі афіцэр вэрмахту, які абурыўся бескантрольным забіцьцём бяззбройных цывільных і пасварыўся з капітанам, камандзірам першай роты. Гэты апошні адмовіўся падпарадкавацца загаду афіцэра й адпусьціць жыдоў, з той прычыны, што, маўляў, загад афіцэра вэрмахту ня мае моцы над ім і ягонымі людзьмі. У капітана былі свае загады, і ён меў намер выканаць іх[27]. Калі немцы распачалі расстрэл жыдоў на пустках[28], ім падалося, што расправа цягнецца надта марудна. Тады жаўнеры батальёну сагналі жыдоў да зборных пунктаў на рынкавай плошчы і сталі расстрэльваць іх у паскораным тэмпе перад галоўнай сінагогай.

Ня маючы дакладных інструкцыяў, немцы дзейнічалі з уласнай ініцыятывы. Галоўная сінагога Беластоку, найбуйнейшая ў Польшчы, была ўражальным каменным гмахам. Гэты квадратны будынак, каранаваны ўверсе купалам, узносіўся высока ўгару і быў сымбалем жыдоўскага жыцьця. Немцы натрапілі на ідэю зьнішчэньня жыдоў разам зь іхнай духоўнай і сымбалічнай радзімай, гэтая “разьвязка” сама напрасілася іхнаму ачмуранаму антысэмітызмам мысьленьню[29]. Спаленьне сінагогаў ужо сталася, асабліва падчас ночы пагромаў у райху, лейтматывам антысэміцкай дзейнасьці і, аднойчы прабіўшы сабе шлях, цяпер зноўку падказвала, як дзейнічаць. Ператварэньне храму Божага ў трупярню адзначыла сымбалічны пачатак кампаніі, якая мусіла скончыцца вынішчэньнем жыдоў.

Жаўнеры першай і трэцяй ротаў 309–га паліцыйнага батальёну загналі свае ахвяры ў сінагогу, набіўшы вялізную сінагогу людзьмі так, што там не было вольнага месца. Перапуджаныя жыды пачалі сьпяваць рэлігійныя песьні і голасна маліцца. Тады немцы аблілі будынак бэнзынай з усіх бакоў і запалілі полымя Галакосту, кінуўшы ў вакно падрыўную шашку. Малітвы жыдоў перайшлі ў крык. Адзін з жаўнераў батальёну пазьней апісваў: “Зь сінагогі валіў дым, людзі крычалі “ратуйце”, спрабавалі выбрацца праз вокны. Па іх стралялі. Наўкола сінагогі стаялі паліцыянты, якія павіны былі пільнаваць, каб хто ня выбраўся”[30].

Ад ста да ста пяцідзесяці жаўнераў атачалі палаючую сінагогу, каб нікому з замкнёных жыдоў не ўдалося ўцячы з таго пекла. Яны глядзелі і чулі роспачныя крыкі больш чым сямісот

чалавек, што паміралі жудаснай і пакутлівай сьмерцю. Большасьць ахвяраў складалі мужчыны, але былі таксама жанчыны і дзеці[31]. Некаторыя з жыдоў пераразалі сабе вены альбо вешаліся, каб хутчэй памерці. Некалькі жыдоў вырваліся зь сінагогі, ахопленыя полымем, але паліцыянты стралялі па іх і пасьля сачылі, як дагараюць іхныя целы[32]. Што адчувалі жаўнеры 309–га паліцыйнага батальёну, назіраючы гэтае відовішча? Адзін зь іх выгукнуў: “Хай гарыць, файны кострык, клас!” Нехта іншы сказаў: “Здорава, варта было б увесь горад так!”[33].

Жаўнеры гэтага паліцыйнага батальёну, многія зь якіх не былі прафэсійнымі паліцыянтамі, паступілі на гэтую службу, каб пазьбегнуць вайсковай[34]. Але цяпер яны раптам сталі “ідэалягічнымі байцамі”, забіўшы ў той дзень паміж 2000 і 2200 жыдоў — мужчын, жанчын і дзяцей[35]. Тое, як яны зганялі жыдоў, самавольныя забойствы, залітыя крывёй і пакрытыя трупамі вуліцы Беластоку — гэта сапраўды ўчынкі ідэалягічных байцоў ці, дакладней кажучы, ваяроў антысэмітызму. Яны выконвалі загад нават больш жорстка, чым патрабавалася, не гідзіліся й не марудзілі, а нават выстаўлялі на показ сваю асалоду. Маёр загадаў сагнаць усіх мужчын–жыдоў, але нібы ведаючы, што Гітлер вырак усіх савецкіх жыдоў на татальнае зьнішчэньне, жаўнеры батальёну самахоць пашырылі загад і забівалі таксама жанчын і дзяцей. Гэтыя немцы зьдзяйсьнялі наўмысныя забойствы й зьверствы, яны перавыконвалі пастаўлены ім загадамі плян. Пры гэтым яны дзеялі згодна з сэнсам больш агульнага загаду і ў адпаведнасьці з духам свайго часу. Тое, што зрабілі жаўнеры 309–га паліцыйнага батальёну, можа разглядацца як сымбалічны старт генацыду. Яны былі “звычайнымі” немцамі і калі яны супрацьстаялі “сьмяротнаму ворагу” Нямеччыны, калі ён быў цалкам у іхных руках — як тыя жыды — яны зь дзяржаўнай ухвалы пасылалі шмат сваіх ахвяраў на лютую сьмерць у агонь.

65–ы паліцыйны батальён, набраны ў Рэклінгаўзэне пераважна з рэзэрвістаў, у якасьці мабільнай часткі таксама быў ублытаны ў пачатак генацыду[36]. Гэтая фармацыя сьпярша выконвала службу на захадзе, 26 траўня 1941 была разьмешчаная ў Гайльзбэргу, Усходняя Прусія, які паслужыў ёй у якасьці базы для ўдзелу ў расейскай кампаніі. 22 чэрвеня батальён супольна з 285–ай дывізіяй забесьпячэньня ўвайшоў у Балтыю. Ягоная

задача палягала ў тым, каб браць савецкіх акружэнцаў і забясьпечваць тылы нямецкіх аддзелаў, што рушылі наперад. 26 чэрвеня першая й другая роты батальёну раскватэраваліся ў Коўне, тымчасам як трэцяя рота затрымалася ў Шаўлях. Перад тым як прасунуцца глыбей на савецкую тэрыторыю, батальён прайшоў сваю “пробу агнём” у генацыдзе.

Коўна сталася арэнай неверагоднай разьні жыдоў, якая разыгрывалася проста на вачах немцаў і летувісаў. Першы пагром безабароннай жыдоўскай грамады адбыўся адразу па ўваходзе ў Коўна вэрмахту, які сядзеў на хвасьце ў частак Чырвонай Арміі. Падтрымваныя і падбадзёрваныя немцамі летувісы арганізавалі крывавую оргію на вуліцах гораду, расправіўшыся з 3800 жыдамі — пры дапамозе дручкоў, нажоў і стрэльбаў. За гэтым гвалтам назіралі таксама дзьве роты 65–га паліцыйнага батальёну. У першы тыдзень ліпеня летувіскія часткі, падначаленыя немцам, расстралялі ў гэтым горадзе яшчэ 300 жыдоў. Забойствы нагадвалі гладыятарскія баі[37]. Жаўнеры 65–га паліцыйнага батальёну распавядалі пра гэтую масакру, а таксама пра “фізычную працу” ў нядзелю, “калі мы назіралі з гары, а на пляцы былі забітыя з аўтаматаў і карабінаў каля сотні чалавек (мужчыны і жанчыны). Выканаўцамі былі летувісы, некаторыя моцна п’яныя”[38]. Некаторым жаўнерам першай і другой ротаў давялося яшчэ пэўны час пачакаць, перш як яны самі зьдзейсьнілі тое, што пакуль толькі назіралі, тымчасам як іншыя ўжо бралі ўдзел у гэтых забойствах, блякуючы раён вакол цытадэлі, дзе летувісы расстрэльвалі жыдоў[39]. Трэцяя ж рота не назірала, а сама адразу ўключылася ў забойствы.
Яна справіла яшчэ адну масакру ў Шаўлях. Ужо пры канцы чэрвеня 1941 паліцыянты пачалі там масавыя экзэкуцыі, ахвярамі якіх, верагодна, станавіліся таксама і жанчыны. Дэталі гэтых забойстваў да сёньняшняга дня нявысьветленыя, але асноўныя рысы ясныя[40]. Людзі трэцяй роты выганялі жыдоў з дамоў[41], пасьля на грузавіках адвозілі ў лясы й расстрэльвалі.
Ужо на гэтай пачатковай стадыі генацыду выявіўся імпульс, які пасьля стаўся правілам — хай не жалезным: вынішчэньне “сьмяротных ворагаў Нямеччыны”, дарма што яно лічылася неабходным, ажыцьцяўлялася тымі немцамі, якія *хацелі* ў ім

удзельнічаць, як сьведчыць адзін з рэзэрвістаў: “Я яшчэ дакладна памятаю, як наш старшына С. два ці тры разы (двойчы напэўна) зьбіраў расстрэльныя каманды. Ад сябе магу сказаць, ... што каманды такога кшталту складаліся *толькі* (падкрэсьлена ў арыгінале — *Д.Г.*) з добраахвотнікаў”[42].
Масавыя расстрэлы з кароткай дыстанцыі былі да таго жахлівыя, што нават некаторыя добраахвотныя забойцы сьпярша адчувалі фізычную агіду. Так, кажуць, што адзін з рэзэрвістаў па вяртаньні з карнай акцыі ўзрушана сказаў: “Першы й апошні раз я ў гэтым удзельнічаў, цяпер тры дні мне кусок у рот не палезе”[43].
Як бы там ні рэагавалі на бойню вантробы выканаўцаў, забойствы працягваліся. Праз пару дзён па прыбыцьці трэцяй роты ў Шаўлі плякаты абвяшчалі: “Гэты горад вольны ад жыдоў!”[44]. Трыюмфальныя абвесткі, падобныя да гэтай, зьяўляліся шмат у якіх савецкіх гарадох па прыходзе немцаў. Улетку і ўвосень 1941 тры роты 65–га паліцыйнага батальёну бралі ўдзел у вынішчэньні жыдоў па ўсёй Балтыі; часам яны забівалі жыдоў самі, часам пакідалі гэта іншым падразьдзяленьням, а самі займаліся аблавай, аховай і транспартаваньнем ахвяраў. Пры гэтым каманды сьмерці складаліся не вылучна з добраахвотнікаў. Тым ня менш, няма сьведчаньняў, каб кагосьці прымушалі ўдзельнічаць у забойствах ці каб ужывалі сілу, каб прымусіць выконваць загады[45]. Прасоўваючыся ў паўночна–ўсходнім кірунку ўглыб Савецкага Саюзу, батальён забіваў у Расейняі, Пскове і шмат якіх іншых месцах, пра якія няма падрабязных зьвестак[46].
Адзін рэзэрвіст гэтак падсумаваў дзейнасьць батальёну ў тую восень: “Падобныя расстрэльныя акцыі паўтараліся на ўсім нашым шляху да Лугі”[47]. Маштабнасьць забойстваў сьцерла з памяці немцаў дэталі асобных масакраў.
У верасьні 65–ы паліцыйны батальён стаў на зімовыя кватэры ў Лузе, за сто дваццаць кілямэтраў на поўдзень ад Ленінграду. На працягу чатырох месяцаў ён займаўся аховай камунікацыяў і змаганьнем з партызанамі ў Лузе й навакольлі. Ён удзельнічаў таксама ў ахове лягеру для ваеннапалонных савецкіх салдатаў. Жаўнеры батальёну ўдзельнічалі ў забойстве мужчынаў, жанчын і дзяцей жыдоў, а таксама савецкіх палонных, якіх ідэнтыфікавалі як жыдоў[48].
Немцы выкарыстоўвалі савецкіх палонных таксама для ўласных

патрэбаў і прымушалі іх выконваць брудную працу ў майстэрнях і кухнях на сваіх кватэрах[49]. Ім падавалася натуральным, што жыды быццам бы прынцыпова розьняцца ад іншых савецкіх грамадзянаў, што гэта вырашальная розьніца выяўляецца ня толькі ва ўчынках ці рысах характару, а грунтуецца на іхнай “расе”, то бок папросту на тым, што ў кагосьці бацькі былі жыдамі і ў жылах цячэ жыдоўская кроў. Падчас свайго знаходжаньня ў Лузе людзі батальёну забівалі таксама жыдоў і тады, калі б маглі зьлітавацца над імі. Адзін з забойцаў нават паведамляе, што яго аднойчы паслалі ў лес сам–насам з жыдом. Пры гэтым ніхто не пільнаваў яго, і ён мог даць сваёй ахвяры ўцячы без аніякіх наступстваў, калі б ён быў супраць расісцкай зьнішчальнай вайны. Але ён застрэліў жыда[50]. Гэтаксама лёгка немцы маглі зрабіць выгляд, што не заўважаюць, што нехта з работнікаў — жыд. Ніхто й нішто не прымушала іх выкрываць, дзе хто жыд, на вуліцах, на кватэрах. Але яны заўважалі гэта рэгулярна. Аднаго з жыдоў жаўнеры 65–га батальёну ня проста замардавалі, але спачатку накпіліся і зганьбілі, прымушаючы танчыць з чучалам мядзьведзя, знойдзеным на кватэры. Насьмяяліся, а пасьля застрэлілі[51]. Простыя немцы–паліцыянты абыходзіліся з жыдамі па ўласным хаценьні: яны маглі вырашаць, забіваць жыда ці не. Для жаўнераў 65–га паліцыйнага батальёну вынішчэньне ўсіх жыдоў (і савецкіх камісараў) сталася нечым само сабой зразумелым. Ім ня трэ было ні запрашэньня, ні дазволу, яны забівалі кожнага жыда, якога ім удавалася схапіць[52]. Варта ўвагі, наколькі яны былі вольныя ў сваім выбары — звычайна ваеннае і палітычнае начальства імкнецца не даручаць прыняцьця рашэньняў, якія, як правіла, павінны зыходзіць ад афіцэраў, на меркаваньне падначаленых. Але ў стасунку да жыдоў усё адбывалася насуперак звыклым правілам. Кожны немец быў абвінаваўцам, судзьдзём і катам у адной асобе.

*Пераклаў з ангельскай Алесь Пяткевіч паводле*
Hitler’s Willing Executors: Ordinary Germans and the Holocaust. *Alfred A.Knopf Inc., New York, 1996. Нямецкі пераклад гэтай кнігі можна знайсьці ў бібліятэцы Інстытуту Гётэ (“Hitlers willige Vollstrecker: ganz gewohnliche Deutsche und der Holocaust”). Wolf, Jobst Siedler Verlag GmBH, Berlin, 1996.*

1 Дагэтуль няма агульнага апісаньня паліцыі парадку за часамі нацызму, няма нават гісторыі гэтых адзінак, апроч таго, што датычыць іхнага ўдзелу ў масавых забойствах. Карл Гелер, “The Reshaping and Political Conditioning of the German Order Police, 1935–1945: Ph. D.–Diss., Cincinnati 1970, канцэнтруецца на індактрынацыі паліцыі парадку. Зборнік *Zur Geschichte der Ordnungspolizei, 1936 bis 1945*, які ўтрымлівае “Die Stabe und Truppeeinheiten der Ordnungspolizei” Геарга Тэсіна і “Entstehung und Organisation des Hauptamtes Ordnungspolizei” Ганса–Ёахіма Нойфэльта, не адпавядае патрабаваньням гістарычнай навукі.
2 Фэдэральны архіў, Кобленц (у далейшым ФАК), R19/395 (8/20/40), ст. 171.
3 Цэнтральнае бюро юрыдычных управаў фэдэральных земляў па дасьледаваньні злачынстваў нацыянал–сацыялізму, Людвігсбург (у далейшым ЦБЛ), 206 AR–Z 6/62 (далей JK), ст. 1949.
4 Паліцыйныя батальёны называліся па–рознаму, у залежнасьці ад асабістага складу. Калі яны складаліся збольшага з прафэсійных паліцыянтаў, яны званіся “паліцыйнымі батальёнамі” (новыя адзінкі, складзеныя з рэзэрвістаў, называлі “рэзэрвовымі паліцыйнымі батальёнамі”). Розьніца не ў апошнюю чаргу палягала ў сярэднім узросьце жаўнераў адпаведных адзінак. Батальёны, якія спачатку прымалі мужчынаў сталага веку, насілі нумары з 301 да 325 і былі вядомыя пад назовам “вахтмайстарскія батальёны”. Паліцыйныя батальёны з нумарамі да 200 звычайна былі рэзэрвовымі паліцыйнымі батальёнымі, але некаторыя рэзэрвовыя батальёны мелі нумары з трэцяй сотні. Асабісты склад батальёнаў часта не адпавядаў іхнаму афіцыйнаму найменьню. Апроч таго, у цягу вайны гэтыя адрозьненьні ўсё больш гублялі значэньне, бо ў асабістым складзе часта адбываліся істотныя зьмены. Я вырашыў ужываць для ўсіх гэтых адзінак зборнае найменьне “паліцыйныя батальёны”.
5 ФАК R19/395 (8/20/40), ст. 175.
6 Справаздача пра вынікі інспэкцыі трох паліцыйных батальёнаў у траўні 1940 (ФАК R19/265, ст. 168) паведамляе пра занядбанасьць, ад якой быццам пакутвала паліцыя парадку. Гл. таксама ФАК R19/265 (5/9/40), ст. 153.
7 ФАК R19/395 (11/20/41), ст. 180–183.

8 Гл., напрыклад, Tessin “Die Stabe und Truppeneinheiten der Ordnungspolizei”, ст. 14 і далей.
9 ФАК R 19/311 (6/26/40), ст. 165.
10 ФАК R 19/265 (5/23/40), ст. 168. У траўні 1940 пяць паліцыйных батальёнаў — сярод іх 65–ы з Рэклінгаўзэна й 67–ы з Эсэну — таксама мелі толькі ад двух трацін да чатырох пятых патрабавальных рэзэрваў. Справаздача інспэкцыі абвяшчала: “Агульнае становішча з заменай для паліцыйных рэзэрвістаў вельмі напружанае”. Гл. ФАК R 19/265, s. 157.
11 Гл., напрыклад, рэпрэзэнтатыўны плян палітінфармацыяў для жаўнераў Асобнай службы, ФАК R 19/308 (3/6/40), ст. 36–43. Як відаць з гэтага загаду, адукацыйны плян для паліцыйных батальёнаў, што складаліся зь нерэзэрвістаў, быў трохі іншым. Пазьнейшы загад ад 14 студзеня 1941 зьмяшчаў дэтальныя ўказаньні па сьветапагляднаму шкаленьню, у тым ліку спасылкі на нумары старонак у брашурах, якія мусілі слугаваць базай для заняткаў з пэўных тэмаў. Загад таксама паказвае, якім мізэрным было гэтае шкаленьне і, адпаведна, наколькі неверагодным быў трывалы ўплыў на людзей. У суме называлася толькі 56 старонак адукацыйнага матэрыялу — і яшчэ колькі старонак, не называных дакладна, з дзьвюх брашураў пра сялянства. Да шэрагу тэмаў матэрыял быў больш чым мізэрны: меней за дзьве старонкі. Нават па “Жыдоўскім пытаньні ў Нямеччыне” згадвалася толькі дзьве старонкі з дзьвюх брашураў. Усяго гэтага наўрад ці магло досыць, калі б насамрэч плянавалася зьмяніць пагляды на жыдоў. Гл. ФАК R 19/308 (12/20/40), с. 100.
12 Гл. дыскусію пра сьветапагляднае шкаленьне ў *Christopher R. Browning, Ganz normale Manner. Das Reserve–Polizeibataillon 101 und die “Endlosung” in Polen, Reinbeck 1993,* с. 231–241. Браўнінг больш падрабязна разглядае матэрыял пра жыдоў, які прапаноўваўся жаўнерам. Хоць ён уважае індактрынацыю за больш істотную й глыбокую, чымся я, ён таксама робіць выснову, што таго матэрыялу было недастаткова, каб матываваць каго–небудзь да ўдзелу ў Галакосьце (с. 240 і наступныя).
13 Гл. ФАК R 19/308 (2/8/41), ст. 267 і далей. Можна з пэўнасьцю меркаваць, што гэтыя заняткі праходзілі нашмат горш, чымся меркавалася ў гэтых загадах, бо жаўнеры батальёну знаходзіліся ў розных месцах пэўнай акругі і былі

цалкам занятыя сваімі непасрэднымі задачамі. Гл. таксама ФАК R 19/308 (6/2/40), с. 250–254. Інструкцыі да сьветапагляднага шкаленьня мужчынаў на асобнай службе знаходзяцца там на ст 252 і наступнай.
14 Пра значэньне ўдзелу ў партыі пры прасоўваньні па службе гл. ФАК R 19/311 (6/18/40), с. 145 і наступныя, с. 149.
15 Ацалелы матэрыял пра паліцыйныя батальёны можна знайсьці ў розных інстытуцыях нямецкай юстыцыі. Пра карныя акцыі ў ФАК няма практычна нічога. Я паспрабаваў прааналізаваць увесь матэрыял ЦБЛ пра паліцыйныя батальёны, які хоць і ёмісты, але ні ў якім разе не дасканалы. Нават укладаньне сьпісу пракурорскіх дасьледаваньняў дзейнасьці паліцыйных батальёнаў сталася цяжкай задачай. Я не магу прэтэндаваць на тое, што я поўніцай прааналізаваў усе ёмістыя справы пра паліцыйныя батальёны, бо мне давялося пачынаць з нуля. Я б вельмі зьдзівіўся, калі б высьветлілася, што я не абмінуў нічога, чым валодае ЦБЛ, хай я й прачытаў справаздачы дасьледаваньняў чыннасьці больш як 35 паліцыйных батальёнаў. Пра некаторыя, як прыкладам пра 101–ы батальён, там былі тысячы старонак, пра іншыя адно некалькі сотняў старонак. Між іншым, гэтыя справы розьняцца ня толькі колькасна, але й якасна. Пра пэўныя батальёны — нават што да абрысаў іхных акцыяў — існуе толькі бедная інфармацыя; пра іншыя ёсьць шмат чаго, адылі нават у стасунку да батальёнаў, дзейнасьць якіх найлепш дакумэнтаваная, наагул няма падрабязных дэталяў пра ўчынкі іхных жаўнераў. Таму зьдзейсьнены тут аналіз не дасканалы, але караніцца на шырокім эмпірычным грунце. Роля паліцыйных батальёнаў у Галакосьце цалкам заслугоўвае на тое, каб стаць прадметам манаграфіі.
16 Гл. *Ruth Bettina Birn, Die hoheren SS — und Polizeifuhrer: Himmlers Vertreter im Reich und in den besetzten Gebieten, Dusseldorf 1986*, і ЦБЛ 204 AR–Z 13/60, том 4, с. 397 і наступныя.
17 Гл. Helmut Krausnick і Hans–Heinrich Wilhelm, Die Truppe des Weltanschauungskrieges: Die Einsatzgruppen der Sicherheitspolizei und des SD 1938–1942, Stuttgart 1981, ст. 46; Alfred Streim, “Das Sonderkommando 4a der Einsatzgruppe C und die mit diesem Kommando eingesetzten Einheiten wahrend des Russland–Feldzuges in der Zeit vom 22.6.1941 bis zum Sommer 1943”, ЦБЛ 11(4) AR–Z 269/60, “Abschlussbericht”, с. 36, таксама Tessin,

“Die Stabe und Truppeneinheiten der Ordnungspolizei”, с. 96.
18 ЦБЛ 204 AR–Z 13/60, том 4, с. 402 і наступныя.
19 ЦБЛ 202 AR–Z 2484/67, с. 2397–2506. У Савецкім Саюзе апэравалі ня толькі гэтыя сем паліцыйных батальёнаў; апроч іх там дзейнічалі, напрыклад, 11–ы, 65–ы і 91– батальёны.
20 Камандзір батальёну, маёр Вайс, перад нападам сабраў сваіх афіцэраў і праінфармаваў іх пра загад Гітлера на зьнішчэньне ўсіх савецкіх камісараў і ўсяго жыдоўскага жыхарства Савецкага Саюзу. Начальнік першай роты, капітан Г.Б., перад нападам паведаміў гэта сваім людзям. Магчыма, тое самае зрабілі і начальнікі іншых ротаў, але гэта не пацьвярджаецца паказаньнямі сьведкаў. Гл. ЦБЛ 205 AR–Z 20/60 (у далейшым Buchs), A.A., Buchs, ст. 1339 г; J.B., Buchs, ст. 1416, і J.B., ЦБЛ 202 AR 2701/65, том 1, ст. 101; K.H., Buchs, ст. 1565; H.G., Buchs, ст. 363 і наступная, і H.G., ЦБЛ 202 AR 2701/65, том 1, ст. 96; R.H., Buchs, ст. 681, і супярэчлівыя паказаньні сьведкі E.M., Buchs, ст. 1813, S. 2794 і наступная, ст. 764; таксама прысуд Буксу ды інш., Wuppertal, 12 Ks 1/67 (далей Прысуд, Букс), ст. 29 і наступная. Варта адзначыць, што Браўнінг у “Ganz normale Manner”, апісваючы батальён, ня згадвае гэтага фундамэнтальнага факту (ст. 31 і наступная). Гэта яўна супярэчыць ягонаму сьцьверджаньню, што тады яшчэ не было агульнага загаду на генацыд (гл. разьдзел 4, заўвага 70 гэтай кнігі).
21 E.Z., Букс, с. 1748.
22 Гл. выказваньні двух ацалелых, S.J., Букс, с. 1283, і J.S., Букс, ст. 1830.
23 Прысуд, Букс, с. 43.
24 Прысуд, Букс, с. 42; таксама J.J., Букс, с. 1828.
25 Прысуд, Букс, с. 44.
26 Гл. A.B., Букс, с. 2875, і T.C., Букс, с. 2877 і наступная.
27 Прысуд, Букс, с. 51 і наступная. Наўрад ці магчыма пагадзіцца зь меркаваньнем Браўнінга: “... гэтую першую масакру можна было б... яшчэ разглядаць як заслугу аднаго асобнага камандзіра, які інстынктыўна правільна адгадаў жаданьні свайго фюрэра”. (Гл. *Ganz normale Manner*, с. 32.) Гэта значыла, што маёр Вайс загадаў забіць некалькі сотняў жыдоў паводле ўласнай ініцыятвы, сьцьверджаньне, што ён “інстынктыўна адгадаў” жаданьне Гітлера, мае наўвеце, што маёр Вайс не атрымліваў загаду забіваць савецкіх жыдоў,

тымчасам як ён відавочна атрымаў такі загад. Гэтага факту, між іншым, былі сьведамыя жаўнеры ягонага батальёну (гл. вышэй, заўвага 20). Падчас карнай акцыі ім нават давялося пераадольваць энэргічныя пярэчаньні вэрмахту, якому юрыдычна падпарадкоўваўся той раён. Немцы спраўлялі падобныя масакры шмат у якіх гарадах на савецкай тэрыторыі. “Інтуіцыя” пры гэтым ня мела прычыннай ролі. Апроч таго, Браўнінгава тлумачэньне гэтай акцыі, улучна зь сьцьверджаньнямі, што яна пачалася як “пагром”, а пасьля “неўзабаве эскалявалася да сыстэматычнага масавага забойства”, (с. 32) падштурхоўвае да памылковага меркаваньня, быццам бы не было ад самага пачатку намераў забіць тых жыдоў.
28 Прысуд, Букс, с. 52 і наступная.
29 Пра спантаннасьць спаленьня немцамі сінагогі гл. E.M., Букс, с. 1814–1815.
30 H.S., Buchs, с. 1764.
31 Суд ацэньвае колькасьць ахвяраў як прынамсі семсот (Прысуд, Букс, с. 57). Абвінавачваньне зыходзіць зь мінімальнай лічбы восемсот (Букс, с. 113); жыдоўскія крыніцы паведамляюць пра больш як дзьве тысячы ахвяраў. Адзін з ацалелых ацэньвае, што 90 працэнтаў ахвяраў складалі мужчыны, 10 — жанчыны й дзеці. Гл. J.S., Buchs, ст. 1830; гл. таксама I.A., Букс, с. 1835.
32 Прысуд, Букс, с. 56 і наступныя. Прынамсі двух жыдоў, мужчыну й жанчыну, немцы прымусілі ўвайсьці ў будынак, калі ён ужо гарэў (гл. L.L., Букс, с. 1775).
33 Прысуд, Букс, с. 59. Жаданьне апошняга збольшага спраўдзілася, полымя ад сінагогі перакінулася на суседнія будынкі. З прычыны таго, што немцы не дазволілі пажарнай камандзе тушыць пажар, полымя пашырылася па жыдоўскім квартале, так што загінула яшчэ больш мужчынаў, жанчын і дзяцей (Прысуд, Букс, с. 59; таксама E.Z., Букс, с. 1748–1749).
34 Гл., напрыклад, J.B., Букс, с. 1415. Словы Браўнінга аб тым, што гэтыя й іншыя жаўнеры батальёнаў з нумарамі трэцяй сотні былі “добраахвотнікамі” (Ganz normale Mdnner, с. 30), лёгка могуць быць зразуметыя няправільна. Нармальным чынам гэтыя мужчыны былі закліканыя ў войска ці чакалі на закліканьне і тады абіралі паліцыю. Так што тут ход не пра добраахвотнікаў ва ўласным сэнсе слова. Пра гэты паліцыйны

батальён гл., напрыклад, Н.Н., ЦБЛ 206 AR–Z 6/62, с. 1091, і А.А., ЦБЛ 206 AR–Z 6/62, с. 1339. У Браўнінгавым апісаньні паліцыйнага батальёну 101, які будзе падрабязна разглядацца ў наступных двух разьдзелах, кідаецца ў вочы, што іхныя камэнтары да гэтых масакраў — прыкладам, іхная радасьць з прычыны вялікага пажару — у ягонай прэзэнтацыі падзеяў адсутнічае. Гл. *Ganz normale Manner*, с. 31 і наступная.
35 Прысуд, Букс, с. 60.
36 Наколькі мне ведама, 65–ы паліцыйны батальён ня згадваецца ў літаратуры пра Галакост. Крыніца гэтай інфармацыі — ЦБЛ 206 AR–Z 6/62.
37 Шматлікія сьведчаньні й ацалелыя фатаграфіі дакумэнтуюць як лютасьць, так і публічны характар гэтых забойстваў. Некаторыя прыклады гэтаму ў Ernst Klee, Willi Dressen i Volker Riess (Hrsg.), “Schone Zeiten”. Judenmord aus der Sicht der Tater und Gaffer, Frankfurt/M. 1988, с. 31–44.
38 Р.К., ЦБЛ 206 AR–Z 6/62, с. 945 і наступная.
39 Загад, ЦБЛ 206 AR–Z 6/62, с. 2120–2124.
40 Агульны агляд паказаньняў сьведкаў і шмат якія факты, вядомыя пра масакру ў Шаўляі, гл. у “Sachverhaltsdarstellung”, ЦБЛ 206 AR–Z 6/62, с. 1212 і наступная. G.T. апісвае карную акцыю, пад час якой ён мусіў удзельнічаць у дастаўцы жыдоў да равоў, дзе адбываліся расстрэлы (ЦБЛ, 206 AR–Z 6/62, с. 1487 і наступная).
41 Напэўна, летувісы ідэнтыфікавалі жыдоў — ва ўсякім разе, так здаралася часта, бо немцы ня ведалі, хто быў жыдом. Адзін обэр–гефрайтар распавядаў аднаму рэзэрвісту, што трэ было б правесьці экзэкуцыю самім, таму што летувісы пад час забіцьця дзеялі занадта “жорстка”. (Н.Н., ЦБЛ 206 AR–Z 6/62, с. 1152).
42 J.F., ЦБЛ 206, AR–Z 6/62, с.849.
43 Н.К., тамсама, с. 733. К. сьцьвярджае, што экзэкуцыі ў Шаўляі, таксама як большасьць забойстваў у тую восень, зьдзяйсьняліся прафэсійнымі паліцыянтамі, што былі сярод іх (с. 732 і наступная). Ён распавёў таксама, што гэты мужчына, В., неўзабаве пасьля гэтага загінуў у баях за Хольм. Ці забіваў ён насамрэч, невядома.
44 J.F., тамсама, с. 849. Адылі гэтыя плякаты не былі праўдзівымі, бо яшчэ пэўны час жыды ў Шаўляі былі. Яны выказвалі хутчэй пажаданьне, каб так і было.
45 Натуральна, шмат хто з жаўнераў гэтага батальёну

сьцьвярджаў, што іх прымушалі забіваць ці што яны адмаўляліся ўдзельнічаць у гэтым. Так, варта згадаць паказаньні аднаго з удзельнікаў: пасьля ягонай адмовы вахтмайтар, маўляў, сказаў яму, каб ён разважыў да вечара. Але яшчэ да вечара вахтмайстар зноў паклікаў яго да сябе. Жаўнер зноў адмовіўся, на што вахтмайстар сказаў, каб ён хаця канваяваў жыдоў да месца экзэкуцыі. Гэтаму загаду, паводле ўласнага меркаваньня, ён ужо ня мог не скарыцца. Гэты аповед, у адрозьненьне ад бальшыні іншых, падаецца праўдападобным, пагатоў, што на допыце жаўнер сказаў, што можна нат' спытаць самога вахтмайстара, ён пацьвердзіць гэтую гісторыю. Апроч гэтага, ён паказаў, што пасьля падзеяў у Шаўляі ня ўдзельнічаў больш у ніводнай карнай акцыі. Калі гэты аповед слушны, то вартае ўвагі перадусім тое, што датычны жаўнер ніякім чынам ня згадвае, што нехта яшчэ ў батальёне падзяляў ягоную пазыцыю ці спрабаваў адмовіцца ад удзелу ў забойствах. Матэрыял да пытаньня прымусу гл. у G.T., ЦБЛ 206 AR–Z 6/62, с. 1487 і наступная; H.M., тамсама, с. 773; таксама Загад, ЦБЛ 206 AR–Z 6/62, с. 2196, с. 2209 і наступная, с. 2212 і наступныя, с. 2138 і наступная.
46 Абагульненьне таго, што вядома пра гэтыя забойствы, гл. у Загад, ЦБЛ 206 AR–Z 6/62, с. 2120–2171.
47 H.K., ЦБЛ 206 AR–Z 6/62, с. 733.
48 Загад, ЦБЛ 206 AR–Z 6/62, с. 2168 і наступныя. H.H. паведамляе, што бачыў шыльду з надпісам "Луга вольная ад жыдоў" (ЦБЛ 206 AR–Z 6/62, с. 1152).
49 Загад, ЦБЛ 206 AR–Z 6/62, с. 2157.
50 Тамсама, с. 2159–2162.
51 Тамсама, с. 2166 і наступныя.
52 З прычыны дэманічных уяўленьняў пра жыдоў, на якіх грунтаваліся іхныя ўчынкі, яны былі пераканаыя, што іх атачаюць жыды, і не было як пераканаць іх у адваротным. Таму ім было досыць мізэрных доказаў, каб залічыць кагосьці да жыдоў. Часам ставала голага падазрэньня, як відаць з аднаго эпізоду, запісанага паводле ўспамінаў пра гэты батальён. Так, адзін з рэзэрвістаў паведамляе: "Як відавочца я магу паведаміць пра мястэчка Іванаўская, што тагачасны рэзэрвіст С. зьбіў да сьмерці аднаго ваеннапалоннага, ці перабежчыка, толькі таму, што ў ягоных паперах стаяла імя Абраам. Пры канцы зьявіўся яшчэ адзін афіцэр вэрмахту, але ён прыйшоў

запозна”. (E.L., ЦБЛ 206 AR–Z 6/62, с. 783). Натуральна, гэты люты забойца, які з–за бясчынстваў гэтага кшталту быў вядомы як садыст, ня быў пакараны. Ён быў бацькам дзевяці дзяцей, народжаных паміж 1924 і 1940.

---



---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 9-05-2000**

[image]
[image] .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima



да Зьместу 2(3)-1999

***міталёгія***

# Лаврентий Цанава Белорусский народ не простит буржуазным националистам их кровавых дел

**Лаврентий Цанава — кіраўнік тайнай паліцыі ў савецкай Беларусі. Аўтар кнігі–догмы «Всенародная партийная война в Белоруссии против фашистских захватчиков». Гэты ўрывак — разьдзел 7 часткі II гэтай кнігі (С. 825—836. Минск, 1951). Стыль і пунктуацыя арыгіналу.**

За три года немецко–фашистской оккупации многострадальная Белоруссия подверглась опустошениям и разорению в огромных масштабах.

И в каждом сожженном доме, разрушенном предприятии, в разграбленном колхозе, в каждой капле крови невинных жертв содержалась большая доля вины преступных белорусских националистов, по праву теперь именуемых национал–фашистами.

Это они, белорусские нацфашисты, присутствовали при казнях белорусских советских патриотов в качестве гитлеровских прокуроров, в качестве палачей гитлеровского “нового порядка”. Вместе с гитлеровскими заплечных дел мастерами белорусские нацфашисты накидывали петли на шеи своих жертв, кололи их шомполами, закапывали и сжигали заживо.

Белорусские националисты в качестве бургомистров городов, администраторов различных торговых и промышленных обществ разрушали предприятия, отправляли промышленное оборудование в Германию.
Гитлеровские мерзавцы и белорусские нацфашисты были связаны круговой порукой, общностью кровавых преступлений, учиненных ими над белорусским населением — женщинами, детьми, стариками.

Лучшим подтверждением этого является оплакивание белнацфашистами Островским, Козловским, Ивановским и другими уничтоженного гневом белорусского народа обер–палача, организатора массовых убийств в Белоруссии, фашистского садиста, гитлеровского гаулейтера Вильгельма фон Кубе.
В специальной статье, опубликованной 25 сентября 1943 года в издававшейся в Минске фашистской “Белорусской газете”, редактор этой газеты белнацфашист Вл.Козловский писал: “Сердце сжимает скорбь... Его (т.е. В.Кубе. — *Л.Ц.*) нет больше среди нас. Генеральный комиссар Вильгельм Кубе был одним из наилучших, наисердечнейших друзей..., который думал и говорил так, как каждый белорусский националист...”.
Поистине белорусским националистам к лицу было оплакивать Кубе, который был не только их фашистским хозяином–реакционером, мракобесом, одним из ближайших доверенных Гитлера и Гиммлера, но питал такую же лютую злобу к Советской Белоруссии и к белорусскому народу, как и они сами. Известно, что Кубе еще в 3 классе гимназии проявлял задатки будущей фашистской ядовитой змеи. Уже тогда змееныш Кубе забавлялся изданием своей собственной газеты, отражавшей его реакционные, антисемитские наклонности. В студенческие годы он сотрудничал с преследовавшим реваншистские цели так называемым национальным союзом содействия торговле. Реакционная деятельность отрывает его от учебы. Покинув университет, он на всю жизнь остается недоучкой. Как один из представителей реакционной германской буржуазии, вскоре он становится генеральным секретарем силезских консерваторов, а затем националистов. Главными его подвигами были одурачивание силезских углекопов и учинение расправ над ними в угоду капиталистам.

Здесь он овладел демагогией, ставшей главным его достоинством в глазах реваншистов. Содействуя подготовке новой войны германского империализма, он становится одним из организаторов “ордена Бисмарка”, из которого вполне естественным был его переход в ряды гитлеровцев. Характерной чертой Кубе того времени была ненависть к “красному” Берлину, так как он оказывался не в состоянии понять, что бывшие тогда у власти немецкие социал–демократы, точнее социал–предатели, социал–барматовцы, прокладывали путь к власти фашистам как ставленникам наиболее реакционных, наиболее империалистических элементов германского финансового капитала, поддерживаемых магнатами Уолл–Стрита. Еще до прихода к власти фашистов Кубе становится одним из ближайших подручных Гитлера. Большой чести в этом, разумеется, не было, зато различных выгод от связей с крупнейшими капиталистами Германии, финансировавшими Гитлера, хоть отбавляй. В 1927 году мутной волной фашизма Кубе выносится в рейхстаг, где он был одним из семерки представителей гитлеровской фашистской партии. Став видным нацистом, Кубе, в качестве уполномоченного Гитлера по Остмаркскому округу, террором, осуществляемым его бандитскими фашистскими шайками, орудовавшими в контакте с социал–демократической полицией, убийствами из–за угла, открытыми уличными расправами стяжал себе ненависть и презрение всех честных немцев и прежде всего германского рабочего класса. Садистские наклонности, проявленные им в самой Германии над собственно немецким населением, определили выбор Гитлера, который именно Кубе назначил своим наместником в Белоруссии для применения на практике расовых человеконенавистнических теорий, призванных обосновать массовые убийства и истребление белорусского населения, чтобы очистить от него белорусские просторы и обеспечить их колонизацию немецкими господами. Главным в нормах поведения Кубе, как он сам об этом говорил, было признание и одобрение Гитлером его действий. Кубе заявил, чего от него хотят. Он должен был истребить не менее 10 миллионов человек белоруссов и русских. Его несложные задачи сводились к умению организовывать и осуществлять массовые убийства, не показывая людям, что его руки в крови

миллионов невинных жертв. Подлую задачу представлять людям его, палача белорусского народа, в ореоле святоши Вильгельм Кубе заставлял выполнять продажную печать и лживую пропаганду подчиненных ему белорусских националистов. Поэтому они гаулейтера Кубе называли не убийцей, а другом белорусского народа. Главного империалистического разбойника Гитлера они преподносили как освободителя Белоруссии.
Но крики белорусских националистов не ввели в заблуждение белорусский народ, который судил об оккупантах не по брехне националистов и геббельсовской пропаганды, а по их делам. Дела же оккупантов и гитлеровского наместника в Белоруссии Вильгельма Кубе вызывали грозный гнев белорусского народа. И когда был ликвидирован этот выродок, то никто, за исключением белорусских националистов, не отважился расценить казнь Кубе как проявление индивидуального террора. Как можно было взрыв, уничтоживший Кубе, считать актом индивидуального террора, когда этот взрыв тонул в грохоте сражений, происходивших по всей Белоруссии, когда сотни тысяч советских партизан беспрерывно атаковали и уничтожали гитлеровцев в городах и селах БССР. Не потеряв рассудка, нельзя обвинить целый народ, осуществляющий вооруженное восстание против иноземных захватчиков, в индивидуальном терроре. Казнь Кубе была одним из эпизодов массовой всенародной борьбы с иноземными поработителями, и белорусский народ весть о ней воспринял как свою очередную победу, как призыв к еще более активной и успешной борьбе с гитлеровцами. Подвиг советских партизан, приведших в исполнение смертный приговор белорусского народа над одним из крупнейших военных преступников, все население Белоруссии расценивало как крупный подвиг своих лучших сынов — народных мстителей, как свою боевую победу.

Когда Козловский писал свою статью о смерти Кубе, его сердце сжималось не от скорби, а от презренного страха за свою собственную участь. Он с достаточным основанием полагал, что может последовать за Кубе, так как сохранить целой свою шкуру в условиях всеобщей ненависти белорусского народа к белнацфашистам совсем не простое дело. Предчувствия

Козловского не обманули его. Уже 13 ноября 1943 года белорусские партизаны уничтожили и его самого.
В статье о смерти Кубе Козловский неожиданно для себя сказал правду о себе и вообще о белорусских националистах, что Кубе и они, они и Кубе думали и говорили одинаково. Думать и говорить одинаково их, разумеется, заставляли не интересы белорусского народа, а приказы Гитлера, империалистические интересы гитлеровской Германии, общая всем империалистам ненависть к народной советской власти, к Советскому Союзу. Это они — белорусские буржуазные националисты не только говорили, думали, но и совершали, как их фашистские хозяева, чудовищные злодеяния против белорусского народа. Они активно с оружием в руках вместе с оккупантами истребляли тысячами и сотнями тысяч трудящихся Белоруссии, сжигали и опустошали города и села Белорусской ССР.
Уже давно для всех советских людей ясно, что националисты в борьбе с советской властью и Советской Белоруссией не останавливались перед самыми гнусными злодеяниями, и белорусский народ истреблял их, как бешеных псов.
В животном страхе перед ответственностью за совершенные кровавые дела, боясь белорусского народа, ведущего счет их преступлениям, уцелевшие буржуазные националисты бежали вместе с гитлеровцами, рассчитывая найти спасение в логове фашистского зверя.
Обосновавшись в Берлине, главари самозванной “рады” продолжали по указке насмерть перепугавшихся гитлеровцев ярую антисоветскую деятельность. Немецким фашистам нужны были новые и новые дивизии, которых становилось все меньше. Гитлеровцы готовы были опираться на любой антисоветский сброд. В это время в Германии околачивалось немало врагов советского народа, формирование которых гитлеровцы возложили на свою агентуру, в том числе на белнацфашистов. В августе 1944 года Островский обратился к правительству Гитлера с просьбой, продиктованной ему фашистскими хозяевами, представить “раде” возможность заняться собиранием остатков сил белнацфашистов.
В меморандуме “рады” указывалось, что “БЦР” берет на себя обязательство создать из числа участников различных антисоветских формирований, из бывших ставленников и

пособников оккупантов, бежавших вместе с гитлеровцами, ни больше, ни меньше как стотысячную армию для борьбы против советских вооруженных сил.
Для подготовки к формированию при “БЦР” было создано главное управление военных дел “БЦР” во главе с матерым шпионом–провокатором К.Езовитовым. Вот тут только гитлеровцы вдруг вспомнили, что Езовитов играл заметную роль в бандах Булак–Булаховича, учитывая которую, некто Душевский, числившийся послом несуществовавшей “БНР” в Прибалтике, 12 декабря 1919 года высказался за присвоение прапорщику царской армии Езовитову чина генерал–майора. Этот генерал от анекдота, сочиненного Душевским, теперь оказался гитлеровским генералом. Рижский анекдот 1919 года стал берлинским 1945 года.
В целях подготовки командных кадров для белорусских националистических формирований войск “СС” в Берлине был сформирован кадровый батальон, который должен был оправдать средства гитлеровцев, затрачиваемые на содержание Островского, Езовитова и всю остальную “БЦРовскую” шайку.
В январе 1945 года генерал милостью гестапо Езовитов под непосредственным руководством главного управления войск “СС” по команде Гиммлера начал комплектовать штурмовую бригаду войск “СС” — “Белорусь”, назначив командиром бригады все того же неудачника Кушеля.
Гитлеровцы не дожидались полного комплектования бригады и гнали на фронт отдельные подразделения этих новоиспеченных эсэсовцев.
Но Островский, Езовитов, Родько и другие члены “рады” занимались не только поставкой пушечного мяса. Вместе с этой открытой работой они использовались и для тайных поручений. Из числа наиболее активных участников нацфашистских организаций — “Белорусской независимой партии”, “Союза белорусской молодежи”, партии белорусских национал–социалистов они подбирали кадры для немецкой разведки, безуспешно пытавшейся организовать разведывательную диверсионную повстанческую работу в тылу Советской Армии.

В это время белорусский народ под руководством партии Ленина — Сталина, при отеческой заботе лучшего друга

белорусского народа, стяжавшего всенародную любовь и признательность, великого Сталина, взялся за восстановление своей родины — Белорусской Советской Социалистической Республики.
Это был героический труд, слава о котором войдет в века. Упорство, знания, высокая социалистическая культура, самоотверженность, выносливость, проявленные белорусским народом, найдут признание грядущих поколений и будут вдохновлять их на новые подвиги.
Социалистический строй, преимущества советской экономики, дружба народов, животворный советский патриотизм, мудрое сталинское руководство сказались со всей силой в невиданно коротких сроках восстановления народного хозяйства республики.
Исключительные размеры опустошений, причиненных войной БССР, отбросили бы любое буржуазное государство на десятки лет назад. С помощью Союзного правительства, Центрального Комитета ВКП(б) и лично товарища Сталина, при помощи братских республик, славших в БССР оборудование, машины, семена, скот, продовольствие, строительные материалы, белорусский народ в течение пяти мирных лет не только выполнил грандиозную программу восстановления народного хозяйства и культуры, но и перешагнул довоенный уровень развития.
Восстановительные работы в Белоруссии начались еще во время войны и захватывали все новые и новые районы по мере освобождения их от немецко–фашистских захватчиков. Уже 21 августа 1943 года СНК СССР и ЦК ВКП(б) по инициативе товарища Сталина приняли постановление “О неотложных мерах по восстановлению хозяйства в районах, освобожденных от немецкой оккупации”. Это постановление стало боевой программой всех союзных республик, выделявших огромные средства для помощи пострадавшим от оккупации районам.
Огромную помощь братских народов СССР и прежде всего великого русского народа сразу же ощутило освобожденное от немецких оккупантов население Белоруссии. Это было величественное зрелище взаимной помощи народов Советского Союза, воодушевлявшее белорусский народ на новые подвиги в деле восстановления и развития своего социалистического хозяйства.

Учебные заведения, библиотеки, медицинские учреждения Белоруссии получали в больших количествах учебники, литературу, оборудование, медикаменты, инструменты для организации дела народного образования и здравоохранения. Уже в июле 1944 года только от Удмуртской Автономной Советской Социалистической республики Белоруссия получила 120 вагонов со станками, инструментом, сельскохозяйственными машинами и металлом, что составляло лишь небольшую частицу грандиозного потока железнодорожных эшелонов, двигавшихся из союзных республик.
В течение одного года в республике почти не оставалось бескоровных колхозников, значительно расширилась посевная площадь, что позволило избежать голода и лишений, от которых спасла белорусское население своевременная помощь, обеспеченная заботами великого Сталина.

За пять послевоенных лет в БССР далеко превышен довоенный уровень по объему валовой продукции промышленности. В республике созданы новые отрасли промышленности — тракторная, автомобильная, локомобильная, велосипедная, предприятия по производству сахара, консервов.
Набрав силы, вновь восстановив свою индустриальную мощь, БССР, развивая машиностроительную, металлообрабатывающую промышленность при высокоразвитой производительности труда, уверенно идет под руководством партии Ленина — Сталина вперед к коммунизму.
Темпы развития народного хозяйства возрастали из года в год. Прирост валовой продукции промышленности в 1950 году составил 30 проц. по сравнению с 1949 годом. Быстрыми темпами развиваются энергетика, топливная промышленность, промышленность строительных материалов, среднего машиностроения, пищевая, текстильная и другие отрасли промышленности.
На непоколебимо прочной индустриальной основе развивается сельское хозяйство республики.
Полностью восстановленные колхозы укрупнены, что обеспечивает более полное и высокопроизводительное использование сильно возросшей технической вооруженности

машинно–тракторных станций и более равномерное использование трудовых ресурсов в колхозах.
В западных областях БССР успешно завершается коллективизация крестьянских хозяйств. В результате успехов дальнейшего организационно–хозяйственного и политического укрепления колхозов сельское хозяйство Белоруссии по валовой продукции перешагнуло довоенный уровень. В 1950 году выращен более высокий урожай по сравнению с 1949 годом, что позволило колхозам полностью и досрочно выполнить свои обязательства перед государством, улучшить материальное благосостояние колхозников и заложить прочные основы для получения еще больших урожаев. В области животноводства, по поголовью всех видов продуктивного скота республика также превзошла довоенный уровень. Благодаря повседневной заботе Советского правительства, ЦК ВКП(б) и лично товарища Сталина из землянок в новые жилые дома переселено свыше двух миллионов человек, и уже давно не осталось ни одной крестьянской семьи, которая бы не имела вновь выстроенного жилища. Быстрыми темпами восстанавливаются разрушенные города республики. Столица БССР гор. Минск украшается сотнями новых прекрасных многоэтажных домов, пересекается широкими асфальтированными, озелененными магистралями и быстро увеличивается в объеме за счет вновь возведенных, благоустроенных заводских кварталов.
В республике полностью восстановлена и значительно расширена сеть научных учреждений, высших учебных заведений, средних и начальных школ, библиотек, клубов, театров и других культурных учреждений. Восстановлена и увеличена сеть больниц, поликлиник, амбулаторий, санаториев, домов отдыха, обеспечивших еще лучшее медицинское обслуживание населения, значительно улучшивших дело народного здравоохранения по сравнению с довоенным периодом. Повседневная забота партии и правительства об инвалидах Отечественной войны позволила им вернуться к трудовой и общественной деятельности; их заботливо оберегаемое здоровье и жизнь наполнены большим содержанием, как и жизнь всех советских людей.
Неоднократное снижение розничных цен, быстрый рост товарооборота обеспечивают увеличение потребления

населением промышленных и продовольственных товаров, рост его материального благосостояния и культуры. Неизмерима всенародная любовь белорусского народа к товарищу Сталину, который помог ему поднять из руин и пепла жилища, заводы, фабрики, школы, университеты. Нет ничего более возвышенного, вдохновляющего, радостного, как жить, неустанно трудиться и бороться под руководством гениального зодчего коммунизма, мудрого отца советских народов товарища Сталина.

Здоровая жизненная основа — советский строй и социалистическая культура позволили подняться белорусскому народу, выпрямиться во весь свой могучий рост, выйти на широкую международную арену и занять подобающее ему место среди народов мира. Гранитная монолитность советских народов, сплоченных первым среди равных великим русским народом, распахнула двери перед представителями белорусского народа к участию в решении международных проблем.

Борьба белорусского народа за советскую власть, за неразрывную принадлежность Белоруссии к Советскому Союзу, против врагов рода человеческого — гитлеровских разбойников нашла всеобщее признание.

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

*Вайна ў ARCHE 2(3)-1999* . [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **14-10-1999**

[image]

[image] .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima


***успаміны***

# Уладзімер Ісаенка
# Жыццё з галавою ў пятлі

**Уладзімер Ісаенка — кандыдат гістарычных навук, археоляг, спэцыяліст па найстаражытнейшай гісторыі Беларусі. Энцыкляпэдыст. Ягоныя апошнія працы — кніга “Памяць” Калінкавіцкага раёну і артыкул “Мінск, абарона 1941” (5–ты том “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі”, выд. “Беларуская энцыкляпэдыя”.**

**Ж**ылі мы на Падгорным завулку (ішоў паралельна вул. Маркса і Кірава), насупраць Лечкамісіі. Там над сквэрыкам быў наш дом. Там пасьля трохдзённай бамбёжкі ў чэрвені 1941 г. мы гасілі першыя пажары, там мы ўбачылі першых немцаў, якія зьявіліся на мосьце вул. Першамайскай.
...Разбомблены цэнтар гораду згарэў, але менчукоў гэта ня вельмі патрывожыла, бо ад Карла Маркса да плошчы Свабоды — гэта быў раён энкавэдыстаў, дык хоць 4 кв. км. у цэнтры згарэла, а ўсё навакольле, дзе жылі мясцовыя, засталося цэлым. Калі ў некага згарэла жытло або не было дзе жыць, людзі маглі прыйсьці ў Менскую гарадзкую ўправу, дзе меліся сьпісы вольных кватэраў, і выбраць сабе новую кватэру з тых, што засталіся ад пераселеных пакутнікаў–габрэяў. Гэтак забясьпечылі жытлом 37 000 чалавек, а 10 000 палепшылі жыльлёвыя ўмовы. Разбураныя дамы, іх каробкі ўвесь час пагражалі абвалам, дык нямецкія сапёры падрывалі самыя небясьпечныя будынкі. Абапал Савецкай утварыліся горы друзу.

...Жыцьцё ў Менску хутка пачало ўваходзіць у нармальную каляіну. Да 10 ліпеня прайшлі нейкія людзі й кажуць: заўтра ўсе павінны выйсьці на свае працоўныя месцы. Людзі выйшлі і сталі працаваць. Атрымлівалі такія ж зарплаты, як і перад вайной. Скажам, інжынэр як меў 800 рублёў, так і далей атрымліваў, толькі ўжо хіба частку савецкімі грашыма, а частку маркамі, 1 марка — 10 рублёў. Былі прынятыя спэцпастановы аб забесьпячэньні насельніцтва. Найперш было дазволена разьбіраць склады, і народ дні два назапашваўся. Па паўмяхі мукі можна было браць, па вядры патакі, паўвядра сьпірту. У маёй маці дык душа не была падрыхтаваная да гэткага, то яна не хадзіла, а некаторыя наведалі ня толькі склады, але й кватэры, пакінутыя савецкімі работнікамі... Супраць нашага дома, які згарэў у ноч на 28 чэрвеня, захаваўся "генэральскі" (дзе цяпер дом Машэрава). Мы, падлеткі, дзеля цікавасьці залезьлі ў кватэру галоўнага ваеннага пракурора: тры дохі каракулевыя віселі ў шафе, дываны на сьценах, у шуфлядзе стала — пісталеты... "Вальтэр", як у энкавэдыстага–апэратыўніка. Мы ні да чаго не дакрануліся, адно ежу, пітво і пісталет зьнесьлі, але яго ў нас адабралі дарослыя і ўтапілі ў Сьвіслачы... Калі разьбіралі склады, ніякай арганізацыі не было, самастойна станавіліся ў чэргі, але ўжо немцы плякаты выставілі: "разрешается брать по полмешка того, полведра другого... Запрещается выдавать продукты жидам". Праўда, габрэйкі ўсё ж прыстройваліся — было спакойна, ніхто нікога не ганяў... Начальства зьнікла яшчэ 25–га. Мы заходзілі ў сталоўку ЦК, елі там чарнасьліў цудоўны, бралі там селядцы смачнюшчыя... У крамах перад вайной такога не было. "Слугі народу" ўцякалі гэтак жвава, што нават пакінулі ў будынку ЦК сьпіс членаў і кандыдатаў у члены партыі з хатнімі адрасамі на 77 тыс. чалавек і партархівы.

Усяго за час вайны наша сям'я жыла ў трох розных месцах: супраць парку Горкага, потым на Маскоўскай і на Красівай. Спачатку знайшлі мы пакінутую кватэру, гаспадар якой, энкавэдыст, зьбег. Яе мы і занялі (якраз насупроць парку Горкага). Бачылі, як праз гэты парк хваля за хваляй пракатваюцца нямецкія войскі. Пад кожным дрэвам яны ставілі намёты. Пасьля кожнай хвалі я наведваўся ў гэтыя мясьціны зь юнацкім спадзяваньнем, што мо яны пакінуць нешта цікавае,

але яны нічога не пакідалі.
Мой бацька прайшоў грамадзянскую вайну, быў адным з тых камісараў, што стваралі Чырвоную Армію, ваенкамам, сакратаром партячэйкі ў Горацкай акадэміі, скончыў апошнюю, працаваў у Наркамземе, а ў 30–я трапіў пад рэпрэсіі, але ацалеў.
Прыйшла восень, час, калі людзі пачынаюць вучыцца. 1 кастрычніка ў Менску было адчынена 14 беларускіх народных школаў, і навучаньне там было сямігадовым. Я трапіў у 2–ю. Да вайны я вучыўся ў прэстыжнай 4–й рускай школе (маці зь цяжкасьцю ўладкавала мяне туды — трэ было мець блат). А тут усё па–беларуску...
Савецкая даваенная школа для мяне памятная тым, што нават у першых клясах настаўнікі раз–пораз загадвалі з падручнікаў, практыкаваньняў па беларускай мове выкрэсьліваць цэлыя абзацы, выкідаць т.зв. нацыяналістычныя творы, нават паэма “Новая зямля” была абвешчаная нацыяналістычнай. У вайну мы ўсе такія творы вывучалі зь вялікай цікавасьцю. Адкрывалі для сябе Алеся Гаруна, Натальлю Арсеньневу, Уладзімера Тэраўскага.
Падчас трэцяе чвэрткі мы пераехалі на вуліцу Маскоўскую, і я ў школу ўвогуле не хадзіў, бо было холадна. Маці прымусіла мяне займацца з унівэрсытэцкім прафэсарам матэматыкі Сталяровым. Стары ледзьве ўжо рухаўся, але ўзяў нас, пяць дзяўчынак і хлопцаў, і навучаў матэматыцы. Можа ён лічыў гэта за свайго роду патрыятычны доўг, можа, ён так займаў свой вольны час у апошнія, як пасьля высьветлілася, месяцы свайго жыцьця. Але я яму ўдзячны, бо дзякуючы яму ў мяне зьявілася любоў да матэматыкі. За тры месяцы, якія мы ў яго навучаліся, мы прайшлі амаль увесь курс 7—8–ых клясаў па алгебры і геамэтрыі Кісялёва. У яго быў арыгінальны спосаб навучаньня: ён адгортваў прыкладна дзесяць старонак падручніка і казаў: “Праз тыдзень вы павінны прыйсьці і здаць увесь гэты матэрыял”. Гэта было вельмі цяжка, бо мы прызвычаіліся, што на ўроку нам усё “разжоўваюць”, замацоўваюць гэтую тэарэму бясконца, рашаюць шмат задачаў, а тут сам вывучай...
Напярэдадні чацьвертае чвэрткі ён памёр, і маці аддала мяне ў 45–ую школу, таксама беларускую народную, дырэктарам якой быў Аляксандар Якаўлевіч Акановіч. Там я давучыў, што

прапусьціў, здаў добра іспыты за сёмую клясу, атрымаў атэстат на нямецкай і беларускай мовах, які да гэтага часу захоўваю і на якім ёсьць подпіс інспэктара школаў Менскай гарадзкой управы Акановіча. У лютым 1943 г. ён стаў дырэктарам Менскай прагімназіі. І там я навучаўся добра, але ў апошнім годзе захварэў месяцаў на пяць.
Пасьля хваробы прыходжу ў школу, а ў клясе шмат новых людзей, частка маіх сяброў у форме Саюзу Беларускай Моладзі, частка зусім незнаёмыя і на беларускай мове ня ўмеюць размаўляць. Высьветлілася, што прынялі шмат дзяцей з тых сем'яў, якія эвакуяваліся са Смаленшчыны па розных прычынах перад наступам савецкіх войскаў. І гэта зразумела, бо даведка пра тое, што ты вучышся ў беларускай прагімназіі (якая пасьля называлася Менская сярэдняя школа з надбудаванымі клясамі), давала магчымасьць жыць і існаваць, і цябе не ўганялі ў Нямеччыну. На непрацуючых жа наладжвалі аблавы.
Сябра мой быў узвадовым кіраўніком СБМ. Сыстэма ўступленьня такая ж, як і з камсамолам ці піянэрамі: прыходзіць настаўнік і кажа: "Трэба паступаць у Саюз Беларускае Моладзі. Будзе ён займацца культурнымі праграмамі, вывучаць гісторыю, будуць паходы, сьпевы, танцы, розныя мерапрыемствы, дадуць форму і г.д.". Шмат хто і запісваўся. Адзін вучань быў пасланы ў Нямеччыну да Гітлерюгенд, потым вярнуўся і паказваў усім падараваны яму кінжал на поясе. Для падлеткаў 14—15 гадоў гэта было вельмі цікава, бо акупацыйныя ўлады забаранялі насіць зброю, а тут на табе — клінок. Але ў СБМ я не паступаў. Бачна было, што вайна ўжо да канца ідзе, а хто ў канцы будзе галаву ў пятлю засоўваць? Хаця мне прапаноўвалі, анкету давалі. Як і настаўнікі, сябры СБМ у анкеце падпісвалі: "Прысягаю, што я ня жыд і не жыдоўскі мяшанец".

...Зайдзіце ў музэй вялікай айчыннай вайны, зірніце на мой атэстат, дадзены ў тым, што я скончыў у 1942 г. 45–ую народную школу: атэстат на беларускай і нямецкай мовах... Акановіч пасьля вайны выкладаў фізыку ў беларускай гімназіі ў лягеры для перамешчаных асобаў у Рэгенсбургу. Беларускую мову й літаратуру ў нас у школе выкладаў Антон Адамовіч, які быў пры Казлоўскім намесьнікам рэдактара "Беларускай

газэты”. Памятаю, як ён прыйшоў і распавядаў, што знайшоў міну ў сваім стале, у шуфлядцы.
...Кіраўнік прадпрыемства ці ўстановы мусіў штотыдня расьпісвацца на тваіх паперах, што ты, такі й такі, гэты тыдзень нідзе не гуляў, а працаваў. І пад час праверкі дакумэнтаў ужо пералічваюць: прайшло з пачатку году 36 тыдняў, значыць, у тваіх паперах мусіць быць 36 подпісаў. Калі няма ўсіх подпісаў, значыць, ты гуляў, мо дзе ў партызанах быў?..
...Савецкая авіяцыя пачала бамбіць Менск у 1942 г. Было пару адзінкавых налётаў, але дакладнасьць была нізкая: памятаю, у ноч на 8–ае сакавіка прыляцеў самалёт і саданўў бомбы па Трубным завулку (цяпер Бэрсана), дашчэнту разьбіў тры хаты, загінулі людзі, што па звычцы рыхтаваліся да сьвята. Кажуць, прылятала “сама” Грызадубава. А цэліла ў Дом Ураду. Празь некалькі месяцаў другі самалёт скінуў бомбы ў дрыгву ля балотнай станцыі. Толькі ў 1943 годзе налёты зрабіліся больш дакладнымі. Адзін раз нейкі дывэрсант патрапіў даць сыгнал, мо зьмясьціў ліхтар на даху ВПШ — а там быў афіцэрскі клюб, — дык бомба трапіла ў будынак, прабіла ўвесь лесьвічны пралёт і разарвалася ўнізе, казіно загарэлася, і некаторыя афіцэры мусілі былі скакаць з вакон...
...Камэнданцкая гадзіна дзейнічала, але трохі своеасабліва: можна было хадзіць у тэатар, у кіно, але трэ было мець квіток, і ў тэатры, мабыць, ставілі пячатку, што ты там быў. І артысты адпаведна мелі права дабірацца дахаты ўвечары, але здараліся ўсякія няшчасныя выпадкі. Быў вельмі добры баяніст у Купалаўскім. Знайшлі яго аднойчы ўночы застрэленага побач са сваім роварам: ці то патруль, ці то бандыты, ці то ён не разабраў чаго...
... Памятаю дагэтуль такую сцэнку з дэманстрацыі на сьвята “вызваленьня” 22 чэрвеня 1944 году. Народ ідзе, лёзунгі, партрэты, сьцягі, сьцяжкі, чырвань. Машына едзе, барты адкінутыя, статуя Іосіфа Вісарыёнавіча. Падымаецца волат і мячом (на мячы, пэўне ж, свастыка) рубіць таварыша Сталіна па галаве. Галава распадаецца, з галавы выходзіць дзяўчынка, уся ў беленькім, а на ёй чырвоная стужка з надпісам: Беларусь. Артысты ж навокал пераапранаюцца. Калі яна выходзіць, усе ў добрай, сьвяточнай вопратцы — беларускай нацыянальнай. Калі ж галава Сталіна зноў зачыняецца, усе артысты апранаюць зэкаўскую паласатую форму і абпутваюць сябе калючым

дротам. Кажуць, ставіў гэтую сцэнку Ўладамірскі, сын таго Ўладамірскага, кагэбіста вялікага, які ў вайну быў у Маскве. Потым, калі вызвалілі, выратаваў яго ўсё–ткі бацька, адправіў працаваць ці то ў Маладэчна, ці то ў Вялейку, і працаваў ён там гадоў, можа, дзесяць, а тады ізноў у Менск вярнуўся...
Потым маё жыццё павярнулася так. Вясной 1944–га школу накіравалі на будаўніцтва ўмацаваньняў у Менску, капаць роў ад нямецкіх могілак да Сьвіслачы. Вучні капалі дні тры–чатыры, а пасьля нас павезьлі ў Нямеччыну. У сувязі з тым, што ў маці былі добрыя сувязі ў адпаведных колах, яна атрымала дазвол на выезд разам са мной, прыхапілі й бабулю.
Мы выязджалі зь Менску адным зь першых эшалёнаў праз Горадню, Беласток. ...Правяраюць нас па дарозе ў Нямеччыну ў Празе (прыгарад Варшавы), і ўсім дакторка ставіць Tauglich... Tauglich...Tauglich... Маці пайшла, стала высьвятляць, што ня Tauglich, што сын моцна хварэў.. А дакторка нічога ня выправіла, сказала толькі: “Так трэба”. А каб жа дакторка аказалася менш гуманнаю і паставіла, што я нядужы, адправілі б мяне ў Асьвенцым... Непрыемны быў лягер у Празе — цагляныя сьцены 4–мэтровай вышыні, шкло і дрот наверсе, нары трох’ярусныя.
Трапілі ў паўднёвую Нямеччыну ў Шварцвальд. Месца называлася Гагенаў–ін–Бадэн. Славуты Бадэн–Бадэн, у якім шмат хто з расейскай інтэлігенцыі прайграваў свае грошы калісьці, знаходзіўся за пяць кілямэтраў ад нас за гарой, але мне, як лягерніку, не давялося там быць ні разу, тым больш што на гары стаяла зэнітная батарэя. Наш лягер знаходзіўся недалёка ад самога заводу. Побач былі лягеры “рускіх” і італійцаў. Прыбылі мы ў той дзень, калі адбыўся замах на Гітлера (20 ліпеня 1944 года). Цяжка было. Рабочы дзень 12 гадзін, а харчаваньне слабое. Ды й нязвыкла ўсё. Папрацавалі крышачку, павучыліся на гэтым заводзе: рабілі па 60—70 грузавікоў на дзень. “Даймлер–Бэнц” — фірма салідная. Насіў значак “Ost” там. Аднойчы я нашыў яго на джэмпэр збоку, і мяне варта не пусьціла ў Гагенаў–ін–Бадэн, бо толькі тыя, хто добра працаваў, маглі насіць яго на рукаве, а астатнія ж мусілі на грудзёх — у мяне ж не было паперы, што я добра працую, дык і не пусьцілі. Была крыўда: мы жадалі паглядзець на ваш гарадок, а вы нас сустракаеце так негасьцінна. Павярнулі назад, але я падумаў: “Даражэнькія, ад нас вы

адгароджваецеся, не пускаеце нас. А мы ж да вас не самі прыехалі, мы вам вайну прывезьлі, ад вайны не адгародзіцеся”.
Хутка гэтая вайна для іх і пачалася. Раптам неяк у нядзелю — 3–га верасьня — бамбёжка. Не пасьпеў я намазаць лусту хлеба маргарынам і павідлам, як гу! — паветраная трывога. Паглядзеў у вакно, ажно бачу: ляцяць выцягнутым строем зьнішчальнікі на вышыні кілямэтраў пяць–шэсьць, ледзь–ледзь бачныя. І ляцяць прама, як быццам бы на нас (раней жа мы супакойвалі сябе, што яны ня ўбачаць заводу ў гарах). Гляджу, ляціць сотні тры чатырохматорных бамбавікоў, а збоку ўюцца зьмейкамі новыя зьнішчальнікі. А як пабачыў, што ад аднаго зь першых амэрыканскіх самалётаў адарваліся дзьве бомбы з дымавым сьледам, то зразумеў, што гэта на нас. Пасьля я даведаўся, што гэтыя бомбы былі сыгналам да пачатку бамбаваньня іншым самалётам. Расьсьцілаўся “бомбавы дыван”.
Тады ўжо ад кожнага адсунулася каля 10—15 кропачак серабрыстых, а калі гэта палічыць у адпаведнасьці з колькасьцю самалётаў... 3000...
Трэ было ратавацца. Як я быў, выскачыў, дабег да брамы лягеру (два разы давялося класьціся на зямлю з–за хваляў бамбёжкі). Уявіце сабе, калі бомбы падаюць такім дыванам, то зямля ўздымаецца ўверх: быў сонечны дзень, а стала цемра. Нешта барабаніць па галаве, б’е па вушах. Пасьля пыл ападае, крыху сьвятлее, і робіш новую перабежку...
Я бег мэтраў 300 да бамбасховішчаў (пабудаваных індыйскім легіёнам “Чандрабоса”, які немцы не пасьпелі накіраваць у Індыю), напэўна, разы чатыры ў зямлю ўціскаўся. Вось ужо, здавалася, адзін рывок, і ты ў бамбасховішчы, але... там трэ было крышачку падняцца і потым прабегчы па лесьвіцы ўніз паміж дзьвюх бэтонных сьценак. Думка: калі выскачу на ўзгорачак, каб хутчэй дасягнуць бамбасховішча, дык мяне саб’е асколкам. Вырашыў, хоць і засталося якіх 15 крокаў, лепш у выемачку перад сховішчам зарыцца. Новая хваля, новая цемра. Нарэшце я даволі спакойна ўваходжу ў бамбасховішча, а зьверху зноў грукат накатваецца. Пасьля я пабачыў, што за 20 мэтраў ад месца, дзе я ляжаў, бомба трапіла, ды не разарвалася.
Італійцы ў бамбасховішчы трасуцца, узгадваюць усіх сьвятых — і гэта былыя салдаты. А я, школьнік учорашні, спакойненька

стаю — сьцяўшы, праўда, зубы. Раптам узгадваю пра заціснуты ў руцэ бутэрброд і пачынаю яго есьці. Ежа нэрвы вельмі супакоіла.
Яшчэ было два–тры заходы, потым усё сьціхла. Навакольля было не пазнаць. Бамбасховішча знаходзілася паміж горадам і лягерам у полі, дзе расьлі яблыні і грушы. Поле моцна пацярпела ад налёту. Праз кожныя 80—100 мэтраў трапляла бомба, а дыямэтар варонкі мэтраў зь 15.
На дзіва, лягераў не зачапіла. Баракі засталіся непашкоджаныя, толькі ў савецка–расейскім лягеры кухару адарвала галаву. Таму я мяркую, што на мапах амэрыканскіх штурманаў вельмі дакладна быў адзначаны лягер, і меўся загад яго не закрануць. Дарэчы, перад бамбёжкай раскідалі ўлёткі з папярэджаньнем, але паліцыянты адбіралі іх. Завод быў пакарэжаны вельмі істотна. На ягонае аднаўленьне кінулі шмат аварыйных брыгадаў. Гарадок, насельніцтва якога ў асноўным было задзейнічана ў працы на заводзе, быў зьнішчаны недзе на дзьве траціны. Мясцовыя жыхары зазналі шмат трагедыяў: напрыклад, адзін нямецкі майстра якраз даходзіў да свайго разбуранага дома і бачыў, як усё абвальваецца, як гіне жонка зь дзецьмі, што схаваліся ў падвале.
У некаторых вёсачках дзе–нідзе былі ўваткнутыя жэрдкі, а на іх пукі саломы, г.зн. там ляжыць неразарваная бомба. Былі бомбы, якія пратыкалі дом і падвал і не выбухалі (потым рускія сапёры, сьмертнікі, гэтыя бомбы разьмінавалі).
Завод рамантавалі цэлы месяц. Нарэшце, пробны пуск у суботу, адпачынак. У панядзелак, 1 кастрычніка, зноўку загулі самалёты. Я ўзьняў галаву і пабачыў знаёмы сьлед: дзьве бомбы дымавыя. Самалётаў дзьвесьце на вялікай вышыні. Немец, што ішоў наперадзе, павольна, як бывалы салдат, пабег у сховішча, і я за ім. Гэтым разам завод быў разьбіты амаль што ўшчэнт, хаця прадпрыемства, увогуле, вельмі цяжка зьнішчыць. Немцы яго ўжо так і не аднаўлялі.
За месяц, які працаўнікі правялі бяз справы, фронт з Францыі значна наблізіўся, і пачалася эвакуацыя. Нас вывезьлі чыгункай паўз Рэйн, праз Франкфурт–на–Майне, дзе давялося пасядзець у цудоўным бамбасховішчы пад станцыяй з плаўным па сьпіралі ўваходам без прыступак. Едзем далей, зноў паветраная трывога, пераязджаем Фульду, разгромленую напярэдадні, якая яшчэ гарыць. І дзесьці пад канец ночы прыехалі да

Райхсгаўптштат — Бэрліну: пражэктары, сфэры супрацьпаветранай абароны. 10 сьнежня мы былі вымушаныя праседзець на галоўным вакзале Ангальтэрбангоф цэлы дзень і ноч. І тады мы сустрэлі чалавека, які параіў зьвярнуцца ў разьмеркавальны пункт, дзе можна было пабыць і атрымаць прадуктовыя карткі. Чалавек гэты нязвыклы, падсеў да нашых столікаў, дзе мы пілі адну толькі гарбату. То быў нямецкі афіцэр у замурзанай палявой форме, у пакамечанай фуражцы. Сустрэча з гэтым афіцэрам была невыпадковай, што стала зразумела празь некалькі дзён, калі мы яго пабачылі і павіталіся, але ён на вітаньне не адказаў, бо ішоў ужо ў іншай форме, эсэсаўскай. Відаць, на вакзале ён высочваў ворагаў. І вельмі добра, што мы пры ім лаялі Сталіна і бальшавізм, а йнакш яўна апынуліся б зусім у іншым лягеры.
І мы разам з нашымі кіраўнікамі пайшлі ў гэты пункт, дзе нас добра ўладкавалі на трохпавярховыя нары. Атрымалі ў спэцыяльным бюро насупраць разовыя карткі, спачатку на дзень–два, потым на тры дні, потым на тыдзень. За гэты час нашыя апекуны знайшлі і месца працы.
Напярэдадні новага 1945–га году маці ўжо працавала ў “Дойчэфэрляг” — нямецкім выдавецтве. Як хворы, я меў дазвол не працаваць (а для немца хоць які дакумэнт, падпісаны нейкім доктарам Кістэмакерам у якімсь глухім Гагенаў — гэта закон). Таму мне выпала апошнія дні існаваньня імпэрскае сталіцы назіраць больш–менш вольным чалавекам, гуляючы, як ні дзіва, па ёй. Улада тады ўжо яўна пахіснулася. Нагледзеўся ўсякага...
Нямецкія рабочыя з усяе моцы працавалі, нямецкія жанчыны вучыліся страляць панцырфаўстам (які нашыя перайменавалі ў фаўстпатрон). Жыць мы жылі ў самым цэнтры, за два кварталы ад Ангальтэрбангоф, за тры — ад дому Гімлера, за чатыры — ад Райхсканцылярыі. Там страшна было жыць, і немцы больш заможныя жылі на ўскраінах Бэрліну, бо цэнтар быў напалову разбураны, яго часта бамбілі. Звычайна была адна паветраная трывога ўдзень і дзьве ўначы, або наадварот. Вельмі рэдка абыходзілася бязь іх. Амаль кожны месяц бамбілі квартал, у якім мы жылі.
Так здарылася і 1–га студзеня 1945 году. Узялі мы вазок на Ангальтэрбангоф (нам пазычыў нейкі немец) і павезьлі свае рэчы ў новы лягер “Дойчэфэрляг” на трэцім паверсе дома па

Хальшэ Штрасэ, 28. Над намі разьмяшчалася ортгрупа НСДАП Кёніггрэц (нешта накшталт райкаму НСДАП). Было вельмі цікава сустракацца зь імі на адной лесьвіцы.
Толькі пераехалі, і я вырашыў на Новы год памыцца ды пайшоў шукаць лазьні. Падчас нялёгкіх пошукаў (мовы нямецкай добра ня ведаў) пачуў паветраную трывогу. Накіраваўся туды, куды ішлі ўсе. Апынуўся ў бункеры, які меў выгляд цыліндрычнай вежы дыямэтрам мэтраў 70, а то і 100. На паверхні зямлі пяць–шэсьць паверхаў і ніжэй тры–чатыры. Зьверху жалезабэтонная пліта, а на ёй зэнітная батарэя. Такое ўмацаваньне звычайнай бомбай не праб'еш. Тым ня менш, калі бамбілі, даносіліся водгукі разрываў. Праз гадзіну далі сыгнал, што можна выходзіць.
Іду і не пазнаю гораду: Вільгельмштрасэ — цэнтральная вуліца, на якой Міністэрства замежных справаў, нагадвае галяндзкі сыр: уся пакрытая варонкамі ад бомбаў. У варонку зірнеш, а там паўмэтровы або мэтровы слой бэтону прабіла, і бачны цягнік мэтро.
Збочваю на Путкамэрштрасэ, дзе быў наш папярэдні лягер. Вуліца зьнішчаная, а дамы згарэлі. Калі б мы хоць на адзін дзень затрымаліся, то ўсё, што мы мелі, згарэла б падчас гэтай бамбёжкі. Іду я да сваёй хаты паўз Ангальтэрбангоф і баюся зварочваць, ну, думаю, зараз тут будуць такія ж руіны. Але ў нас усё ацалела, толькі шыбы крыху павыбівала.
Гэтак і павялося: бамбёжкі, прагулкі, наведваньне крамаў, дзе трэ было атрымоўваць прадукты па картках, праца на развалінах. Горад жыў — і бэрлінцы трымаліся стойка. А "фрэмдлінгі" (чужынцы) чакалі хуткага вызваленьня. Нават савецкія ваеннапалонныя (іх лягер быў паблізу) ішлі бадзёра, у нагу, а вакол іх ахоўвалі маркотныя "татальнікі".
Там мы лічыліся ўжо не остарбайтары... (удакладняць ня буду). Але правы я меў, як остарбайтар.
У мяне на станцыі Ангальтэрбангоф была любімая мясьціна: ля калёны было зручна сядзець на чамадане. Я, дарэчы, захаваў яго — мо калі зноў траплю ў Бэрлін, пасяджу. Нямала там начэй я праседзеў з бабуляй і маці.
І вось наступілі апошнія дні. Пачаўся савецкі наступ ад Кюстрына. Цяпер насельніцтва павінна было нарыхтаваць некаторую колькасьць прадуктаў (па тры кіляграмы кілбасы выдавалі на чалавека), і ўсе, хто мелі жаданьне, маглі

эвакуявацца. Эвакуацыя пачалася прыкладна 16–га красавіка. Эшалёны ехалі ў паўднёвую Нямеччыну, у асноўным у Баварыю. Можна было ўзяць толькі адзін чамаданчык і адзін заплечнічак — і эвакуюйся. З нашага лягеру так усе зрабілі, і толькі адныя мы засталіся: я, маці і бабуля.
Кілбасы таксама атрымаць не ўдалося, бо падала шмат снарадаў, а гінуць не хацелася, дый чарга стаяла чалавек зь дзьвесьце. Так і застаўся нам Бэрлінскі магістрат вінен 9 кіляў кілбасы.
Пайшлі ў бамбасховішча ў Ангальтэрбангоф, а там бегаюць эсэсаўцы і рыхтуюцца да абароны. Стала ніякавата крышачку. Маці з адным пагаварыла і высьветлілася, што гэта ня проста эсэсавец, а гішпанец з былое “Блакітнае дывізіі”, які потым у Гішпанію не вярнуўся, а паступіў у СС. Потым я даведаўся, што ня толькі гэты батальён СС, дзе было шмат гішпанцаў, абараняў Ангальтэрбангоф, але і Райхсканцылярыю, дзе знаходзіўся Гітлер, абараняў батальён эсэсаўцаў, большасьць зь якіх былі французамі нардычнага выгляду. Не хапала ўжо ім прыродных немцаў нават для абароны такіх пунктаў.
(Той гішпанец падараваў маёй маці зялёны швэдар, у якім я потым хадзіў два гады ў інстытут у Гомлі. Узгадваў гэтага гішпанца, а ён, мабыць, касьцьмі лёг на тым Ангальтэрбангофу.)
Зьявілася такое адчуваньне, што трэба сыходзіць. Пайшлі мы на сваю вулачку Гальшэштрасэ (гэта было ўжо 25–га красавіка). У гэты час праходзіў абстрэл цэнтру Бэрліну з гаўбіцаў. І мы літаральна ў апошні момант перабраліся ў бамбасховішча пад школай. У трэцім пакойчыку там была лавачка, на якой я праседзеў тры дні падчас штурму цэнтру Бэрліну.
У нас быў некаторы запас прадуктаў: кавалачак кумпяку, які мы яшчэ колісь зь Менску вывезьлі, дык што сяк–так трымаліся.

Вызвалялі нас штрафнікі 28–га а чацьвертай гадзіне дня.
У апошнія хвіліны пачалася мітусьня каля ўваходу. Чую, начальнік апорнага пункту Люфтшуцраўм не дазваляе камусьці ўвайсьці, спрачаецца — не пускаў ён маладзенькага салдата і казаў: “Не, тут для грамадзянскага насельніцтва”. Дарэчы, ён у нас таксама спачатку дакумэнты папрасіў, пасьля прапусьціў. Тады мы для іх ужо служылі нейкім прыкрыцьцём: не, рускіх

яны рабаваць ці біць ня будуць. Бамбасховішча было скрозь нямецкае, людзі звыклыя, а мы ўпершыню зьявіліся, як жыхары гэтай вуліцы.
Тыя некалькі сэкундаў каштавалі таму немцу жыцьця: штрафнікі, урываючыся, на месцы яго паклалі, так і ляжаў ён перад уваходам.
Вызвалілі нас штрафнікі, і першае, што абвясьцілі: “Рускіе, выходіте с вешчамі”. Мы выйшлі і, вядома, трэба ж было аддзякаваць сваім вызваліцелям. Вызваліцелі не падобныя да немцаў — хто ў ватніку, хто ў шынэлі, некаторыя ў накідках, зімовых шапках, хто паголены, а хто не. Знакаў адрозьненьня амаль ня бачна, у некаторых з амэрыканскае кансэрвовае бляшанкі белая зорка выразаная і прышытая белымі ніткамі, але зброя ў поўным парадку. Дзіўна было глядзець на гэта. Адзін рослы, мажны, і я да яго падышоў, падзякаваў за вызваленьне. А ён пачырванеў чамусьці.
Пасьля нас перавялі ў іншае памяшканьне, дзе пачалі частаваць, а немцаў тым часам правяралі. П’яныя штрафнікі нам прасьпявалі крыху песень, і мы нават адчулі сябе неяк незразумела. Пераспалі, а на наступны дзень я ўзгадаў пра забыты ў бамбасховішчы мех з хромавымі скурамі. Вярнуўся па яго ды бачу: два пакоі вакол напоўненыя немцамі. Немцы нейкія зусім разгубленыя, бо іх рэчы ператрэсьлі і пакідалі па ўсім бамбасховішчы. Адна дзяўчына знайшла ў адным куце свае трусікі, у другім свой бюстгальтар, а ў трэцім — камбінацыю. Усё перабралі, рабуючы. У некаторых салдатаў было ад кісьці да локця па 8—10 гадзіньнікаў навешана. А пасьля савецкія салдаты гулялі: адзін пальцам на нейкі гадзіньнік, другі пальцам на нейкі гадзіньнік: “Махнём не глядя” — і мяняліся. Адны пярсьцёнкі нямецкія зьбіралі, другія нейкіх нямецкіх жанчын гвалтавалі. Адзін сямідзесяцігадовы стары немец пры мне намагаўся адкрыць сабе жылы, я паспрабаваў, як мог, супакоіць яго. Нават прамармытаў, што войны сканчаюцца, а народы застаюцца жыць.
На наступную ноч (да ўзяцьця Райхстагу было яшчэ тры дні) камандзір захацеў зрабіць нам добрае, ведаючы, што нас адпраўляюць у тыл і што дарога дальняя — вырашыў даць прадуктаў. Таму даў нам правадніка, які ведаў пароль, каб нас пусьцілі на склады, і ўначы мы зь ім пайшлі па руінах амаль да Ангальтэрбангоф, дзе насупраць быў Паштамт ды вялікія

ўнутры склады. Яны былі яшчэ не апрыходаваныя, і таму мы маглі браць усё, што хацелі.
Ідзём, пасьля ціхенька шэптам пароль называем. За насыпам тым часам чуліся кулямётныя чэргі, узьляталі ракеты. Прабраліся. Новы гаспадар складу даў нам усё, што мы хацелі: кансэрвы для булёнаў, яшчэ дацкія, кансэрвы мясныя, згушчанае малако ў парашку, так што кіляў з дваццаць я набраў і ў руках панёс. Такім жа шляхам вярталіся назад, а пры ўваходзе (акно ў падвале) нейкі штрафнік захацеў у мяне бляшанку кансэрваў забраць, але я запёрся і не аддаў, кажучы, што нас там шмат. А была там толькі нашая сям'я і сям'я польскага перакладчыка з "Дойчэфэрляг", які наглядчыкам быў нейкім маленькім. (Ён мяне ў сваім часе спрабаваў прымусіць працаваць, пакуль я не паказаў яму даведку, што хворы. Цяпер я аддзячыў яму за тое, што ён не настойваў. Мы зь імі па–брацку падзяліліся, хаця дарога нашая была больш дальняй.)
Запасьліся мы дзвума дзіцячымі вазкамі, каб скласьці рэчы. Частка рэчаў была ў тым доме, дзе мы жылі. Спусьціўся я туды, а там усё пагарэла. Зайшоў у двор. Там ляжаць два клінкі: адзін — афіцэрскі, другі — штурмавікоў. Прыхапіў абодва на памяць, але потым мусіў зь імі расстацца. Шкада.
Накіраваліся мы па дарозе, якая ішла ля таго ж "Дойчэфэрлягу".
Дабраліся да Капэнік (паўднёва–ўсходні прыгарад Бэрліну), там заначавалі ў парку, потым у адным нямецкім доме. У той час было загадана, каб немцы на ноч дамоў не замыкалі. Немцы выконвалі загад, а гэтым карысталіся людзі з розных вайсковых частак, якія сыходзілі ў самаволку і фармавалі банды, каб хадзіць і рабаваць вось такія адчыненыя дамы (пра гэта ў немцаў, сьведкаў гэтых падзеяў, напісана шмат апавяданьняў).
Пабылі некаторы час, а потым паехалі па перасыльных пунктах. Пасадзілі нас на цягнік. Як сёньня памятаю знаходжаньне ў лягеры горада Швібус (зараз Свабадзін — цэнтар Міжэрыцкага ўмацаванага раёну, які немцы, калі адступалі з Польшчы, заняць не пасьпелі). Лягер знаходзіўся збоку, у парку. Маці і бабуля засталіся каля рэчаў, а я пайшоў у горад.
Горад быў пусты, я йшоў адзін і заходзіў, куды толькі хацеў. Канечне, ніякіх запасаў прадуктаў харчаваньня там ужо не было, ніякага абутку, вопраткі. Усё кінутае: бібліятэкі, посуд...

пух зь пярынаў (мабыць, калі займалі горад, вельмі падабалася ім пускаць “сьнег”). Расейцы любілі таксама забіраць ровары, якіх у немцаў было даволі шмат. Каталіся, пакуль не разьбівалі, і кідалі. Уявіце сабе сельскага рускага хлопчыка, які нават гадзіньніка ня бачыў, а тут — ровар.
Так і вярталіся пасьля: ад лягеру да лягеру, атрымоўвалі дзе–нідзе нейкія прадукты харчаваньня. Гэта было ў пачатку траўня, таму мы вельмі хутка прайшлі ўсе кантролі, якія фактычна былі фармальнасьцю. Ня зьдзекваліся з нас нідзе, не рабавалі. На пляцформах праскочылі Польшчу, зь цягніка на цягнік. У Берасьці мы пабылі ля крэпасьці, пайшлі афармляць дакумэнты на ўезд, і толькі там нас спыталі, ці не вязем якіх кніг ці зброі. У мяне быў той кінжал штурмавіка, і маці дамаглася, каб я аддаў. Памежнік пачапіў яго сабе на пояс, хадзіў горды.
Нашай мэтаю быў Менск, там маці пайшла ў адрасны стол, дзе знайшла адрэсу свайго стрыечнага брата, які да вайны служыў у апэратыўным аддзеле НКУС. Пачаў дзесьці ў 1938... Па начах працаваў больш, чым днём. У 1941 годзе ён зьбег зь сям’ёй. Сям’я пайшла ў Гомель, а ён на фронт, дзе завёў сабе новую сям’ю, а ад гомельскае адцураўся. Пасьля гэты дзядзька кіраваў школай па падрыхтоўцы радыстаў для партызанскіх атрадаў. Было вельмі добра, што маці знайшла ягоную адрэсу. Сардэчна сустрэў нас, і на вакзал паслаў фурманку, каб забраць нашы рэчы і перавезьці на сваю часовую кватэру. Ён растлумачыў нам абстаноўку: тых, хто знаходзіўся ў час акупацыі ў Менску, не прыпісвалі тут (напрыклад, родзічка маткі Саўчанка Марыя вярнулася з канцлягеру ў Францыі і была вымушаная жыць у Менску падпольна, а прыпісацца ў Барысаве), тых, каго можна было абвінаваціць у супрацоўніцтве, т.зв. калябарацыянізьме, маглі пасадзіць на дзесяць год.
Малочны завод, дзе працавала ў вайну маці, яўна мог пацягнуць на калябарацыю, а пра Менскую гарадзкую ўправу я й не кажу. Бо ж у вайну мой бацька спачатку працаваў аграномам у Менскай гарадзкой управе, пасьля ўдзельнічаў у Беларускай Народнай Самапомачы. Выехаў у Нямеччыну, апынуўся ў Штатах. Нават вершыкі пісаў бацька, якія падпісваў ці то Дубровінскі, ці то Дуброўскі — у газэту “Беларус”. На жаль, іх чытаць не давялося. Мы зь ім ад вайны ніякіх сувязяў ня мелі, толькі ведаю, што памёр ён 19 лютага 1971 года

вольным чалавекам. Але ці шчасьлівым?
Стрыечны брат маці параіў пераехаць у Гомель, куды даў спэцыяльнае накіраваньне сваім людзям. Нас пераадрасавалі, і т.ч. нашая сям'я пераехала ў Гомлю, дзе я скончыў 9 і 10 клясы ў чыгуначных школах. На мае дакумэнты там глядзелі зь цікавасьцю, бо я ў вайну не вывучаў ані расейскае мовы, ані расейскае гісторыі, ані геаграфіі, ды замест канстытуцыі ведаў нейкае грамадазнаўства. І як такому здаваць на атэстат сталасьці? Здаў.
Не пашанцавала толькі, што зноў захварэў у 10 клясе месяцы на чатыры. Усё ж быў трэцім у выпуску па пасьпяховасьці, нягледзячы на пропускі па хваробе і іншую экзотыку.
У 1947 годзе паступіў у Гомельскі пэдінстытут на фізыка–матэматычны факультэт. У такіх умовах на гістарычны ці які яшчэ я наўрад ці б паступаў. Бо ведаў, што гэта фальшывая гісторыя, аднабаковая літаратура, далёкая ад сапраўднай навукі...
Праблемы, зьвязаныя зь мінулым, не сканчаліся. Першы год маці прапрацавала, бо была магутная рэкамэндацыя ад чалавека, які быў залежны ад яе стрыечнага брата, майго дзядзькі. Потым, калі той пасварыўся з сваім начальнікам, маці зьнялі адразу ж з працы, і ёй давялося за шэсьць год жыцьця ў Гомлі памяняць ажно сем ці восем месцаў працы. Сем ці восем разоў пераязджалі з кута ў кут. І ўрэшце, каб уладкавацца, ёй давялося ехаць у Шклоў. У мяне таксама хапала праблемаў. Я добра скончыў інстытут (першы выпускнік), у характарыстыцы было напісана "прыдатны выкладаць у ВНУ". Але я ведаў, празь якую праверку праходзяць выкладчыкі ВНУ і таму сказаў, што лепей паеду працаваць у школах Палесься, і, калі ўсё будзе добра, буду паступаць на асьпірантуру па матэматыцы.
Гэта быў 1951 год. Прыехаў — і мяне прызначылі завучам, а завуч праходзіў праз райкам, дзе мне ясна далі зразумець, што завуч — гэта іх "крэатура". У камсамол я ўступаў, у партыю прымушалі. Неяк адкруціўся ад гэтага і ад грунтоўнай праверкі. Я працаваў спачатку завучам, пасьля настаўнікам, а потым тры гады і дырэктарам школы ў Юравічах. Добра працаваў, бо ня ўмеў інакш.
А так можна лічыць, што я ўсё жыцьцё пражыў у маскіроўцы. Усё жыцьцё прыходзілася маўчаць, каб цябе ня дай Бог не пачалі цягаць па інстанцыях, не пачалі капацца ў тваёй

біяграфіі, правяраць. Бо інакш бы замучылі.
Цяпер пытаюцца: “Чаму ж вы тады не выходзілі на дэманстрацыі, чаму ж вы тады не змагаліся?” А гэта тое самае, што пытацца: “Чаму ж вы тады не далі расправіцца з вамі, чаму не далі магчымасьці катам пусьціць вам кулю ў патыліцу? Чаму не дапамаглі органам дзяржбясьпекі, не прыйшлі і прама не сказалі, што вы супраць таварыша Сталіна? Чаму не прыйшлі і не сказалі, што супраць савецкае ўлады ці што глядзіце на Захад і чакаеце адтуль вызваленьня, бо ўнутранага вызваленьня сваімі сіламі не дачакацца?” Дзяржбясьпека бы вам была ўдзячная за вашу адкрытасьць, але ці варта было дапамагаць дзяржбясьпецы? Таму людзі, якія ведалі ўсе хібы савецкай палітыкі і дзяржавы, рабілі вельмі добра і дальнабачна, што маўчалі: яны не далі расправіцца з сабой.
...Вайна адышла ў гісторыю, але ня вырвацца зь яе абдымкаў. Узгадваюцца факты, працую ў пошукавым батальёне, каб ня згасла памяць аб ахвярах вайны. Вялікай вайны, дагэтуль невядомай вайны.
...Я ўсё жыцьцё зьбіраў цікавыя факты. Вось, напрыклад. Шмат якія камандзіры партызанскія золата зьбіралі. Як і паліцаі. Камандзір Юрэвіцкай паліцыі Канапацкі, былы афіцэр НКВД, вырашыў пайсьці ў партызаны, усё пагрузіў, пераехаў у лес. Яго адразу ж паставілі ў падрыўную групу, і на чыгунку. Група вярнулася, а яго няма. Жонка захвалявалася: што, дзе?.. Хвалюешся? Пойдзем пакажам. Пайшлі, вярнуліся — безь яе ўжо. Золата куды пайшло?..
...Зь Беларусі немцы вывезьлі 380 тыс. Вярнулася ж: з жанчын — палова, а з мужчын — толькі трэцяя частка. Рэшта засталіся на Захадзе. Відаць, яны загадзя вырашылі не вяртацца, бо працавалі вельмі добра. Я сам быў гэтаму сьведкам.
...Падпольле? Ягоная роля перабольшваецца. Пакуль немцы пераможна йшлі на Маскву, усе сядзелі, баяліся высоўвацца. Але калі завязалася доўгая, пазыцыйная вайна, то й органы НКВД аднавілі ўсе свае сувязі, а ў іх была велізарная сетка даносчыкаў і правакатараў. Што зьмянілася ў параўнаньні зь перадваенным часам? Раней нейкі ўпаўнаважаны НКВД па раёне сядзеў у сваім кабінэце, а з 1942 г. — у зямлянцы на востраве недзе пад Уздой сярод балота. І вымушаў людзей зноў працаваць на НКВД, прысылаў да сваіх былых агентаў партызанскіх сувязных і казаў так: калі вы адмовіцеся, дык я,

па–першае, сям'ю вашу дастану, а, па–другое, папросту падкіну немцам інфармацыю пра тое, чым вы займаліся перад вайной, і яны самі з вамі разьбяруцца. Адны беларусы помсьцілі немцам — і было за што: за роднага, што ў арміі, за зьнявагу, за прымус на працы, нарэшце, за разьбітае жыцьцё. Але былі і паліцыянты, якія таксама вялі свой рахунак. Усё ж дзейнасьць падпольшчыкаў была вельмі абмежаванаю. Я асабіста за гады вайны ў горадзе ня бачыў ніводнай лістоўкі, ніводнай антынямецкай газэты. У стотысячным горадзе хіба што раз у тры месяцы здараліся тэракты: ну хай узарвуць трохі толу — пераб'юць пару дэталяў у станку або шыбу высадзяць. З большых тэрактаў згадваюцца ўзрыў сталоўкі паліцыі бясьпекі (30 забітых), забойства Кубэ і тэракт у Купалаўскім тэатры, калі загінула 10 чалавек. Пра апошні спачатку пасьля вайны гаварылі як пра выдатны акт помсты немцам і іх пасобнікам, пасьля сталі замоўчваць. Мая маці мела квіток на гэты спэктакль, але спазьнілася, на сваё шчасьце. Як адбыўся выбух, падлога правалілася, дык і ёй прыйшлося выскачыць праз вакно. Прыбегла дадому — глядзіць, а ззаду нечай крывёю залясканая ўся сьпіна ў гарнітуры... Афіцыйная вэрсія — што адзін артыст тэатру падчапіў бомбу ў сутарэньнях пад самую столь, там, дзе дэкарацыі захоўваліся. Немцы сваё паседжаньне правялі раней, а на спэктакль сабраліся звычайныя менчукі — на прадпрыемствах раздавалі запрашальнікі. Мо гэты выбух быў нямецкай правакацыяй...

...Калі немцы прыйшлі ў Менск, можна было пайсьці глядзець будынак НКВД. Я хадзіў, глядзеў. Там, дзе круглы вэстыбюльчык, стаяла 10 шафаў, усе запоўненыя шклянымі пласьцінкамі ды здымкамі тых, хто прайшоў праз НКВД — анфас, профіль, нумары... Цікава, колькі было такіх небаракаў, "ворагаў народу": зірнуў на нумары ў першай шафе — 4000, 5000, у сярэдняй — 40 000, пад канец — ужо за 100 000! Ну, думаю, на нашу маленькую Беларусь... Амэрыканку, круглую турму, таксама можна было наведаць... У Мазыры, калі немцы прыйшлі, яны адкрылі для наведваньняў сутарэньні Міхайлаўскага сабору, дзе НКВД расстрэльвала. Людзі прыходзілі, гладзілі вышчэрбіны ад куляў на сьценах і думалі, мо гэта мой сын ці сястра тут стаялі... Расстрэльвалі, а пад нагамі — магільныя пліты XVIII ст...

...У кабінэтах сьледчых траплялiся дзіўныя рэчы, якія

нагадвалі, памятаю, людзі гаварылі, інструмэнты цырульніка. Цяпер я вычытаў, што НКВД закупляла за мяжой спэцыяльныя прылады: іголкі заганяць, пазногці зрываць, костачкі ламаць на пальцах... Калі цяпер кажуць, што ў Курапатах знайшлі пэўную колькасьць нямецкіх куляў, гэта тлумачыцца проста. У 1929—30 гг. ворганы ОГПУ—НКВД закупілі вялікія партыі нямецкай зброі і боепрыпасаў. Дбайныя ворганы мусілі быць узброеныя лепшай зброяй. Савецкі "ТТ" пачынаў даваць збоі пасьля 60 стрэлаў, нямецкі "Вальтэр" вытрымліваў 200 стрэлаў бесьперапыннай стральбы...

...Генэрал Гудэрыян запісаў у дзёньніку наступнае. Калі немцы захапілі Арол, яны знайшлі ў дварэ цэнтралу некалькі тысячаў расстраляных вязьняў. Немцы вырашылі паказаць гэта людзям, адкрылі турму, дазволілі шукаць сваякоў. Людзі прыходзілі, шукалі, знаходзілі. Пакутліва маўчалі, але немцам ня дзякавалі. Мабыць, думалі: "Каб вы не прыйшлі, ніхто б іх не расстраляў, яны б спакойна даседжвалі, з–за вас расстралялі". Перавернутая сьвядомасьць...

...25 чэрвеня ўлады сталі разьбягацца і выгналі зьняволеных зь менскай турмы. Калёна выйшла пару тысячаў чалавек. Маскоўская шаша была занятая войскамі і бежанцамі, пагналі па Магілёўскай шашы. Два дзённыя пераходы да Чэрвеня. Аддзялілі палітычных ад крымінальных. Пару чалавек, напрыклад, Сямён Кандыбовіч, перапаўзьлі ўночы да крымінальнікаў, памяняліся вопраткамі. На досьвітку крымінальнікаў, "сацыяльна блізкі элемэнт", які, дарэчы, будзе падрываць акупацыйны рэжым, адпусьцілі, палітычных расстралялі. І прыйшоў сюды ў Менск Сямён Кандыбовіч (які да арышту быў кіраўніком справаў Саўнаркаму), і стаў сябрам Рады даверу пры генэральным камісары, пасьля БЦР. З–пад расстрэлу выратаваліся таксама К.Гержыдовіч (гл. "Народную газету" ад 9—11 ліпеня 1994 г.) і да 30 важных літоўскіх дзеячоў (гл. "Новый взгляд на историю Литвы", Каунас, 1991, С.166).

Іншага з чэрвеньскіх уцекачоў, ня памятаю ўжо імя, немцы пасьля расстралялі за спэкуляцыю: ён выменьваў сыр–масла на жыдоўскае золата. Жыдоўскае ж золата лічылася ўласнасьцю Райху. І золата палонных таксама. У палоннага пры паступленьні ў лягер бралі падпіску ў тым, што ён ня згубіць свае залатыя зубы. Калі ж згубіш маёмасьць Райху — табе

капут… Калі захаваеш — таксама, але пазьней.
…Кажуць, кіраваў чэрвеньскім расстрэлам Васілеўскі, якога пасьля закінулі ў Крупскі раён партызанку арганізоўваць. Немцы яго там схапілі й расстралялі.
…Першае ўражаньне ад немцаў было такое: цябе за нішто не арыштуюць. Адзінае, калі шмат людзей гінула — гэта ў помсту за забітых немцаў. Меўся загад: 50 мужчынаў расстраляць за пашкоджаную лінію сувязі, 100 — за забітага салдата. Але ў рэальнасьці звычайна гэтых прапорцыяў не выконвалі, 10 за аднаго заб'юць, і ўсё. Яно, вядома, вайна давала падставы і для квітаньня асабістых рахункаў: калі суседу хацелі адпомсьціць, падыйдуць, перарэжуць ля суседзкай хаты дрот. За вайну памятаю ў Менску дзьве аблавы: адну, калі забілі нямецкага камісара Кубэ. Другую ж пасьля такога выпадку: шмат сялян прыязджала з Заходняй Беларусі: гандлявалі салам, харчамі ў абмен на прамысловыя тавары. І нейкі хлопец за нешта пальнуў у аднаго немца. Тры суседнія дамы разам зь людзьмі, якія былі каля месца забойства за Суражскім рынкам, былі спаленыя.
…Ноччу можна было быць упэўненым: ноччу ніхто да цябе ня прыйдзе арыштоўваць. Таксама, перш чым прыняць меры, разьбіраліся. У мяне стрыечная цётка Марыя Саўчанка была партызанскай сувязной. Злавілі, дапыталі–дапыталі, адправілі ў Нямеччыну. Пасьля вайны яе ўжо назад, у Менск, не прапісвалі. Яна мусіла жыць недзе ў Барысаве, а лічылася, што яна загінула ў 1945–м. Так прасьцей.
…Памятаю партрэт "Гітлера–асвабадзітеля". Стаіць Гітлер за крэслам, на плечы накінуты шынэль, шапка на ім. І надпісы па–расейску й па–беларуску, але па–беларуску чамусьці "Гітлер–асвабадзітель", нават ня "ц", а "т". Глядзіць з партрэта так сувора. Эге, думалі людзі, такі вызваліцель запраста сустрэне вечарком і зарэжа… І сапраўды забілі ў Менску да 100 000 габрэяў. Групэнфюрэр Бах–Зелеўскі паведаміў у Нюрэнбэргу: калі Гімлера прывезьлі ў Менск паказаць, як "канчаткова вырашаецца жыдоўскае пытаньне", выставілі 100 габрэяў і пры ім расстралялі, ён самлеў проста перад афіцэрамі. Як паперкі пісаць — мільён туды, мільён сюды. А як пабачыў расстрэл, яму кепска стала… Далікатная натура.
…Супрацоўнікі НКВД перад вайной жылі ў цэнтры, у чужых кватэрах, сярод мэблі, сканфіскаванай у забітых імі, у чужым

розумам сабраных бібліятэках. І лепшыя школы былі для іх, у тым ліку й музычныя. Мая траюрадная сястра Вілена Саўчанка ўладкавалася ў прэстыжную балетную школу, дзе амаль усе дзеці былі дзецьмі энкавэдыстаў. У час вайны школьная трупа танцавала ў Купалаўскім тэатры. Калі пачалося вызваленьне, усе яны, 35 чалавек, выехалі ў Нямеччыну, выступалі там у лягерах беларускіх работнікаў. Пасьля аднойчы выступалі яны ў нямецкім вайсковым лягеры ў Аўстрыі, начавалі на гарышчы. Прачнуліся — у лягеры ніводнага немца. Знайшлі бінокль, бачаць, едуць танкі з зоркамі. Ой, нашы, нашы!.. Аказалася, ня нашы, а амэрыканцы. Выступілі перад амэрыканцамі — дзяўчынкі харошыя, балерынкі — і сталі езьдзіць з гэтай дывізіяй. Прыйшоў час вызначацца. Ну, знаеце, кажуць амэрыканцы, рускіх мы мусім выдаваць, але як вы запішацеся... Яны запісаліся палячкамі, тымі, сімі... Вярнуліся 2—3 дзяўчыны, астатнія выехалі ў Амэрыку. Мая сястра выйшла ў Амэрыцы замуж за менскага міравога судзьдзю. Калі б ён цяпер вярнуўся ў Беларусь, яго б спыталі: судзіў? Судзіў. Кажаш, крымінальнікаў? Маніш... Партызанаў. Крымінальныя злачынствы цяжка адрозьніць ад палітычных...

...А вось гісторыя доктара М.Уладысіка. Добры доктар быў, дацэнт. Спэцыялізаваўся ў лячэньні нырак. Жонка ў яго была габрэйкаю, дачка прафэсара Чарнага. Дык спачатку зь яго ўзялі расьпіску, што ён больш ня будзе ад яе мець дзяцей. Даў расьпіску. Пасьля кажуць: не, гэтага мала. Узялі, жонку стэрылізавалі. Яшчэ праз пэўны час узялі жонку ў гета, а сын, маўляў, няхай будзе з вамі. Празь некаторы час узялі й сына. А пачалося вызваленьне, і ён выехаў за немцамі да Варшавы, баяўся, што яго тут рэпрэсуюць за тое, што ён немцаў лячыў. А ў Варшаве якраз паўстаньне пачалося. І там лячыў. Пасьля вайны вярнуўся ў Менск дажываць доктар М.Уладысік. Жыў сьціпла, непрыкметна. І толькі ў 70–я гады на школе каля Чэрвенскага рынку прымацавалі памятную дошку зь яго прозьвішчам, бо дапамагаў партызанам... Стары мянчук. Мяне малога ў час вайны лячыў ад піеланэфрыту. Доля...

...Зусім унікальны выпадак адбыўся ў вёсцы Слабада Хойніцкага раёну. Стары дзед зварыў кашы, зварыў баршчу і панёс у кастрычніку ў лес. А ў лесе — нямецкі патруль. Ну, ясна, каму нясеш, хто ў лесе. Пачаў камандзір дапытваць, блытаецца ў рускіх словах — дзед ня вельмі й адпіраецца,

кажа, а вы па–нямецку дапытвайце, бо бачыць, што немец па–нашаму мала разумее. Скуль жа ты ведаеш нямецкую? А ў першую сусьветную я палонным на ферме працаваў. Дзе? У Прусіі. А хто там быў на ферме? Была фраў Марта і фраў Інге. А што яшчэ было? Было тое і тое. А хлопчык быў? Быў. Дык гэта быў я той хлопчык, — кажа немец. Так выратаваўся стары партызан. Я запісаў гэта, калі быў там у экспэдыцыі ў 1958 годзе, але, на жаль, не занатаваў імя і прозьвішча дзеда. А цяпер і яго няма, і вёска зьнікла... Незваротныя страты. І нічога ня зробіш. Такое ўжо нам наканавана жыцьцё.

*19.08.98 Менск*
*Падрыхтаваў Севярын Квяткоўскі*
*Пры падрыхтоўцы былі выкарыстаныя матэрыялы сэмінару Заходнепалескага навуковага таварыства “Загародзьдзе”*

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]
Вайна ў ARCHE 2(3)-1999 · [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 9-05-2000**

[image]

[image] .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

да Зьместу 2(3)-1999

***мастацтва***

# Сяргей Харэўскі
# Мастацтва пра вайну

**Сяргей Харэўскі — віленскі мастацтвазнаўца, аўтар кнігі “100 твораў мастацтва XX стагодзьдзя” (“Наша Ніва”, 1998—99), што падводзіць вынік стагодзьдзя беларускага выяўленчага мастацтва ад Фэрдынанда Рушчыца й Марка Шагала да Лёніка Тарасэвіча. Адзін з творцаў новай “Нашай Нівы” (з 1991 году), яе нязьменны мастацкі рэдактар. Літаратурныя і крытычныя творы Сяргея Харэўскага таксама друкаваліся пад псэўданімамі Антон Сіюль і Гары Куманецкі.**

**З** пачаткам другое сусьветнае вайны лёс беларускіх мастакоў склаўся па–рознаму: хто эвакуяваўся на Ўсход, хто пайшоў на фронт альбо ў партызаны, але многія нікуды ня краталіся. У часе нямецкае акупацыі ў Беларусі па–ранейшаму працавалі Ціхановіч, Даўгяла, Дучыц, Шыбнёў, Зьвінагродзкі, Волкаў ды іншыя. Многія і пры гэтай уладзе заставаліся ў фаворы. Волкаў, напрыклад, у гэты час пісаў партрэты адміністрацыі, між іншых і партрэт камісара Менску Янэцке й ягонай жонкі. Немцам таксама лесьціў акадэмічны жывапіс старое школы.
Адразу па 1945 годзе большасьць мастакоў разгубілася перад ваеннай тэмаю. У 40–я гады не было створана нічога вартаснага ў гэтай тэматыцы. Мастакі альбо кідаліся ва неўласьцівыя сабе жанры (напрыклад, як Бялыніцкі–Біруля, напісаўшы жанравае палатно пра нямецкія рабункі ў Ноўгарадзе. Карціна атрымалася аматарскай па жывапісе й

карыкатурнаю па характарыстыцы пэрсанажаў), альбо як Ахрэмчык пісалі алеем карціны–плякаты. Надта непасрэднае набліжэньне да ваенных падзеяў, складаная кан'юнктура, якая з аднаго боку патрабавала трыюмфатарскіх штампаў, а з другога дэманстрацыі максымальнае нянавісьці да нядаўніх акупантаў. Ані жыдоўскі генацыд, ані будзённае жыцьцё пад акупацыяй, ані сапраўдныя пакуты ў акопах і канцлягерах не знайшлі свайго асэнсаваньня. Заўважу, яны не асэнсаваныя ў беларускім мастацтве да сёньня, і, бадай, да гэтага ніхто больш ня будзе вяртацца.

Сапраўдным шэдэўрам у той яшчэ не астылы ад агню час стала палатно Волкава „Менск, 3 ліпеня 1944 году", якое адным крокам увайшло ў савецкую клясыку й засталося непераўзыйдзеным у сваім жанры ў мастацтве беларускім... Цяжка сказаць дакладна, калі Волкаў пачаў пісаць сваё эпічнае палатно пра ўваход танкаў у Менск, адно пэўна — да 1944 году. Дзясяткі людзей, якія паслужылі Волкаву мадэлямі, пацьвярджалі гэта. Напрыклад, дзяўчынка з кветкамі, у левым куце, пазьней сама стала мастачкаю і выкладала ў мастацкай вучэльні. Яна, спадарыня Глазава, распавядала і сваім вучням, што першапачаткова жаўнеры былі ў іншай форме, у нямецкай, горад ня быў такі зруйнаваны, а ў яе была сукеначка не карычневая школьная, а лілёвая аксамітная. Ну і тое, што піянэрскага гальштуку не было — то пэўна...

Мастак, якога не зачапілі бальшавікі ў рэвалюцыю, які не "прапаў" у 30–я гады, пражыў і акупацыю. Засталося таямніцаю, як палатно "Менск, 3 ліпеня...", нягледзячы на тое, што любы франтавік адзначаў, што "матацыкл–то нямецкі", — ня толькі ня выклікала пытаньняў "органаў", а наадварот, было сустрэтае з прыхільнасьцю і вывешанае ў Доме ўраду.

"Менск..." Волкава маштабамі й часам, за які было створанае палатно, можна параўнаць хіба што са "Зьяўленьнем Хрыста народу" расейскага мастака Іванава, які пісаў яго 25 гадоў. Карціна Волкава — больш за пяць мэтраў у даўжыню, фігуры людзей на першым пляне — амаль у натуральную велічыню. Дзеля стварэньня гэтае працы мастак зрабіў сотні малюнкаў, накідаў, эскізаў, якія складаюць сёньня велізарную калекцыю. Натуральна, тыя, што зробленыя пасьля 1944–га...

Задума Волкава вяртае нас у эпоху барока, у даўно забыты сьвет, дзе мастацтва "агортвала" гледача, стварала ілюзію

саўдзелу зь дзеяньнем у палатне. Дзеля дасягненьня такое задачы мастак ужыў ня толькі цыкляпічны, “натуральны” маштаб, але й барочную кампазыцыйную схему — клясычны трохкутнік. “Кулісныя” трохкутнікі па краях, якія нібыта ўцягваюць гледача ў дзеяньне, і цэнтар — танк з галоўным героем–танкістам, які, нібы сьвяты, лунае па–над людзкім вірам. Толькі замест крыжа ў руцэ аўтамат...

Аднак, рэлігійнае мастацтва прадугледжвае ўмоўнасьць, бязважкасьць мэтафізычнае прасторы, у якой можна кампанаваць бясконцую колькасьць пэрсанажаў, не зважаючы на патрэбу выяўляць пыл. Запыленыя пэрсанажы Волкава мусілі быць сапраўднымі. Прынцыповую немагчымасьць такой задачы мастакі зразумелі яшчэ ў мінулым стагодзьдзі. Але Волкаў і быў чалавекам зь мінулага, які, прагнучы абесьсмяроціць таталітарны рэалізм, забіў яго... Пасьля ягонае калясальнае працы ў рэчышчы гэтага стылю не было ўжо чаго сказаць. Шматкроць перапісаныя героі карціны, нібы манэкены, застылі ў няпэўным руху. А цікаўныя школьнікі, разглядаючы гэтую карцінку, не маглі даць веры, як гэта ў Менску па вайне застаўся прыгожы касьцёл са званіцаю…
Адразу па вайне шырака ўзяліся эксплюатаваць наноў партызанскую тэму. Насуперак сёньняшнім стэрэатыпам, вобраз Беларусі як партызанскага краю быў створаны ...перад вайною, калі 20 ліпеня, Дзень вызваленьня Менску ад белапалякаў, было ў нас нацыянальным сьвятам нароўні зь першамаем і акцябарскай. Змаганьне беларусаў з расейскімі белагвардзейцамі, немцамі й палякамі стала для мастакоў арганічнай тэмаю, якая ўважалася ці не за самую нацыянальную. Яшчэ на 3–яй Усебеларускай выставе 1929 году было прадстаўлена звыш 20–ці твораў з назовам “Партызаны”... Сярод іх ужо былі свае шэдэўры, якія сфармавалі амаль кананічную іканаграфію беларускай партызанкі — людзі ў сялянскіх уборах, падперазаныя кулямётнымі лентамі, зброя ў руках, за поясам — сякера. Нават краявід падкрэсьліваў нацыянальную спэцыфіку — лес узімку, радзей увосень, але ні промня летняга сонца. І вось што цікава — вобразы партызанаў павінны былі быць не канкрэтныя, а як бы зьлепленыя ў суцэльны вобраз беларуса наагул. Гэткай клясыкай сталі “Партызаны” Гаўрылы Віера, “Партызаны” Міхаіла Эндэ,

“Партызаны” Валянціна Волкава. Вобраз беларуса–партызана, які супрацьстаіць чужынцам, быў спробаю засьведчыць суб’ектнасьць Беларусі ў падзеях ХХ стагодзьдзя.
Шмат паспрыяла фармаваньню партызанаманіі коласаўская аповесьць “Дрыгва”, герой якой, дзед Талаш, успрымаўся як узор нацыянальнага мэнталітэту. Над ілюстрацыямі да “Дрыгвы” перад вайною працавала шмат беларускіх мастакоў — Мінін, Волкаў, Ціхановіч... Ці не найлепшымі зь іх сталі чатыры дрэварыты Ібрагіма Гембіцкага: “Засада”, “Партызаны”, “Гарыць маёнтак” і “Нашэсьце”... У 1938 годзе гэтую сэрыю набыў Музэй імя Пушкіна ў Маскве. У тыя гады гэта сьведчыла пра выключную ўвагу. Акрылены посьпехам, Гембіцкі працягнуў “партызанскую” лінію ў 1939 годзе, прысьвяціўшы яе змаганьню беларусаў з Польскай дзяржаваю. Адзін з дрэварытаў тых гадоў — “Партызаны рэжуць правады” — успрымаецца сёньня як сапраўдны сымбаль беларускага супраціву па–за часам і па–за палітычнай канкрэтыкай... Аднак на гэтым слава Ібрагіма Гембіцкага перарвалася. Яго абвінавацілі ў нацдэмаўшчыне. Як і Мініна, і Ціхановіча...
Папулярнасьць тэмы партызанкі нарастала перад вайною з году ў год. На Ўсебеларускай выставе 1940 году партызаншчына ўжо трыюмфавала — як–ніяк, а польскую кампанію выйгралі. Тут табе і Генрых Бржазоўскі з “Раззбраеньнем насельніцтвам белапольскага атраду” і Монас Манасзон са сваім “Зьнянацку”. “Партызанскія” фантазіі заходзілі часам вельмі далёка. Напрыклад — скульптура “Арджанікідзэ ў разьведцы ў лесе пад Барысавам” Аляксея Глебава. Праўда, да Беларусі гэты шал ужо меў мала дачыненьня... Хаця... Выхаваўчая работа з гледачом, а менавіта гэтак і варта разглядаць мастацтва канца трыццатых, у даступных і наглядных формах была праведзеная.
Таму па вайне зварот да партызаншчыны быў амаль аўтаматычны. Яе сьвятасьць і спрадвечна беларускі характар былі ўжо па–за дыскусіяй. Праўда, у канцы саракавых — пачатку пяцідзясятых канон пачаў быў распадацца, рассмоктвацца натуралістычным бытавізмам. Той жа Ціхановіч, той жа Бржазоўскі, Манасзон і дзясятак маладзейшых мастакоў выяўлялі стаячых, паўзучых, ідучых постацяў, сьпісаных з канкрэтных асобаў. Тут пачаліся гіерархіі: гэты вядомы, гэты цяпер пры пасадзе, у гэтага адабралі мэдаль, гэты...
Абстрактныя масоўкі людзей са зброяю ў лесе ўсё болей і

болей нагадвалі пастановачныя здымкі манэкенаў, расстаўленых адпаведна ў тым парадку, які гэтыя манэкены занялі ў паваенным жыцьці...

Напрыканцы 60–х адбыўся апошні ўсплёск, як апошні ўздых партызанскае тэмы. Яго падрыхтавалі тыя, хто стаў мастаком ужо без вайны. Ідэалягічна гэтыя часы ўжо былі бязьмерна далёкімі і ад 30–х, і ад 50–х гадоў. Сама тэма вайны ўжо займала непараўнальна меншае месца. Мастакі змаглі сабе дазволіць абагульненьні. Ізноў перадусім яны паспрабавалі намацаць прыроду нацыянальных рысаў, прынамсі, да тае ступені, да якой яны самі адчувалі сябе нацыянальнымі мастакамі...

“Партызанская мадона” Савіцкага, купленая маскоўскай Трацьцякоўкаю, і “Беларусь — маці партызанская” Данцыга (абедзьве напісаныя ў 1967 годзе) фактычна паставілі кропку (не двукроп’е) на ўсёй тэме. У гэтых двух палотнах няма ні штучнага патасу штучна насупленых людзей, ні самога дзеяньня вайны. Ёсьць адчуваньне драмы, а не гульня ў яе. Калі я параўнаў гэтыя два палатны з тым, што стваралася ў Беларусі перад вайною, я быў моцна зьдзіўлены тым, наколькі яны перагукаюцца нават у дэталях. Але зьмест ужо цалкам іншы. Ні азарту бунту, ні помсьлівае нянавісьці... Адно толькі горыч стратаў і ...любоў. З вышыні свайго пакаленьня абодва мастакі сьцьвярджаюць ужо тое, што адбылося: загояцца раны... Тым самым запярэчыўшы ўсёй сыстэме папярэдніх савецкіх стэрэатыпаў: беларус у любым узросьце і ўва ўсе часы — лясны мсьцівец, гатовы на любыя ахвяры. Савіцкаму гэтага здалося мала, відаць, сьвярбела паставіць самую тлустую кропку, сваю кропку на “ваеннай” тэме. І ён стварыў адзіную ў сваім родзе сэрыю “Лічбы на сэрцы”, прысьвечаную вязьням і ахвярам канцэнтрацыйных лягероў. Стварэньне гэтай сэрыі заняло шмат гадоў, з 1974 па 1980... Застаецца толькі здагадвацца, якія думкі роіліся ў галаве мастака, які з гэткай любоўю й цярплівасьцю выпісваў сіневу мерцьвякоў, запалыя вачніцы й агонь крэматорыяў. Карціны гэтае сэрыі ўпрыгожылі залі Музэю айчыннай вайны да Алімпіяды–80... Замежныя госьці дзівіліся й, часьцяком, іранічна ўсьміхаліся. Надта ж наіўным падавалася ім адкрытае цытаваньне Сальвадора Далі, зусім невядомага савецкім гледачам... А вось тут крышку з Эль Грэка, а вось тут нешта з мэксыканцаў... Гэтая сэрыя прадвызначыла

месца Савіцкага ў гісторыі мастацтва, адкінуўшы цень і на папярэднюю, і на далейшую творчасьць жывапісца. “Нэкрафіл–кампілятар”, казалі ворагі.

Рэнэсанс “ваеннае” тэмы прыпадае на 70–80–я гады, калі да розных датаў праводзіліся калясальныя рэпрэзэнтатыўныя выставы. У тыя гады стагнацыі мастакі сыходзілі ў сьвет вайны ад сьвету ўласных будняў, у якіх усё болей было сапраўднага, нявымысьленага сюррэалізму... А на “вайне” можна было і пагуляцца, і патрафіць сацзаказу. Сотні карцінаў Зайцава, Ціханава, Белановіча, Грамыкі, Куфко, Аракчэева, Масьленікава ды іншых (пералік можа заняць не адну старонку) увабралі ў сябе і краявід, і жанр, і нацюрморт з партрэтамі ў аблямоўцы “вайны”. Што праўда, сярод іх патрапляўся і добры жывапіс у нядобрым сьвятле...
... Не пасьпеў астыць попел на менскім друзе, а на цнатлівых аркушах ватману, у цішы майстэрняў, нараджаўся новы Менск. Зруйнаваная сталіца па вайне набывала цалкам новыя рысы, новы колер, новы маштаб. Можа таму Менск да сёньня выглядае па–акварэльнаму празрыста, як і ў архітэктурных праектах, дзе сухія красьлюнкі адухоўленыя пяшчотнымі адмыўкамі й лесіроўкамі. Паўматэрыяльная прастора красьлюнкаў увасобілася ў паўматэрыяльнай прасторы Менску... Сталіца вымагала Манумэнту, які ўвабраў бы ў сябе ўсе дасягненьні беларускае скульптуры і архітэктуры. Аўтарам першага праекту Плошчы Перамогі быў Столер. Аднак праект рэалізаваўся напалову, паваенны трыюмфатарскі патас патрабаваў большых маштабаў. Два паўкруглыя дамы былі скончаныя ў 1947 годзе (моста яшчэ не было!), і з таго часу і па сёньняшні дзень плошча завецца ў народзе Круглай. Але тут і была закладзеная горадабудаўнічая хіба... У 30–я гады за гэтай плошчаю цягнуліся драўляныя хаціны, могілкі, а далей — Камароўскае балота. Таму грандыёзны пляц падцягнулі бліжэй да цэнтру, у выніку чаго ён апынуўся ў лагчыне. Атрымліваецца, у палёту фантазіі ўтапістаў 30–х усё ж былі свае межы. Каб пляц быў разьбіты за якіх 500 мэтраў далей угару, то сёньняшні манумэнт Перамогі мы б бачылі зь любое кропкі Менску...
... Пасьля 1947 году пачалося будаўніцтва новага ансамблю. Паводле праекту Аранаўскасаў і Баршча абапал плошчы былі

ўзьведзеныя сымэтрычныя групы па тры дамы ў кожнай. Ад праспэкту іх аддзялілі зялёныя палосы, якія пераходзяць у зеляніну менскіх набярэжных паркаў. Увесь гэты комплекс стаў ці ня самым гуманістычным ансамблем Менску. У гэтым засталася нейкая таямніца.

...Колішні генэральны консул колішняе ГДР у Менску часам распавядаў, што ён ня любіць бываць на гэтай плошчы, хоць тая зусім блізка ад кансуляту. “Я працаваў на яе будоўлі, і для мяне найлепшы ўспамін”, — казаў ён. Сапраўды, плошчу Перамогі (ці Круглую) спачатку будавалі палонныя немцы пад рулямі савецкіх карабінаў. Савецкаму рэжыму паваенны трыюмф надаўся для ўмацаваньня ўласнай міталёгіі. Ужо мала хто сёньня згадвае, што ў сьцены будынкаў на плошчы былі ўмураваныя кавалкі друзу з гарадоў–герояў СССР. Хоць якіх гадоў дваццаць таму любы падлетак мог паказаць “дом героя Савецкага Саюзу Паўлава”, у якім замураваная цагліна са Сталінграду. Хто такі Паўлаў? Дзе той Сталінград? Стаяць папросту імпазантныя дамкі зь вежкамі–бэльвэдэрчыкамі, балясінкамі, шыкоўнымі портыкамі, кахлянымі аканічкамі, маскарончыкамі. Чалавечная, зразумелая архітэктура. Вельмі чалавечная...

Апошняй кропкаю ў сфармаваным ансамблі стаў Манумэнт Перамогі. Яго будаўніцтва доўжылася з 1954 па 1955 год. Рэкордныя нават па тых часах тэрміны! Аўтарамі праекту сталі Георгі Заборскі і Ўладзімер Кароль. Ізноў жа па тых часах цікавая акалічнасьць: абодва архітэктары — беларусы, Заборскі родам зь Менску, а Кароль з Чэрвеня.

Сам манумэнт — клясычны гранёны абэліск з шэрага граніту на вялікім ступенчатым стылябаце. Абэліск увянчала грувасткая выява савецкага ордэну Перамогі. У той жа час не забылі і пра нацыянальны калярыт (дарэчы, адпаведна традыцыі ўсёй той эпохі) — па стэле разьмешчаныя рэльефныя паскі зь беларускім арнамэнтам. Стэла стала галоўнаю дамінантаю ня толькі плошчы Перамогі, але і зьвязала кампазыцыйна ўвесь праспэкт Сталіна (сёньня Скарыны).

Над мастацкай пластыкаю Манумэнту працавалі ўсе найбуйнейшыя скульптары Беларусі. Насуперак уяўленьням, гарэльефы атрымаліся рознымі, як розны быў талент гэтых творцаў, розны тэмпэрамэнт і розныя школы. Цэнтральную

кампазыцыю “9 траўня 1945 году” выканаў Бэмбель. Яна ўяўляе сабою алегорыю трыюмфу перамогі савецкіх войскаў і беларускіх савецкіх партызанаў. Адну дэталь зь цягам часу падправілі: з бронзавага сьцягу, які лунае над людзьмі–героямі, зьнік з часам профіль Сталіна, а Ленін атрымаў вуха. Паводле дзіўнага зьбегу абставінаў у 5 томе “Гісторыі беларускага мастацтва” за 1992 год зьмешчаны здымак гэтага гарэльефу ўсё з тым жа Сталіным, якога няма ў рэальнасьці ўжо тры дзясяткі гадоў. Нягледзячы на самае пачэснае месца і простую, у параўнаньні зь іншымі скульптурамі, задачу, гэты гарэльеф — самы нягеглы з усіх. Кампазыцыя зрабілася разбэрсанай. Штучны патас фігураў на другім пляне недарэчна кантрастуе са статычнымі фігурамі на першым.

Кампазыцыя Селіханава “Савецкая Армія ў гады Вялікай Айчыннай вайны”, зьлепленая імпэтна, сакавіта, амаль імпрэсіяністычна, спускаючыся ад алегорыі да рэалізму, прадстаўляе матыў бою. Гэты гарэльеф, як і паралельны яму гарэльеф “Партызаны” Глебава, які адлюстроўвае эпізод рэйкавай вайны, скіраваны ў бок галоўнага рэльефу. Азгур выканаў тыльную кампазыцыю, ці не найбольш адпаведную прызначэньню Манумэнту — “Слава палеглым героям”. Пры абсалютнай ляпідарнасьці й статычнасьці гэты гарэльеф апынуўся самым цэласным паводле кампазыцыі і ўнутранага эмацыйнага строю.

Складаныя й шматслоўныя рэльефы былі аблямаваныя дэкаратыўнымі элемэнтамі. Па гранітных тумбах з чатырох кутоў разьмешчаныя бронзавыя вянкі з пальмавых галінаў і кветак, ля падэшвы стэлы ўскладзены меч, спавіты галінкаю ляўра. Гэтае ўбраньне было відавочна залішняе.

Нічога больш магутнага ў “ваеннай” тэме не было створана. У тым ліку і тымі скульптарамі, якія прынялі ўдзел у стварэньні Манумэнту. За выключэньнем хіба Селіханава, чый лепшы твор усё ж — “Хатынь”, зроблены ў 1969 годзе. “Хатынь” у адначасьсе стала сусьветна вядомай часткай савецкае клясыкі. Аднак гэты комплекс усё ж стаіць у шэрагу падобных мэмарыялаў у Пірчупісе, Саласьпілсе, Бухенвальдзе, Асьвенцыме ды іншых. А вось супольны праект на менскай Плошчы Перамогі цяжка параўнаць з чым іншым у нашым стагодзьдзі...

У 1961 годзе пад стэлаю запалілі “вечны” агонь, які гарыць з

папераменным посьпехам і да сёньня. Але пад манумэнтам ужо няма зямлі... У 1984 годзе, пры будаўніцтве мэтрапалітэну тут прайшла траса мэтро, а вакол самой стэлы створаная падземная галерэя. Насуперак чаканьням, людзей перад гэтай рэліквіяй стала меней. Галерэя стала звычайным пераходам, дзе гандлююць бабкі й сьпяваюць студэнты...

---

[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima
[image]



---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
[image]
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 17-01-2000**

[image]
[image] .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima



да Зьместу 2(3)-1999

***вожык***

# Андрэй Хадановіч
# Песня белорусских партизан

**Андрэй Хадановіч — паэт і перакладчык паэзіі (у 1998 годзе выйшлі ягоныя пераклады Бадлера, Ейтса, Галчыньскага). У ARCHE–2 выйшла ягонае «Пасланьне да беларускага пошт–мадэрніста». Паэтычнае адкрыцьцё 1998 году.**

**Песня белорусских партизан**
**О**й, Тарзаны, лесные Тарзаны!
Хай жыве обезьяна Кинг–Конг!
Уходили в поход партизаны,
уходили в далекий Гонконг!
Далеко им идти до Гонконга...
В тех краях, где растет баобаб,
по весне разливается Конго,
затопляет беременных баб.
В дельте Нила советские танки —
тель–авивский агрессор не рад:
там смуглянки, сиречь молдаванки,
собирают в садах виноград!
Виноград наливается кровью,
краше губ Катерины Денев
эти губы пошлют в Приднестровье,
и завидует пусть Кишинев!
Вот идут по просторам Китая,
что лежит под японской пятой.

Там пшеница цветет золотая,
даже рис в тех краях золотой!
Не сдаются народные массы
и уходят сражаться в Тибет…
Белорусские летчики–асы
до сих пор не терпели побед!
Партизаны садятся в каноэ
и плывут по широким волнам.
Ни души на проспектах Ханоя,
спит спокойно родимый Вьетнам.
Не страшна им подводная мина,
не боятся наземных собак:
неприметной тропой Хошимина
их ведёт полководец Ковпак.
Кампучия моя, Кампучия,
и Пол Пот над тобой не судья!
Спой мне песню про Санту–Лючию,
дарагая сяброўка мая!
Ой, Непалы мои, Разнепалы,
и сюда дух свободы проник!
Улеглись партизаны на шпалы,
подорвали варожы цягнік!
Прокричали “ура” троекратно
на краю евразийской земли,
а потом повернули обратно,
в Беловежскую пущу ушли.
А потом повернули обратно, —
трепещите теперь, москали!

**Лили Марлен**

**И**х бин единственный сын
штандартенфюрера Шмидта.
Когда сгорели шасси,
вас не спасет “Мишелен”...
Мои дела — керосин:
горит крыло “мессершмита”.
Майн Гот, от смерти спаси!
Прощайте, Лиля Марлен!
Четверка Кожедуба,

А снизу канонада…
Я дам сегодня дуба —
так надо!
Носил три года шинель,
страдал у Вермахта в лапах…
Твоя подружка Нинель
уже пошла на панель…
Твои духи от Шанель,
о, их волнующий запах!..
Но есть у русских шрапнель,
и я помру слишком шнель!
Допью остатки “Херши”,
спою “Грена… Гренада…”,
пускай приходят СМЕРШи,
так надо!
Мой респиратор уже
сгорел — дышу через марлю…
Вот взрыв — и я уже тлен,
лечу как те журавли,
качусь яйцом Фаберже
к тебе, любимая Мрлен,
к тебе, родная Марлн,
к тебе, родная Лили!..
Я дал сегодня дуба,
но есть на свете НАТО:
держись, Вьетнам и Куба, —
так надо!

**Новейшие приключения неуловимых**

*Природа–мать,*
*когда б таких людей…*
Н.А.Некрасов

**В** саду ли в огороде
три танка на природе,
а может — на Плющихе,
стоят, как три сосны.
А восемь с половиной
пытливых инвалидов

любуются преданьем
глубокой старины.
Девятый с половиной —
законною супругой —
контуженный по жизни,
но вовсе не дебил…
Как бишь его по отчеству?
Запамятовал имя.
Фамилии не помню.
И рожу позабыл.
Вернемся к инвалидам.
В интернациональном
они составе: чукча,
Чапаев и поляк.
Четвертый неизвестен,
по всем приметам — болен,
но очень энергично
бежит на костылях.
Восьмой был командиром,
провел разведку боем.
Решили ополчиться.
Построили редут.
Устроили засаду.
Орудья зарядили.
На компасе уж полночь,
а немцы не идут…
Биноклей не сомкнули.
Не отдались Морфею:
дабы отстал насильник,
хлебнули “Нескафе”.
И встретили французов
по первому разряду:
условный неприятель
наделал в галифе…
Их наградят пожизненно
и в Самой Красной Книге
напишут их фамилии
и чем они больны,
чтоб каждый октябренок
пример брал с инвалидов,

любил свою отчизну
и не хотел войны!

**Песня тинэйджера–героя**

*Светлой памяти всех товарищей по борьбе*

Тинэйджер, тинэйджер, взлети выше тучи
и спой про озоновый слой.
Тебя не любили ни фюрер, ни дуче,
пилили двуручной пилой.
Познал душегубку, познал крематорий,
Освенцим, Майданек, Хатынь.
На ядерный взрыв объявил мораторий
и “Мать” перевел на латынь.
Восставшим испанцам немало товара
привез контрабандой в Мадрид.
Друзья называли тебя Че Геварой,
сам Кастро о том говорит.
Спасал арестантов, припрятав стамеску
в свой старенький школьный пенал.
Ты знал Ким Ир Сена, ты знал Чаушеску,
лишь Рейгана с Бушем не знал.
Товарищу Цеткин ты пел серенаду,
а Гельмуту Колю едва ль.
Ты ездил сражаться в Гренаду–Гренаду,
свернув по пути в Ронсеваль.
По улицам Праги бродил, словно Голем,
в Париже смотрел Нотр–Дам,
в лесу Фонтенбло с генералом де Голлем
ночами пугал честных дам…
Взлети в поднебесье, отважный тинэйджер,
забудь про домашний уют.
Пусть Маргарет Тэтчер, а с нею и Мэйджер,
тихонько тебе подпоют.
Тебе за границей жилось очень скверно
в отелях “Бристоль” и “Савой”.
Да ну их! Пускай паруса “Крузенштерна”
шумят над твоей головой!
Тинэйджер, тебе не страшны перегрузки,
послушен штурвалу фрегат.

Грядущий маршрут намечаешь по–русски
и держишь свой путь наугад!
Найдешь наяву свой несбыточный сон ты,
а после вернешься домой.
Счастливое завтра таят горизонты,
былое — уже за кормой!

Оцени! 5 - отл. 4 - хор. 3 - уд. 2 - неуд. 1 - ...
br.gis.com.by

---

[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima
[image]

*Вайна ў ARCHE 2(3)-1999* . [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **14-10-1999**

[image]
Вайна ў 2(3)-1999 .
[image]
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 2(3)-1999

***прабел***

# Віктар Мухін
# Беларуская Опэра ў 1941–1944 гадах

Да вайны беларуская опэра разьвівалася як складнік савецкае опэры. У кірунку, дыктаваным Саюзам кампазытараў ды запатрабаваньнямі ваеннага часу, беларускія кампазытары й выканаўцы працягвалі працаваць і пасьля адступленьня чырвонага войска зь Беларусі ды эвакуацыі часткі Беларускага Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатру опэры й балету ў глыб Расеі. У той самы час пазасталыя ў акупаваным немцамі Менску беларускія музыкі стварылі шэдэўры нацыянальнага музычнага мастацтва, у тым ліку і опэры.

**Беларуская Опэра ў Расеі**

Наступ гітлераўскага войска быў нагэтулькі імклівы, што першымі здолелі ўцячы толькі савецкія кіраўнікі Рэспублікі, а гэтаксама іхныя сем'і. Для дзеячоў культуры й мастацтва, ужо ня кажучы пра шараговае жыхарства, акупацыя сталася гэткаю ж раптоўнаю, як і ўдар маланкі.

Вайна распачалася ў той час, калі акторы Беларускага Дзяржаўнага Вялікага тэатру опэры й балету былі ў адпачынку. Частку зь іх мабілізавалі ў савецкае войска, а рэшта апынулася ў франтавых канцэртных брыгадах, альбо часова далучылася да іншых творчых групаў. Але ўжо на пачатку 1942 году беларуская трупа зьбірае свой творчы калектыў у Горкаўскім опэрным тэатры імя А.Пушкіна. Перад ад'ездам з Масквы група беларускіх выканаўцаў на чале з Л.Александроўскай дала некалькі канцэртаў у вайсковых частках, шпіталях і канцэртнай

залі імя П.Чайкоўскага. Апроч эўрапейскае й расейскае клясыкі былі выкананыя найбольш папулярныя фрагмэнты зь беларускіх опэраў: арыі Конрада й Надзейкі з „Кветкі шчасьця“ А.Туранкова, арыя Кузьміча з опэры „У пушчах Палесься“ А.Багатырова, дуэт Міхася й Марысі зь першага акту опэры „Міхась Падгорны“ Я.Цікоцкага. Гэтаксама прагучалі й хоравыя фрагмэнты зь беларускіх опэраў у выкананьні хору Дзяржаўнага музычнага тэатру імя К.Станіслаўскага й У.Немірoвіча–Данчанкі. Гэтыя канцэрты артыстаў Беларускага опэрнага тэатру ў Маскве называлі „другою дэкадаю беларускага мастацтва“.

У Горкім трупа беларускіх артыстаў налічвала 50 салістаў, якія выконвалі асобныя партыі ў спэктаклях тэатру імя А.Пушкіна. На жаль, стварaць спэктаклі ўласнымі намаганьнямі калектыў Беларускае Опэры на той час яшчэ ня мог. Л.Александроўская прыгадвае: „Не было ні хору, ані балету, ані аркестру, ані дэкарацыяў, ані строяў“ (Александроўская Л. У дні Айчыннай вайны // Звязда. 1944. 30 сьнежня). Аднак на той час была зробленая першая спроба ўласных магчымасьцяў. З дапамогаю горкаўскага тэатру беларускія артысты паказалі свой першы вайсковы спэктакль — опэру П.Чайкоўскага „Яўген Анегін“, а пасьля шчэ „Сэвільскага цырульніка“, „Кармэн“, „Травіяту“, „Рыгалета“, „Русалку“ й „Князя Ігара“. Зь беларускага рэпэртуару ставілася інсцэнаваная сюіта беларускіх народных песьняў, урыўкі з опэраў А.Туранкова, Я.Цікоцкага ды інш. Ад 1 ліпеня да 15 чэрвеня 1942 году творчы калектыў тэатру вёў актыўную канцэртную чыннасьць праз выступы з тэматычнымі канцэртамі „Беларускае мастацтва“ ў Горкім ды ў шпіталях суседніх расейскіх гарадоў.

У чэрвені 1943 году ЦК КП(б)Б зьвярнуўся ў ЦК ВКП(б) з дакладною нотаю наконт аднаўленьня Беларускага тэатру опэры й балету як самастойнага творчага калектыву. Было сказана, што трэба адклікаць беларускіх артыстаў зь іншых тэатраў ды скамплектаваць тэатар патрэбнымі кадрамі, а гэтаксама разгледзець рэпэртуарны плян. Паводле загаду Камітэту па справах мастацтваў Савету народных камісараў БССР ад 21 кастрычніка 1943 году тэатар пераведзены з Горкага ў горад Каўроў ва Ўладзімерскай вобласьці, дзе пачаўся новы пэрыяд у гісторыі Беларускае Опэры. У тамтэйшым клюбе „Мэталіст“ была атрыманая сцэнічная

пляцоўка. Трупа паступова вяртала як ранейшыя выканальніцкія й опэрна–пастаноўніцкія кадры, гэтак набывала й новых артыстаў. Мастацкім кіраўніком тэатру й галоўным дырыжорам стаецца таленавіты опэрны пастаноўнік А. Брон. У Каўрове гледачу поруч зь „Яўгенам Анегіным“ і „Сэвільскім цырульнікам“ паказалі опэру „Чыо–Чыо–сан“ Дж. Пучыні, гэтаксама рабіліся выезды да працоўных калектываў, шпіталяў, а праз Агульнасаюзную радыёстанцыю на адкрытых канцэртах у Маскве беларускіх выканаўцаў чулі далёка па–за межамі месца выступу. Працягвалася праца над опэрай Я. Цікоцкага „Алеся“.

Вызваленьне Беларусі з–пад немцаў пацягнула вяртаньне артыстаў у Беларусь. Перад вызваленьнем сталіцы артыстамі былі дадзеныя 20 канцэртаў для жыхарства гораду, 60 выступаў у шпіталях і вайсковых частках, 3 — для змагароў Першага Беларускага фронту. Па вызваленьні Менску калектыў Беларускае Опэры вяртаецца ў горад. Аднак давялося пачынаць працу ў дужа цяжкіх умовах. Будынак тэатру на колішнім Траецкім пляцы быў разбураны авіяцыйнаю бомбай, скінутай на пачатку вайны, маёмасьць разрабаваная й зьнішчаная, таму тэатру давялося часова месьціцца ў ацалелым акруговым доме савецкага войска. Будынак той ня быў прыстасаваны да патрэбаў тэатру: аркестар змушана разьмяшчаўся ў глядзельнай залі, ня мелася тэатральнага рэквізыту, адпаведнае сцэнічнае тэхнікі, ня цалкам скамплектаваны быў і хор. Умовы для артыстаў былі невыносныя — рэпэтыцыйная заля грэлася „буржуйкаю“, што дужа дыміла, а ў перапынках, нягледзячы на моцныя маразы, даводзілася адчыняць вокны. Людзі хварэлі й мелася шмат траўмаў, кватэраў не ставала й артысты жылі проста ў тэатры. Увечары рэпэтыцыі адбываліся без электрычнасьці, і балетмайстар з капцілкай у руках, прысеўшы, поўзаў па падлозе залі за артыстамі, каб разгледзець, як яны выконваюць рухі (Музычны тэатр Беларусі: 1917—1959 гг. Мн., 1993. С. 305). Нягледзячы на тое, да 1944 году трупа ўлучала 500 чалавек, салісты засталіся ранейшыя, асноўныя ж ролі выконвалі сьпевакі Л.Александроўская, Л.Аляксеева, А.Арсенка, І.Балоцін, М.Дзянісаў, В.Лапін, Р.Млодак, І.Мурамцаў, дырыжорам быў М. Шнэйдэрман, рэжысэрам — У. Шахрай, хоравым майстрам — А.Бельскі. У трупу прыйшлі новыя выканаўцы С.Ганчароў, В.Левандо,

С.Маратаў, Ю.Матраеў, В.Пятрова, В.Фурс. У той жа час у віхуры вайны загінулі дырыжор Беларускае Опэры М.Балазоўскі, артысты В.Каліноўскі, С.Трахановіч, Р.Шапіра, П.Жэзмэр.

Опэра „Алеся“ Я.Цікоцкага, прэм'ера якое адбылася 24 сьнежня 1944 году, хоць і была створаная ў часе вайны, мае дачыненьне ўжо да новага пэрыяду — паваеннага часу. Гэтай опэры наканаванае было доўгае і шчаснае жыцьцё. Беларуская опэра ў часе вайны разьвівалася ў агульнай плыні савецкага опэрнага мастацтва, нацыянальнае аблічча зусім не выяўлялася, а калі й зьяўляліся нейкія ўзгадкі пра Беларусь, дык хіба толькі ў надзейных з гледзішча цэнзуры творах — „нацыянальных па форме, сацыялістычных па зьмесьце“. Вышэйзгаданы выступ беларускіх выканаўцаў у маскоўскай Канцэртнай залі імя П. Чайкоўскага газэта „Правда“ схарактарызавала гэтак: „Канцэрт *беларускага* (тут і далей вылучана мною — *В.М.*) мастацтва... стаўся цудоўнаю праяваю нязломнае, жыцьцёвае моцы *савецкага* народу... У цяжкую часіну вайны й выпрабаваньняў *савецкі* народ працягвае будаваць сваю культуру...“ (Правда. 1942. 19 траўня.)

**Беларуская Опэра ў Менску**

Найбольш цікавая для нас і дагэтуль слаба асьветленая на Бацькаўшчыне чыннасьць беларускіх музыкаў пад нямецкай акупацыяй у Генэральнай акрузе „Беларусь“, а найперш — Міколы Шчаглова–Куліковіча (1897—1969). Гэты пэрыяд слаба асьветлены ў гісторыі беларускага тэатру, а ўся літаратура выдадзеная на эміграцыі. Фундамэнтальная праца „Музычны тэатр Беларусі: 1917—1959“ (Мн., 1993) толькі згадвае імя гэтага выбітнага кампазытара ды спасылаецца на „адсутнасьць у Беларусі неабходных біяграфічных, архіўных зьвестак і асабліва музычнага матар'ялу“, што „не дае магчымасьці аўтарам зрабіць вычарпальны аналіз і арганічна ўвесьці творы М. Шчаглова–Куліковіча ў агульны працэс разьвіцьця беларускага мастацтва“.

Ніжэй пойдзе гаворка пра беларускае опэрнае мастацтва ў паднямецкай Беларусі, што грунтавалася на „нацыянальна–гістарычным сюжэце з шырокім скарыстаньнем фальклёрных крыніцаў... і ўяўляе адзін з тых кірункаў беларускага опэрнага

мастацтва, якому ня лёсіла асягнуць сталасьці на савецкай опэрнай сцэне“ (Музычны тэатр Беларусі: 1917—1959 гг. Мн., 1993. С. 246).

Беларускія дзеячы ўбачылі ў немцах вызвольнікаў ад польскага шавінізму й савецкага таталітарызму. Немцы паступова ўсьведамлялі неабходнасьць супрацоўніцтва зь мясцоваю інтэлігенцыяй, якая не адмаўлялася ад кожнага шанцу зрабіць нешта на карысьць роднага краю. Людзі спачатку ўспрынялі немцаў проста як *чарговых* акупантаў — пасьля савецкіх ды польскіх. Кожная магчымасьць працаваць дзеля Беларусі мусіла быць скарыстаная, нават калі трэ было ісьці на супрацоўніцтва з чужынцамі. Менавіта гэта трэба мець наўвеце, калі глядзім на падзеі таго часу. Ня быў выняткам у агульнай плыні адраджэньня нацыянальнае культуры пэрыяду другое сусьветнае вайны й беларускі тэатар, улучна з опэрай. Дапамагаюць уявіць ролю беларускага тэатру, і ў прыватнасьці опэрнага мастацтва, радкі з артыкулу „Творчыя праблемы беларускага тэатру“ ведамага музыказнаўцы Вячаслава Селяха з часапісу „Новы шлях“ (№ 1 (37), студзень 1944 году): *„Сярод наймагутнейшых сродкаў ажыцьцяўленьня тых вялізарных заданьняў, што паўстаюць сяньня ў галінах адбудовы нашае бацькаўшчыны, тэатар займае адно з адказных мейсцаў. Сутнасьць тэатральнага мастацтва тая, што яно зьяўляецца моцнай зброяй у заваёве думак і пачуцьцяў чалавека, у абуджэньні і арганізацыі ягоных імкненьняў, ягоных жаданьняў. Тэатар мабілізуе гэтыя думкі ў тым ці іншым кірунку, абуджае пэўныя эмоцыі і станоўка афармляе пэўны і непахісны сьветапагляд. Праз гэта ўсякі запраўдны тэатар, а гэта значыць і наш Беларускі тэатар зьяўляецца пэўным фактарам, які можа і павінен адыграць значную ролю ў вадбудове на руінах старога, нядаўна мінулага нашае бацькаўшчыны“*. Цікавы погляд аўтара на стан беларускага тэатру па прыходзе ў Менск немцаў і праз тры гады пасьля таго: *„Калі першы пасьля вызваленьня пэрыяд у працы Беларускага тэатру ў Менску быў пераважна арганізацыйны, калі зьбіраліся і згуртоўваліся патрэбныя сілы, калі тэатар ня меў тады яшчэ магчымасьці ставіць у сваёй творчасьці пэўныя праблемы, дык сяньня, у трэйці год існаваньня тэатру, гэтыя праблемы паўсталі перад тэатрам ува ўсю веліч і патрабуюць неадкладнай гарачай і станоўкай працы“*.

Галоўнаю справаю тагачаснага беларускага тэатру бачылася

асьвета: *„Нашае першае і галоўнае заданьне ў вадбудове нашае нацыянальнае культуры, — гэта ачысьціць наш побыт, нашае жыцьцё ад бальшавіцкае спадчыны і перш за ўсё ачысьціць псыхалёгію таго чалавека, які сфармаваўся пры бальшавізьме (…) Тэатар агітуе, тэатар захапляе, тэатар вабіць і абуджае пэўныя эмоцыі і пачуцьці. Тэатар павінен паказваць усю жудасьць і брыдоту савецкай рэчаіснасьці, зь якой некаторыя ў свой час зжыліся, нібы з нармальным зьявішчам. Трэба абуджаць у сэрцах нашага народу высокі запраўдны патрыятызм і бязьмежную любоў да нашае бацькаўшчыны. Паказаць на сцэне ў мастацкіх вобразах гістарычных герояў–патрыётаў, як, прыкладам, Кастусь Каліноўскі, як князь Полацкі Ўсяслаў і інш.“* Беларуская опэра ў паднямецкім Менску пайшла ў кірунку паказу слаўнага й багатага мінулага.
Вячаслаў Селях, ацэньваючы стан беларускае нацыянальнае опэры на пачатку 1944 году, піша: *„Перад опэрай стаіць вельмі складаная і вельмі адказная праблема выхаваньня і перавыхаваньня чыстага музычнага парадку, асабліва нашага маладога пакаленьня, якое расло пры бальшавікох і набывала свой эстэтычны густ на розных савецкіх “дрындульках”, што ўпарта выціскалі з жыцьця нашую мілагучную беларускую народную песьню і ейную прыгожую мэлёдыю. Адны забываліся на нашую родную песьню і музыку, а іншыя, маладзейшыя, шмат чаго з гэтага прыгожага народнага песеннага фальклёру і ня ведаюць. Задача опэры ўваскрашаць усё каштоўнае, прапагандаваць і падаваць у магчыма прывабным, высакамастацкім выкананьні. Творы нашых слаўных кампазытараў, як “Купальле” Туранкова ды “Лясное возера” Шчаглова даюць найлепшы матар’ял, каб на ім выхоўваць добры мастацкі густ, даваць эстэтычную асалоду, абуджаючы адначасна нацыянальныя пачуцьці“.*

**Шчаглоў–Куліковіч**
У беларускай музыцы таго часу вылучаецца постаць Міколы Шчаглова–Куліковіча, які вёў рэй у беларускім опэрным мастацтве 1941—44 гг., а пазьней займаў выбітнае месца на эміграцыі. Яшчэ ў даваенны час у 1938 годзе ён напісаў опэру „Кацярына“ (няскончаная, лібрэта М.Клімковіча), што на Першай дэкадзе беларускае літаратуры й мастацтва ў Маскве

была паказаная гледачу ў канцэртнай вэрсіі на сцэне тэатру імя К. Станіслаўскага й У.Неміровіча–Данчанкі. У той самы пэрыяд кампазытар актыўна выступаў на бачынах штотыднёвіка „Літаратура і мастацтва“ з артыкуламі па праблемах разьвіцьця беларускае музыкі, у прыватнасьці, а для нас гэта вельмі істотна, нацыянальнае опэры. Кампазытар не эвакуяваўся зь Менску, а застаўся ў горадзе, калі той занялі немцы. Тут ён узначаліў музычны аддзел Беларускае Культурнае Рады й Беларускага Культурнага Згуртаваньня, пры якіх у 1942—44 гг. была арганізаваная й дзеіла сэкцыя музычных працаўнікоў Беларусі — кампазытараў, музыказнаўцаў, дырыжораў, рэгентаў, музыкаў, сьпевакоў. Да сэкцыі належалі такія відныя й заслужаныя дзеячы беларускага музычнага мастацтва, як кампазытары А.Туранкоў, М.Равенскі, Р.Самохін, М.Іваноў, А.Спаскі, опэрны рэжысэр Вастокаў, салісты опэры Лазараў, Пукст, Чамярысава, Купцэвіч, Бандарэнка, Касьценіч, Вержбаловіч, Шчаціхін, Швайка й шмат іншых. Адны зь іх пісалі новыя музычныя творы, а ў тым ліку опэры й апэрэты: Самохін — опэру „Каваль–ваявода“ (паводле А. Міровіча), Равенскі — апэрэту „Залёты“ (паводле В.Дуніна–Марцінкевіча), Іваноў — дзіцячую опэру „Мухамор“ (паводле вершаванае казкі М.Танка) (А.Калубовіч. Мікола Шчаглоў (Куліковіч) // Беларускі сьвет. № 15 (44), 1984. С.5).

Фактычна ж музычным жыцьцём акупаванага Менску кіраваў Мікола Шчаглоў–Куліковіч ды асабіста браў чынны ўдзел у арганізацыі Менскага опэрнага тэатру, быў у ім дырыжорам сымфанічнае аркестры. Але асноўная ягоная роля ў азначаны пэрыяд выяўляецца ў напісаньні дзьвюх опэраў, значэньне якіх неацэннае ў агульнай скарбонцы нашае культуры. Выдатны музыказнаўца й кампазытар А.Карповіч дае ў зьвязку з гэтым такую ацэнку творчасьці М.Шчаглова–Куліковіча: *„Ён у сваёй творчасьці імкнецца знайсьці арганічнае адзінства мэлёдыі й гармоніі, сымфанізаваць народны музычны фальклёр, шукаць новыя фарбы на гукавой палетры народных інструмэнтаў, сродкамі сучаснай эўрапейскай сымфанічнай аркестры імкнецца перадаць іхнае гучаньне. Ён уздымае беларускую мэлёдыю на высокі мастацкі ўзровень кампазытарскае тэхнікі, глыбака і ўдумліва падыходзіць да захаваньня ў мастацкіх творах своеасаблівасьцяў беларускага калярыту. Творчая дзейнасьць М. Шчаглова–Куліковіча можа служыць прыкладам няўпыннае і*

*ўпорыстае працы над праблемай народнасьці ў музыцы, праблемай, якая стала перад ім яшчэ ў часе першых спробаў засваеньня беларускае песьні“* (А.Калубовіч. Мікола Шчаглоў (Куліковіч) // Беларускі сьвет. № 15 (44), 1984. С. 10).

**Туранкоў**

Побач зь імем Міколы Шчаглова–Куліковіча праходзіць постаць кампазытара А.Туранкова. Ён разам зь ім скончыў Маскоўскую Сынадальную Музычную Вучэльню ды меў падобны творчы шлях. Яшчэ ў 1932 годзе ён піша першую рэдакцыю опэры „На Купальле“ на тэкст Міхася Чарота, што з палітычных матываў аднак не была дапушчаная на сцэну (A. Karpovic. Matarjaly da historyji bielaruskaj muzyki. Chranalohija). У 1939 годзе ён перарабляе гэтую опэру ды піша другую ейную рэдакцыю і надае ёй новы назоў — „Кветка шчасьця“ (лібрэта П.Броўкі й П.Глебкі). У 1941 годзе ў Менскім тэатры была адноўленая першая рэпрэсаваная рэдакцыя ягонае опэры „На купальле“.

**Арсеньнева**

Досыць прыкметнае месца ў музычным жыцьці таго часу займае паэтка Натальля Арсеньнева. Яна супрацоўнічала зь Менскай Опэрай у гадох 1941—44 і пераклала на беларускую мову для пастаноўкі многія агульна ведамыя опэры, апэрэты й драматычныя творы, як „Кармэн“ Бізэ, „Яўген Анегін“ Чайкоўскага, „Зачараваная жалейка“ Моцарта, „Разьбіты кубак“ Кляйста, „Вольны стралец“ Вэбэра, „Цыганскі барон“ Штраўса, „Затонуты звон“ Гаўптмана, „Дзяды“ Міцкевіча ды іншыя.
У тым ліку Натальля Арсеньнева сталася аўтарам лібрэта да дзьвюх опэраў Міколы Шчаглова–Куліковіча — „Усяслава Чарадзея“ ды „Ляснога возера“. Пра іхнае плённае супрацоўніцтва ўжо па сьмерці кампазытара паэтка прыгадвае: „Імя Міколы Куліковіча, Міколы Шчаглова зойме некалі бясспрэчна пачэснае месца ў гісторыі беларускае музыкі й культуры наагул. Ён увойдзе ў іх як вялікі й шчыры энтузыяст ды знаўца беларускага песеннага фальклёру, а таксама й як вельмі таленавіты й плодны творца–кампазытар, аўтар дзьвёх цудоўных беларускіх опэраў, дзе беларускі песенны фальклёр якраз вельмі багата скарыстаны. Опэры гэтыя — лірычнае, мэлядыйнае „Лясное возера“, не пазбаўленае, адылі, глыбака

трагічных, драматычных момантаў, ды гераічная опэра „Ўсяслаў Чарадзей“. Апроч опэраў Натальля Арсеньнева зь Міколам Шчагловым–Куліковічам напісалі апэрэту „З выраю“, чым, аднак, іхнае супрацоўніцтва не абмежавалася — аднак гэта ня тычыцца тэмы нашых дасьледзінаў.
У 1941—42 гг. Мікола Шчаглоў–Куліковіч стварае лірычна–рамантычную опэру зь беларускага жыцьця XIII ст. „Лясное возера“. Увэртура да опэры — яскравы музычны абраз, прасякнуты рамантычным успрыняцьцем прыроды. Шматкаляровую палітру эмоцыяў перадае ў гуках кампазытар — пяшчотную лірыку дзявочага каханьня, тонкае адчуваньне прыроды, бадзёры крок юнакоў–барацьбітоў за вольную Бацькаўшчыну, патрыятычны ўздым, эпічную шырыню й драматычную ўсхваляванасьць (А.Калубовіч. Мікола Шчаглоў (Куліковіч) // Беларускі сьвет. № 15 (44), 1984. С. 6, 14). У 1942—43 гг. яна ішла на сцэне Менскага опэрнага тэатру. Нельга не прывесьці тут словаў Натальлі Арсеньневай пра опэру: *„“Лясное возера” было створана кампазытарам у першыя гады нямецкае акупацыі Беларусі. Памятаю, як сяньня, тыя галодныя й халодныя часы, калі я пісала да гэтае опэры лібрэта. Паэта, раўнуючы да кампазытара, бясспрэчна пакрыўджаны доляй. Слова бо шмат цяжэй успрымаецца слухачом, чымсьці музыка, дый імя ягонае ў агульным сутворы губляецца, памінаецца. Ды ўсё ж радасна, як ніколі было пачуць свае словы, прабуджаныя, ажыўленыя музыкаю Міколы Шчаглова. Мо таму, што ад першага знаёмства, ад першага сутыку нашых талентаў, мы нейкім дзіўным чынам знайшлі супольную мову, сугучнасьць, зразуменьне. Музыка кампазытара незвычайна зьлівалася з маімі словамі й думкамі. Мне здавалася, што каб я была й паэтам, і кампазытарам, я б сама лепшае музыкі да сваіх словаў напісаць не патрапіла. Асабліва падабалася мне працягненая як быццам чорнаю ніткаю праз усю канву опэры музычная тэма долі, трагічнага людзкога кону, тае долі, долі–чужаніцы, у якое „нельга адпрасіцца“, што „хоча — дорыць шчасьцем, хоча — гнець і ломіць, аж жыцьцё людзкое, як той колас зломіць“. „За аснову песьні аб долі*, — працягвае Натальля Арсеньнева, — *што выконваецца ў першым акце опэры квартэтам, а прыканцы вялікім хорам, кампазытар узяў народную песьню “Палыночак”, ператварыўшы яе сваім талентам у глыбака–трагічнае сьцьверджаньне людзкое*

*бясьсільнасьці перад Конам. Памятаю, калі ў фінале опэры вялікі хор Менскага тэатру разам з салістымі сьпяваў над целам забітага дружыньнікам Данілаю князя: "Цябе, доля злая, праклінаюць… славяць, славяць, цябе, доля!" — сапраўды, як кажуць, мароз бег па скуры й балюча а моцна білася сэрца"*.
У 1942—43 гг. пішацца гістарычна–гераічная опэра з падзеяў XI ст. „Усяслаў Чарадзей". Яна мелася ў рэпэртуарным пляне Менскага опэрнага тэатру на 1944 год, пра што ў прэсе было пададзена для публічнага ведаму. У тэатры ішлі рэпэтыцыі. Але з–за акупацыі Менску й Беларусі савецкім войскам паставіць яе не пасьпелі. У канцэртным выкананьні ў 1943 годзе опэру перадавала менская радыёстанцыя, а 26 сакавіка 1944 году сцэна зь яе была паказаная ў Менскім тэатры на сьвяточным канцэрце пасьля ўрачыстае акадэміі, прысьвечанай сьвяту 25–га Сакавіка. Натальля Арсеньнева ўжо на эміграцыі прыгадвала часіны стварэньня опэры: *„Не падвяла сугучнасьць нашых талентаў зь Нябожчыкам і ў іншай нашай супольнай працы — опэры "Ўсяслаў Чарадзей", ці, як яе яшчэ называюць, "Князь Усяслаў Полацкі". Разнастайнасьць, багацьце творчага таленту Міколы Шчаглова выявілася ў гэтым творы бадай ці шчэ не паўней. Гэта была опэра гераічная, і ў аснову ейную мною былі пакладзеныя ведамыя гістарычныя факты". „Гісторыя беларускага народу на працягу вякоў была гісторыяй несьціханага, упорыстага змаганьня за свабоду й нацыянальную незалежнасьць. Ужо ад самога пачатку стварэньня беларускіх самастойных гаспадарстваў народ наш мусіў напружана й жорстка змагацца за свае межы і з суседзямі, і зь дзікімі вандроўнікамі, з наезьнікамі з усходу й захаду. У гэтым змаганьні й нарадзіліся першыя формы беларускага літаратурнага ды музычнага мастацтва"*, — гэтыя думкі Міколы Шчаглова–Куліковіча, выкладзеныя ў адным зь ягоных шматлікіх артыкулаў, прысьвечаных беларускай музыцы й песьні, як найлепей тарнуюцца й да опэры „Ўсяслаў Чарадзей". У яе ўплецены вобразны разьдзел пра змаганьне Полацкага княства — калыскі нашае дзяржаўнасьці — за незалежнасьць ды створаны велічны абраз князя Ўсяслава, які, як піша аўтар „Слова пра паход Ігаравы": „Людзьмі кіраваў, князём гарады перадказаў, а сам па начох ваўком бегаў: з Кіеву ў Тмутаракань да петухоў забягаў, вялікаму Хорсу дарогу перасякаючы" (пераклад Натальлі Арсеньневай).

Опэры Шчаглова–Куліковіча належаць да новага этапу ў беларускім музычным мастацтве ды вылучаюцца сваім „манумэнтальным эпасам“ паводле трапнага вызначэньня музыказнаўцы Алеся Карповіча (А. Карповіч. Памяці Міколы Шчаглова (Куліковіча) // Беларускі сьвет. № 15 (44), 1984. С. 13). Прасякнутыя духам беларускага народу й беларускае прыроды, яны становяць творы цалкам сучасныя й з боку тэхнічнага майстроўства, якія па праву могуць заняць месца ў шэрагу эўрапейскіх узораў опэрнага мастацтва. Музыка па–майстроўску злучыў лепшыя традыцыі славянскай музычнай школы зь інтанацыйна–ладавым багацьцем беларускага народна–песеннага мастацтва, стварыўшы гэтым падставы заснаваньня беларускага нацыянальнага стылю ў музыцы, непаўторнага ў сваёй сьвежасьці й арыгінальнасьці (А. Карповіч. Памяці Міколы Шчаглова (Куліковіча) // Беларускі сьвет. № 15 (44), 1984. С.14).

Па прыходзе саветаў імя Міколы Шчаглова–Куліковіча было надоўга сьцёртае з гісторыі беларускае музыкі. Будзьма спадзявацца, што ягоныя творы некалі будуць адноўленыя ў рэпэртуары нашага Нацыянальнага Вялікага тэатру опэры й балету.

Гэты агляд разьвіцьця беларускае опэры ў 1941—44 гадох паказвае, што нягледзячы на разбурэньні й цяжкасьці ваеннага часу беларускія кампазытары, а найперш Мікола Шчаглоў–Куліковіч, стварылі й паставілі творы опэрнага мастацтва эўрапейскага ўзроўню, што займаюць пачэснае месца ў скарбонцы нашых нацыянальных культурных здабыткаў.

*Падрыхтоўка тэксту сталася магчымай дзякуючы ласкавай дапамозе кіраўніка “Беларускай капэлы” сп. Віктара Скарабагатава.*

*Пры падрыхтоўцы выкарыстаныя матэрыялы са збораў Лёнданскай Бібліятэкі імя Францішка Скарыны.*

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** [e-mail] Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 01-02-2000**

[image]
[image] .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

*Вайна ў 2(3)-1999*

да Зьместу 2(3)-1999

***лірыка***

# Зьміцер Саўка
# Аповед пра Іона Аксэльрода

**Аповед пра Іона Аксэльрода**
Іон Аксэльрод
ішоў дадому
І раптам спаткаў
ката.
Іон Аксэльрод
прыйшоў дадому,
Знайшоў здаравенна мяха.
Іон Аксэльрод
стараўся бяз шуму
Пракрасьцісь паўз жоўты плот.
Але ён меў рудую бэрэтку —
Яго заўважыў
кот.
Аднак Іон
Не
разгубіўся
І кінуў бэрэтку ў сьнег.
Кот, працяты вялікаю крыўдай,
Зваліўся ў падстаўлены мех.
Іон закрычаў:
“А дзе ж ваш гонар?!
Так лёгка патрапіць у мех!”
А кот
зірнуў Іону ў вочы —
У вачох

застыг
сьмех.

*зіма-вясна 1993*

**Восеньскае апавяданьне пра тое, чым захапляўся паэта Вікенцій Шышко з вуліцы Казлабродзкай**

**С**вет захапленьняў нічым ня меншы за сьвет Божы. Папросту гэта той самы сьвет.

У доме нумар 2 па вуліцы Казлабродзкай жывуць аматары самых розных захапленьняў.

Настаўнік фізыкі Шальчэўскі, яшчэ кавалер, у свае 34, зьбірае розныя выразкі з газэтаў і прыклейвае іх да сьценкі. Некаторыя з выцінак адклеіліся і зьвісаюць, нібы старыя скальпы са сьценак (ці як там яны ў іх называюцца) вігвама маршчыністага індзейскага правадыра.

Удава адстаўніка баба Марфа, якую жыхары дома, у залежнасьці ад узроставай і сацыяльна-адукацыйнай прыналежнасьці, называюць Марфаю-пасадніцаю, -асадніцаю або -задніцаю,

— дык вось баба Марфа за ўпадабаны
занятак мела чытаньне кулінарных кніг. Яна магла гадзінамі сядзець на маленькім услончыку ў вітальні і захапляцца чарговым рэцэптам, на падставе пераліку інгрыдыентаў уяўляючы, што за страва магла б атрымацца! Гэтак глухі Людвік ван Бэтговэн па нотах летуцеўся ад музыкі, імі выражанай.

Старажыд нашага дома Самуіл Аронавіч Ліс, які ў дэталях памятаў цырымонію пахаваньня цадыка Іцхока ў 1932 годзе, зьбіраў старасьвецкія аўтамабілі. Праўда, ягоная калекцыя была невялікая — яна складалася з аднае адзінае адзінкі. Але ж якой!

Распавядаючы пра яе чарговай ахвяры — слухачу яго бясконца падрабязных гісторыяў, — калекцыянэр прыкладаў

палец па вуснаў і ціха скрыпеў: “Ві панімаеце, это такая же рэліквія, как “Аврора”. Да. Патаму что в эту машіну садзілся Ленін, кагда в йіво стрыляла Фаіна Каплан...”

Пасьля ўсяго згаданага, вы, мяркую, ня зьдзівіцеся, даведаўшыся, што і паэта Вікенцій Шышко таксама меў захапленьне:

Ён любіў катацца на трамваі.

*каля 1995*

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

*Вайна ў ARCHE 2(3)-1999* . [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **14-10-1999**

[image]
[image] .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima



да Зьместу 2(3)-1999

***лірыка***

# Чэслаў Мілаш
# Іншага канца сьвету ня будзе

**Чэслаў Мілаш (нар. у 1911 у Шатэйнях у нашай Віленшчыне) — вялікі майстра літаратуры, польскі паэт, празаік, эсэіст, крытык і перакладчык. Ляўрэат Нобэлеўскае прэміі (1980). Паводле аўтарытэтнага польскага крытыка Анджэя Кіёўскага, «Мілаш — гэта ўсьведамленьне абранасьці, гэта пачуцьцё рангу паэзіі... гэта мэталітаратура, значыцца слова, якое не паведамляе, а ачышчае». Аднаразовага кантакту зь ягонай паэзіяй недаволі. Трэба вяртацца да гэтых вершаў шматкроць, каб учытацца ў іхныя тайніцы, пераадолець усе бар'еры, што не даюць доступу, вычытаць праўду, утоеную ў накладаных адзін на адзін вобразах і галасох, паддацца надзеі, што праменіць з гэтае паэзіі, знайсьці збаўленьне. І можна шчэ дадаць — знайсьці красу, хоць так бароніцца ад спакушэньня ёю вялікі майстра. Апошнія пераклады Мілаша на беларускую мову — «Прыдарожны сабачка» («Наша Ніва», 1999), «Дзіця Эўропы» («Фрагмэнты», 1999), а таксама нізка вершаў у часопісе «Крыніца» (1997). Некаторыя зь вершаў, якія мы тут друкуем, былі напісаныя ў гады вайны.**

**Campo di Fiori**

**У** Рыме на Кампа дзі Ф’ёры
Місы масьлін і лімонаў,
Брук віном акраплёны
Ды пялёсткамі кветак.
Пладамі ружовымі мора
Гандлёўцы сталы засыпаюць,
Цяжар вінаградных гронак
Кладзецца на пух брусквічны.
Тут менавіта, на пляцы,
Спалілі Джардана Бруна.
Каты агонь распалілі
Ў коле цікаўнае чэрні.
А ледзьве полымя згасла,
Зноў стала поўна ў тавэрнах,
Місы масьлін і лімонаў
Несьлі гандлёўцы на продаж.
Я ўспомніў Кампа дзі Ф’ёры
Ў Варшаве ля карузэлі
Ў вясновы пагодны вечар
Пры гуках эстрадных мэлёдый.
Залпы за мурам гета
Глушыліся танцавым рытмам,
У бясхмарнае неба
Высока ўзьляталі пары.
З вогнішча вецер прыносіў
Чорных лятучых цмокаў —
Хапалі шматкі ў паветры
Гулякі на карузэлі.
Ветрылі сукні дзяўчатам
Павевы з дамоў палалых,
Сьмяяліся весела гурмы
Ў час гожай варшаўскай нядзелі.
Мараль можа вычытаць нехта,
Што люд варшаўскі ці рымскі
За гандлем, забавай, каханьнем
Ня бачыць вогнішчаў сьмерці.
Іншы мараль заўважыць
Пра справаў людзкіх мінаньне,

Пра забыцьця наступленьне,
Перш як агонь дапалае.
Я ж думаў пра адзіноту
Асуджаных на загубу,
Аб тым, што калі Джардана
Ўступаў на памост да катаў,
У мове людзкой ня здолеў
Знайсьці ніводнага слова,
Каб разьвітацца з народам,
З тым людам, які застаўся.
Віна ўжо пабеглі выпіць,
Прадаць свае морскія зоркі.
Місы масьлін і лімонаў
Несьлі вясёлыя пары.
А ён быў ад іх далёкі,
Быццам мінулі стагодзьдзі,
Яны ж толькі мгненьне чакалі
Яго адлёту ў пажары.
Тыя, самотныя, гінуць,
Пазабываныя сьветам,
Іх мова цяпер нам чужая,
Як мова даўняй плянэты.
І ўсё гэта стане легендай,
Пройдуць гады, і за гэтым
На новым Кампа дзі Ф'ёры
Падыме бунт слова паэты.
*Варшава, Вялікдзень 1943*
*Пераклалі Юрась Бушлякоў і Андрэй Хадановіч*

**У Варшаве**
**Ш**то робіш, паэт, на руінах
Сабору Сьвятога Яна
У цёплы вясновы дзень?
Пра што ты думаеш тут,
Дзе вецер нясе ад Віслы
Пыл чырвонае крушні?
Ты кляўся ня быць ніколі
Плакальніцай жалобнай.
Ты кляўся не дакранацца

Да ранаў свайго народу,
Каб іх не зрабіць сьвятыняй,
Праклятай сьвятыняй, насланьнем
Тваіх далёкіх нашчадкаў.
Ды гэта плач Антыгоны,
Што не знаходзіць брата,
Ды гэта звыш чалавечай
Меры. Сэрца — як камень,
Дзе жамярыцай замкнулі
Зерне цёмнай любові
Сама няшчаснай зямлі.
Ці так я хацеў кахаць,
Ці пра гэтае марыў?
Ці так я хацеў шкадаваць,
Ці пра гэтае марыў?
Маё пяро мне здаецца
Лягчэйшым за пёры калібры.
Мне гэткі цяжар не пад сілу.
Як жыць у гэтай краіне,
Дзе наступаеш на косьці
Непахаваных блізкіх?
Галасы чую, бачу ўсьмешкі.
Як пісаць мне? Пяцёра рук
Хапаюць маё пяро
І кажуць пісаць гісторыю
Іхных жыцьця і сьмерці.
Ці плакальніцай жалобнай
Мне стацца наканавана?
Не, пяяцьму людзкія сьвяты,
Залатыя гаі, да якіх
Мяне ўводзіў Шэксьпір. Пакіньце
Хвілю радасьці для паэтаў,
Бо йнакш загіне ваш сьвет.
Вар'яцтва жыць без усьмешкі
І паўтараць два словы,
Зьвяртаючыся да мёртвых,
Да вас, чыім лёсам
Мусіла быць весялосьць
Думак, пачуцьцяў, песень, бяседаў.
Два ўратаваныя словы:

Праўда і справядлівасьць.
*Кракаў, 1945*

**Песьня пра канец сьвету**
**У** дзень канца сьвету
Над кветкай настурцыі лётаюць пчолы,
Рыбак ладзіць свой нераток,
У моры вясёлыя скачуць дэльфіны,
А скура вужа зьзяе золатам, як і павінна,
Малы верабейка чапляецца за вадасьцёк.
У дзень канца сьвету
Жанчына па полі ідзе з парасонам,
Спіць п'яны ў абдымку з газонам,
На вуліцы крык гандляроў садавінай,
Пад ветразем лодка ідзе, як павінна,
Лунаюць скрыпічныя гукі ў паветры,
Уначы адмыкаючы зорныя нетры.
А ўсе, хто чакаў перуноў і маланак,
У расчараваньні.
А ўсе, што чакалі трубы Арханёла і знакаў,
Ня ў стане даць веры, што ён настае.
Пакуль над зямлёй сонца зь месяцам кружаць
І чмель прылятае да ружы,
І дзеткі ружовыя родзяцца ў жонкі і мужа,
Ніхто ня дасьць веры, што ён настае.
І толькі сівенькі стары, які мог быць прарокам,
Але ж не прарок, бо на гэта ёсьць іншыя людзі,
Падвязвае памідоры і кажа сабе:
Іншага канца сьвету ня будзе,
Іншага канца сьвету ня будзе.
*1945*
*Пераклаў Андрэй Хадановіч*

**Песьня пра парцаляну**
**С**подкі, шкляныя вечкі,
Квяцістыя філіжанкі
Ляжаць на беразе рэчкі,
Там, дзе прайшліся танкі.

Ветрык над вамі лунае,
Кідае пух пярынны,
На чорны сьлед ападае
Цень зламанай шыпшыны.
Пырскамі пены застылай
Палі, вокам кінуць, засланы.
Нічога, спадару мілы,
Ня шкода мне, як парцаляны.
Толькі заранка ўстане
Над далягляду абрэзкам,
Чуваць зямлі якатаньне,
Сподачкі жаляцца трэскам.
Сон майстроў патаемны,
Зімны сьпеў лебядзіны...
Чорны ручай падземны
Змые пра іх успаміны.
А раніцай смутак бяскрылы
Сэрца пячэ, несьціханы.
Нічога, спадару мілы,
Ня шкода мне, як парцаляны.
Бачаць да берагу сонца
Зыркую крышанку вочы.
Мора аскепкаў бясконца
Пад нагамі скрыгоча.
Зьвёзды з каляднае крамы,
Цешылі нас сваёй барвай,
Цяпер сьпярэшчаны ў плямы
Брыдкай загуслай фарбай.
У сьвежых ляжыць магілах
Посуд, жалезам зламаны.
Нічога, спадару мілы,
Ня шкода мне, як парцаляны.
*Вашынгтон, 1949*

**Ня больш**

**К**алі–небудзь я мушу сказаць, як зьмяніў
Свой пагляд на паэзію, як так сталася,
Што сягоньня лічуся адным з шмат якіх
Гандляроў і рамесьнікаў японскага цэсарства,

Складальнікаў вершаў аб вішняў цьвіценьні,
Хрызантэмах і месячнай поўні.
Калі б мог куртызанак Вэнэцыі
Апісаць, як прутком у падворку яны цьвеляць паўліна,
І з тканіны шаўковай, з апаяскі парловай
Вылушчыць пругкія грудзі, чырвоную
Рысу на чэраве — сьлед спражкі ад сукні,
Так, прынамсі, як бачылі шкіпэры галіёнаў,
Таго ранку прыбылых з запасамі золата;
І калі б адначасна я іхныя бедныя косьці
На магільніку, дзе ліжа браму драпежнае мора,
Залучыць мог у слове, мацнейшым за грэбень апошні,
Які сам у гнільлі пад плітою чакае сьвятла,
Не суміўся б тады. Што з матэрыі непадаткой
Пазьбіраеш? Нічога, мо толькі красу.
А тады нам павінна хапіць кветак вішні,
Хрызантэмаў і месячнай поўні.
*Манжэрон, 1957*
*Пераклалі Юрась Бушлякоў і Андрэй Хадановіч*

**Прадмова**
**Т**ы, каго я ня здолеў выратаваць,
Паслухай
Гэтыя простыя словы:
Іншых проста ня маю
Й гавару з табой моўчкі, як воблака альбо дрэва.
Што мяне гартавала, было для цябе загубай.
Разьвітаньне з эпохай прымаў ты за прыйсьце новай,
Подых нянавісьці — за лірычную навальніцу,
Сілу сьляпую — за дасканалы кшталт.
Плыткія польскія рэчкі ў даліне. Вялізарны мост
Хаваецца ў белай імгле. Зьнішчаны горад.
Пакуль я з табой размаўляю,
Вецер крыкамі кірляў засыпае тваю магілу.
Чым ёсьць паэзія, што не ратуе
Людзей, не ратуе народаў?
Формай службовай хлусьні,
Гарланьнем пітушчае глоткі, якую вось–вось перарэжуць,
Чытанкай на ноч для прыгожых паненак.

У тым, што, няўмелы, я прагнуў сапраўднай паэзіі,
У тым, што пазьней зразумеў яе ратаўнічы сэнс, —
У гэтым, у гэтым адным было ратаваньне.
Некалі на магілы сыпалі мак ці проса,
Пакідаючы ежу душам памерлых — птушкам.
Сёньня гэтую кнігу для цябе пакідаю,
Каб ты ніколі больш сюды не вяртаўся.
*Пераклаў Андрэй Хадановіч*

---

[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima
[image]

*Вайна ў ARCHE 2(3)-1999* . [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **14-10-1999**

да Зьместу 2(3)-1999

***сьветліня***

# Прыма Леві
# Ці гэта чалавек?
# Жыцьцё ў Асьвенцыме

**Кніга Прыма Леві (1919—87) “Ці гэта чалавек?” выйшла ў 1947 г. У студзені 1944 г. маладога навукоўца–хіміка, які ваяваў у партызанскім атрадзе на поўначы Італіі, захапілі ў палон, і ён патрапіў у Асьвенцым. Ён быў адным зь некалькіх соцень вязьняў гэтага лягеру, якія засталіся жывыя — іх не пасьпелі адправіць у газавыя камэры. Пісаць ён яе пачаў праз 11 месяцаў пасьля вызваленьня. Першая кніга Леві — страшная праўда пра мяжу жаху, пра лягерную машыну, якая была прадумана ня проста для вынішчэньня людзей па навуцы, але каб найперш таптаць іх чалавечую годнасьць, ператвараць перад сьмерцю ў недачалавекаў. Аднак таксама гэта апавяданьне–сьведчаньне пра чалавечую самаахвярнасьць. Помнік трагедыі жыдоўскага народу. Літаратурны шэдэўр па сваёй меры, стылі, кампазыцыі. У Савецкім Саюзе была малавядомая — кнігі такога кшталту падрывалі нашу манаполію на пакуты. Леві працягваў разважаць над лягерным досьведам, сутнасьцю зла і сэнсам супрацьстаяньня яму ў творах “Замірэньне”,**

**“Пэрыядычная сыстэма” і “Хто патануў і хто ўратаваўся” — ягонай апошняй кнізе, перад тым як ён зрабіў сабе сьмерць. Менавіта над этычнымі пошукамі Леві разважае ў сваім артыкуле Цьветан Тодараў.**

**Падзеі лета**

**У**сю вясну прыбывалі транспарты з Вугоршчыны: цяпер кожны другі вязень быў вугорцам, і вугоршчына стала другой мовай лягеру пасьля ідыш.

У жніўні 1944–га мы, што патрапілі сюды пяць месяцаў таму, лічыліся амаль вэтэранамі. З тае прычыны нас — каманду №98 — ужо нішто ані бянтэжыла, ані засмучала надта: у прынцыпе ўсе проста баяліся пераменаў: “Калі нешта мяняецца, то мяняецца на горшае” — гучала адна зь лягерных прыказак. Ды й наагул досьвед ужо столькі разоў дэманстраваў нам марнасьць любых прадбачаньняў: які сэнс намагацца прадбачыць будучыню, калі ніводнае наша дзеяньне, аніводнае наша слова ня могуць хоць на кроплю паўплываць на яго? Мы былі старыя гэфтлінгі: нашай мудрасьцю было “не імкнуцца зразумець, не ўяўляць будучыні, не тлуміць сабе галаву тым, як і калі ўсё скончыцца: ня ставіць ні перад іншымі, ні перад сабой пытаньняў”.

Мы захоўвалі ўспаміны аб нашым папярэднім жыцьці, але туманныя і далёкія, а таму глыбока пяшчотныя і сумныя. Так людзі ўспамінаюць сваё маленства і ўсё тое, чаго ўжо ня вернеш; а вось момант, калі ты патрапіў у лягер, распачынаў зусім іншую нізку ўспамінаў, такіх блізкіх і балючых і ўвесь час пацьверджаных, нізку незагойных ранаў.

У шахтах распаўсюдзіліся зьвесткі пра дэсант хаўрусьнікаў у Нармандыі, пра наступ рускіх і пра няўдалы замах на Гітлера. Яны ўзьнялі хвалі бурных, але эфэмэрных спадзеваў. Кожны адчуваў, як дзень за днём згасаюць ягоныя сілы, губляецца воля да жыцьця, точыцца розум; і Нармандыя, і Расея былі так далёка, а зіма так блізка, настолькі канкрэтнымі былі голад і адчай, а ўсё астатняе ірэальным, што сапраўды здавалася немагчымым існаваньне сьвету і часу па–за нашым сьветам бруду і па–за нашым бясплодным, застылым часам, канец якога мы былі няздольныя ўявіць.

Для жывых людзей адзінкі часу заўсёды маюць вартасьць тым большую, чым большыя ўнутраныя рэсурсы таго, хто рухаецца ў часе; а для нас гадзіны, дні і месяцы тупа перацякалі ад будучыні да мінулага, заўсёды надта павольна, — гнюсная і непатрэбная матэрыя, ад якой мы імкнуліся пазбавіцца як мага хутчэй. Скончыўся час, калі дні міналі за днямі, поўныя жыцьця, каштоўныя і непаўторныя. Будучыня, шэрая й неакрэсьленая, устала перад намі непераадольным бар'ерам. Для нас гісторыя спынілася.

Але ў жніўні 44–га зноў пачаліся бамбардаваньні Горнага Шлёнску, яны працягваліся зь нерэгулярнымі паўзамі ўсё лета й восень, пакуль не наступіў канчатковы крызыс. Пачварная, зладжаная праца па адбудове заводу рэзка спынілася і хутка пераўтварылася ў бязладную, ліхаманкавую і натужную мітусьню. Дзень, калі мела распачацца вытворчасьць сынтэтычнай гумы і які яшчэ ў жніўні здаваўся сьвятой, недатыкальнай мяжой, адсоўваўся ўсё далей, а потым немцы перасталі згадваць яго ўвогуле.

Канструктыўная праца спынілася; намаганьні статку загнаных нявольнікаў былі скіраваныя ў іншым напрамку. Рабы станавіліся з кожным днём усё менш пакорлівымі і пасыўна варожымі. Пасьля кожнага налёту трэ было рамантаваць разбуранае; дэмантаваць і звозіць далікатнае абсталяваньне, наладжанае колькі дзён таму; сьпешна будаваць сховішчы і абаронныя пабудовы, якія пры бліжэйшым выпрабаваньні аказваліся да сьмешнага непрыстасаванымі.

Нам здавалася, што няма горшага пекла за манатоннасьць аднолькавых упарта доўгіх дзён, за змрочную сыстэму зладжанай працы заводу; але мы сталі думаць зусім па–іншаму, калі завод пачаў рассыпацца на часткі вакол нас, нібыта пад праклёнам, і сярод тых, хто закляў, былі таксама й мы. Нам даводзілася аблівацца потам сярод пылу і гарачых руінаў, жывёльна трымцець, урастаючы ў зямлю, калі зь неба прыціскае ашалелы гул самалётаў. Увечары, доўгімі ветранымі польскімі вечарамі, мы вярталіся, ледзь жывыя ад стомы, спражаныя смагай, і апыналіся ў скаламучаным лягеры, дзе не было вады, каб папіць і памыцца, і не пасьпявалі атрымаць супу, безь якога зьвіваліся спустошаныя жылы, а цемра перашкаджала абараняць свой кавалак хлеба ад згаладнелага суседа і знаходзіць раніцай драўляныя сабо й вопратку ў

аглушальнай поначы Блёку.
На заводзе лютавалі цывільныя немцы. Гэта быў шал упэўненага чалавека, які прачынаецца ад доўгага сну, у якім ён быў уладаром, і раптам бачыць, што ўсё навокал развальваецца, і ня можа зразумець, што да чаго. Лягерныя немцы з Райху, у тым ліку й палітвязьні, у гадзіну небясьпекі зноў адчулі повязь крыві і зямлі. Нешта новае абвастрыла інтрыгу нянавісьці і непаразуменьняў да крайнасьці і падзяліла нас на два лягеры: палітвязьні разам з тымі зьняволенымі, што насілі на робах зялёныя трохкутнікі, бачылі або ім здавалася, што яны бачаць, на твары кожнага з нас адбітак зласьлівай цёмнай радасьці помсты. Яны паразумеліся ў гэтым уражаньні, іхная жорсткасьць падвоілася.
Ніводзін немец ня мог забыцца, што мы стаім за іншы бок, што мы шчыра падтрымліваем тых, чые страшныя сейбіты гаспадараць у нямецкім небе, пераадольваючы любы супраціў, і нішчаць жывое жалезьзе іхнай працы, штодзень руйнуючы іхныя хаты, дамы нямецкага народу, якім ніхто ніколі раней не пагражаў.
Што да нас, то мы былі надта зьнясіленыя, каб сапраўды баяцца. Нямногіх, хто яшчэ быў здольны на нейкія думкі ці пачуцьці, бамбардаваньні напаўнялі новай сілай і надзеяй; тыя, каго голад яшчэ не давёў да канчатковай млявасьці ды абыякавасьці, часта выкарыстоўвалі моманты ўсеагульнай панікі для вылазак удвая небясьпечных (бо апроч прамой рызыкі бомбаў і асколкаў крадзёж ва ўмовах надзвычайнага становішча караўся павешаньнем) на фабрычную кухню і сховішчы. Але большая частка пераносіла новую небясьпеку і новую бяду з адпорнай раўнадушнасьцю: гэта быў не асэнсаваны адчай, а мутнае здранцьвеньне быдла, якое гоняць кіём і якое ўжо ня чуе ўдараў.
Нам забаронена было ўваходзіць у жалезабэтонныя сховішчы. Калі зямля пачынала трэсьціся, мы прабіраліся, агаломшаныя, кульгаючы, сярод едкага дыму пажараў на агромністыя, закінутыя, змрочныя, бескарысныя тэрыторыі за заводзкую агароджу; там мы покатам ляжалі адзін на адным, як трупы, усім целам адчуваючы, аднак, хвілінную слодыч адпачынку. Глядзелі асьлеплымі вачыма, як вакол нас выбухаюць слупы дыму і агню: у момант зацішша, працятага ледзь чутным пагрозьлівым бзычэньнем, знаёмым кожнаму эўрапейцу, мы

зьбіралі са сто разоў утрамбаванай зямлі завялыя цыкорыі ды рамонкі і доўга моўчкі жавалі іх.
Калі трывога сканчалася, мы вярталіся з усіх бакоў на свае месцы. Немы незьлічоны статак, прывучаны да жорсткасьці людзей і рэчаў; мы зноў браліся за заўсёдную працу, зьнянавідную, як заўсёды, а да таго ж зусім бескарысную і бессэнсоўную.
У гэтым сьвеце, які з кожным днём усё мацней курчыўся перад надзеяй, у ярме няволі мне давялося сустрэць Лёрэнца. Гісторыя маіх адносінаў з Лёрэнцам і доўгая, і кароткая, простая і загадкавая; гэта гісторыя з часу і ўмоваў зусім не такіх, як наша цяперашняя рэчаіснасьць, а таму думаю, што яе можна ўспрымаць, толькі як успрымаюць цяпер падзеі легендарныя або старадаўнія гістарычныя.
Усё было так проста, што, быццам, няма каго й апісваць; адзін італьянскі работнік прынёс мне кавалак хлеба і потым шэсьць месяцаў штодня дзяліўся сваім рацыёнам; аддаў мне сваю цыраваную–перацыраваную кашулю; напісаў ад мяне ў Італію паштоўку і перадаў адказ. За ўсё гэта ён не прасіў і не прыняў аніякай платы, бо быў добры і просты і ня думаў, што можна рабіць дабро за плату.
Але тое, што ён рабіў, гэта ў лягеры было зусім ня мала. Не адному мне так дапамагалі. Іншыя таксама мелі рознага кшталту сувязі з цывільнымі і карысталіся імі, каб выжыць: але былі адносіны і іншага толку. Нашыя таварышы гаварылі пра іх тым жа двухсэнсоўным, поўным недасказанасьці тонам, якім людзі ў сьвеце гавораць пра свае адносіны з жанчынамі: гэта значыць, як пра прыгоды, якімі можна з поўным правам ганарыцца і якімі хочацца выклікаць зайздрасьць, але якія, асабліва для “паганскіх” галоваў, заўсёды выходзяць на мяжу дазволенага і дастойнага; таму казаць пра гэта надта шчыра было б няправільна і неадпаведна. Так гэфтлінгі распавядаюць аб сваіх “абаронцах” і “сябрах” зь ліку цывільных: зь яўнай асьцярожнасьцю, ня згадваючы імёнаў, каб не скампрамэтаваць іх, а перш за ўсё не ствараць сабе непажаданых супернікаў. Найбольш забясьпечаныя, прафэсійныя спакусьнікі, як Анры, зусім нічога не распавядаюць аб іх; яны атачаюць свае посьпехі аўрай містычнай таямніцы і абмяжоўваюцца намёкамі ды алюзыямі, прадуманымі так, каб стварыць перад слухачамі туманную і хвалюючую легенду аб тым, як ім дагаджаюць

супэруплывовыя і шчодрыя знаёмцы–цывільныя. Усё з адной мэтай: слава посьпеху, як я ўжо казаў, аказваецца дужа карыснай для таго, хто ўмее стварыць такое ўражаньне. Слава спакусьніка, “блатніка” выклікае адначасова зайздрасьць, пагарду і захапленьне. Хто есьць “блатны” харч на людзях, нарываецца на вялікія непрыемнасьці; гэта грубая бестактоўнасьць і поўная бессаромнасьць, а да таго ж яўная дурасьць. З другога боку, дурасьцю і нахабствам лічыцца пытаньне “хто табе даў гэта? Дзе знайшоў? Як сумеў?” Толькі Вялікія Нумары, непрыстасаваныя і безабаронныя тупіцы, якія нічога ня ведаюць пра лягерныя правілы, ставяць такія пытаньні; на такія пытаньні нічога не адказваюць альбо адказваюць “Verschwinde, Mensch”, “Hau’ab”, “Uciekaj”, “Schiess in den Wind”, “Va chier”; адным словам, з дапамогай аднаго зь вельмі многіх адпаведнікаў “Валі адсюль”, на якія так багаты лягерны жаргон.

Некаторыя спэцыялізуюцца на складаных, руплівых шпіёнскіх акцыях, каб высьветліць, хто з цывільных або якая група цывільных знаходзіцца ў кантакце з кімсьці з нашых, а потым імкнуцца рознымі спосабамі адсунуць яго зь цёплага месца. Так нараджаюцца бясконцыя спрэчкі за першасьць, тым больш горкія для таго, хто прайграў, бо ўжо даўно “доены” цывільны амаль заўсёды больш прыбытковы і надзейны, чым цывільны–новік. Такі цывільны варты значна болей, і пачуцьцёвыя ды тэхнічныя прычыны гэтага відавочныя: ён ужо ведае асновы “блату”, яго правілы і небясьпекі, а да таго ж прадэманстраваў здольнасьць пераадоленьня каставага бар’еру.

Насамрэч, мы для цывільных уяўляемся гэткай кастай недатыкальных. Цывільныя, хто больш, а хто менш выразна, з рознымі нюансамі складанага пачуцьця, сярэдняга паміж пагардай і спачуваньнем, думаюць, што раз нас засудзілі, апусьцілі да такога становішча, дык мы абавязкова заплямленыя нейкай загадкавай цяжкай віной. Яны ненавідзяць нас, якія размаўляем на розных незразумелых ім мовах, што гучаць камічна, як зьвярыныя галасы; яны бачаць нас, зьняволеных, зганьбленых, зьневалошаных, зьняслаўленых, безназоўных, бачаць, цкуюць, але ніколі не заўважаюць у нашых вачах ні бунту, ні міру, ні веры. Яны бачаць, як мы крадзем і робім падлы адзін адному, як абрастаем калам і амаль не зьвяртаем увагі на тое, ці яшчэ

прыкрываюць лахманы зглоджаныя голадам целы і, блытаючы вынік з прычынай, лічаць, што мы вартыя сваёй долі. Хто зможа адрозьніць нашыя твары? Для іх мы ўсе — “зэка” ніякага роду.
Натуральна, нягледзячы на гэта, многія зь іх шпурляюць нам час ад часу кавалак хлеба або бульбіну ці дазваляюць пасьля раздачы “цывільзупы” на фабрыцы выскрабсьці свае міскі і вярнуць памытымі. Часам іх кранае чыйсьці галодны позірк, прачынаецца момантны імпульс гуманнасьці, іншы раз — простая ахвота паглядзець, як мы налятаем, як зьвяры, без разбору, вырываючы адзін у аднаго кавалак, аж покуль мацнейшы не заглыне яго, а астатнія, зможаныя, пачыкільгаюць упрочкі.
Паміж мной і Лёрэнца не было нічога падобнага. І калі ёсьць сэнс вызначыць прычыны, чаму менавіта я сярод тысячаў такіх жа здолеў выжыць, то я перакананы, што менавіта дзякуючы Лёрэнца я сёньня жывы; і ня столькі дзякуючы яго матэрыяльнай дапамозе, колькі празь няспынны напамін сваёй прысутнасьцю, сваёй такой простай і яснай дабрынёй, што па–за нашым сьветам існуе справядлівы сьвет, нешта і нехта яшчэ чыстыя і цэльныя, хто не апусьціўся і не зьдзічэў, па–за нянавісьцю і страхам, нешта хутчэй цяжка вызначальнае, аддаленая магчымасьць дабрыні, якая надае сэнс выжыванню. Пэрсанажы гэтых старонак — ня людзі. Іхная чалавечнасьць пахаваная, альбо яны самі яе пахавалі пад цяжарам зьдзекаў, якія ім давялося вытрымаць або ўчыніць. Жорсткія і тупыя эсэсаўцы, капо, палітычныя, крымінальнікі, вялікія і малыя начальнікі і ўрэшце неакрэсьленая маса рабоў–гэфтлінгаў, — усе прыступкі вычварнай гіерархіі, створанай паводле жаданьня немцаў, — парадаксальна злучаныя ў адзіным душэўным адчаі.
Але Лёрэнца быў чалавекам; ягоная чалавечнасьць была чыстая і незатручаная, ён быў па–за гэтым сьветам адмаўленьня. Дзякуючы Лёрэнца, мне выпала не забыцца, што і я таксама чалавек.

**Кастрычнік 1944–га**
З усіх нашых сілаў мы змагаліся за тое, каб зіма не надышла. Чапляліся за кожную гадзіну цяпла, з кожным захадам імкнуліся

затрымаць на небе сонца яшчэ хаця б на трошкі, але ўсё марна. Учора ўвечары сонца беспаўротна закацілася за згустак бруднага туману, комінаў і дротаў, а назаўтра надышла зіма. Мы ведаем, што гэта значыць, бо правялі тут мінулую зіму, а іншыя хутка гэта спазнаюць. А значыць, што за гэтыя месяцы, ад кастрычніка да красавіка, сямёра зь дзесяці памруць. Хто не памрэ, будзе пакутаваць хвіліну за хвілінай, штодня, усе дні: ад раніцы, ад яшчэ да відна да раздачы вечаровай зупы трэ будзе трымаць мускулы нацятымі, танчыць на адной назе, потым на другой, зьвівацца рукамі пад пахамі, каб вытрываць холад. Трэ будзе ахвяраваць кавалкам хлеба, каб дастаць пальчаткі, і адрываць гадзіны ад сну, каб залапіць іх, калі яны парвуцца. Больш нельга будзе есьці на дварэ, а трэ будзе — у бараку, дзе на кожнага прыходзіцца лапік падлогі, стоячы, бо абапірацца на нары забараняецца. Ва ўсіх адкрыюцца раны на руках, і каб перавязаць іх, трэ будзе штовечар гадзінамі выстойваць у сьнезе на сіверы. Таксама як наш голад не падобны на пачуцьці таго, хто проста не паабедаў, так і наш холад варта было б назваць нейкім спэцыяльным словам. “Голад”, “стома”, “страх”, “пакута”, “зіма” ў нашых вуснах набываюць цалкам іншае значэньне. Гэтыя вольныя словы былі для ўжытку вольных людзей, якія жывуць у дабры або ў нэндзы, але ў сваіх дамах. Калі б Лягеры пратрымаліся даўжэй часу, нарадзілася б новая вострая мова; і таму адчуваецца неабходнасьць растлумачыць, што значыць надрывацца цэлы дзень на працы — на ветры, на марозе, маючы на сабе толькі кашулю, трусы, палатняныя куртку і штаны, а ў целе — слабасьць і голад ды ўсьведамленьне блізкага скону.

Раніцай надыйшла зіма, так, як наступае канец надзеі. Мы сьцямілі гэта, калі выйшлі памыцца: зорак не было, цёмнае і халоднае паветра дыхала сьнегам. На Апэльпляцы на досьвітку падчас шыхтаваньня на працу ніхто не размаўляў. Калі мы ўбачылі першыя сьняжынкі, то падумалі, што калі б хтосьці сказаў нам у гэты ж час летась пра яшчэ адну зіму ў Лягеры, то мы палезьлі б на агароджу з токам; і палезьлі б цяпер, калі б дзейнічалі лягічна, каб ня гэтыя бязглузда шалёныя рэшткі невымоўнай надзеі.

**Бо слова “зіма” азначае яшчэ нешта**

Сёлета ўвесну немцы паставілі два агромністыя намёты ў

адным з куткоў нашага Лягеру. У кожным увесь цёплы сэзон знаходзілася больш за тысячу чалавек; цяпер намёты прыбралі, і дзьве тысячы жыхароў звыш нормы запаўняюць нашыя баракі. Мы, старыя вязьні, ведаем, што такі беспарадак немцам не падабаецца і неўзабаве адбудзецца нешта, што зьменшыць нашую колькасьць.

Адчуваецца, што набліжаецца сэлекцыя. “Selekcja”: гібрыднае лацінска–польскае слова чуецца адзін раз, два разы, шмат разоў, унітаванае ў шматмоўныя размовы; спачатку яно не высоўваецца, потым прыцягвае да сябе ўвагу, урэшце перасьледуе нас.

Раніцай палякі кажуць пра “Selekcju”. Палякі першымі даведваюцца навіны і імкнуцца не распаўсюджваць іх, бо веданьне таго, чаго ня ведаюць пакуль іншыя, заўсёды можа прыдацца. Калі ўсе даведаюцца, што сэлекцыя непазьбежная, дык кожны зможа паспрабаваць зрабіць тое малое, што можна зрабіць (падкупіць хлебам альбо тытунём якога–небудзь мэдыка або адказнага; патрапіць з бараку ў шпіталь або наадварот у адпаведны момант, каб не патрапіць пад камісію, а так гэтай манаполіяй будуць валодаць толькі яны).

У наступныя дні паветра Лягеру і фабрыкі прасякала “Selekcja”: ніхто ня ведае нічога дакладна, і ўсе пра гэта гавораць, нат вольныя работнікі — палякі, італьянцы, французы, — зь якімі мы тайна перамаўляемся на працы. Нельга сказаць, што ўздымаецца хваля адчаю. Наш калектыўны дух надта невыразны і ніякаваты, каб вагацца. Змаганьне супраць голаду, холаду і працы пакідае мала месца для думак, нават для думак пра голад і працу. Кожны рэагуе па–свойму, але амаль ніхто — такім чынам, які, здавалася б, быў куды больш апраўданым, то бок рэалістычным — пакорай і адчаем.

Хто можа нешта прадпрыняць, прадпрымае: але зрабіць ён ня можа амаль нічога, бо пазьбегнуць сэлекцыі вельмі цяжка. Немцы праводзяць гэтую апэрацыю вельмі сур’ёзна і старанна. Хто ня можа ратавацца матэрыяльна, шукае пэўнасьці інакш. У прыбіральнях, умывальніках мы паказваем адзін адному грудзі, дупу, лыткі, і прыяцелі пераконваюць: — Можаш быць спакойны, пэўна, не твая чарга… *du bist kein Muselmann*… а вось я… — і ў сваю чаргу спускаюць штаны і задзіраюць кашулю. Ніхто не адмаўляе іншаму ў гэтай міласьціне: ніхто ня ўпэўнены ў сваім лёсе, каб мець сьмеласьць выносіць прысуд

іншым. Я таксама бессаромна схлусіў старому Вэртгаймэру; сказаў яму, што як будуць распытваць, хай скажа, што яму сорак пяць, хай ня дасьць сябе загрэбсьці ў першы ж вечар, хаця б і коштам хабару з хлебную пайку; што, зрэшты, можа, і няма чаго баяцца, і што зусім не абавязкова йдзецца пра сэлекцыю на газ: хіба ён ня чуў ад *Blockltester*[1], што вылучаныя патрапяць у Явожна ў аздараўляльны лягер?

Спадзяваньні Вэртгаймэра абсурдныя: на выгляд яму шэсьцьдзесят, у яго варыкозныя жылы на нагах, ён ужо нават амаль не адчувае голаду. А ўсё ж ён ідзе на нары суцешаны і спакойны, а калі хто пытаецца, адказвае маімі словамі; гэта стала паролем Лягеру ў гэтыя дні: я сам пачуў гэтыя суцяшальныя словы ад Хаіма, які ў Лягеры ўжо тры гады, і з прычыны сваёй сілы і вытрываласьці неверагодна ўпэўнены ў сабе; і я паверыў яму.

На гэтым хісткім грунце і я прайшоў вялікую сэлекцыю ў кастрычніку 1944–га зь незразумелым спакоем. Я быў спакойны, бо здолеў хлусіць сабе настолькі, наколькі было трэба. Тое, што мяне ня вылучылі, залежала перадусім ад выпадку і ня сьведчыла пра абгрунтаванасьць маёй упэўненасьці.

Мсье Пінкер — яшчэ адзін асуджаны *a priori*: дастаткова зірнуць яму ў вочы. Ён знакам падклікае мяне і з налётам канфідэнцыйнасьці распавядае, што даведаўся, але зь якой крыніцы, ён мне сказаць ня можа, што на гэты раз адбываецца нешта сапраўды новае: Сьвяты Пасад за пасярэдніцтвам Міжнароднага Чырвонага Крыжу... адным словам, ён асабіста гарантуе, што як ён сам, так і я абсалютна надзейна абароненыя ад любой небясьпекі: у цывільным жыцьці ён, як вядома, працаваў у амбасадзе Бэльгіі ў Варшаве.

Здараецца рознае, але й гэтыя дні чаканьня, якія, калі распавядаеш пра іх, здаецца, сьведчаць пра пакуты, што пераўзыходзяць усякія чалавечыя сілы, і гэтыя дні мінаюць ня надта адрозна ад іншых дзён.

Дысцыпліна ў Лягеры і на фабрыцы не аслабла ні трохі; праца, холад і голад займалі ўсю нашу ўвагу без астатку.

Сёньня працоўная нядзеля, *Arbeitlossonntag*: працуем да трынаццаці, потым вяртаемся ў лягер, каб прыняць душ, пагаліцца і прайсьці агульны кантроль на каросту і вошы, і на будпляцоўцы, як ня дзіва, усе даведаліся, што сэлекцыя

адбудзецца сёньня.
Навіна дайшла, як заўсёды, у абалонцы супярэчлівых і падазроных падрабязнасьцяў: сёньня раніцай адбылася сэлекцыя ў шпіталі; працэнтоўка была ў сем працэнтаў ад усіх, у трыццаць–пяцьдзясят працэнтаў ад хворых. У Біркенаў комін крэматорыю дыміць ужо дзесяць дзён. Трэба вызваліць месца для агромністага эшалёну з Познані. Маладыя кажуць маладым, што вылучаюць усіх старых. Здаровыя кажуць здаровым, што вылучаюць толькі хворых. Што не крануць спэцыялістаў. Не крануць нямецкіх габрэяў. Не крануць Малыя Нумары. Вылучаць цябе. А мяне не крануць.
Як заўсёды, роўна а трынаццатай будпляцоўка пусьцее, а бясконцы шэры шэраг дзьве гадзіны шпацыруе перад двума кантрольнымі пунктамі, дзе як штодня, нас зноў і зноў падлічваюць, а аркестар дзьве гадзіны, як штодня, безь перапынку іграе маршы, пад якія мы павінны на выхадзе і на ўваходзе падладжваць свой крок.
Здаецца, усё ідзе, як штодня, комін кухні дыміць, даючы супакаеньне, ужо й раздача зупы пачалася. Але потым гучыць звон, і робіцца ясна, што пачалося.
Бо гэты звон звоніць заўсёды на сьвітанку, як будзільнік, а калі ён звоніць апоўдні, гэта значыць “Blocksperre”, замкнуць баракі. А адбываецца гэта пры сэлекцыі, каб ніхто яе ня ўнік, і каб ніхто ня бачыў, як ідуць у газавую камэру вылучаныя пры сэлекцыі.
Наш *Blockltester* ведае сваю справу. Праверыўшы, ці ўсе зайшлі, ён замкнуў дзьверы на ключ, раздаў кожнаму фармуляр з прозьвішчам, прафэсіяй, узростам і нацыянальнасьцю ды загадаў усім поўнасьцю распрануцца, пакінуўшы толькі чаравікі. Цяпер, голыя і з фармулярам у руках, мы чакаем, пакуль камісія прыйдзе ў наш барак. Мы ў бараку №48, але немагчыма прадугледзець, пачнуць яны з бараку №1 або з №60. У любым выпадку прынамсі на гадзіну мы можам супакоіцца і з поўным правам зашыцца на нары, каб сагрэцца пад коўдрамі. Шмат хто ўжо задрамаў, і тут сыплюцца каманды, лаянка і ўдары, што азначае набліжэньне камісіі. *Blockltester* і ягоныя памагатыя кулакамі з крыкам пагналі з глыбіні спальнай часткі напалоханы голы натоўп у *Tagesraum*[2], дзе месьціцца надзіральніцкая. *Tagesraum* — гэта пакойчык сем на чатыры мэтры: калі ўсіх туды загналі, у *Tagesraum* нагрувасьцілася

чалавечая маса, цёплая і кампактная, якая пранікла і запоўніла сабой усе куткі, ціснучы на драўляныя сьцены з разбуральнай сілай.
Мы ўсе цяпер у *Tagesraum*, і нам няма калі і няма дзе палохацца. Адчуваньне цёплага цела, якое сьціскае навокал, незвычайнае і не пазбаўленае прыемнасьці. Галоўнае — вышэй задраць нос, каб хапаць паветра, і не пакамечыць, не згубіць з рук фармуляр.
*Blockðltester* зачыніў дзьверы з *Tagesraum* у спальню і адчыніў дзьве наступныя, якія вядуць з *Tagesraum* і з спальні на двор. Там перад дзьвярыма стаіць вызначальнік нашага лёсу, падафіцэр СС. Праваруч ад яго *Blockltester*, леваруч капцёр бараку. Кожны з нас выходзіць голы з *Tagesraum* у халоднае кастрычніцкае паветра, мусіць прабегчы колькі крокаў празь дзьверы перад тымі трыма, аддаць фармуляр эсэсаўцу і вярнуцца празь дзьверы ў спальню. Эсэсавец за долю сэкунды паміж двума вязьнямі, зірнуўшы ў фас і ў профіль, вызначае лёс кожнага, а потым перадае фармуляр чалавеку праваруч або чалавеку леваруч, і гэта і ёсьць жыцьцё або сьмерць кожнага з нас. За тры–чатыры хвіліны барак на дзьвесьце чалавек “зроблены”, а пасьля абеду гатовы й увесь лягер на дванаццаць тысячаў чалавек.
Я, зацісьнуты сярод мяса ў *Tagesraum*, паступова стаў адчуваць, што людзі ціснуць на мяне слабей, а неўзабаве надышла й мая чарга. Як усе, я прайшоў энэргічным, эластычным крокам, імкнучыся трымаць галаву вышэй, выкаціўшы і напяўшы грудзі, напружыўшы мускулы. Краем вока паспрабаваў азірнуцца, і мне падалося, што мой фармуляр трапіў направа.
Вяртаючыся адзін за адным у спальню, мы апраналіся. Ніхто яшчэ дакладна ня ведаў свайго лёсу. Трэба перш за ўсё вызначыць, ці фармуляры асуджаных пайшлі направа, ці налева. Цяпер ня той момант, каб далікатнічаць і трымацца забабонаў. Усе тоўпяцца вакол найбольш старых, схуднелых, “мусульманаў”; калі іхныя фармуляры пайшлі налева, то зьлева дакладна месца асуджаных.
Яшчэ сэлекцыя ня скончылася, а мы ўжо ведалі, што зьлева сапраўды “schlechte Seite”, кепскі бок. Натуральна, здарыліся непаразуменьні: напрыклад, Рэнэ, такі малады і здаровы, патрапіў налева. Можа таму, што носіць акуляры, можа таму, што крочыць схіліўшыся, як усе блізарукія. Але хутчэй за ўсё з

прычыны простай памылкі: Рэнэ прайшоў камісію проста перада мной, і тыя маглі проста паблытаць фармуляры. Я ўсё думаю аб гэтым, гутару пра гэта з Альбэртам, і мы згаджаемся, што гэтая гіпотэза верагодная: ня ведаю, што я буду думаць аб ёй заўтра і потым; сёньня яна не выклікае ў мяне ніякіх акрэсьленых эмоцыяў.

Падобна, што памылкова ацанілі й Сатлера, магутнага трансыльванскага селяніна, які дваццаць дзён таму быў яшчэ ў сябе дома; Сатлер не разумее па–нямецку, зусім нічога не зразумеў з таго, што адбылося, і латае ў кутку сваю кашулю. Можа падыйсьці да яго і сказаць, што кашуля яму больш не спатрэбіцца?

Дзівіцца памылкам няма чаго: агляд быў вельмі хуткі й павярхоўны, а потым для адміністрацыі Лягеру ня так важна вылучыць менавіта самых непатрэбных, як важна хутчэй вызваліць месцы на заранёў вызначаны працэнт.

У нашым бараку сэлекцыю ўжо скончылі, але працягваюць у іншых, а таму мы яшчэ сядзім пад замком. Тымчасам прыехалі бідоны з зупай, і *Blockltester* вырашыў прыступіць да раздачы. Вылучаным даюць двайную пайку. Ня ведаю, ці гэта была абсурдна жаласьлівая ініцыятва *Blockltester*'а, ці адмысловае распараджэньне эсэсаўцаў. Але насамрэч на працягу двух–трох дзен (часам і значна больш) ад сэлекцыі да вывазу ахвяры Мановіцу–Аўшвіцу карыстаюцца гэтым прывілеем.

Цыглер падстаўляе місу, атрымлівае нармальную пайку, але стаіць і чакае. — Што табе яшчэ? — пытаецца *Blockltester*. Па ягоных выкладках Цыглеру не належыць дабаўка, і ён падганяе яго высьпяткам. Але Цыглер вяртаецца і прыніжана настойвае: яго сапраўды скіравалі налева, усе гэта бачылі.

*Blockltester* ідзе зірнуць у сьпісы: так, ён мае права на двайную пайку. Атрымаўшы яе, Цыглер спакойна ідзе на нары есьці. Цяпер кожны ўважліва вышкрэбвае лыжкай дно місы, каб сабраць рэшткі зупы, звонкі скрыгат па мэтале азначае, што дзень скончаны. Паступова ўсё змаўкае, і вось з маіх нараў на трэцім паверсе відаць і чуваць, як стары Кун моліцца ўголас, нацягнуўшы на галаву бэрэт, і моцна ўдарае сябе ў грудзі. Кун дзячыць Богу, бо яго ня вылучылі.

Кун — прыдурак. Хіба ён ня бачыць на суседніх нарах Бэпа, дваццацігадовага грэка, які пасьлязаўтра пойдзе ў газавую камэру і ведае гэта? Ён ляжыць выпрастаны і глядзіць проста

на лямпачку, нічога ня кажучы і ўжо ні аб чым ня думаючы? Хіба Кун ня ведае, што наступным будзе ён? Хіба Кун не разумее, што сёньня рабілася такое паскудзтва, што ніякая хвалебная малітва, ніякае дараваньне, ніякае выкупленьне грахоў вінаватымі, наагул нішто з таго, што можа чалавек, не дапаможа?
Калі б я быў Богам, я выплюнуў бы Кунаву малітву на зямлю.

[1] блёкавы (нямецк.).
[2] агульнае памяшканьне (нямецк.).

*Пераклаў зь італьянскай Валеры Буйвал паводле Primo Levi.* Se questo e un uomo. *Roma, L'Unita / Einaudi, 1992.*

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]



---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **01-02-2000**

[image]
[image] Вайна й 2(3)-1999 .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 2(3)-1999

***сьветліня***

# Цьветан Тодараў Дзесяць гадоў бяз Прыма Леві

**Цьветан Тодараў — (нар. 1939, Баўгарыя, з 1963 г. у Францыі) — філёляг, сэміётык, культуроляг. Аўтар, сярод іншых, кніг “Паэтыка прозы” (1971), “Тэорыі сымбаля” (1977), “Мы і іншыя” (1989), “Тварам да скрайняга” (1991), “L’homme depayse” (1996). Ягоная апошняя кніга — “Бэнжамэн Канстан. Дэмакратычная жарсьць” (1997, “Minuit”). Сярод нядаўніх артыкулаў — “Чаму Якабсон і Бахцін так і не сустрэліся” (1997, “Esprit”). Інтэлектуальны і публіцыстычны стыль Тодарава супрацьлеглы стылю ягонай суайчыньніцы Юліі Крысьцевай, якая таксама жыве й працуе ў Францыі.**

**З** гадамі Прыма Леві стаў адным з аўтараў, якія найбольш паўплывалі на мяне. Гэты факт не перастае зьдзіўляць мяне самога, бо прычыны гэтай блізкасьці не зусім ясныя. Сам я замалады, наўпрост з нацызмам не сутыкаўся, і ніхто з маіх сваякоў ня стаў ахвярай нацызму. Выходзіць, тлумачэньне майго пачуцьця палягае ня ў тым, што мы падзяляем агульны досьвед. І ўсё ж я гадаваўся ў таталітарнай краіне, і гэты факт складаным чынам, які я не магу ні прааналізаваць, ні праігнараваць, прывёў мяне да адчуваньня глыбіннай

закранутасьці пытаньнем дабра і зла, у прыватнасьці, у ягоных палітычных вымерах. Гэтая патрэба ўжо, у сваю чаргу, прывяла мяне да пошуку новага гуманізму, і менавіта на гэтым шляху я сустрэўся з творамі Прыма Леві і паспрабаваў засвоіць сія–тыя зь ягоных урокаў.
Калі б мне трэ было вылучыць галоўнае ў той гуманістычнай думцы, якую я знаходжу ў Леві — а таксама ў некаторых іншых сучасных аўтараў, вось у Рамэна Гары — я адзначыў бы дзьве, магчыма, банальныя, але моцныя тэзы, моц якіх і бярэцца з самой гэтай супрысутнасьці. Першая заключаецца ў прызнаньні таго, якія жахі здольны чыніць чалавек. Гуманізм тут зусім ня зводзіцца да культу чалавека, чалавека ўвогуле і ў прыватнасьці, або веры ў высакароднасьць ягонай натуры; не, адпраўны пункт тут — гэта Асьвенцым, найбольшы за гэтае стагодзьдзе паказьнік таго, якое зло можа зрабіць чалавеку чалавек. Другая тэза заключаецца ў сьцьвярджэньні магчымасьці дабра, таго дабра, якое бярэ за сваю канцавую мэту чалавека ў ягонай канкрэтнай і індывідуальнай тоеснасьці, і адмове падмяняць яго звышнатуральнай істотай, Богам, або наадварот, сіламі, ніжэйшымі за чалавечую прыроду — законамі жыцьця або якімі абстрактнымі вартасьцямі, выбранымі чалавекам: працьвітаньнем, рэвалюцыяй або чысьцінёй і, ідучы далей, законамі Гісторыі. Як прымірыць гэтую адсутнасьць ілюзіяў наконт чалавека з захаваньнем чалавека ў якасьці мэты нашага дзеяньня? Вось праблема, што паўстае перад сучасным гуманізмам, гуманізмам пасьля Асьвенцыму й Калымы.

**Памяць і крыўда**
Сёньня аднак я хацеў бы падысьці да думкі Леві не ў агульнафілязафічным пляне, а праз больш спэцыфічную, хоць і цэнтральную ў ягоных кнігах тэму, якую можна акрэсьліць двума словамі: словамі “памяць” і “крыўда”, якія мы знаходзім у загалоўку першага падразьдзелу кнігі “Хто патануў і хто ўратаваўся”. Гэтая апошняя кніга Леві, як вядома, складаецца ўжо не са сьведчаньняў пра ягоны досьвед, а з разважаньняў пра Асьвенцым, якія выкрышталізаваліся ў яго за сорак гадоў, што аддзяляюць яго ад лягеру. З простасьцю і яснасьцю, характэрнымі для ўсёй кнігі, у першым падразьдзеле Леві разьвівае дзьве ідэі. Першая зь іх заключаецца ў тым, што

памяць заўсёды недасканалая: мы выкарыстоўваем яе зусім не бескарысьліва. Найчасьцей мы зь яе дапамогай абараняемся ад мінулага; памяць — няверная, ня вартая даверу сяброўка, мы ўладкоўваем мінулае паводле сваіх інтарэсаў і цяперашніх стэрэатыпаў. Другая ідэя ўводзіць адрозьненьне: нельга аднолькава падыходзіць да памяці зьняволеных і памяці ахоўнікаў. Я скажу так (гэтых словаў няма ў Леві, але, мне здаецца, яны добра падсумоўваюць ягоную думку): былыя зьняволеныя маюць права на забыцьцё, тады як былыя ахоўнікі, хутчэй, — абавязаныя памятаць. Толькі так яны могуць калі ня выкупіць свае злачынствы, дык прынамсі ўсьвядоміць уласную злачыннасьць і прыйсьці да раскаяньня; ахвярам жа забыцьцё можа даць спакой.

Гэтыя назіраньні і адрозьненьні здаюцца мне неаспрэчнымі, і я гатовы падпісацца пад імі. Я хацеў бы толькі дапоўніць іх некалькімі разважаньнямі, паспрабаваўшы выказаць тое, што Леві адно дае зразумець. Гэтыя разважаньні будуць весьціся вакол двух паняцьцяў: памяць, крыўда.

Памяць: нашы ўспаміны пра мінулае не настолькі дакладныя, як нам хочацца, бо памяць — гэта не мэханізм, цалкам адасоблены ад іншых мэханізмаў чалавечай дзейнасьці, гэта ня штосьці такое, чаму заменаю можа стаць памяць кампутара. У пэўным сэнсе, вядома, я магу сказаць, што я ёсьць (і я ёсьць толькі) тым, што я ўяўляю сабой у гэты дадзены момант — ідэальную тоеснасьць між я і я, гэтымі целам, мозгам, тут і цяпер.

Але ў іншым, менш банальным сэнсе, супадзеньне я і я — гэта ілюзія: я заўсёды ёсьць большым, чым тое, чым я ёсьць, бо як у прасторы, так і ў часе я выходжу па–за межы сябе. Я тут ня проста я, бо іншыя таксама ўваходзяць у мяне; я складаюся са сваіх сустрэчаў і абменаў зь імі, і я цяпер ня толькі я, бо мая тоеснасьць ствараецца мінулым.

Калі я адкрываю для сябе, што мінулае было зусім не такім, як я меркаваў, або наадварот, завешваю для сябе некаторыя ягоныя аспэкты, каб магчы жыць шчасьліва, — гэта ставіць пад пытаньне не асобныя часткі маёй істоты, але самую тоеснасьць. Я не магу прыняць іх бяздумна; жаданьне кантраляваць іх цалкам лягічнае.

Можна было б даўжэй спыніцца на другім, неаспрэчным меркаваньні Леві: нельга падыходзіць да ахоўнікаў і

зьняволеных з аднымі патрабаваньнямі. Іншымі словамі, нельга аднолькава прасіць усіх: памятайце!
Трэба выстаўляць розныя патрабаваньні ў залежнасьці ад таго, якую ролю адыгрываў у мінулым чалавек ці да якой групы ён належаў. Або можна сказаць яшчэ й так: захаваньне мінулага добрае не само сабою, яно робіцца добрым пры пэўным раскладзе ў сыстэме роляў і дзеяньняў. Але ў чым канкрэтна гэтыя ролі й дзеяньні заключаюцца?
Разгледзім спачатку некалькі прыкладаў. Леві сам падказвае, што, калі ўспаміны занадта пакутлівыя для былога вязьня, няма ніякай прычыны трымаць іх у галаве вечна. Да такой высновы часта схіляюцца аўтары, якія апісваюць гэты тып досьведаў, а таксама тэрапэўты й псыхолягі.
Зацятае нежаданьне забываць дае не адзін толькі гэты нэгатыўны эфэкт. Як не прыгадаць яшчэ адзін разбуральны ўжытак памяці, той, калі перанесеная крыўда дае падставу для нанясеньня крыўды ў адплату. [...]
Дух рэваншу — не адзіная магчымасьць непажаданага ўжытку памяці былой ахвярай, калі былая ахвяра “тут” робіцца катам недзе “там”. У 1958 годзе, калі ўспаміны пра другую сусьветную вайну зь яе жорсткасьцямі былі яшчэ сьвежымі ў Францыі, у Альжыры французы сталі шырока ўжываць катаваньні. Гэтай паралелі не маглі не заўважыць сьведкі той эпохі (і Леві, дарэчы, таксама). У пасьлямове да “Допыту” Анры Алега Сартр пісаў:
“У 1943 годзе на вуліцы Лёрыстон французы крычалі ад нэндзы й болю, і іх чула ўся Францыя. Зыход вайны заставаўся няясным, і мы не хацелі задумвацца над будучыняй; адно нам здавалася немагчымым у любым разе: каб з–за нас некалі вось так крычалі людзі. Для французаў няма немагчымага: у 1958 годзе ў Альжыры рэгулярна, сыстэматычна катуюць людзей, усе гэта ведаюць, — але ўсе маўчаць”.
Няма, мабыць, іншай краіны сьвету, дзе памяць пра генацыд была б такой жывой паўсюль, як у Ізраілі; але ці можна сказаць, што гэтая краіна дэманструе сёньня прыклад бездакорнай палітыкі ў тым, што датычыць права іншых на існаваньне й годнасьць?
Мінулае не заўжды навучыць добрага былую ахвяру; няма гарантыі, што кат, у сваю чаргу, ня будзе натхняцца прыкладам дзеяў колішніх катаў. Сьцьвярджаюць, што Гітлер, калі

вырашылася пытаньне генацыду жыдоў, кінуў: “Хто цяпер памятае пра генацыд армянаў?” Ён бачыў у тым генацыдзе не папярэджаньне сабе, а доказ таго, што злачынства можа застацца непакараным і незаўважаным гісторыяй — імя Энвэра–пашы не фігуруе ў сьпісах вялікіх злачынцаў супраць чалавецтва.
[...]
Я не зусім веру ў карысьць Музэю Галакосту ў Вашынгтоне — не як такога, а як сродку выхаваньня амэрыканскага народу. Чаго можа навучыцца амэрыканец–турыст, пабачыўшы сьведчаньні злачынстваў, зьдзейсьненых паўстагодзьдзя таму нямецкімі нацыстамі? Яно можа толькі сьцьвердзіць яго ў ягонай пэўнасьці: мы ніколі не чынілі падобных злачынстваў, можа сказаць ён, і зрэшты, дзякуючы нам былі пераможаныя гэтыя паскуды. Вынік атрымліваецца зусім іншым, чым калі б на месцы Музэю Галакосту стаяў музэй вынішчэньня індзейцаў або нэгрыцянскай няволі. Самая ідэнтычнасьць Злучаных Штатаў грунтуецца на двух гэтых вялізных злачынствах, а іх наступствы яшчэ адбіваюцца на штодзённым жыцьці сёньняшняй Амэрыкі ў форме культу гвалту і пераўтварэньня гарадоў у адасобленыя і варожыя гета. Задумацца над уласнай адказнасьцю — значыць, магчыма, зьмяніць сябе; яшчэ ніхто не палепшыў сябе, вучачы іншых маралі.

**Чатыры ролі**

Я хацеў бы трохі ўдакладніць гэтую першую інтуіцыю. Тут можна заўважыць, што, па–першае, у любым апавяданьні зь мінулага ёсьць свае героі і нягоднікі, станоўчыя і адмоўныя пэрсанажы; і па–другое, што гісторык (або крытык, або філёзаф, або проста наратар) уваходзіць у стасунак ідэнтыфікацыі з адной з гэтых роляў і запрашае сваіх чытачоў ці гледачоў рабіць гэтаксама. Што ж гэта за ролі? Любы маральна не нэўтральны ўчынак можа зьдзяйсьняцца ў адпаведнасьці з дабром ці злом, ён закранае прынамсі двух пратаганістаў, агента і пацыента. Гэта дазваляе нам вылучыць у любым гістарычным апявяданьні, якое мае дачыненьне да вартасьцяў, чатыры галоўныя ролі: я мог быць дабрадзеем або тым, на каго скіраваныя дабрадзействы ўчынку, а мог быць таксама злодзеем або ягонай ахвярай. На першы погляд толькі

дзьве з гэтых роляў, ролі дабрадзея і злодзея, ясна азначаныя ў пляне вартасьцяў, тады як дзьве другія, ролі дабрабёрцы і ахвяры — нэўтральныя, бо пасыўныя.
У сапраўднасьці ж дзьве апошнія ролі таксама маральна азначаныя ў сілу сваёй сувязі зь дзьвюма першымі. У становішчы дабрабёрцы нашмат менш гонару, чым у становішчы дабрадзея, бо яно азначвае момант нашага бясьсільля; быць ахвярай злога ўчынку, відавочна, нашмат больш пачэсна, чым быць за яго адказным. Вылучаюцца два вялікія тыпы гістарычных канструкцыяў: гераічнае апавяданьне, што апявае подзьвіг “сваіх”, і ахвярскае апавяданьне, якое апісвае перажытыя мучэньні.
Такім чынам, дзьве ролі спрыяльныя для “я” — гэта ролі героя–дабрадзея і бязьвіннай ахвяры, і дзьве неспрыяльныя — злодзея і пасыўнага дабрабёрцы. Калі мы, згадваючы мінулае групы, да якой належым, атаесамляем сябе з пазытыўнымі фігурамі, мы лесьцім сабе, прыпісваючы добрую ролю; тое самае адбываецца, калі мы адначасова зьмяшчаем іншых у ролю бездапаможнага атрымальніка дабрадзействаў або злачынца. Зусім іншая сытуацыя атрымліваецца, калі разьмеркаваньне роляў супрацьлеглае. “Мне” няма ніякай простай выгоды згадваць той факт, што “мае” таксама маглі быць агентамі зла ці пасыўнымі адрасатамі чужога геройства, а іншыя маглі быць ахвярамі ці героямі; але толькі такім чынам я, кажучы словамі Канта, стаўлю шчасьце іншага і ўласную дасканаласьць па–над уласнымі інтарэсамі і пачынаю маральнае дзеяньне. Інакш кажучы: калі ўзгадваньне мінулага заключаецца ў ідэнтыфікацыі сябе з слаўнай роляй (героя ці ахвяры), яно не дае суб’екту ніякай маральнай карысьці. Такая карысьць ёсьць толькі ў тым выпадку, калі згадка пра мінулае дазваляе нам усьвядоміць грахі і памылкі сваёй групы. Такой перасьцярогі адносна ўжытку мінулага недастаткова — мы гэта пабачым; тым ня менш, яна вызначае нам нейкі першасны накірунак...
Пяройдзем цяпер да другога паняцьця — крыўды; задумаемся спачатку, якую рэакцыю грамадзтва яна павінна выклікаць. Прыма Леві выказаўся на гэты конт асабліва ясна; ягоную пазыцыю можна ахарактарызаваць як падвойную адмову, якая вядзе да пазытыўнай сьцьвярджальнасьці: не дараваньне, ня помста, але справядлівасьць. Не дараваньне:
“Ня маю схільнасьці дараваць, — піша ён, — нікому з маіх

тадышніх ворагаў, як не адчуваю магчымасьці дараваць іх сёньняшнім пераемнікам [...], бо ня ведаю, якія чалавечыя ўчынкі могуць сьцерці грэх".
Ня помста:
"Помста мяне не цікавіла; [...] мне нават вельмі падыходзіла, што шыбеніцамі і справамі правасудзьдзя заняліся іншыя".
Якія прычыны такога выбару?
Па–першае, дараваць можна толькі тое, што сам перанёс; але як я магу браць на сябе права дараваць тое, ад чаго пакутаваў іншы? Таму забойства (а генацыд — гэта масавае забойства) недаравальнае па азначэньні. Блізкія ахвяры могуць вырашыць не перасьледваць забойцу сваёй нянавісьцю; але яны ня могуць падмяніць таго, хто страціў жыцьцё. Здаецца, дараваньне асабліва патрэбнае таму, хто даруе — бо гэта дазваляе яму жыць у спакоі; але ніхто ня мае права такім чынам наноў інструмэнталізаваць ахвяраў. Юрыдычнае дараваньне, ці амністыя, ні ў якім разе не павінна папярэднічаць прысуду або зьнімаць адказнасьць за такія цяжкія злачынствы, як забойства, пыткі, дэпартацыю ці навяртаньне ў рабства: самую ідэю правасудзьдзя трэба адхіліць у імя іншых, больш важных фактараў, напрыклад, грамадзянскага міру. Перш чым перагарнуць старонку былых злачынстваў, трэба прачытаць яе, казаў экс–прэзыдэнт Балгарыі, былы дысыдэнт Жэлё Жэлеў. Дараваньне — гэта асабісты выбар, тады як злачынства выходзіць за прыватныя рамкі. Калі маюць месца памылка, злачынства, ня толькі гіне ахвяра, пацярпелы чалавек; пры гэтым таксама аказваецца растаптаным ці прынамсі парушаным сацыяльны парадак, што прадугледжвае ідэю правасудзьдзя і адплаты. Калі адзін чалавек даруе другому, значыць, ён вырашае прабачыць нанесеную крыўду, але гэта не загладжвае шкоды, нанесенай сацыяльнаму парадку.
Зь іншага боку паўстае ня менш спрэчная спакуса помсты. Трэба адзначыць, што ў нашы дні помста ня ў модзе і часта хаваецца пад патрабаваньне правасудзьдзя... Правасудзьдзе адрозьніваецца ад помсты дзьвюма рэчамі. Па–першае, помста заключаецца ў адказе на індывідуальны акт іншым індывідуальным актам, у прынцыпе, параўнальным: ты забіў майго сына, а я заб'ю твайго. Між тым правасудзьдзе суадносіць індывідуальны ўчынак з усеагульнасьцю закону; безыменнасьць тых, хто вяршыць суд і праўду (паліцыянты і

судзьдзі) процістаўляецца ўласнай канкрэтнасьці мсьціўцы. Як і дараваньне, помста — акт асабісты, правасудзьдзе — не, для закону індывіды не існуюць. Разам з тым пакараньне адмяраюць не паводле злачынства, а ў прапарцыйным параўнаньні зь іншымі пакараньнямі, яно не матывуецца непасрэдна злачынствам, а існуе ў пэўнай сыстэме. Акт правасудзьдзя ліквідуе правал у грамадзкім ладзе, пацьвярджае дзейснасьць закону (пісанага або, як у злачынствах супраць чалавецтва, непісанага) і, такім чынам, самое існаваньне сацыяльнага ладу; неабявязкова пры гэтым кампэнсуецца крыўда, нанесеная індывіду–ахвяры.

Помста, заўважае Леві, нічога не вырашае: яна дадае новы гвалт да старога, але такое складаньне не кладзе канец гвалту... Недахоп правасудзьдзя ў абстрактнасьці і дэпэрсаналізацыі; але ў гэтым якраз шанц зьменшыць гвалт. Важна ня тое, суворыя суд і праўда ці паблажлівыя, важна, каб яны былі.

Адплата за шкоду — толькі адзін з аспэктаў пытаньня крыўды... У кнізе “Хто патануў, хто ўратаваўся” адразу за “Памяцьцю і крыўдай” ідзе падраздзел “Шэрая зона”. Гэтым тэрмінам, які ён сам прыдумаў, Леві абазначае, па–першае, тых, каго нельга цалкам залічыць у “зьняволеных” ці “ахоўнікаў”. Сапраўды, як у нямецкіх, так і ў савецкіх лягерах штатным ахоўнікам з SS і КГБ дапамагалі шматлікія вязьні, якіх узвышалі над агульнай масай, але трымалі ў не да параўнаньня ніжэйшым становішчы адносна саміх ахоўнікаў; іх звычайна выбіралі з звычайных крымінальнікаў, тэхнічнага й мэдычнага пэрсаналу, спэцыялізаваных работнікаў. Гэтыя людзі, хто ў большай, хто ў меншай ступені, адначасова належалі да дзьвюх катэгорыяў — вязьняў і ахоўнікаў. Аднак Леві ўжывае выраз “шэрая зона” ў яшчэ шырэйшым сэнсе. Ён апісвае, як у аднаго жорсткага й бязьлітаснага генэрала–эсэсаўца аднойчы здарыўся парыў спагады да адной з ахвяраў:

“Гэтая адзіная сэкунда спагады, бадай, не выкупае ўсіх правінаў Мугсфэльда, але нават яна адна ўжо зьмяшчае яго ў “шэрую зону”, хаця й бліжэй пад яе край”. Іншымі словамі: у гэтую зону ўваходзяць ці ня ўсе насельнікі лягеру.

Гэтая выснова можа прывесьці да аднаго непаразуменьня. Трэба яго адразу зьняць. Леві мае на ўвазе (хаця й не заўсёды выказвае гэта наўпрост) што дзеяньні чалавечыя трэба

разглядаць як у юрыдычным пляне, так і ў антрапалягічным (або псыхалягічным); нельга аддаваць аднаму пляну перавагу над другім. Юрыдычны бок прадугледжвае, што чалавек заўсёды разглядаецца як свабодны агент і, значыць, як суб'ект, адказны за свае дзеяньні. У гэтым сэнсе ня можа быць ніякага зьмешваньня катаў і ахвяраў. Леві рашуча крытыкуе тых, хто, робіцца ўражаньне, блытае дзьве гэтыя ролі, напрыклад, рэжысэра Лільяну Кавані, словы якой ён цытуе: "Мы ўсе ахвяры або забойцы, і мы з добрай ахвоты прымаем гэтыя ролі". Леві пратэстуе:

"Ня ведаю [...], ці ўматаўся ў глыбіню маёй душы забойца, але знаю, што я быў ахвяраю безь віны, а не забойцам; знаю, што забойцы існавалі [...] і што блытаць іх зь іхнымі ахвярамі — сьмяротная хвароба, або эстэцкае какецтва, або чорны знак таго, што вы заадно з забойцамі".

Тое, што мы ўсе з адной дзежкі, яшчэ не азначае, што трэба ігнараваць бясспрэчны факт, што між патэнцыйнасьцю і актам — цэлая бездань: можа, мы сапраўды ўсе — эгаісты, але ня ўсе мы робімся расістамі, а сярод расістаў, у сваю чаргу, толькі немцы ў Эўропе перайшлі да вынішчэньня іншай расы.

Усе людзі *патэнцыйна* могуць зьдзейсьніць аднолькавае зло, але ня ўсе рэальна могуць яго зьдзейсьніць, бо ў іх розныя жыцьцёвыя досьведы: у іх маглі выхаваць здольнасьці любові, спагады, маральнай ацэнкі або, наадварот, усё гэта маглі заглушыць і вырваць з коранем. Вось у чым розьніца між Поляй Ліфшыц, якая добраахвотна сядае на цягнік да Трэблінкі, каб быць пры нямоглай маці, і кіраўніком гэтага лягеру, які імкнецца займацца выключна тым, *як* функцыянуе лягер, і ня браць да галавы ягоных мэтаў. Адны людзі могуць забіваць і мучыць, другія — не; таму нельга гаварыць пра "звычайнасьць зла": ня толькі зло, зьдзейсьненае Айхманам і Штанглем, ня ёсьць звычайным, але й самі гэтыя людзі перастаюць быць звычайнымі, калі вырашаюць паслаць на сьмерць тысячы іншых людзей. Ёсьць усё–ткі розьніца, і вельмі сутнасная, і менавіта яна апраўдвае асьветніцкую і грамадзкую дзейнасьць — тое, чаму Леві аддана прысьвячаў сябе ўсё жыцьцё. Хоць людзі й падобныя адзін да аднаго, але падзеі — адзіныя й непаўторныя; гісторыя ж складаецца з падзеяў, і менавіта над падзеямі трэба разважаць, і іх трэба судзіць.

Аднак недастаткова абмяжоўвацца толькі адным бокам

юрыдычнай і маральнай адказнасьці; трэба таксама прызнаць, што прыналежнасьць да шэрай зоны шмат зьмяняе, і задумацца над наступствамі гэтага. Бо, як казаў Рамэн Гары: “Пакуль мы не прызнаем, што бесчалавечнасьць уласьцівая чалавеку, мы будзем заставацца ў цнатлівай аблудзе”... Такім чынам, Леві адмаўляе падзел людзей на дзьве дакладныя катэгорыі і вучыць нас пераадольваць маніхейства.

**Увасабленьне пакоры**

Цяпер мы можам дакладней акрэсьліць уласьцівую яму пісьменьніцкую пазыцыю. Маральнае выхаваньне індывіда адбываецца ў некалькі этапаў. На першым этапе дзіця спасьцігае самое адрозьненьне паміж добром і злом празь любоў сваіх родных, аб’ектам якой яно зьяўляецца; калі гэтага першага кроку не адбываецца, мы маем справу з этычнай абыякавасьцю, поўным рэлятывізмам усіх вартасьцяў. На другім этапе чалавек адкрывае, што я або мы не абавязкова зьяўляемся ўвасабленьнем дабра, а другія — несумненна горшымі за нас; ён падштурхоўвае нас пераадолець свой эгацэнтрызм. Толькі пасьля першых двух можа пачацца трэці этап, і няшмат людзей дасягае яго; на гэтым этапе чалавек адракаецца ўсякага выключнага і канчальнага перадпадзелу на дабро і зло, не перастаючы, аднак, адрозьніваць дабро ад зла; на гэтым этапе чалавек змагаецца і пераадольвае ў сабе ўжо не рэлятывізм і эгаізм, а маніхейства. Акурат такі тып маральнай пазыцыі ўвасабляе Прыма Леві.

У гэтым кантэксьце робіцца ясным, чаму Леві так не падобны на іншых аўтараў і дзеячоў нашага стагодзьдзя, якія сюд–туд прысьвячаюць свае тэксты адной зь нядаўніх катастрофаў. Вядома, гэтыя аўтары прызнаюць існаваньне дабра і зла; але яны гэта робяць, каб упрывілеяваць сябе і ўласную групу: бо яны пішуць як пераможцы гэтага зла або як ягоныя ахвяры. Некаторыя аўтары пераступаюць гэтую першую мяжу і павяртаюць гнеў на ўласную групу, прыпадабняючыся да старых прарокаў, што бічавалі ўласны народ, што запаў у грэх. Для такога немца немцы — найгоршы народ на зямлі, для такога амэрыканца гісторыя Злучаных Штатаў — ланцуг імпэрыялістычных агрэсіяў і расавых несправядлівасьцяў. Гэты бязьлітасны крытык — захавальнік маральных вартасьцяў, той,

хто паказуе іншым правільную дарогу, а сам мае прывілей цноты. Ён, аднак, не пазбаўлены эгацэнтрызму: кажучы “мы ўсе вінаватыя”, ён мае на ўвазе “ўсе, але я менш, чым іншыя, бо менавіта я гэта кажу”.

Побач з гэтымі громагалоснымі маралізатарамі, якія з подзьвігаў, няшчасьцяў і злачынстваў свайго народу чэрпаюць упэўненасьць ва ўласнай рацыі, Прыма Леві здаецца самім увасабленьнем пакоры. Ён не ўзьвяшчае, а кажа напаўголасу; ён узважвае “за” і “супраць”, нагадвае пра выняткі, шукае прычыны ўласных рэакцыяў. Ён не прапануе ашаламляльных тлумачэньняў падзеяў мінулага і пазьбягае інтанацыяў прарока, наўпрост падключанага да сьвятарнага; ён умее заставацца чалавечным, надта чалавечным, сутыкаючыся з экстрэмальным. А калі ён гаворыць пра зло, крыніцу праўды, ён робіць гэта не для таго, каб абвінаваўча тыкнуць пальцам на гэтае зло ў іншых, але для больш уважлівага, бязьлітаснага дасьледаваньня сябе пад мікраскопам.

У кнізе “Хто патануў і хто ўратаваўся” Леві падрабязна апавядае гісторыю Хаіма Румкоўскага, прэзыдэнта гета ў Лодзі. Сьмеху вартая, нікчэмная ўлада, якою надзялілі яго немцы, проста ап’яняла Румкоўскага, і ён ставіў сябе як той цар, што ў суворых умовах жыцьця ў гета выглядала гратэскным і камічным. Але Леві ня кпіць зь яго і не абураецца, а знаходзіць у гэтым гістарычным факце нагоду для разважаньня пра разбуральнае ўзьдзеяньне любой улады на таго, хто яе ажыцьцяўляе. Румкоўскі ня вытрываў; але ці мы мацнейшыя за яго?.. Перст, які паказваў на Румкоўскага, паказвае цяпер на аўтара; трагедыя Румкоўскага — гэта наша трагедыя. Як і яму, “нам так засьляпляе пад чарамі ўлады і прэстыжу, што мы забываемся пра сваю сутнасную крохкасьць: мы добраахвотна ці вымушана заключаем дамову з уладай, забываючыся, што ўсе мы ў гета [...] і што зусім побач чакае эшалён”.

Некалькімі старонкамі ніжэй Леві апавядае выпадак, які здарыўся зь ім асабіста: аднойчы, калі вязьні зусім засьмяглі, ён выдабыў крыху вады, але падзяліўся толькі з найбліжэйшым сябрам, а зь іншымі — не. Раздумваючы над гэткім “нашызмам”, эгаізмам, што распаўсюджваецца і на блізкіх сваіх, ён не імкнецца ганьбіць сябе: на ягоным месцы любы дзейнічаў бы гэткім жа чынам, ды ўвогуле ён не зрабіў ніякага асаблівага зла, нікога не забіў. І ўсё ж гэтага нязначнага

эпізоду дастаткова, каб зарадзіць у сабе “цень падазрэньня: што ўсе мы Каіны свайго брата, што ўсе мы [...] занялі месца свайго бліжняга і жывём на ім”.
Страшны вывад для чалавека, надзеленага маральнай сьвядомасьцю. Няўжо сапраўды няма ніякага бар’еру паміж злом і чалавечым я? Зло выключна моцнае; ад яго ніхто з нас не застрахаваны; скрыжаваньне двух гэтых сьцьвярджэньняў здольнае кінуць у роспач чалавека з самай добрай у сьвеце воляй. Але ці пра адно і тое самае зло тут ідзецца?
Леві вельмі ўважліва й не бяз смутнай трывогі вывучыў зону, дзе можа праявіцца гэтая мяжа; адказ на гэтае пытаньне важны для яго ня толькі абстрактна, але й для падтрымкі ўласнага існаваньня. Дылему можна было б сфармуляваць так: або існуе радыкальнае зло, зло, якое робяць, каб рабіць зло — “каб служыць д’яблу”, сказалі б хрысьціяне; вось гэткае зло юдзіць чалавека, калі ён забівае і рэжа на кавалкі дзіця, мучыць іншага чалавека да сьмерці. Ня ўсе і не заўсёды працятыя такім крайнім злом. Або існуе звычайнае, агульнае, ардынарнае зло, корань якога ў тым, што чалавек сябе любіць лепш за іншых, як у гісторыі Каіна ды Абэля; у пэўных экстрэмальных абставінах — войны, таталітарныя й ваенныя дыктатуры, катастрофы — у звычайнага зла бываюць незвычайныя вынікі. Гіпотэза з д’яблам тут непатрэбная.
Леві задумваецца над гэтым пытаньнем у падразьдзеле, які называецца “Гвалт без патрэбы”. Гвалт “патрэбны” сустракаецца дай жа часта: калі я не магу дасягнуць мэты мірным шляхам і чую ў сабе дастатковую сілу, я ўжываю гвалт. Зло тут — проста грубы сродак, кароткая дарога, якою зручна праставаць да дабра, свайго або сваёй супольнасьці. Але ў сьвеце канцэнтрацыйных лягераў Леві назірае таксама розныя выпадкі красамоўна “непатрэбнага” гвалту: чаму б не прадугледзець максымальна простых прыбіральняў у таварняках, якімі вязьняў вязуць у лягеры? Чаму ім не даюць ні кроплі вады? Навошта вязьняў так часта разьдзяваць дагала? Чаму ім не даюць лыжак, каб яны не хляталі супу па–сабачы? Навошта так расьцягваць пераклічку? Навошта вымагаць, каб ложкі былі засьцеленыя бездакорна? Навошта цягнуць у лягер нават тых, хто ўжо адной нагой на тым сьвеце ды так і так вось–вось памрэ? Навошта прымушаць вязьняў выконваць бескарысныя работы? Навошта разглядаць людзей у якасьці

простага радовішча сыравіны, мэталю, валокнаў і фасфатаў, калі жывымі яны могуць выраблять без параўнаньня большую дабаўленую вартасьць?
Вага пытаньня ясная: калі можна даказаць, што гэта сапраўды насільства без патрэбы, зло, якое яго спараджае, будзе карэнным чынам адрозьнівацца ад таго зла, якое нам прывычнае і знаёмае, і значыць, між ім і намі паўстае сьцяна; калі ж не, дык гэтае зло можа апынуцца ў сярэдзіне нас. Леві вагаецца, не дае канчатковага адказу. Але кожны раз глыбей задумваючыся над апісваным, ён вымушаны прызнаць: пры глыбейшым разглядзе “непатрэбнага” на першы погляд зла выяўляюцца ягоныя рацыянальныя мэты. У абесчалавечваньні вязьняў была свая лёгіка, бо тым самым ад пачатку закладалася, што яны недачалавекі. У мучэньні ворага была свая лёгіка, бо яно ўмацоўвала нашу сілу і вершнасьць. У вымогах падпарадкаваньня абсурдным загадам была свая лёгіка, бо гэта даказвала, што пакора павінна быць безумоўнай. У дэманстрацыі перавагі сваёй сілы была свая лёгіка, бо мэтай усёй апэрацыі было дасягненьне абсалютнага вяршэнства. Карацей: калі мы дапускаем, што клопат пра ўласнае дабро лягічны й карысны, няма чаго зьдзіўляцца таму, якую “радасьць дастаўляе шкода, зробленая бліжняму”.
Леві любіць цытаваць вядомы радок Джона Дона: “no man is an island”. Тое, што здараецца зь іншымі, наўпрост закранае й нас. Жорсткае разьвіцьцё атрымлівае тут гэтая праўда: я спрыяю ўласнаму самасьцьвярджэньню, узвышаючы сябе або дастаўляючы сабе асалоду, але таго самага я дасягаю, прыніжаючы іншых, мучачы іх. Мы, людзі, ствараем адно цэлае, сіла і слабасьць вымяраюцца толькі ў параўнаньні: я раблюся велічным, калі іншыя зганьбленыя... калі я толькі не разглядаю гэтых іншых як працяг сябе, як сваю сям’ю, сваё кола, у выпадку чаго іх бяда адразу робіцца маёй... Адзіная розьніца заключаецца ў прыродзе стасунку, які я падтрымліваю зь іншымі: я цешуся зь іх няшчасьця ў тым выпадку, калі я параўноўваю сябе зь імі, не атаесамляючы; я цешуся зь іх шчасьця, калі разглядаю іх як працяг сябе...

**Патануў ці ўратаваўся?**
Ці можна спадзявацца, што такі стан рэчаў зьменіцца? І што

можна зрабіць, каб ён зьмяніўся? Леві скептычна камэнтуе пазыцыю Жана Амэры, яшчэ аднаго вядомага былога вязьня, які заявіў, што трэба “rendre les coups”: “Хто б’ецца на кулаках з цэлым сьветам [...], той не сумняваецца ў сваёй паразе”. Але Леві выбраў іншы шлях, дарогу розуму й дыскусіі; але хіба менш гарантаваная параза таго, хто б’ецца з цэлым сьветам на аргумэнтах? Можна і нават трэба працягваць бой, але посьпеху не дачакацца. Усе шляхі закрытыя; ясна, чаму Льяна Мільлю, былая вязень Біркенаў і сяброўка Леві, казала, што з гадамі позірк Леві рабіўся ўсё больш балесным. “Калі гэта чалавек”, першая ягоная кніга, сьведчыць пра асаблівае зло; у “Хто патануў і хто ўратаваўся”, апошняй, канстатуецца, што зло каведна пранікла паўсюль.

[...] Цягам жыцьця прынамсі аднаго пакаленьня памяць пра былыя злачынствы не дае Эўропе вярнуцца да старога. Але гэта мала суцяшае Леві. Наступнае злачынства будзе апранута ў трохі іншую форму, і яго не пазнаюць: фашызму больш не відаць; значыць, нацыяналізм і рэлігійны фанатызм болей нас не хвалявацьмуць... У наступнага злачынства будуць іншыя ахвяры і іншыя каты, магчыма нават — катамі стануць былыя ахвяры. Леві мусіць прызнаць: Асьвенцым нічога не навучыў, сумная гісторыя чалавецтва коціцца сваёй дарогай.

У красавіку 1994 г. праз паўстагодзьдзя па Асьвенцыме і праз 7 гадоў па сьмерці Леві выбухнуў генацыд у Руандзе, калі хуту забілі ня менш за 800 000 тутсі. У сваёй дакумэнтальнай кнізе “Сьмерць мяне ня хоча” Яландэ Мукагасана так кажа...: “Хай тыя, у каго ня стане сілы прачытаць гэта, лічаць сябе заадно з аўтарамі генацыду ў Руандзе. [...] Усе, хто ня хоча ўсьвядоміць, празь якое пекла прайшоў народ Руанды, зьўляюцца прысьпешнікамі катаў. Сьвет перастане быць жорсткім, толькі калі пагодзіцца дасьледаваць сваю патрэбу ў гвалце”. Аўтарка хоча ад нас няшмат: ёй ня трэба, каб мы станавіліся судзьдзямі, нават каб мы вырашылі, хто вінаваты, а хто нявінны. Яна проста просіць, каб мы прачыталі й пачулі. Зрэшты, гэтага ўжо ня так і мала: выключнае зло сустракаецца нярэдка, звычайнае — паўсюль. Немагчымы ня толькі ўсясьветны боль, але і ўсясьветная спагада. Вынятак — сьвятыя: “Калі б мы мусілі й маглі браць на сябе пакуты ўсіх, мы не змаглі б жыць”, — піша Леві. Зваблены сьвятасьцю рызыкуе страціць жыцьцё. Зьберагаючы жыцьцё, мы выбіраем сабе аб’ект спагады воляй

выпадку, мы шкадуем адных і забываем іншых.
Вось зь якой ісьцінай былому вязьню Леві асабліва цяжка пагадзіцца. У выніку саракагадовага роздуму над урокамі Асьвенцыму ён зрабіў выснову, што апроч непасрэднай віны пэўнай колькасьці людзей, галоўная адказнасьць за катастрофу ляжыць на нямецкім народзе ў цэлым, бо ён быў абыякавы й пасыўны і — за рэдкім выняткам — заплюшчваў вочы. Гэта быў ягоны выбар, і ён трымаўся яго, пакуль гэта было магчыма; а калі ігнараваць стала больш немагчыма, ён не паўставаў супраць зла. Як мы можам сёньня зноў выбіраць бязьдзеяньне, добраахвотнае ігнараваньне? Ці не стаем мы тым самым падручным новых трагедыяў, не такіх, як колішнія, але ня менш балючых? Розьніца між патэнцыялам і актам тут ня надта каб дапамагла. Калі мы, прыкрываючыся межамі дзейснасьці, абмяжоўваем сфэру свайго клопату сям'ёй і сваім колам, мы можам сьмела спадзявацца на посьпех (хоць гарантыі і тут няма); але мы моцна рызыкуем паўтарыць нямецкі досьвед часоў вайны. Калі ж мы вырашаем клапаціцца пра лёсы ўсёй краіны ці чалавецтва, дык як пазьбегнуць пачуцьця паразы? У нас, падобна, адзін выбар — між віной і адчаем, і ён можа прывесьці нас да самагубства.
Вынік разваг Леві — безнадзейнасьць, і ўсё ж па прачытаньні кнігі, што прыходзіць да такога безнадзейнага фіналу, адчуваеш сябе мацнейшым. Ад чаго такое дзіва? Сьветлінёю сьвеціцца сама манера пісаць і дасьледаваць: ніякіх гучнасьцяў, ніякіх громагалосных дэклярацыяў, скрупулёзны падбор словаў, прыманьне толькі рацыянальных аргумэнтаў; пошук праўды і справядлівасьці для яго важнейшы за інтэлектуальныя выгоды. Сьвятло выпраменьвае ня сьвет, апісаны і прааналізаваны Леві, але сам Леві: самое тое, што такія людзі, як Леві, існавалі, што яны сумелі супрацьстаяць заразе зла, можа па–свойму стаць крыніцай надзеі для нас. Прыма Леві, або адчайны баец. Нам важныя абедзьве часткі гэтага вобразу. Менавіта таму, што ён не захацеў спыняцца на горкіх і відавочных высновах, ён асабліва каштоўны нам сёньня.
*Пераклаў з французскай Андрэй Дынько*
*паводле Tzvetan Todorov, Dix ans sans Primo Levi, "Esprit" 02/1998.*

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

[image]

Вайна ў ARCHE 2(3)-1999 . [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
[image]
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 01-02-2000**

[image]
[image] .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima



да Зьместу 2(3)-1999

***гуманістыка***

# Эдвард Кінан
# Расейскія прэтэнзіі на рускую спадчыну

**Эдвард Кінан — прафэсар гісторыі Гарвардзкага ўнівэрсытэту, дырэктар Гарвардзкага бізантыністычнага інстытуту ў Дамбартан Оўкс у Вашынгтоне. Цяпер ён завяршае працу пра «Слова аб палку Ігаравым» як значны помнік канца XVIII ст. Артыкул друкуецца зь невялікімі скарачэньнямі. Публікацыя сталася магчымай дзякуючы месячніку «Крытыка» (Кіеў).**

**1.**

**Р**азгляд звыклых расейскіх нацыянальных мітаў, большасьць зь якіх сталі таксама й мітамі сусьветнай русістыкі, — зусім ня марная справа.
Высьвятленьне таго, чаму менавіта гэтая міталёгія замацавалася ў расейцаў, беспасярэдне зьвязанае з тым, якіх паводзінаў у міжнародных справах мы можам чакаць ад іх цяпер, калі яны перасталі быць панскай нацыяй у імпэрыі і іх не абмяжоўвае болей дактрынэрскі марксісцка–ленінскі інтэрнацыяналізм.

З успрыманьнем расейцамі сваіх нацыянальных мітаў асабліва цесна зьвязанае іхнае стаўленьне да сувязяў са Злучанымі Штатамі і Захадам у цэлым, а таксама да новага замежжа. Гэтае

стаўленьне — сур'ёзнае выпрабаваньне для посткамуністычнага інтэрнацыяналізму.
Нават мэдыевісту нельга забывацца, што цяперашняя палітычная сытуацыя настолькі зьменлівая, што немагчыма прадбачыць паводзіны расейцаў у найбліжэйшым часе, і гэта было б немагчыма, нават калі б яны адназначна пагаджаліся з тым пераглядам стэрэатыпаў іхнай гісторыі, пра які я пішу. Немажліва таксама вызначыць, якой з наяўных вэрсій гісторыі паводзінаў Расеі на міжнароднай арэне самі расейцы аддадуць перавагу, прыймаючы і абгрунтоўваючы свае найважнейшыя рашэньні ў найбліжэйшай будучыні.
Зрабіўшы гэткую перасьцярогу, я маю намер абмеркаваць шэраг распаўсюджаных поглядаў на гісторыю расейскай афіцыйнай ідэалёгіі (падаўшы іхны пералік трохі ніжэй), каб вызначыць, у якой ступені яны адлюстроўваюць гістарычную рэальнасьць, а пасьля (паколькі яны яе не адлюстроўваюць) прапанаваць пару думак наконт таго, як яны ўзьніклі і падтрымліваліся.
Зрэшты, трэба адзначыць, што міты, якія будуць мяне цікавіць найперш, не настолькі ўжо відавочна фантастычныя, як, скажам, паданьне пра Ромула й Рэма. Гэта апавяданьні, якія сталі, так бы мовіць, агульнапрынятымі стэрэатыпамі. Яны набылі знаныя і любёныя намі формы пераважна ў XIX ст. або трохі раней і сутнасна не зьмяніліся ў камуністычнай гістарыяграфіі, калі хіба што трохі зьмяніліся акцэнты (за што, аднак, сумленныя гісторыкі дорага заплацілі). На Захадзе, у прыватнасьці ў Злучаных Штатах, гэтыя міты распаўсюдзіліся дзякуючы парадаксальнаму спалучэньню ўплываў, з аднаго боку, старэйшага пакаленьня, пакаленьня навукоўцаў–эмігрантаў, у бальшыні сваёй касмапалітаў і памяркоўных лібэралаў, і савецкай гістарыяграфіі, найчасьцей забітай, нацыяналістычнай і кансэрватыўнай. Цяпер, калі абмежаваньні зьнятыя, трэба зьвярнуць увагу таксама на гэтыя радыкальна нацыяналістычныя акцэнты.
Нягледзячы на тое, што асобныя праблемы расейскай гістарыяграфіі моцна зпалітызаваныя, як ні дзіўна, і левыя, і правыя, і так званыя „русафілы", й „русафобы" ў шчасьлівай згодзе лічаць гэтыя міты слушнымі, хоць адны прымаюць іх, паважаючы пачуцьці расейцаў, а іншыя паўтараюць іх як доказ паклёпаў на расейцаў. Аднак, наколькі я ведаю, амаль ніхто не

паклапаціўся разгледзець самы падмурак гэтых мітаў...

**2.**

Няпоўны пералік нацыянальных мітаў, якія я прапаную разгледзець, выглядае неяк так:

— Маскоўская дзяржава, сэрца і ўзор для наступных расейскай і савецкай імпэрыяў, ствараласяся вакол Масквы ў XIV ст. як галоўная й беспасярэдняя пераемніца палітычнай і нацыянальнай спадчыны Кіеўскай дзяржавы.

— Менавіта ўсьведамленьне гэтай пераемнасьці і матывацыя адбудовы былой кіеўскай еднасьці сталі прычынамі маскоўскай экспансіі на суседнія княствы, вядомай як „зьбіраньне рускіх земляў".

— Маскоўскія князі выступалі правадырамі ўсёй рускай нацыі (пад якой большасьць расейцаў, калі ня робяць асобнай агаворкі, разумеюць таксама ўкраінцаў і беларусаў), што ў значнай ступені было абумоўлена вызначальнасьцю іх ролі ў нацыянальна–вызвольнай барацьбе супраць мангольскага панаваньня (традыцыйна называнага „татарскім ярмом").

— У гэтай і далейшай барацьбе маскоўскія князі палітычна выйгравалі ад цеснага супрацоўніцтва зь вярхушкаю нацыянальнай праваслаўнай царквы, якая была верным носьбітам і ахоўнікам царкоўнай і палітычнай бізантыйскай культурнай традыцыі.

— У прыватнасьці, сама царква прапагандавалася ідэю Расеі як трэцяга Рыму, паводле якой пасьля заняпаду Рыму ды Канстантынопалю Масква атрымала ў спадчыну сусьветна–гістарычную адказнасьць за хрысьціянскае валадарства.

— Менавіта спалучэньне ідэі антытатарскага крыжовага паходу з пачуцьцём хрысьціянскай місіі натхняла першую вялікую маскоўскую заваёву нерасейскіх тэрыторыяў — Казані й Астрахані ў сярэдзіне XVI ст.

— Пазьнейшая заваёва Беларусі й далучэньне Ўкраіны былі выразам тугі па страчаным адзінстве часоў Кіеўскай Русі, але гэтую экспансію натхняў таксама рэлігійны непакой за долю праваслаўнага насельніцтва гэтых земляў.

Знаёмаму з адпаведнай навуковай літаратурай чытачу відавочна, што я ня надта дэтальна акрэсьліў погляды тых, хто гэткім чынам характарызаваў эвалюцыю самабразу ды ідэалёгіі Расеі, але гэтага рэзюмэ хіба што досыць, пагатоў што

я наважуся сьцьвярджаць, што ніводная з працытаваных аксыёмаў не вытрымлівае выпрабаваньня сучаснай крытыкі ды праверкі крыніцамі.

Пачнем з праблемы нібыта ўсьведамленьня Масквою сябе як беспасярэдняй пераемніцы ролі ды месца даўняга Кіева. Хіба маскоўскае атачэньне Івана III (1462—1505) — сапраўднага заснавальніка Маскоўскай дзяржавы, ягонага сына Васіля III ды ўнука Івана IV, ператвараючы сваё нязграбнае княства ў пышную імпэрыю, сапраўды верыла ў тое, што яно аднаўляе ці пераймае славу Кіева? Думаю, адказ ясны: ня верыла, а калі й верыла, дык верыла хіба што само сабе, нікому пра гэта ня кажучы. Увогуле дзіўна, што сучасныя дасьледнікі могуць нават прыпускаць, што маскалі з ваярскай кіраўнічай касты часоў Івана III ці Івана Жахлівага ўяўлялі сябе спадкабёрцамі кіеўскай, скажам, Яраслававай мантыі. Проста няма доказаў гэтага[1].

Урэшце, я лепш чым хто ведаю, якая асьцярожнасьць патрэбная ў абыходжаньні з аргумэнтамі “ад умаўчаньня”, калі йдзецца пра Маскоўшчыну тае пары: бо ж зьвесткі аб ёй часьцяком занадта абмежаваныя й непаказальныя, але досыць і іх. Пры гэтым існуе цэлы шэраг ускосных указаньняў на тое, што маскоўскія палітычныя эліты за Івана III (і нашмат пазьней таксама) досыць смутна ўяўлялі сабе гісторыю кіеўскай пары і шчэ менш прэтэндавалі на тое, каб быць пераемнікамі Кіева. Прывяду толькі два з такіх доказаў — я выбраў іх за тое, што яны адназначныя і, наколькі мне вядома, ніколі не прыводзіліся ў гэтым кантэксьце.

Недзе праз 10 гадоў пасьля ўступленьня на трон Івана III (і праз пакаленьне пасьля перамогі ягонага бацькі ў грамадзянскай вайне, якая ледзьве не зруйнавала Расеі) настаўнікі вялікага князя зразумелі (накшталт таго, як перад 800–м годам тое самае зразумела атачэньне Карла Вялікага), што вакол двару й войска іхнага сувэрэна фармуецца новая магутная сіла. І гэтак жа, як і Каралінгі, яны пачынаюць ствараць належны імпэрскі стыль. З рэнэсанснай Італіі запрасілі архітэктараў, чаканшчыкаў і, так бы мовіць, кансультантаў–стылістаў. Гэтыя майстры ператварылі манархаву рэзыдэнцыю: яны атачылі яе фартыфікацыйнымі будовамі нябачанага ў Расеі маштабу, пабудавалі першы ў Расеі вялікі палац, тры манумэнтальныя царквы і званіцу, сылюэт

якой меў ствараць у падарожнікаў першае зрокавае ўражаньне пра новае велічнае места. Гэтыя збудаваньні (хоць і, збольшага, рэканструяваныя) нават цяпер ствараюць рэклямна–турыстычны вобраз маскоўскага Крамля, і няма сумневу, што яны задумваліся як старанна ўзважаная дэманстрацыя разуменьня новаўтворанай дынастыяй сваёй сутнасьці. Разам яны ствараюць самы значны архітэктурны ансамбаль з усіх, якія калі–кольвек узводзіліся ў Маскоўшчыне.

Ва ўсім гэтым — у царкоўных і сьвецкіх пабудовах, у надпісах ці летапісных згадках пра будаўніцтва — ня знойдзеш ні сьледу, ні нат намёку на кіеўскую спадчыну. Храмы, маючы нейкія дэталі італьянскага рэнэсансу, увогуле маюць за ўзор архітэктуру расейскіх гарадоў Верхняй Волгі, напрыклад, Уладзіміру й Суздалю, але ня Кіева. Няма тут ні Дзесяціннай, ні Барысаглебскай цэркваў, ні нават Сьвятой Сафіі (як у Ноўгарадзе або Полацку) — хаця другую Іванаву жонку, якая, відавочна, столькі пашчыравала над стварэньнем новага вобразу сталіцы, саму звалі Соф'яй. Калі ўзяць брамы маскоўскага Крамля, дык ня толькі ніводную зь іх не назвалі ў гонар знакамітых кіеўскіх (у прыватнасьці, Залатых Варотаў), але й надпіс на галоўнай браме зрабілі не кірыліцай, а лацінкай.

І ў пабудаванай праз 50 гадоў "знакавай" нацыянальнай царкве сярэдзіны XVI ст., у так званым саборы Васіля Бажавольнага (насамрэч жа галоўны аўтбр у гэтым комплексе храмаў прысьвечаны Пакрову Багародзіцы) — няма ніводнай спасылкі на кіеўскую сымболіку ці ўласьцівы Кіеву пантэон сьвятых. Тут было сьвет магчымасьцяў для найменаваньняў — аднак усе капліцы называліся або ў гонар паўночнарускіх, расейскіх сьвятых, або галоўных бітваў Казанскай кампаніі 1522 году. Яшчэ праз пару дзесяцігодзьдзяў Барыс Гадуноў, рэалізуючы свой грандыёзны плян пераўтварэньня сталіцы, часткова перабудаваў Крэмль і надбудаваў званіцу, але зноў кідалася ў вочы адсутнасьць кіеўскіх рэмінісцэнцый. Тыя людзі Кіева і ў галаве ня мелі.

Яшчэ адно дзіўнае й амаль незаўважанае сьведчаньне перарванасьці традыцыі або гістарычнай амнэзіі можна пабачыць у тым, якімі імёнамі маскоўскія магнаты называлі свае дзеці. Лішнім было б тлумачыць важнасьць гэтага акту для любой культуры, ягонае сымбалічнае значэньне, культурную

абумоўленасьць і падуладнасьць модзе. Гістарычныя крыніцы часоў Івана Жахлівага зьбераглі імёны тысячаў людзей вышэйшае клясы. Аднастайнасьцю яны нічым не адрозьніваюцца ад імёнаў у іншых грамадзтвах. Дзясятак найбольш распаўсюджаных імёнаў пакрываў 70% асобаў, а іншыя трапляліся рэдка. Найбольш папулярнымі былі імёны валадароў маскоўскай дынастыі — Іван (20%) і Васіль (10%). Нічога дзіўнага тут няма. Што ж сапраўды зьдзіўляе, калі прытрымлівацца традыцыйных уяўленьняў пра гэтую культуру, дык гэта амаль поўная адсутнасьць спэцыфічна кіеўскіх імёнаў. Сярод амаль 3000 імёнаў у разрадных кнігах часоў Івана няма ніводнага Ігара, Сьвятаслава, Мсьціслава, менш як 1% Уладзімераў і ўсяго тры Глебы. Маскоўскага прыдворнага часоў Івана хутчэй назвалі б Тэмірам ці Булгакам, чым Уладзімерам, Глебам або Ўсеваладам.

Трэба зазначыць, што тут ідзе гаворка пра сьпелую маскоўскую культуру, а не даўнейшыя гістарычныя “факты”, пра якія маскоўцы, за рэдкім выняткам, амаль нічога ня ведалі. Калі ж браць “факты”, дык можна было б сказаць, што Маскоўская дзяржава як і добры дзясятак іншых палітычных утварэньняў ад Малдовы да Літвы насьледавала цэлы шэраг культурных здабыткаў Рускай, Кіеўскай дзяржавы: веру ў харызму нашчадкаў кіеўскай дынастыі князёў–ваяроў; усходнеславянскую вэрсію праваслаўя; супольную юрыдычную ды бюракратычную мову. Аднак запазычаньне было ўскосным ды аслабленым: надта ж мала славянаў за кіеўскіх часоў жыло на геаграфічнай прасторы будучай Масковіі, перасяленцы ж, пераважна з наўгародзкіх земляў і Беларусі, не ўтваралі дэмаграфічна значнай канцэнтрацыі недзе аж да 1350 году, калі Кіеў ужо даўно заняпаў. Безумоўна, праўда, што Іван III быў прамым нашчадкам Сьвятога Ўладзімера па мужчынскай лініі, — але такімі самымі прамымі нашчадкамі былі й многія ягоныя ворагі, і сотні князёў у самой Маскоўшчыне, у іншых рускіх княствах, у Вялікім Княстве Літоўскім і Польшчы. Вось праблема — Іван вельмі мала, амаль ніяк не зважаў на сваё кіеўскае паходжаньне.

Можна было б прывесьці шчэ процьму фактаў у доказ таго, што маскавіты наўрад ці памяталі кіеўскі досьвед. Важна зазначыць: цалкам неймаверна, каб Іван III ці ягоныя дарадцы хоць у найменшай ступені кіраваліся усьвядомленым пачуцьцём

аднаўленьня былога адзінства, калі пачыналі на схіле XV ст. экспансію ў бок беларускіх, украінскіх — або хоць бы й наўгародзкіх — земляў. Вядома, у дыпляматычнай перапісцы з польска–літоўскай дзяржавай — гэта *locus classicus* — дыпляматы Івана III гаварылі пра памежныя тэрыторыі як пра ягоную “дзядзіну”, але гэтая спасылка на спадчыну дзядоў мела на ўвазе перадусім вялікіх князёў маскоўскіх, а ня даўніх кіеўскіх. Такая ж формула ўжывалася таксама ў дачыненьні да прыбалтыйскіх і фіна–вугорскіх земляў, якія ніколі не ўваходзілі ў Кіеўскую дзяржаву. Насамрэч мелася на ўвазе, што “некалі на гэтыя землі прэтэндавалі нейкія мае продкі, а цяпер прэтэндую я”.

Можна запярэчыць, што іменна за Іванавых часоў упершыню згадваецца славутая карона маскоўскіх цароў — так званая “шапка Манамаха” — і што гэта адсылае нас да кіеўскага князя Ўладзімера Манамаха. На жаль, гэтае шырока распаўсюджанае меркаваньне — падвойная памылка. Саму карону вырабілі для татарскага хана (найхутчэй, для Ўзбэка) у 1330–я гады. Пры канцы XV ст. яе перайменавалі, дакладней, перахрысьцілі, дадаўшы крыж, і выпісалі новы пашпарт — змахляваную легенду, якая зьвязвала карону зь імпэратарам Канстанцінам Манамахам. Як бачыце, тут відавочная адсылка да Бізантыі, а не да Кіева, падказаная грэка–італьянскімі кансультантамі, што прыбылі ў 1472 годзе зь Італіі ў сьвіце Соф’і, другой Іванавай жонкі.

Падсумоўваючы гэтыя камэнтары да міту пра “рускую спадчыну”, адзначу: у часы Івана III і Васіля III Маскоўшчына пашыралася за кошт старой кіеўскай тэрыторыі, але я ня бачу падставаў, каб лічыць, што яны кіраваліся нейкай тэарэтычнай ці ідэалягічнай праграмай, якая настойліва раіла ім злучыць усходніх славянаў пад сьцягам адноўленай рускай спадчыны. Усё ж ня можа не зьдзіўляць жывучасьць такіх поглядаў: я мяркую, што сучасных дасьледнікаў падманулі пазьнейшыя, з XVII ст. сьведчаньні, што ў значнай ступені эксплюатавалі рускае мінулае. Аднак тэксты XVII ст. выніклі падчас або адразу пасьля маскоўскай экспансіі на рускую тэрыторыю, больш за тое, іх стваралі пераважна беларускія ці ўкраінскія праваслаўныя навукоўцы–эмігранты або іхныя імітатары. Пра гэты важны ўплыў гаворка яшчэ пойдзе ніжэй.

[1] Гэта яўнае перабольшаньне. Важнае азначэньне тут — “ваярская кіраўнічая каста”; я абазначаю ім вайскова–палітычную эліту, — яно прыблізна адпавядае тагачаснаму паняцьцю “двор” (якое ўжываецца ў дакумэнтах). Амаль усе прадстаўнікі гэтага “двору” былі непісьменнымі недзе аж да канца XVI ст., і іх мэнтальнасьць найлепш характарызуюць дакумэнты іх канцылярыяў. Можна запярэчыць, што наяўнасьць маскоўскіх сьпіскаў “Аповесьці мінулых гадоў” сьведчыць пра ўсьведамленьне маскоўцамі кіеўскага мінулага, — але амаль няма сьведчаньняў, што такія тэксты чытала да зазначанага часу сьвецкае кіраўніцтва. *(назад)*

**3.**

Вернемся, аднак, да нашага пераліку нацыянальных мітаў і скажам пару словаў пра міт пра “татарскае ярмо”. Маскоўскіх палітыкаў мала ела настальгія па Залатым Кіеве, але, як сьведчыць багатая дакумэнтацыя пра стасункі між Маскоўшчынай і яе татарскімі саюзьнікамі, яны яшчэ менш усьведамлялі сваю экспансію ў стэп як зьдзяйсьненьне спрадвечнай нацыянальнай ды рэлігійнай барацьбы супраць бусурманскага татарскага панаваньня. Уважлівае чытаньне дыпляматычнай перапіскі — і нават часам вельмі патрыятычных маскоўскіх прыдворных летапісаў — адкрывае вартыя подзіву сьведчаньні пра тое, наколькі цеснымі й прагматычнымі былі стасункі паміж маскоўскімі й татарскімі палітыкамі. Уласна, цяжка сабе ўявіць, што яны маглі быць інакшымі, бо іменна цесны і трывалы палітычны саюз між маскоўцамі ды татарамі (між Іванавым бацькам Васілём II і ханам Улу Мэхмэтам) у значнай ступені абумовіў перамогу Масквы ў грамадзянскай вайне XV ст. Супраць праваслаўных стрыечных братоў Васіля, расейцаў, дарэчы.

У наступным пакаленьні найбліжэйшым іншаземным хаўрусьнікам Івана III быў самы пасьпяховы крымскі хан Мэнглі–Гірэй. Саюз гэты быў шчыльны і ўзаемавыгодны — што, між іншым, зрабіла магчымай заваёву Ноўгараду і Пскова. Іван IV, у сваю чаргу, ніколі не здабыў бы Казані і Астрахані бязь цеснага супрацоўніцтва з сваімі вечнымі татарскімі хаўрусьнікамі, нагайцамі. З абодвума ісламскімі саюзьнікамі Масква абмянялася незьлічонымі мірнымі пасольствамі, жэстамі добрай волі ды сымбалічнымі дарункамі, напрыклад,

коньмі для хаджу да Мэккі, — ды, відавочна, і шапкаю Ўзбэка, то бок Манамаха. Маскоўскія палітыкі, якімі б цнатлівымі ні былі ў сваім прыватным жыцьці, вельмі прывольна пачуваліся ў стасунках з мусульманскімі саюзьнікамі: прадавалі ім хрысьціян у няволю, парадняліся зь іхнымі княскімі дамамі і без ваганьняў вэрбавалі сабе ў шпіёны іхных прыдворных мулаў. Вось так напраўдзе абстаяць справы зь містычным “татарскім ігам”.

**4.**

Цяпер ужо ня стане неспадзяванкай, што т.зв. тэорыя “Трэцяга Рыму” — проста вынік навуковага непаразуменьня. Ідэя *translatio imperii* — пераносу імпэрскай спадчыны з Рыму да Бізантыі або Францыі Каралінгаў ці шчэ некуды — патэнцыйна даступная любой хрысьціянскай дынастыі пасьля падзеньня Рыму. (Нават нашы амэрыканскія бацькі–заснавальнікі скарысталіся з гэтай ідэі, праўда, у яе рэспубліканскай вэрсіі: маўляў, Рымская імпэрыя была Першым Рымам, Рымская рэспубліка — Другім, а Вашынгтон — сталіца Другой рэспублікі ёсьць — Трэцім Рымам...). Сякое–такое рэха такіх уяўленьняў цягам стагодзьдзяў рознымі шляхамі дасягала Расеі. Але напраўдзе навуковая, а пазьней і папулярная ідэя Масквы як Трэцяга Рыму, здаецца, выйшла з адной–адзінай фразы нічым іншым не адметнага і ўсё яшчэ кепска зразумелага пасланьня, якое, як мяркуецца, даслаў манах Філафей ці то Івану III, ці то Васілю III, ці нават Івану IV. Аднак паколькі з такой драбніцы ўсчалося столькі ляманту, дык варта зьвярнуць на яе трохі ўвагі. Хоць цалкам і няясна, калі менавіта быў напісаны гэты ліст, найбольш верагодна, што ён быў адрасаваны Васілю III з нагоды далучэньня Пскова ў 1510 годзе. Асноўная думка ліста, у якім ідзецца галоўным чынам пра рэлігійныя пытаньні, — што вялікаму князю маскоўскаму нядобра адбіраць уласнасьць у царквы на пскоўскіх землях, як гэта адбылося пакаленьнем раней на вялізных наўгародзкіх абшарах. Калі б вялікі князь зрабіў такое, піша Філафей, яго наўрад ці можна было б лічыць хрысьціянскім валадаром. А паколькі два папярэднія Рымы заняпалі, і Масква застаецца адзіным сапраўды хрысьціянскім — то бок праваслаўным — царствам, дык калі маскоўскі цар ня будзе хрысьціянінам, то чацьвертага Рыму ўжо ня будзе. Як мы

бачым, Філафеевы словы, што ў любым разе маюць толькі вузка рэлігійны кантэкст, былі папярэджаньнем, а ня заклікам да велічы. Яны ня мелі нічога агульнага з замежнай палітыкай ці бачаньнем наканаваньня Маскоўшчыны.
Магчыма, нехта назаве маё прачытаньне Філафеевага ліста не зусім прымальным. Аднак, нават калі іншыя ягоныя інтэрпрэтацыі пераконваюць больш, праблема ў тым, што проста няма сьведчаньняў таго, што маскоўская палітыка ці палітыкі хоць крыху падпалі пад уплыў гэтага тэксту ў прыватнасьці ці пісаньняў царкоўных кніжнікаў увогуле аж да пярэдадня Новага часу — прыблізна да канца XVII ст. — калі новыя заходнія ідэі пачалі абумоўліваць расейскую думку ў дзяржаўных і нацыянальных справах.

**5.**

Але перш чым гаварыць пра тое, як расейцы займелі тыя погляды, якія яны маюць у мадэрную эпоху, мы мусім разабрацца з двума варыянтамі апошняга непаразуменьня: уяўленьнем пра нібыта глыбокі і трывалы ўплыў бізантыйскай рэлігійнай і палітычнай думкі на Масковію. Мушу сказаць, што чым больш я вывучаю гэтую канкрэтную праблему, тым больш пераконваюся, што гэта адна з найвялікшых містыфікацый у эўрапейскай культуры. Напраўдзе ж, апроч відавочнага й вельмі важкага факту навярненьня ў хрысьціянскую веру кіеўскіх усходніх славянаў бізантыйскімі паўднёвымі, а таксама эпізадычных прапаведніцкіх, палітычных і пастырскіх місіяў некаторых падарожнікаў, грэкаў і паўднёвых славянаў, на маскоўскіх землях, існуе да дзіўнага мала сьведчаньняў пра нейкую жывую і бесьперапынную бізантыйска–маскоўскую культурную традыцыю. Як са зьнішчальнай пэдантычнасьцю прадэманстраваў Фрэнсыс Томпсан, у Кіеўскі пэрыяд на тэрыторыі ўсходніх славянаў з грэцкай мовы амаль нічога не было перакладзена; цяпер гэты дасьледнік блізкі да таго, каб прадэманстраваць тое самае ў дачыненьні да Масковіі. Як ужо даўно даказалі Каптэрэў ды іншыя гісторыкі, рэальныя расейска–грэцкія стасункі характарызаваліся сталай узаемнай падазронасьцю і варожасьцю.
Прынамсі да другой паловы XVII ст. у Маскве цяжка было знайсьці хоць аднаго тутэйшага, які б больш–менш прыстойна валодаў грэцкай мовай. Можна быць, нават у такой глухой

правінцыі, якой быў тагачасны Гарвардзкі коледж, вучняў, што маглі б працытаваць нейкі верш Новага Запавету ў арыгінале знайшлося б больш, чым ва ўсёй тадышняй Маскоўскай дзяржаве. Маскоўцы, як і іхныя забытыя кіеўскія папярэднікі, грэцкай мовы амаль ня ведалі, грэцкіх тэкстаў — ня мелі, а з грэцкай на царкоўнаславянскую нічога не перакладалі.
У вырашальны пэрыяд пабудовы Крамлю ды ўвядзеньня ў Маскве сталічнага стылю добры тузін гарадоў каталіцкай Эўропы мог пахваліцца большай колькасьцю студэнтаў і выкладчыкаў грэцкай мовы, колькасьцю грэцкіх рукапісаў і ўвогуле нашмат большай увагай да бізантыйскай традыцыі, чым уся Маскоўшчына разам.
І праўда, менавіта з аднаго такога італьянскага гораду прыехаў слаўны Максім Грэк, якога ў 1518 годзе запрасілі ў Маскву, каб ён зрабіў рэвізію старых перакладаў Псалтыра, дзе праз пару год яго замкнулі ў адным з манастыроў і дзе ён правёў рэшту жыцьця. Аднак і Максім, чыя дзейнасьць у Маскоўшчыне дагэтуль слаба вывучаная, у любым разе аж ніяк ня быў такім выкшталцоным знаўцам грэцкага тэксту Новага Запавету, як, скажам, ягоны заходні сучасьнік Эразм Ратэрдамскі.

**6.**

Можна было б гаварыць далей пра чыста грэцкі аспэкт міту пра “маскоўскі бізантызм”, аднак неабходнасьць быць сьціслым вымушае, зрэшты, перайсьці да роднаснага яму міту пра “маскоўскае праваслаўе”. Тут мы закранаем пытаньне ня толькі складанае, але й далікатнае. Далікатнасьці вымагае простая ветлівасьць: непрыстойна выказваць скептыцызм наконт рэлігійных перакананьняў іншага чалавека. Калі няверны ставіць пад сумлеў нечую веру, скажам, у Сьвятую Тройцу — гэта і бязглузда, і абражае. Аднак на гэтай падставе ня варта ўстрымлівацца ад выказваньня сваёй думкі, напрыклад, наконт таго, ці меў рацыю Эразм, заяўляючы пра наяўнасьць пазьнейшых уставак у кананічным грэцкім тэксьце Новага Запавету (*comma Johannem*).
Таксама й калі, напрыклад, расеец абвяшчае сябе верным, чужому чалавеку нягожа правяраць ягонае веданьне “Сымбалю веры”. Але калі той самы расеец заяўляе, што быць расейцам — значыць, быць праваслаўным верным, хоць тымчасам апытаньні выяўляюць, што больш расейцаў вераць у гараскопы, чым у

Тройцу, чужы чалавек можа зрабіць пэўныя высновы, не баючыся кагосьці абразіць.
Такое разуменьне інтэлектуальных добрых намераў датычыць і ранейшых часоў, хоць там яно ўскладняецца абмежаванасьцю нашай інфармаванасьці. Штука ў тым, што мы папросту ня ведаем, што думала большасьць маскоўцаў пра такія рэчы, — перадусім таму, што абсалютная большасьць (у тым ліку й большасьць палітычнай эліты і нават звычайнага сьвятарства) аж да XVII ст. заставалася вельмі сьціпла адукаванай і, як вынік, не пакінула нам вартых даверу запісаў пра тое, што думала. Аднак мы маем доказы таго, што вобраз маскоўскай палітычнай сыстэмы, цесна зьяднанай з праваслаўнай гіерархіяй у нацыянальным саюзе, або сыстэмы, якою рухалі магутныя рэлігійныя перакананьні, — гэта прадукт пазьнейшых часоў. Маскоўская палітычная сыстэма Івана III ды ягоных наступнікаў паўстала з трывалых грамадзянскіх войнаў між праваслаўнымі князямі, якія ня раз, часам у змове са здраднымі япіскапамі, парушалі хросныя клятвы. Толькі ўзьнікнуўшы, маскоўскі двор перавёў першыя сто гадоў свайго існаваньня на тое, каб падпарадкаваць суседнія славянскія і праваслаўныя княствы, часта з дапамогай саюзьнікаў–мусульманаў. Адным словам, прагматызмам — назавем гэта так — сваіх паводзінаў маскоўская палітычная сыстэма нічым не адрозьнівалася ад іншых эўрапейскіх дзяржаваў перад Рэфармацыяй. Аднак два аспэкты рэзка вылучалі Маскоўшчыну, і абодва сьведчаць супраць ідэі моцнага саюзу царквы зь дзяржавай у “праваслаўнай Маскве”. Па–першае, царква як асобны інстытут была тут не да параўнаньня бяднейшаю, слабейшаю і менш арганізаванаю, чым яе заходнія сёстры і чым сьвецкая ўлада. Амаль усе вялікія князі рабілі з царквой, што хацелі шчэ задоўга да таго, як Пятро I ператварыў яе проста ў адну з галінаў улады. Па–другое, у Маскоўшчыне нашмат слабейшым было ўзаемапранікненьне сьвецкай ды царкоўнай элітаў, якое мела месца ў заходніх грамадзтвах, зь якімі часта параўноўваюць расейскае. Здаецца, у гэтай ізаляцыі былі структурныя прычыны: яны крыюцца ў лёгіцы маскоўскай плянавай арганізацыі, сыстэмах спадчыннай перадачы прыходаў жанатымі сьвятарамі ды манаполіі манахаў на япіскапскую ўладу. Але як бы мы ні тлумачылі гэтую розьніцу, факт застаецца фактам: сьвецкая ды царкоўная эліты так і ня

склалі такой непарушнай фалянгі, якую мы знаходзім у іншых хрысьціянскіх супольнасьцях.
З гэтых ды шэрагу іншых прычынаў можна толькі зьдзіўляцца, чаму гісторыкі трымаюцца погляду, быццам канфэсійная палітыка адыгрывала вялікую ролю ў мысьленьні рэальных палітыкаў Маскоўшчыны ў тыя стагодзьдзі, калі фармавалася імпэрыя, і што міт аб “праваслаўнай Маскве” такі жывучы.

**7.**

Але калі імпульсамі да пашырэньня Маскоўскай імпэрыі не былі ні згадкі пра гэтак званую кіеўскую спадчыну, ні ідэя крыжовага паходу супраць татараў, ні пераканаьні, узятыя зь неіснуючай тэорыі Трэцяга Рыму, і калі ў гэтай імпэрыі ня ведалі бізантыйскага цэзарапапізму і ўвогуле гісторыі Бізантыі, калі вучэньні царквы не натхнялі экспансіі, а самую царкву да таго ж рэгулярна прыгняталі, — тады паўстае два пытаньні. Першае: што ж тады было сілай–рухавіком? І другое: адкуль узяліся ўсе гэтыя стэрэатыпы?
Першае пытаньне — больш складаная і цяжкая галаваломка, бо яно, здаецца, паўстае з парадоксу: калі ніводная зь ідэяў, якія, традыцыйна лічылася, кіравалі маскоўскай імпэрскай экспансіяй, напраўдзе ніколі не была істотным элемэнтам сьветапогляду маскалёў, дык што ж падштурхоўвала іх так упарта і няспынна пашыраць дзяржаву?
Разглядаючы галоўныя этапы маскоўскай экспансіі, я лічу, мы можам, нешта спрашчаючы, сказаць, што асноўных прычынаў экспансіі было тры: маскоўцы былі дэмаграфічна дынамічнаю этнічнай масай, вакол якой распасьціраліся маланаселеныя тэрыторыі; маскоўскі двор сумеў стаць высокаэфэктыўнай, цэнтралізаванай, маналітнай і ваенізаванай палітычнай арганізацыяй; суседнія вайскова–палітычныя арганізацыі ў часы найбольшай экспансіі Масквы былі з розных прычынаў аслабленыя ўнутранымі канфліктамі, вычарпаньнем рэсурсаў або пагрозай трэцяга боку. Звычайна гэтыя чыньнікі ўзаемадзейнічалі: у цэлым мірнае прасоўваньне ў Сібір давала рэсурсы для вайсковай машыны, што рухалася на Смаленск і Кіеў; унутраныя канфлікты ў Літве або на Каўказе ўзмацняліся пад маскоўскім уплывам; высока цэнтралізаваная палітычная сыстэма выяўляла асаблівае ўменьне кіраваць рэсурсамі ды паглынаць мясцовыя эліты і г.д. І наадварот: там і тады, дзе й

калі гэтых умоваў не было, экспансія збольшага тармазілася: расейскія каляністы не змаглі выцясьніць адносна шчыльнае насельніцтва Ўкраіны, Беларусі або нават Сярэдняй Волгі; у пэрыяды, калі цэнтральная палітычная сыстэма страчвала маналітнасьць, экспансія прыпынялася або нават, як у 1605 годзе, імпэрыя пачынала распадацца; а там, дзе суседзі былі здольныя аказаць вайсковы супраціў, як было з Швэцыяй, Кітаем, Асманскай імпэрыяй, экспансія спынялася.
Больш за тое, я наважыўся б сьцьвярджаць, што гэтая дзяржава магутна разрасталася, але не была цалкам “экспансіянісцкаю”. То бок маскоўскія, а пазьней расейскія палітыкі зусім не кіраваліся трансцэндэнтным пераканаьнем, што дзяржава або будзе пашырацца, або загіне, што іх вырок — экспансія, што яны маюць занядбаць прыземленыя прагматычныя меркаваньні й небясьпекі дзеля экспансіі, бо яны не падобныя да іншых сьмяротных, а іхная экспансія — да іншых практычных справаў. Маскоўцы звычайна паводзілі сябе як прагматычныя прыстасаванцы; яны не былі схільныя да рызыкі і лёгка адступаліся ад нейкай мэты, сутыкаючыся з супрацівам ці зь неабходнасьцю плаціць завысокую цану. Яны не былі Крыжакамі. (Пытаньне пра тое, ці былі Крыжакамі самі Крыжакі, я пакідаю да іншага разу.)

**8.**

Аднак калі справы былі менавіта так — калі Расейская імпэрыя сапраўды зьяўлялася вынікам сьведамага, апартуністычнага і спэцыяльнага прыстасаваньня да абставінаў — тады адкуль узяліся ўсе гэтыя размовы пра “рускую спадчыну”, “Трэці Рым”, “маскоўскае бізантыйства” і ўсё такое?..
Гэтыя ідэі пранікалі ў расейскую думку рознымі шляхамі і з розных крыніцаў — надта шматлікіх, каб іх тут можна было пералічыць. Аднак тыя ідэі, якія цікавяць нас найбольш, маюць дзьве нечакана агульныя рысы: сваім паходжаньнем яны заўдзячваюць збольшага эўрапейскім інтэлектуальным рухам і клопатам, а імпарт гэтых ідэяў ажыцьцяўляўся, як правіла, у інтарэсах не саміх расейцаў, а некага іншага.
Пачнем з таго самага Івана III, якога я згадваў вышэй як заснавальніка Маскоўскай дзяржавы. Як усе мы памятаем, другая ягоная жонка Соф’я была пляменьніцай апошняга бізантыйскага імпэратара. Гэты шлюб, арганізаваны ў Ватыкане

вядомым грэка–італьянскім кардыналам Вісарыёнам (які памёр у 1472 годзе), быў часткай супольнага пляну грэкаў і папы, скіраванага на далучэньне Масквы ды яе татарскіх саюзьнікаў да вялікага антытурэцкага вайсковага альянсу. Паказальна, што ўрэшце Іван не далучыўся ні да якіх зьвязаў: ягоная прагматычная татарская палітыка ды ўсходні гандаль, як аказалася, важылі для яго нашмат больш, чым любыя заходнія саюзы. Аднак ягоная новая жонка і шмат хто зь яе грэка–італьянскай сьвіты істотна паўплывалі на фармаваньне парадкаў маскоўскага двору амаль ва ўсіх сфэрах. Італьянскія архітэктары адбудавалі новы Крэмль у мілянскім стылі, Гранавітая палата амаль паўтарае палац у Фэрары, тры саборы, што імітуюць расейскія стылі, аздобленыя незьлічонымі італьянскімі рэнэсанснымі дэталямі й дахамі з чырвонай дахоўкі. Аднак — і гэта галоўнае — гэтыя моцна засымільваныя грэкі–ўніяты, італізуючы маскоўскае прыдворнае жыцьцё, падобна, пераканалі сваіх маскоўскіх замоўнікаў у тым, што менавіта яны ўвасабляюць традыцыі, якія самі прадстаўлялі — традыцыі Палеалёгаў і бізантыйскае велічы. Аднак, як і ўсё іншае ў новым імпэрскім стылі Масквы, гэта была заходняя па сваёй сутнасьці, італьянская форма бізантыйства — нездарма ж апякун Соф'і, уніяцкі кардынал Вісарыён, праз усё сваё жыцьцё намагаўся пераканаць італьянцаў, што бізантыйская мантыя перайшла (зноў *translatio imperii*) у спадчыну… да Рыму!

Іншая тэма, што прыйшла з Захаду прыкладна ў той самы час (можа, з тым самым Вісарыёнам), — антыісламскія пераканаьні, якія пачынаюць праяўляцца ў маскоўскіх літаратурных творах і летапісах. І хоць наўрад ці Вісарыён прысылаў Івану III асобнік сваіх "Прамоваў і лістоў да хрысьціянскіх манархаў супраць туркаў", грэкі ніколі не гублялі надзеі нацкаваць Маскву (разам зь іншымі) супраць туркаў. Гэтыя высілкі найчасьцей, здаецца, прымалі форму няспыннага нагадваньня прагматычным расейцам пра надзвычайнае значэньне іхнай бізантыйскай і праваслаўнай спадчыны.

Пасьля таго як Контрарэфармацыя ўпершыню ў гісторыі Рэчы Паспалітай ператварыла яе ў каталіцкае каралеўства, галасы ўкраінскіх і беларускіх праваслаўных клерыкаў–эмігрантаў далучыліся да грэцкага хору, які заклікаў Маскву ўстаць на

абарону праваслаўя. Менавіта гэтыя красамоўныя й палітычна дасьведчаныя прыбышы (пазьней да іх далучылася казацкая эліта, рэкрутаваная ў імпэрскі істэблішмэнт) пры канцы XVII і ў XVIII стст. стварылі — ва ўласных інтарэсах — для маскоўцаў міт пра “рускую спадчыну”.
Бадай, нельга аспрэчваць той факт, што сьпіскі “Аповесьці мінулых гадоў” былі вядомыя сяму–таму ў маскоўскай духоўнай эліце здаўна. Але яны не былі распаўсюджанай чытанкай у сьвецкіх колах, і нават тыя зь летапісцаў, хто чытаў іх, падобна, не адчувалі сувязі паміж маскоўскай і кіеўскай гісторыяй. Да кіеўскай яны ставіліся як да клясычнай старадаўнасьці. А вось сьвецкія чым больш чыталі “Сынопсіс” і Феафана Пракаповіча — найперш таму, што менавіта гэтыя кнігі выходзілі з друку (“Сынопсіс” шматкроць перавыдаваўся паміж 1674 і 1836 гадамі).
Адно з выданьняў “Сынопсісу” (відавочна, 1690 году) выкарыстаў для сваёй вялікай зводнай гістарычнай працы, у якой ён ужо цалкам разгарнуў тэзіс пра перайманьне Маскоўшчынай кіеўскай спадчыны, Васілій Таціщчаў. Аднак нават ягонае разуменьне пераемнасьці не было спэцыфічна ўсходнеславянскім: ён пачынаў ад Гогі й Магогі, а Кіеў у ягонай гістарычнай канструкцыі адыгрываў сьціплую ролю, уяўленьне пра якую ён атрымаў у значнай ступені ня з рускіх, а з заходніх крыніцаў.
Мікалай Карамзін сумняваўся ў тым, ці карыстаўся Таціщчаў крыніцамі ўвогуле; але ён, здаецца, ні кроплі не сумняваўся ў ідэі свайго папярэдніка, што ўся гісторыя пасьля Ўладзімера — гэта гісторыя Расеі. Ягоная ўсё яшчэ выдатная “Гісторыя дзяржавы расейскай” заклала канцэптуальную базу, якая заставалася непарушнаю і ў вялікай ступені неперагледжанаю два стагодзьдзі. Ён увёў паняцьце адзінай “Расеі”, ужо ад IX ст. населенай “россиянами”, — меліся на ўвазе ўсе ўсходнія славяне і амаль уся эўрапейская частка тагачаснай (пад 1801 год) Расейскай імпэрыі. Карамзін, які справядліва лічыцца выдатным майстрам расейскай славеснасьці, старанна падбіраў словы, дык жа меў бы ведаць, што “Россия” ды вытворныя ад яго словы трапілі ў расейскую мову з навуковай пальшчызны, на якую, у сваю чаргу, моцна паўплывала грэка–лацінская традыцыя, і ўвайшлі ў моўную норму толькі з XVII ст. Аднак, безагаворачна ўключаючы сьледам за Таціщчавым кіеўскую і

ўсю ўсходнеславянскую гісторыю ў расейскую, Карамзін гаворыць пра яе зусім мала: у ягонай вядомай праграмнай “Запісцы пра даўнюю й новую Расею” няма ніводнай згадкі ні пра Кіеў, ні пра Ўкраіну (якую ён называў бы “Маларосіяй”). Канец гэтай гісторыі — ні для каго не сакрэт: калі эўрапейскія плыні рамантызму ды раньняга нацыяналізму дасягнулі Расеі і іх асвоілі ў форме славянафільства ды панславізму, іхныя адэпты зьвярнуліся ў пошуках свайго “тэксту” да таго, што здавалася ім гістарычнымі сьведчаньнямі, а напраўдзе было стракатай мяшанкай іншых тэкстаў, створаных або натхнёных чужаземцамі дзеля ўласных патрэбаў і надта далёкіх ад спосабаў мысьленьня рэальных палітыкаў маскоўскага мінулага, памылкова ўспрынятага як апошні пэрыяд нацыянальнай “сапраўднасьці”. Толькі цяпер мы разумеем, што нарабілі гэтыя дылетанты, — ды толькі ці не запозьненыя гэтыя веды.

**9.**

…

Аднак цяпер я хачу паказаць, які, на маю думку, стасунак усё адзначанае тут мае да сучасных клопатаў пра паводзіны расейцаў на міжнароднай арэне. Тут паўстаюць тры аспэкты: у якой ступені ў той ці іншы з разгледжаных мітаў вераць палітычна актыўныя слаі сёньняшняга расейскага грамадзтва; як такая вера можа паўплываць на фармуляваньне ды правядзеньне замежнай палітыкі; і ў якіх спэцыфічных галінах такія вераваньні могуць мець найбольшае значэньне?

З апошніх публікацыяў, як уплывовых, так і маргінальных, робіцца ясным, што цэлы шэраг міталягемаў, якія я спрабаваў тут абвергнуць, апанаваў амаль усіх тых расейцаў, каторыя ўвогуле схільныя зьвяртацца па гістарычныя аргумэнты.

…

Беды й хваробы, якія чакаюць расейскую нацыю ў найбліжэйшай будучыні, разам з развалам акадэмічнай навукі ды адраджэньнем нацыяналістычнай настальгіі відавочна не дадуць становішчу палепшыцца. … Мера, у якой шырока распаўсюджаныя міталягічныя вераваньні будуць уплываць на фармуляваньне ды правядзеньне расейскай замежнай палітыкі (у прыватнасьці, і стасункаў з “блізкім замежжам”), уяўляецца мне залежнаю ад эвалюцыі палітычных структураў у

найбліжэйшай будучыні. ... Праўда, большасьць адкрытых адэптаў традыцыйных поглядаў (за прыклад можна ўзяць Салжаніцына — але толькі як прыклад, бо сумнеўнай здаецца ягоная прэтэнзія выступаць ад імя ўсіх расейцаў) настолькі занятыя ўнутранымі духоўнымі й матэрыяльнымі праблемамі расейскай нацыі, што наўрад ці здольныя (калі ня браць пад увагу агульны антаганізм да ўсяго пасьляасьветніцкага заходняга матэрыялізму ды картэзіянства) скласьці нейкую цэласную праграму паводзінаў Расеі ў сучаснай супольнасьці нацыяў.

...

Першай і самай небясьпечнай сфэрай зьяўляюцца расейска–ўкраінскія стасункі. Трэба, аднак, адразу сказаць, што ў гэтым выпадку нацыянальныя міты спрацоўваюць з абодвух бакоў, і можна было б напісаць аналягічны артыкул, зрабіўшы ў ім такі самы скептычны агляд гістарычнай аргумэнтацыі вялікай колькасьці нацыянальных мітаў, мілых сэрцу ўкраінца... Тут зноў спашлюся на Салжаніцына... — як носьбіт міту пра кіеўскую спадчыну, ён лічыць Украіну часткаю Вялікай Расеі... Другая сфэра, у якой старыя нацыянальныя міты могуць лёгка паўплываць на замежную палітыку — гэта рэакцыя Расеі на агонію Югаславіі. Міт, які закранаецца ў гэтай сувязі — міт аб “праваслаўі”. З улікам цынічнага выкарыстаньня яго для апраўданьня расейскай імпэрскай палітыкі ў супрацьстаяньні зь іншымі вялікімі дзяржавамі пад канец XIX ст. ён набыў дадатковы мітычны бляск.

...

Кожны, хто вывучаў расейска–сэрбскія стасункі ў XX ст., можа ставіцца да гэтага падвойнага міту толькі скептычна, бо ён падвойна бязглузды. Расейцы “спачуваюць” сэрбам як “братам–славянам” — дык што, іхныя сымпатыі выходзяць большыя або меншыя, чым да ўкраінцаў, беларусаў, палякаў? А іхная падтрымка “праваслаўных братоў” — больш ці менш рашучая, чым падтрымка ўкраінцаў ці румынаў?

Ёсьць і трэцяя сфэра, у якой міт пра “нацыянальнае адзінства” ці “народ” патэнцыйна можа стварыць праблемы... Маю на ўвазе тую акалічнасьць, што мільёны расейцаў апынуліся, нібы альжырскія *pieds noirs*, па іншы бок звужаных імпэрскіх бар’ераў.

...

Цяпер у, здавалася б, патэнцыйна найбольш небясьпечным Казахстане справы йдуць лепш, чым можна было б чакаць, бо прэзыдэнт Назарбаеў, як і ўкраінскае кіраўніцтва, тлумачаць новае дзяржаўнае аб'яднаньне не як нацыянальную дзяржаву, а як палітычную юрысдыкцыю, і не даюць мясцовым нацыяналістам расхадзіцца. Пажадаем яму посьпеху.

**10.**

Падвядзем вынік. Расейская палітычная культура, стаўшы пазнавальнай пад канец XV ст. і эвалюцыйна разьвіваючыся да найноўшага часу, у аснове сваёй неэкспансіянісцкая. Аднак маскоўская і пазьнейшая расейская дзяржавы маюць немалы досьвед экспансіі. Міты пра яе паходжаньне ды прыроду былі створаныя й прынятыя навукоўцамі ды адукаванай публікай у найноўшыя часы. Некаторыя з гэтых мітаў нават тлумачыліся як прычыны самой экспансіі або адлюстраваньні экспансіянісцкіх або мэсіянскіх памкненьняў. Але большасьць такіх мітаў узьнікла не спантанна ва ўлоньні самой маскоўскай культуры, а пад уплывам галоўных плыняў у гісторыі эўрапейскай культуры ды ў кантэксьце эўрапейскай палітыкі. І не яны натхнялі маскоўскую экспансію.

У савецкі час складаныя працэсы папулярызацыі, у тым ліку распаўсюджаны супраціў афіцыйнаму інтэрнацыяналізму, прывялі да таго, што гэтыя нацыянальныя міты былі ўспрыняты большасьцю людзей. Аднак яны збольшага ня маюць непасрэднага ўплыву на замежнапалітычны выбар Расейскай Фэдэрацыі і зьяўляюцца галоўнай праблемай для большасьці расейцаў.

Аднак даецца ў знакі груз праблемаў, зь якімі сутыкаецца Расея, абцяжараны распаўсюджаным уяўленьнем пра павярхоўнасьць і эгаізм Захаду. Гэта спрыяе ўзьнікненьню па–рознаму выяўленага пачуцьця расейскай нацыянальнай крыўды. Паветра зноў набрыняла нацыяналізмам. Можа так атрымацца, што расейцы — і іхныя палітыкі — надыхаюцца яго, і боль свайго сёньняшняга ўбоства адальецца ў ірацыянальныя формы. І тады ўжо мала значэньня будзе мець, ці ёсьць у мітаў нейкі рэальны грунт, ці не. Ніхто ня будзе марнаваць часу на абмеркаваньне яшчэ цікавейшай у нейкім сэнсе тэмы: ці сучасная расейская ўрбанізаваная ды індустрыялізаваная нацыя ёсьць іншай, чым была, — бо яны

будуць верыць, што адбудоўваюць старую мітычную нацыю. Кіравацца такой прывіднай для расейцаў тэмай будзе трагедыяй, але надта шмат чаго ў гісторыі — трагедыя. Цалкам магчыма, што акурат гэты факт часткова й падштурхоўвае народы на стварэньне нацыянальных мітаў — і прымушае верыць у іх.

*Пераклаў з ангельскай А.В.*
*паводле Edward L.Keenan.* On Certain Mythical Beliefs and Russian Behaviors. У: *S.Frederick Starr (ed.)* The Legacy of History in Russia and the New States of Eurasia. — *Armonk, New York and London, 1994*.

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]
*Вайна ў ARCHE 2(3)-1999* . [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 14-10-1999**

[image]
Вайна ў 2(3)-1999 .
[image]
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 2(3)-1999

*хроніка*

# Уладзімер Плешчанка Сьледчыя хацелі зрабіць мяне Міронам

**Старшыню віцебскай Рады БНФ „Выбар“ Уладзімера Плешчанку пасьля сямі месяцаў адседкі выпусьцілі на волю з–пад варты. Падазравалі яго ў тым, што ён Мірон. Мірон — легенда беларускага мірнага вызвольнага руху 90-х.**
**Уладзімер Плешчанка — прыклад адданасьці чалавека й палітыка Эўропе, яе вартасьцям і інтарэсам і змаганьня за свой кантынэнт. Усё гэта адбываецца ў 36 км ад Расеі.**

**1**–га верасьня 1998 году па Віцебску пайшла чутка пра тое, што напярэдадні Мірон з групай сваіх паплечнікаў зьняў з пастамэнту ў двары гарваенкамату ля Кастрычніцкага РАУС бюст Суворава.
Раніцаю я быў на мейсцы здарэньня. Вакол пастамэнту сабралася шмат прадстаўнікоў гарадзкога кіраўніцтва ды іншых асобаў у цывільным, нібы ў Віцебску адбылося штось надзвычайнае. На мяне ніхто не зьвярнуў увагі.
На-пярэдадні ўначы мы зь сябрамі Рады «Выбар» распаўсюджвалі па горадзе ўлёткі і газэту «Выбар». Мы з Барысом Хамайдам акурат працавалі ў гэтым раёне. Каля трох гадзінаў начы сустрэліся з намесьнікам начальніка Кастрычніцкага РАУС пад-палкоўнікам Заблоцкім, па яго

прапанове заходзілі ў пастарунак.
Другога верасьня з раніцы зьбіраўся ў грыбы — іх таго году было, як ніколі, шмат. Не пасьпеў пасьнедаць і прыбрацца, як да хаты ў вёсцы Вароны (каля васьмі кілямэтраў па Смаленскай шашы) а палове сёмай раніцы прыехалі трое малойцаў у цывільным.
Прадставіліся супрацоўнікамі крымінальнага вышуку Кастрычніцкага РАУС. Кіраваў імі капітан Дымакур. Запрасілі праехаць зь імі ў аддзел міліцыі да падпалкоўніка Заблоцкага. Запатрабавалі гумовыя боты й крыху ношаны пінжак. Я зразумеў, што шукаюць Мірона і падазраюць мяне. Добра ўсьведамляў, што забраныя ў мяне рэчы ня могуць быць доказам майго ці чыйго іншага ўдзелу ў дэмантажы бюсту Суворава, бо забіралі іх незаконна, бязь сьведкаў і пратаколу, упакоўкі і запячатваньня. Я пажартаваў, што гэтыя маладыя людзі проста так ад мяне не адчэпяцца, і, відаць, давядзецца разам зь імі наведаць майго знаёмага падпалкоўніка. Не аднойчы я меў справу зь міліцыянтамі. Здаралася, што сустрэча зь імі пазбаўляла мяне мажлівасьці своечасова вяртацца дахаты. Часам жонцы даводзілася чакаць мяне пасьля тых сустрэчаў па некалькі сутак. Але ў той дзень я не спадзяваўся, што вяртаньне дадому зацягнецца на сем месяцаў.
Ад'ехаўшы ад вёскі ў бок гораду, хлопцы асьмялелі й пачалі мяне апрацоўваць. Пыталіся, як мне ўдалося зьняць бюст, якім чынам і з кім я рабіў гэта. Я, вядома, жартаваў, што дапамагалі Бог і супрацоўнікі міліцыі.
У міліцэйскім пастарунку панесьлі некуды боты зь пінжаком, а вярнуўшыся, праз гадзіну абвясьцілі, што мой удзел у дэмантажы бюсту даказаны, бо забраным у мяне ботам адпавядае сьлед каля пастамэнту, ды яшчэ там застаўся гузік ад майго пінжака. Мне застаецца ва ўсім прызнацца, аддаць галаву генэралісімуса Суворава і пасьля гэтага спакойна выпраўляцца дахаты. Не патрабавалі нават выдаць тых, хто мне ў гэтай справе дапамагаў. Я пажартаваў, што калі б здымаў генэралісімуса, то неадменна накіраваў бы яго ў падарунак маскоўскаму мэру Лужкову — аматару адстойваць інтарэсы Расеі за яе межамі. Заўважыў, што любыя доказы трэба здабываць законным шляхам і заявіў, што ніякіх паказаньняў па ўзбуджанай крымінальнай справе №198982 па факце зьнікненьня з пастамэнту бюсту генэралісімуса Суворава

даваць ня буду.

На гэтым супрацоўніцтва маё са сьледзтвам скончылася. Нейкія паказаньні спрабаваў узяць у мяне сьледчы Аўчыньнікаў, але я яму карэктна нагадаў, што ніколі не даю міліцыі ніякіх паказаньняў. Калі спатрэбіцца — пасьпею выказацца ў судзе.
Праз тры гадзіны сьледчы Аўчыньнікаў вынес пастанову аб затрыманьні мяне ў якасьці падазраванага па факце крадзяжу бюсту арт.87 ч.2 КК.РБ. Я зноў пажартаваў, што, паколькі крадзяжом людзі займаюцца дзеля якой–кольвечы спажывы, дык галаву генэралісімуса ў падмурак хаты я мог бы пакласьці, але хату зараз не будую, а ні на што болей тая галава непрыдатная. У боксе міліцэйскага пастарунку трымалі мяне да ночы. Увечары чуў, як прывозілі на допыт маіх сяброў — Барыса Хамайду й Юрася Карпава. Па паводзінах міліцыянтаў здагадаўся, што й сябры мае паказаньняў не давалі. Глыбокай ноччу адвезьлі ў ізалятар часовага ўтрыманьня. Патрапіў ў камэру да двух небаракаў: адзін пасьля перапою ці яго імітацыі ўвесь час «сядаў на каня», другі скраў на лецішчы пракурора вобласьці, Шахметава, мех бульбы. Апошняму давялося ў нечым даверыцца — ня будзе ж, разьлічыў я, пракурор садзіць свайго рабаўніка, лепш зробіць яго на ўсё жыцьцё абавязаным ды выпусьціць. Так яно й сталася, і хлопец гэты ўсё, што прасіў я, зрабіў дзеля мяне.
Праз двое сутак ізноў адвезьлі ў аддзел міліцыі. Па просьбе майго сябра Барыса Хамайды да мяне наведаўся адвакат Уладзімер Шайкевіч. Пазнаёміўся з сутнасьцю справы. Да таго часу сьледчы Аўчыньнікаў перадумаў падазраваць мяне ў крадзяжы й вынес абвінавачваньне ў злосным хуліганстве арт.201 ч.2 КК.РБ і разбурэньні гісторыка–культурных каштоўнасьцяў арт.225 ч.2 КК.РБ. Як потым высьветлілася, бюст Суворава да таго часу ўжо знайшлі ў двары за некалькі соцень мэтраў. Сьледчы вынес пастанову аб маім арышце на час расьсьледаваньня справы з прычыны таго, што, знаходзячыся на волі, я магу перашкодзіць сьледзтву высьветліць праўду.
Адвакат папярэджваў, што прычынаў дзеля майго ўтрыманьня пад вартай нямашака, бо на месцы злачынства я затрыманы ня быў, сьведкаў, якія б паказалі на мяне, не знайшлося, і ў месцы

майго пражываньня ані галавы, ані іншых частак бюсту не адшукалі. Тым ня менш намесьнік пракурора Кастрычніцкага раёну Віцебску У.Казлоў даў санкцыю на мой арышт.
Яшчэ сем дзён давялося прабыць у ізалятары часовага ўтрыманьня. Ізноў наведаўся да мяне капітан Дымакур — дапытваўся, ці маю я дачыненьне да замены на даху аблвыканкаму 14 траўня 1998 г. чырвона–зялёнага сьцягу на бел–чырвона–белы і ці ведаю Мірона.
На дзясяты дзень перавялі ў віцебскую турму (СІЗА–2); яшчэ сем дзён прабыў у каранціне, перш як патрапіў у камэру на больш–менш прыстойны ложак. За гэты час бяз мыла, рушніка, прыладаў дзеля галеньня я стаў нагадваць ваеннапалоннага ў фашыстоўскім канцлягеры, толькі што не такі схуднелы.
І да сёньня не ўцяміў, навошта мяне сямнаццаць дзён трымалі ў такіх умовах, нягледзячы на перанесены некалькі год таму інфаркт. Можа, хацелі правучыць за адмову даваць паказаньні? Далей распачалося доўгае й нуднае жыцьцё ў камэры памерам 15 кв.м., дзе часамі мясьцілася да 25 чалавек. Дзесь пры канцы верасьня мяне выклікаў у Кастрычніцкі РАУС новы сьледчы Гінько, каб узяць пробу на пах майго поту — мабыць, каб даказаць, што рэчы, забраныя ў вёсцы, належаць менавіта мне. Яшчэ раз мы сустрэліся зь ім у часе закрыцьця крымінальнай справы 2 сьнежня і болей ужо ня бачыліся. Па справе відаць, што яна «шытая белымі ніткамі» й цяжка будзе адшукаць судзьдзю, які па яе матэрыялах прызнаў бы мяне хоць у чым–небудзь вінаватым. Тым ня менш Гінько трымаўся бадзёра, падганяў мяне знаёміцца з матэрыяламі справы, пагражаў працягнуць тэрмін сьледзтва, нібы ад гэтага штось магло зьмяніцца. Апраўдваўся, што калі б за справу з самага пачатку ўзяўся ён, дык абавязкова ўпёк бы мяне на некалькі гадоў. Калі б гэта была шэраговая крымінальная справа — да канца сьнежня мяне ці апраўдалі б, ці асудзілі. Са мною ўсё гэта зацягнулася аж на чатыры месяцы.
У камэру прыходзілі новыя людзі. Палову з сукамэрнікаў складалі забойцы. Шмат у каго крымінальныя справы былі заблытаныя; тым ня менш іх асуджалі, пераводзілі ў камэры для асуджаных, накіроўвалі ў зоны, а мой суд усё адкладваўся й адкладваўся. Сукамэрнікі жартам называлі мяне самым небясьпечным злачынцам.
Асноўны кантынгент вязьняў — досыць маладыя яшчэ людзі, не

абцяжараныя адукацыяй. Былую савецкую рэчаіснасьць і камуністычныя ідэі ўспрымаюць абыякава. З зайздрасьцю глядзяць на багатых людзей на Захадзе і разам лічаць той самы Захад нашым ворагам. У большасьці гэта людзі з неакрэсьленым сьветапоглядам. Асноўная мэта — набыць як мага больш грошай, каб самасьцьвердзіцца: мець добры аўтамабіль, шыкоўнае адзеньне, сродкі дзеля таго, каб бавіць вольны час, і каб гэтага вольнага часу было як мага болей. Думка, што калі ты не абдурыш, дык абдураць цябе, штурхае іх на парушэньне законаў. Фактычна, палове з тых, з кім я правёў больш за паўгоду, адсутнасьць маралі дазволіла пайсьці на забойства. Думаю, тыя, хто сядзеў за рабаўніцтва, разбой і бандытызм, таксама маглі забіць пры зручным выпадку. Учынкі свае яны апраўдвалі тым, што ніколі ня бралі ў бедных апошняга — ну проста як бальшавікі, калі прыходзілі да ўлады. У аснове гэта ўсё ж людзі савецкія.

Другая частка — тыя, каму няма за што пражыць, і яны змушаныя красьці ў калгасе, на прадпрыемстве, а ў апошнія гады ўсё часьцей у такіх, як самі. За мех зерня ці бульбы сядзяць побач з забойцамі, і, вядома, пачуваюцца ня дужа ўтульна. Такім не прыносяць перадачы — няма за што, і яны вымушаныя выпрошваць цыгарэты. Цыгарэты ды гарбата, зь якой вараць «чыф», — у СІЗА найбольшая каштоўнасьць. Не спрабаваў, але, відаць, «чыф» як алькаголь дазваляе на нейкі час забыцца на ўсё.

Зьдзіўляе імкненьне сьледзтва й пракуратуры як мага завысіць артыкул абвінавачваньня ці яго частку, каб як мага цяжэй выглядала абвінавачваньне. А пакалькі больш як палова абвінавачваных не наймаюць сабе за грошы адваката, а суды разглядаюць такія справы, як на канвееры, дык няцяжка ўявіць, колькі людзей дарэмна атрымліваюць завышаныя тэрміны пакараньня. А тут яшчэ за апошнія два гады — некалькі ўзмацненьняў КК, нібыта ўлады за мэту ставяць як мага болей людзей прапусьціць праз турмы. Празь некалькі год на Беларусі да турмы дачыненьне будуць мець амаль усе. Адны будуць сядзець, другія — ахоўваць, а дзеці — ці рыхтаваць сябе да працы ў міліцыі, ці спазнаваць законы крымінальнага сьвету. Ахова вязьняў зьневажае, апроч так званых «положенцев», ды й то таму, што каля іх можна чым–небудзь пажывіцца, бо перадачы тым носяць штомесяц, а то й часьцей, бо за пачак

цыгарэтаў можна прынесьці перадачу на імя сукамэрніка, у родзічаў якога на перадачу няма грошай альбо няма каму прынесьці. Ахоўнікі звыкліся вакол зэкаў пабірацца. Нейкую паслабку можна атрымаць за некалькі добрых цыгарэтаў. Наглядчыкі перастаюць заўважаць «кабуры» — прасьвідраваныя ў сьценах паміж камэрамі дзіркі, празь якія ажыцьцяўляецца перапіска, а таксама перадаюцца цыгарэты й гарбата. Тыя ж ахоўнікі ня любяць выконваць ускладзеныя на іх абавязкі. Па выходных і ў сьвяточныя дні, калі няма адміністрацыі, лянуюцца выводзіць зэкаў у прагулачныя дворыкі. З гэтай прычыны ў мяне ўзьнікалі зь імі сваркі, бо на пагадненьне я ня йшоў, і патрабаваў, каб мяне выводзілі на прагулку штодня. З–за гэтага ахоўнікі нават спрабавалі сварыць мяне зь іншымі сукамэрнікамі, але з гэтага нічога не атрымалася, бо тым я часта дапамагаў юрыдычнымі парадамі, і тыя ва ўсім мяне падтрымлівалі. Увогуле, у турме паважаюць тых, хто ўмее бараніцца — асабліва ад адміністрацыі й ахоўнікаў. Абы ня ставіўся зьняважліва да астатніх. Цяжкія ўмовы жыцьця згуртоўваюць розных людзей. Той, хто не скарыўся адміністрацыі — у асаблівай павазе, як і той, хто змог адстаяць сябе ў судзе ці дапамог зрабіць гэта іншаму. Мой багаты досьвед затрыманьняў міліцыяй, два судовыя працэсы па аднаўленьні на працы, крымінальная справа па вершы С.Адамовіча «Убей президента», грамадзянскія справы паміж газэтай «Выбар» і выканаўчымі ўладамі дужа прыдаліся. Але да такіх зь перасьцярогай ставіцца адміністрацыя, іх імкнуцца запалохаць, зламіць, пасварыць зь іншымі вязьнямі. А калі не атрымліваецца — імкнуцца прыціснуць усіх, хто сутыкаецца зь імі.

У нашай 109 камэры амаль увесь час быў тэлевізар. Быў і тады, калі туды пасадзілі мяне, але празь месяц чалавека з тэлевізарам перавялі ў іншую камэру. А калі тэлевізар блізкія спрабавалі прынесьці іншым сукамэрнікам, ім тлумачылі, што не перададуць, бо камэра «балаваная». Але ж у 109 камэры мацюкаліся менш, чым ахова, зь якой з–за гэтага ды яшчэ з–за неўспрыманьня маёй беларускай мовы даводзілася весьці сапраўдную вайну. Відаць, каб пазбавіць мяне сувязяў з воляй на час апошніх паведамленьняў адключалі нават радыёкропку. Але з сукамэрнікамі мяне гэта не пасварыла.

Фактычна, усе ў камэры былі ўпэўненыя, што з судом у

адносінах да мяне ў сьледзтва й пракуратуры нічога не атрымаецца, спачувалі й з паразуменьнем ставіліся да майго ўзросту й ня дужа добрага стану здароўя. Некаторыя хлопцы навучыліся амаль без памылак пісаць па–беларуску мне запіскі (мулі) і перадаваць іх пасьля таго, як іх асуджалі ці пераводзілі ў іншыя камэры. Было два–тры выпадкі, калі ў камэру траплялі новыя вязьні й спрабавалі задаваць мне пытаньні, якія маглі ўзьнікнуць адно ў чалавека, які добра ведае дзейнасьць арганізацыі «Выбар». З такімі пераходзіў на жарты ці рабіў выгляд, быццам нічога не разумею. Зрэшты, вязьні такіх хутка распазнаюць, і ў камэрах яны доўга не затрымліваюцца — ніхто іх ня б'е, проста перастаюць заўважаць і празь нейкі час іх пераводзяць нібы ў бальнічную камэру ці яшчэ куды. Нездарма ж у турме столькі апэратыўных работнікаў. Зьнешне яны займаюцца толькі тым, што носяць вязьням лісты.

Ёсьць у штаце й выхавальнікі. Іх прызначэньня я так і не зразумеў. Дзесь у пачатку маёй адседкі у камэру зайшоў адзін такі — маёр Лук'янаў, які патлумачыў, што добра ведаў мяне на волі. Сказаў. што ў яго абавязкі ўваходзіць пазбаўляць вязьняў за парушэньне рэжыму перадачаў, а пры неабходнасьці й пачаставаць дубінкай. Аднойчы выклікаў такога парушальніка й запытаў, чаму той аддасьць перавагу — аднаму ўдару дубінкай ці пазбаўленьню перадачы на месяц. Безь перадачы хлопец заставацца не захацеў і выбраў дубінку, тым больш гэта ў асабовай картцы не фіксуецца.

Калі празь некалькі дзён Лук'янаў наведаў камэру, я спытаў, ці добра накарміла яго жонка пасьля той цяжкой «выхаваўчай працы». Пасьля гэтага мы яго больш ня бачылі. Сутыкнуліся аднаго разу, калі выводзілі ўсіх «на шмон» — праверку. Ён за нешта папракнуў мяне, а адзін зь ягоных паплечнікаў усур'ёз пачаў тлумачыць сукамэрнікам, нібыта з–за таго, што я зьняў бюст Суворава, у Расеі, а потым і ў Беларусі распачаўся крызыс. Больш сутыкацца з выхавальнікамі не давялося.

Яшчэ адна служба СІЗА — гэта спэцчастка. Яе абавязкі — арганізоўваць справаводзтва і перамяшчэньне афіцыйных дакумэнтаў і рашэньняў судоў, пастановаў пракуратуры аб працягу тэрміну сьледзтва, скаргаў вязьняў. У выніку майго незаконнага арышту і ўтрыманьня пад вартай гэтых скаргаў ад мяне паступіла нямала. Спачатку іх добрасумленна выпраўлялі па прызначэньні. А потым, відаць, ці сьледзтва, ці пракуратура

параілі не выпраўляць. На гэта давялося скардзіцца абласному пракурору празь неафіцыйны, т.зв. «зялёны канал». Высьвятляць прычыну затрымкі маёй карэспандэнцыі прыходзіў памочнік пракурора вобласьці, але як заўжды ў такіх выпадках, ніякіх парушэньняў не знайшоў. Як кажуць, даручылі ваўку авечак пасьвіць!

Калі падвесьці вынікі майго знаходжаньня за кратамі на працягу сямі месяцаў — гэта дарэмна страчаны час. Адзінае, што я вынес адтуль — гэта перакананьне, што йснуючая сыстэма пакараньня правапарушальнікаў не перавыхоўвае, а наадварот, азлабляе, робіць непрыдатным да нармальнага цывільнага жыцьця. Ці не таму тыя, хто адбыў пакараньне, празь нядоўгі час трапляюць зноў за краты.

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]

Вайна ў ARCHE 2(3)-1999 · [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
[image]
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 7-04-2000**

[image]
[image] .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima



да Зьместу 2(3)-1999

*гісторыі*

# Міхась Шупенька
# У Німе

**Я** на сквоце. Праванс. Горад Нім. Каб патрапіць у яго, ідзеце па рю Апалінэр да пляс Бадлер і далей налева напрасткі. Сквот — гэта незаселеная гаспода, у якую ўласьнік, мусіць, уклаў багата грошай, ды шчэ й мала аказалася. Нагадвае яна вілу ці нават замак, які навіс над стромым адхонам.
Якраз прыдатнае сховішча для тузіну падпітых прыблудаў–палячкоў. І мяне.
На слухаўцы ў тэлефоннай будцы на рагу пляс Бадлер вісіць сьвежазвараная курыца. Пад нагамі на сьцяжынцы да сквоту валяецца цалюткі ананас. “Ня хляй, ня хляй, Міша”, — навучае беларускі злодзей, які жыве на сквоце асобна ад палякаў, малы Сярога, тутэйшая мянушка ў яго — Ванька (бо ён “рускі”).

Зарабляю грошы ў Францыі, адылі амаль не пачуваюся чужынцам. Гэта дома, дзесьці ў пераходзе на “Кастрычніцкай”, дзе ўсе ідуць у адным кірунку, дзе на ўсіх аднолькавая скураная вопратка, пачуваешся бы чужынец у вар’ятні. Ды не пра тое...
Маю праблему — нейкі расеец у Марсэлі, мой калега (апошнім часам зарабляю продажам газэтаў), атрымаў кухталёў ад палякаў, а пасьля высачыў іх ды парэзаў, мусіць што й да сьмерці. Дык мясцовая польская мафія выганяе ўсіх “рускіх” — мушу зьяжджаць, шукаць сабе іншага месца.
Па дарозе сустракаюся зь нейкім Жэмэкам (амаль што Зэмбэк, як у Акулавага Сянкевіча, чый шлях я, сам ня ведаючы таго, надта ж добра вывучыў). У Нім мы зь ім прыяжджаем разам, і ён чытае мне на дарозе файны лектум аб складаным

стаўленьні паўднёвых французаў да альжырскіх эмігрантаў. Зьнячэўку патрапляем пад жахлівую трапічную калябаранцкую залеву. Курдэ! Містраль бязьлітасна джгае па мулкіх, здавалася так, стромкіх калюмнах дажджу, ажно падкідаючы іх, нібы вышчарбленыя ўзмахамі нябачных рук пустоты.
Жэмэк — будыйскі лекар, рахманы, здатны хіба млява паглядаць праз свае акуляры ды ўздыхаць аб пакінутай дзесьці ў смутку жонцы (ці надта яна ўжо там смуткуе?). Бадзяецца з намёцікам за плячыма пасьля зьлёту такіх самых лекароў у Італіі (“не естэм лекажэм, ешчэ тылько се учэ”).
У Німе спыняемся пасьля сустрэчы зь мясцовай “польскай бандаю”: падышоў быў ад іх чалавек і папытаўся, хто мы маем быць. Раней мне даводзілася ўжо быць і Мікка Шуппяляйненам і Мікаэлам Шупенасам, у гэты раз назваўся нарэшце мадзярам, абы адчапіліся — а ён пачаў раптам штось па–мадзярску балбатаць, і дзе ж толькі мовы гэтай навучыўся? Аказаўся славак, які жыве з паньствам паспалітым на тым самым сквоце. Што рабіць — пасьмяяўся я, ды прыйшлося здавацца ды праўду казаць.
Прымаюць яны нас добра. І кушакі даюць, і вінка белага й чырвонага выставілі колькі захочаш. Дзядэк — музыкаж, і Дарэк, і Чарэк, і Джоні–Гітара, які зьбег яшчэ падчас ваеннага стану ў Польшчы ды так і застаўся, апошнія гадоў з восем усё ніяк ня могучы выбрацца “на Корсыку” да сваёй кабеты. Выпіваем. Даю старому Джоні сваю гітару: ён прасьпявае дзеля прыемнасьці розныя маскальскія пёсэнкі, ды й сам я трошкі прасьпяваю.
Мяркуем з Жэмэкам і вырашаем паспрабаваць знайсьці тут працу.
Як у Німе цёпла ды прыгожа — стаіць помнік імпэратару, і камяніца, мусіць, яшчэ цэзаравых часоў.

Наступнага вечару зноў прыходзім на той сквот. Файна сабе, сьцелемся. На шчытох са сьвежае дошкі — у Жэмэкавым намёціку спаць апошнім часам трохі надакучыла — уночы ўсё ж зімна. Анэкдоты, байкі, троху вінка. Засынаю. Раптам — бах нешта ў морду — прачынаюся — Дарэк, адпітая галава, даў мне ў зуб: не знаходзіў, курва паляцка, свае дакумэнты, дык, ты ж бач, адразу рашыў, што гэта я іх скраў. Скуль гэты Дарэк узяўся? У яго нейкі беларус зьлямзіў дакумэнты. І яму пляваць,

што я да таго сьвінтуса зусім не падобны.
Ня слухае нас Дарэк, сыходзіць у цемру па нож. Разьбягаемся са сквоту хутчэй, хутчэй — ці мала што дурному і п'яному ў голаў стукне... Бадай, правільна той сьвінтус зрабіў — палякі колькі ўжо гадоў бязь візаў па Эўропе вандруюць.
Цэлую ноч блукаю. Як які Чэсь дэ Монтэ Касына. Крадуся ціхутка, зуба ў роце ня маю. Пасьля сяджу да ранку ў кабіне нейкага трактару ці то скрэпэру. Трымаю даўгі цяжкі пажарны бусак у руках для пэўнасьці.
Назаўтра сустракаю тых палякаў. "Дык Дарэк жа шалёны, цяпер сам шкадуе. Ён табе за зуб адкупную заплаціць". Няхай ужо ж і заплаціць, дурная пальшчызна. А не заплаціць, біць будзем.
Праз колькі тыдняў выганяюць Дарэка са сквоту пэндалямі — у сябрука майго нож–фінку шпульнуў. А яшчэ праз год, тамсама зь ім стрэўшыся, вінка расьпілі. Тады ён мне за зуба й заплаціў хіба ж па справядлівасьці. Хаджу цяперака, раскашую.

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

*Вайна ў ARCHE 2(3)-1999* . [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **14-10-1999**

[image]
[image] .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima



да Зьместу 2(3)-1999

***запісы***

# Вінцэсь Ліпскі
# Пра вайну

**Н**еяк несур’ёзна выглядаюць цяперашнія афіцыйныя святкаванні Дня Перамогі ў параўнанні з савецкім часам. Маштаб не той, ці што. Тады, здавалася, была сапраўдная ўпэўненасць пераможцаў, а цяпер — нейкі істэрычны надрыў, нават святочны канцэрт па БТ выглядаў калгаснай самадзейнасцю з Уладзімірам Правалінскім у ролі Яраслава Еўдакімава. Дый дзе цяпер тыя ветэраны? Тыя дзядзькі, якіх я помню з дзяцінства, што жылі па суседству, выказваліся досыць катэгарычна і нецэнзурна на адрас тэлевізійных ветэранаў, абчапляных юбілейнымі медалямі, а цяпер толькі гэткія й засталіся... У былым партызанскім краі вайна ўспрымалася як нешта нязменна значнае. Школьнікі зачытваліся кніжкамі “пра вайну”, і не адарваць было іх ад ваенных фільмаў, як цяперашніх — ад якога Шварцнэгера ці “чалавека–павука”. Бацька 18–гадовым прыйшоў пешшу дамоў аднекуль з–пад Адэсы, уцёкшы з румынскага палону. Пабыўшы каля сваёй маці, пайшоў у партызаны. У 44–м, пасля партызанскага параду ў Менску, іх трохі падкармілі, ды папёрлі на Ўсходнюю Прусію, адкуль мала хто і вярнуўся. Пра быццё сваё ў партызанскай разведцы неяк дужа не расказваў. Адно запомнілася: я неяк стаяў на двары і кідаў нож у вароты. Утыкаўся ён крыва, коса і рэдка. Падыйшоў бацька, і, замест таго, каб насварыцца за падзёўбаныя вароты, узяў нож і шыбнуў яго крокаў з 15–ці, дый пайшоў далей. Той нож я пасля ледзь выдраў з варот. (Кідаць нож я ад таго так і не навучыўся, як не навучыўся (і ўжо не давядзецца) яшчэ многім бацькавым уменням...).

Спаліць нашу вёску разам з жыхарамі немцы хацелі не раз, ды ўсё неяк не выпадала — то партызаны прарваліся ды не далі, то людзі паспелі пахавацца ў балоце, то, адступаючы, не справіліся падпаліць як след. Праўда, спалілі ў хаце 12 старых жанчын, што выйшлі з лесу, каб памалоць трохі збожжа. Сярод іх была і немка, жонка вясковага доктара, якую той прывёз з Нямеччыны, дзе доўга быў у палоне пасля першай германскай. Як толькі пачаліся ваенныя пературбацыі, мой дзед надумаўся ды раскаціў хату па бярвеннях. Калі ўсё скончылася, склаў зноў, і такім чынам пад канец вайны ў вёсцы засталіся пасля ўсіх паленняў і бамбёжак дзьве цэлыя хаты — дзедава ды яшчэ адна, якая ацалела ўжо нейкім дзівам. (Людзям, якія хаваліся ў барознах ад кулямётных чэргаў з нямецкіх самалётаў, цяжкавата цяпер давесці, што “сербы самі вінаватыя”.)
Цяпер пайшла мода разважаць, што вось партызаны правакавалі немцаў на знішчэнне мірных вёсак. У 1942 г. два чэхі, закінутыя з Англіі на парашутах, забілі імперскага пратэктара Багеміі і Маравіі Гайдрыха. У адказ немцы расстралялі заложнікаў і знішчылі два бліжэйшыя населеныя пункты — Лідзіцэ і Лежакаў, разам з жыхарамі, якія не мелі ніякага дачынення да дыверсантаў. Цікава, як там цяпер у Чэхіі — лічаць тых дыверсантаў героямі ці правакатарамі?
(Сяргей Харэўскі ў “Нашай Ніве” неяк піша: “Мы не гатовыя прыняць прабачэнні”. Няхай бы ішлі ды прасіліся: украінцы — за спаленую Хатынь, латышы — за спустошаную Асвейшчыну, палякі — за спаленыя АК вёскі, ды ці мала за што яшчэ. *Я*, можа, і гатоў быў бы дараваць. Але ж нешта не ідуць — не гатовыя. А кнігу “Я з вогненнай вёскі” не адважыліся выдаць нават у ГДР.
Харэўскі яшчэ пісаў пра палатно Волкава “Мінск, 3 ліпеня”: “Любы франтавік адзначаў, што матацыкл — нямецкі”. Але франтавік, адзначаючы гэта, не бачыў бы тут “кампрамату”, бо, магчыма, і сам у вайну ездзіў на трафейных матацыклах (а ці былі свае?) Падазраю, што Харэўскі пытаўся не ў франтавіка, а ў нейкага тылавіка, альбо і ні ў кога не пытаўся. Вось жа заўсёды лепей пісаць ад сваёй асобы і тое, што ведаеш сам. Я, напрыклад, валю проста — ***я***, а ніякія не *мы*. А вось чаго ні Харэўскі, ні “любы франтавік” так і не заўважыў, дык таго, што вызваляльнікі Мінска на карціне Волкава прыйшлі з Захаду.)

Пасля таго, як перайшла лінія фронту, асобныя групы немцаў яшчэ брылі на захад, а неяк раз невялікі атрад здаўся ў палон групе вясковых падлеткаў. Немцы аддалі вінтоўкі і аўтаматы, адно прасілі, каб іх завялі да найбліжэйшай вайсковай часткі Чырвонай Арміі (здаваліся хоць каму, абы не партызанам). А было і так, што хлопец адвёў такога брадзячага немца ад дарогі ды застрэліў, хоць яго іншыя і адгаворвалі. Той немец прасіўся і паказваў фотакарткі сям'і і дзяцей.

У майго дзядзькі — такога вось ваеннага падлетка — працоўны стаж пачынаецца з 12 гадоў, з 1944–га. Араў на бабах. Восем баб запрагаюцца ў плуг і цягнуць, а ён — мужчына — за плугам ідзе. Пакуль яшчэ прыгналі з Усходняй Прусіі трафейнае быдла і коні.

(Чаму гэта на полі сталі рэдка трапляцца патроны ды гільзы? У дзяцінстве знаходзіў іх ледзь не ў кожнай баразне. А таму, што з таго часу прайшло гадоў 20, метал не вечны.) Помню, было недзе ўлетку пасля 9–га класа. Глядзеў у хаце тэлевізар і пачуў у лесе выбух. Спачатку думаў, што зноў карчы на смалу ірвуць, але насцярожыла тое, што гук выбуху быў нейкі нязвычны. Аж падлеткі паклалі снарад у вогнішча, дый самі падарваліся. Я і сам не раз праходзіў каля таго нямецкага снарада без узрывальніка, вывернутага плугам з зямлі, які даўно ўжо ляжаў пры дарозе на мяжы поля і лесу. Снарад у вогнішчы доўга капцеў і не ўзрываўся, а ўзарваўся толькі тады, калі хлопцы, якім абрыдла чакаць, падыйшлі бліжэй. Двух трохі пабіла пяском і асколкамі, а трэці, што прыехаў з Казахстану на лета да бабулі, застаўся на месцы. Месца тое было лёгка знайсці па загнутых выбухам да зямлі бярозах. Хлопец ляжаў на спіне, помню гладка зачасаныя назад выбухам даўгія белыя валасы і белы твар — уся кроў з развернутай сярэдзіны выцекла ў зямлю. Неслі мы яго да дарогі, здаецца, учатырох ці ўпяцёх, бо іначай развальваўся на часткі.

Нямецкі генерал Гайнц Ґудэрыян у кнізе "Вынікі другой сусветнай вайны" пісаў: *"Савецкія салдаты паказалі сябе ў мінулай вайне храбрымі, умелымі і ініцыятыўнымі. Яны не падалі духам у час адступленняў і няўдач у першай фазе вайны. … Таксама савецкія афіцэры і генералы паказалі ў мінулай вайне высокія камандныя якасці"*. Ці дадзім веры былому нямецка–фашысцкаму акупанту?

Найлепш пераканаць сваіх піцерскіх сяброў у адрознасці

гістарычных шляхоў Беларусі і Расеі мне ўдалося байкамі не пра розных князёў, а пра тое, як беларусы ў складзе дывізіі СС “Беларусь” баранілі італьянскую крэпасць Монтэ–Касіна ад беларусаў, якія былі ў складзе дывізіі Войска Польскага... Чуў, што ў нямецкіх дакументах часоў вайны згадваецца аб стойкасці і адвазе беларускіх салдатаў, што служылі ў частках СС. На жаль, з успамінаў саміх удзельнікаў падзеяў мы аб гэтым ужо не даведаемся, бо тыя ўспаміны пісаліся ўжо пасля вайны, у “вольным свеце”, калі даводзілася маўчаць аб некаторых акалічнасцях. Зрэшты, наколькі па праўдзівасці адрозніваюцца мемуары савецкіх падпольшчыкаў і, скажам, удзельнікаў БКА? Вось жа мала хто з тых другіх з эміграцыі наведаў Беларусь, пасля таго як гэта стала магчымым. Дзіўна, бо калі верыць іхным успамінам, дык землякі мусяць мець надта цёплую памяць пра іх... Усё ж міфы могуць нарадзіцца толькі пасля таго, як вымруць усе ўдзельнікі і відавочцы падзеяў.

---

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

*Вайна ў ARCHE 2(3)-1999* . [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **14-10-1999**

[image]
[image] .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

*Вайна ў 2(3)-1999*

да Зьместу 2(3)-1999

***прыпавесьць***

# Ісмаіл Кадарэ
# Плач па Косаве

**Ісмаіл Кадарэ — найбольш вядомы з альбанскіх пісьменьнікаў, аўтар вершаў, апавяданьняў, раманаў “Генэрал мёртвага войска”, “Заход стэпавых багоў”, “Трохарачны мост”, “Хроніка каменя”, “Канцэрт”, “Палац мрояў”, “Пачвара”, “Цень”, “Spiritus” (1995), а таксама кнігі апавяданьняў “Сьляпы фірман” і эсэ “Альбанская вясна” (1991). Апавяданьні са зборніку “Тры плачы па Косаве” — спроба ўваскрасіць на паперы страчаную шляхетнасьць колішняй балканскай цывілізацыі.**

**I**

**Я**шчэ ніколі ён не апынаўся пасьля бітвы ў стане пераможаных. Аднак у гэты раз на схіле дня яму прымроіліся першыя прадвесьці паразы. Ад стомы ён заплюшчыў веі, а калі расплюшчыў зноў, ягоным вачам адкрылася тая самая карціна: жаўнераў і афіцэраў круціў вялізны чалавечы вір. Двойчы ці тройчы яму здавалася, што нехта выгукваў: Г’ёрг Шкрэлі! — але пасьля ён дапяў, што гэта ўласнае імя мроіцца яму ў галаве. У навакольным хаосе ён нікога не пазнаваў. Яшчэ апоўдні ён згубіў сваіх альбанцаў.

Песьняры заўсёды гінуць у бітве апошнімі, сказаў надоечы князь Лазар, начальнік над усім хрысьціянскім войскам, загадаўшы, каб усе сэрбскія гусьляры, валаскія і басьняцкія

дудары і альбанскія барды, што прынесьлі з ілірыйскіх Альпаў свае аднаструнныя лагуты, сабраліся разам на ўзгорку побач зь ягоным намётам, каб зь бясьпечнага месца сачыць за бітвай. Песьняроў, як заўжды, ашчаджае лёс, кінуў адзін з княскіх намесьнікаў, расьцягнуўшы вусны ва ўсьмешцы, і іскры рэўнасьці заскакалі ў яго ў вачах; але князь абарваў яго: калі мы страцім нашых пеюноў, хто засьпявае нам славу?
Сонца схілялася на захад, сьпевакі стаялі за намётам ўладара і назіралі за рухам войскаў, іншы раз выціраючы сьлёзы. Жудаснае сьвятло залівала спражаную невыноснай сьпёкай косаўскую раўніну. У гэты сьляпучы дзень палкі, здавалася, перамяшчаліся без усякага ладу. Калі ў нейкі момант туркі адкаціліся назад у цэнтры сваіх пазыцыяў і іх загоны лукам выгнуліся пад націскам хрысьціянаў, з–пад вялікакняскага шатра данесьліся пераможныя крыкі, пасьля зноў і зноў, але рапсоды ўжо добра ня бачылі, як там разгортваюцца падзеі. Яны стомлена сачылі за мільгаценьнем штандараў, ім здавалася, што Крыж топча Маладзікі, але залева сьвятла можа спараджаць міражы. Як і наступствы ўчарашняй гулянкі могуць... “Яны занадта наперад рвуцца!” — прашаптаў стары басьняк–дудар, той самы, які ўчора ўначы нагадаў, што нікому, нават князям, нельга піць перад бітвай.
Новыя выгукі раздаліся, калі перад шатром князя Лазара праскакаў сэрбскі загон. Ваяры подбегам кінуліся за ім, і музыкі здагадаліся аб прычынах іх радасьці: коні павымазвалі капыты ў мёдзе, а да мёду прыстаў рыс. Вой жа, што хрысьціянскае войска разарвала турэцкія парадкі, дасягнуўшы самых тылоў і пранёсшыся па сховішчах з харчамі.
То стуль, то сьсюль даляталі лікаваньні, і ўсё ж смутная трывога не пакідала Г’ёрга. І ад гэтага пранізьлівага сьвятла яму тачылася галава. Неўзабаве ён убачыў, што не яму аднаму так нядужа. Раптам і коні рыцараў замарудзіліся: да капытоў, да мёду наліпла калу, і воіны не маглі вярнуцца назад на поле сечы.
Г’ёрг зноў доўга ўзіраўся ў мора сьцягаў над людзкою прорвай. І менавіта над галовамі ваяроў прачытаў ён першае прадвесьце паразы. Здавалася, шоўк харугваў дрыжыць ад хваляваньня, а крыжы, ільвы й вышытыя каранаваныя арлы пагубілі ўсю сваю пыху. Маладзікоў жа, было такое ўражаньне, большала а большала. І не давала спакою беспадстаўная і трохі дзіцячая

думка, што калі гэтым месячыкам і пякучае сонца не ў перашкоду, дык з набліжэньнем ночы і чорт іх не стрымае.
Праваруч, ля намёту князя Лазара, усчалася нейкая сумятня, але Г'ёрг ня мог адарваць вачэй ад сечы. Толькі калі нехта крыкнуў: "Князь перабіраецца куды інш!" — ён усё зразумеў.
— А нам, што ж нам рабіць? — спытаўся гусьляр Владан.
Ніхто не паклікаў сьпяўцоў, значыць, князь ня ў слаўную вылазку кінуўся, а проста палічыў патрэбным памяняць месца знаходжаньня.
Г'ёрг паспрабаваў супакоіць сябе, кажучы, што няма нічога больш натуральнага, чым рух галоўнага начальніка над войскамі пад час бітвы, але трывога мацнела.
Цяпер княскі шацёр запоўніўся параненымі, і ўсё гучней там стагналі. Песьняры сноўдаліся сюды–туды, ня ведаючы, куды падзець свае музычныя інструмэнты, якія раптам сталі ім цяжкімі, як камень.
— Пайду зірну, дзе мае валахі! — усклікнуў адзін.
І іншыя шукалі вачыма свае родныя колеры.
У Владана выступілі сьлёзы. Вось ужо ня думаў ён і не гадаў, што ў гэтай мітусьні забудуцца ня толькі пра іншых сьпевакоў, але й пра сваіх, пра сэрбаў.
Г'ёрг таксама выглядваў сярод безьлічы штандараў альбанскіх арлоў і злаваў на сябе, што не даведаўся, зь якога боку пайшлі ў бой палкі графа Бальшы і графа Янімы. Але шукаць іх было ўжо запозна.
Грукацелі непрыяцельскія барабаны. Урэшце ён адзначыў альбанскія сьцягі, але белыя і чорныя арлы нібы пераскідала бурай.
Багародзіца, Збаў нас! — маліўся ён сам сабе.
Пасьля разам зь іншымі ён некуды бег, ня ведаючы куды, у сьвет. Нехта крыкнуў: тут туркі прарваліся!
Іншыя крычалі сваё. Спачатку здавалася, што гэта загады, але пасьля яны пераходзілі ў журбу. Двухгаловыя арлы згубіліся, але ён ішоў далей. Які разгром! — енчыў нехта. Другі гукнуў: Наперад! — але дзе ж быў цяпер той перад і дзе зад? Г'ёрг пабачыў, як падаўся налева сьцяг караля Босьніі Тврка, а пасьля ў хмарах пылу мільгнулі флагі князя Лазара побач–побач са страшнымі маладзікамі.

Людзі беглі. Блукалі, сьціскаючы меч у руцэ, нейкія незнаёмцы,

узіраючыся ў сустрэчных выпучанымі вачыма. Суайчыньнікаў было не знайсьці. Ён, як у сьне, вярнуўся да кінутага шатра галоўнага камандуючага задзіночанымі войскамі і ледзьве не сутыкнуўся з Владанам. Сэрб рваў на сабе валасы з плачам: князя Лазара забралі ў палон, загінула наша сэрбская зямля! Госпадзе Ісусе, збаў нас! — вырвалася ў Г'ёрга, і ён падставіў плячо свайму калегу Владану, каб разам выбірацца з сумятні. Владан усё наракаў — нібы трызьніў: "Няма ў мяне больш гусьляў, браце; выкінуў я гусьлі. Навошта яны мне цяпер, падумаў я. Калі князь Лазар у палоне, дык і мы ўсе пойдзем у ярмо. А дзе падзеліся твае альбанцы?"

— Ня ведаю, — адказаў Г'ёрг. — Я ня бачу нашых сьцягоў.

— Няма сэнсу шукаць іх, — сказаў Владан. — Яны ўсе палеглі. Пакінь і ты сваю лагуту, браце. Ці мо табе карціць сьпяваць цяпер на лад турэцкі?

— Маці Божая, як нас разьбілі! — усклікнуў Г'ёрг замест адказу.

Байцы беглі хто куды, спатыкаліся аб трупы і стагналі. Некаторыя былі выкінулі зброю, а цяпер нахіляліся да нябожчыкаў, забіралі мячы, а неўзабаве зноў адкідалі іх. З усіх бакоў лямантавалі: "Стойце, куды вы бяжыце? Хто вы?" Абрыўкі навінаў міжволі дасягалі вушэй у гэтай куламесе. Ваявода Мірча з рэшткамі сваіх валахаў імкнуўся прарвацца за Дунай. Кароль Тврко, згубіўшы карону, адступаў у Босьнію. Альбанскія каталікі на чале з графам Бальшам шукалі сьцежак у туманныя горы заходняй Альбаніі, а праваслаўныя сьцякаліся за Янімай на македонскую раўніну. Толькі мёртвыя не сьпяшаліся пакідаць праклятае поле.

— Так я й думаў, — мармытаў Владан. — У мяне даўно было прадчуваньне бяды.

Чаму ж ты не папярэджваў пра гэта, нябога? — карцела спытацца Г'ёргу, — але стомленыя вусны адмаўляліся варушыцца.

Здалёк даляцелі глухія крыкі: "Вяртайцеся! Добрая навіна! Султана забілі!"

Але дзіўна: ніхто не павярнуў назад. Усе пачулі вестку, але ўсе, такое ўражаньне, адразу выкінулі яе з галавы. Сутонела. Позна было нешта мяняць. Уцекачы нейкую хвілю абводзілі вачыма абшар, быццам шукаючы тое месца, дзе абарвалася жыцьцё султана, і празь нейкі момант, занадта стомленыя, каб думаць,

казалі самі сабе, што й гэтая падзея, як і ўсе астатнія, здарылася занадта позна.
Хутка цямнела. Дзень згасаў. Такі невыносна сьляпучы дзень мог спарадзіць адно такую бясконца цёмную ноч. У падвойна змрочнай ночы бадзяліся афіцэры, што пазрывалі свае камандзірскія значкі, і шараговыя, маркітанты, захавальнікі цяпер ужо нікому не патрэбных сакрэтаў і пячатак, забойцы, якія шчэ ня зьдзейсьнілі злачынстваў, сьвятары, што толькі звар'яцелі, і ўбогія розумам, да якіх ад страху вярнуўся глузд. Двойчы Г'ёрг гатовы быў зашпурнуць сваю лагуту куды далёка, але абодва разы ён казаў сабе, што ў такім учынку не было б сэнсу, і прыціскаў інструмэнт да грудзёў. Калі я застануся ў розуме да раніцы, я застануся ў розуме назаўжды, — падумаў ён. Калі рука ўзьнялася трэці раз, струна лагуты ціха прастагнала: "Скажы, чым я табе не ўгадзіла, Божае дзіця?"
Так ляцелі яны з Владанам, быццам два бухматыя чмялі ў змроку. У бляску запаленай некім паходні твары здаваліся ім яшчэ страшнейшымі. Сабакі лізалі капыты мёртвага каня. О неба! — крыкнуў Г'ёрг. Гэта той мёд, які нам паказаўся раніцай знакам перамогі.
"Мы мёртвыя, браце", — прашаптаў Владан. — Ты ўпэўнены, што мы не прывіды?

***далей*** >

---

[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image]

*Вайна ў ARCHE 2(3)-1999* . [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

---

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
**Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту**
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 14-10-1999**